ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА

# СТАЛАСЦЬ ДУМКІ, МАЛАДОСЦЬ ДУШЫ



ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА



# СТАЛАСЦЬ ДУМКІ, МАЛАДОСЦЬ ДУШЫ

Зборнік паэзіі

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2000

УДК 882.6-93
ББК 84(4Беи)6
С75

*Для старэйшага школьнага ўзросту*

Укладанне *Міколы Мятліцкага*

Прадмова *Алеся Марціновіча*

ISBN 985-02-0060 X

© Укладанне. М. М. Мятліцкі, 2000
© Прадмова. А. А. Марціновіч, 2000
© Афармленне. В. І. Цехановіч, 2000

# ІМГНЕННЯЎ ПАЭТЫЧНЫХ ХАРАСТВО

Сярод шматлікіх твораў, напісаных слыннай беларускай пясняркай Еўдакіяй Лось, вылучаецца верш, у якім аўтарка растлумачыла сваё разуменне паэзіі, хораша і непаўторна выказала тое, чаго не можа не разумець кожны, хто неабыякавы да найвышэйшага эмацыянальна-духоўнага ўзруху:

У кожным імгненні паэзія ёсць,
У кожным здзяйсненні —
яе прыгажосць,
У кожнай істоце — яе хада,
У кожнай бядоце — яе бяда.

Аднак паколькі кожны сапраўдны паэт — яркая творчая індывідуальнасць, ён па-свойму выказвае тое, што не можа не хваляваць іншых творцаў. Ды і звычайных людзей, улюбёных у паэзію, таксама. Але калі чытачы, пазбаўленыя ўмення пісаць вершы, могуць заставацца паэтамі толькі ў душы, дык тыя, каму падуладна вобразнае мысленне, ствараюць яркія, уражлівыя малюнкі, якімі захапляюцца многія. Тым самым пашыраюцца межы паэзіі. Але індывідуальны пачатак яе не знікае, у чым лёгка пераканацца, знаёмячыся з творамі паэтаў, прадстаўленых у гэтай кнізе. Кожны з іх — са сваім бачаннем і разуменнем свету.

...Максім Лужанін — патрыярх беларускай літаратуры. І патрыярх не толькі па ўзросту (нарадзіўся 2 лістапада 1909 года), а і па значнасці таго, што зроблена амаль за семдзесят пяць гадоў настойлівай творчай працы. Родам Аляксандр Амвросьевіч (сапраўднае імя яго Аляксандр, прозвішча Каратай, а Максім Лужанін — адзін з самых распаўсюджаных псеўданімаў, бо часам карыстаўся і такімі, як М. Бусловіч, Ал. Даведка, Мікола Драч, Л. Трыер) з вёскі Прусы цяперашняга Салігорскага раёна. Скончыўшы сямігодку ў Чырвонай Слабадзе, у 1924 годзе паступіў у Беларускі педагагічны тэхнікум, што працаваў у Мінску і з'яўляўся важным літаратурна-культурным асяродкам. У тэхнікуме вучыліся многія

з тых, каму ў далейшым выпала стаць вядомымі пісьменнікамі. Сваім пачуваўся сярод іх і М. Лужанін. Ды і не з пустымі рукамі прыехаў у сталіцу, а з першымі вершамі. Хутка знайшоў сяброў і аднадумцаў. Найперш зблізіўся з Пятром Глебкам, Сяргеем Дарожным, Віктарам Казлоўскім. Хлопцы таксама пісалі вершы, і кожны спяшаўся надрукавацца.

У 1925 годзе змог парадавацца сваёй першай публікацыі і М. Лужанін. У сёмым нумары часопіса «Чырвоны сцяг» быў апублікаваны яго верш «Звоніць восень». Бадзёры, аптымістычны, напоўнены радасцю і светлынёй жыцця, ён родніўся зместам з творамі іншых тагачасных пачаткоўцаў. Такі ўжо быў час, калі гэтак хораша верылася ў светлую будучыню. Гэта пазней прыйдзе ўсведамленне, што многае ў краіне робіцца не так, як павінна рабіцца. Гэта пазней пачнуць ламацца лёсы, а іх, пісьменнікаў, ці не ў першую чаргу. Не міне благая часіна і трох з іх дружнай кампаніі. У 1943 годзе памрэ, адбываючы пакаранне на Далёкім Усходзе, С. Дарожны. Цяжка захварэе, не жадаючы верыць у тое страшнае, што адбываецца, В. Казлоўскі. Самога ж Аляксандра Амбросьевіча рэпрэсіравалі ў 1933-м, незаконна асудзілі на два гады. Пакаранне адбываў у Марыінску Кемераўскай вобласці (Расія).

Ды гэта — яшчэ наперадзе... Вясной 1925 года М. Лужанін быў прыняты кандыдатам у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк». А перад гэтым уваходзіў у студыю «Маладняка», якую ўзначальваў Міхась Зарэцкі. У лістападзе 1925-га прымаў удзел у рабоце першага з'езда гэтай літаратурнай арганізацыі. Праўда, у 1926 годзе перайшоў у літаратурна-мастацкае згуртаванне «Узвышша». Гэта былі пошукі самога сябе і пошукі сябе ў літаратуры. Талент шукаў свайго найбольшага і найлепшага раскрыцця. Таму ўзяўся і за прозу. «Бабіна лета», «Багун», «Мяцеліца» — гэтыя і іншыя апавяданні былі напісаны М. Лужаніным яшчэ ў 20-я гады. Дарэчы, яго проза спадабалася К. Чорнаму, які меў бездакорны мастацкі густ.

Пасля заканчэння універсітэта М. Лужанін працаваў адказным сакратаром у рэдакцыі часопіса «Узвышша», рэдактарам на Беларускім радыё. З'яўляўся адным з самых актыўных маладых пісьменнікаў. Аб гэтым сведчаць і шматлікія публікацыі ў перыёдыцы, і кнігі, якія выходзілі на працягу некалькіх гадоў: зборнікі вершаў «Новая ростань», «Аднагалосна», «Галасуе вясна за вясну», «Кастрычнікам! Ліпенем! Маем!», «Першамайская вуліца».

10 жніўня 1933 года Аляксандра Амбросьевіча арыштавалі. Зведаў нямала. На шчасце, менш, чым іншыя, хто таксама быў аб'яўлены «ворагам народа». Аднак хоць у 1935 годзе і змог атрымаць жаданую свабоду, рэабілітавалі толькі ў 1956-м. А развітаўшыся з Марыінскам, прыехаў у Маскву. Працаваў рэдактарам-

арганізатарам Галоўнай рэдакцыі літаратуры па машынабудаванні. На гэтай пасадзе яго і заспела Вялікая Айчынная вайна. Мабілізавалі ў жніўні сорак першага і накіравалі ў Падольскае пяхотнае вучылішча, якое скончыў у 1942 годзе. Ваяваў пад Сталінградам... Супрацоўнічаў у выданнях, якія тады выходзілі ў Маскве на беларускай мове. Дэмабілізаваўся ў 1944 годзе. Загадваў аддзелам культуры рэдакцыі газеты «Звязда», працаваў адказным сакратаром часопіса «Вожык», рэферэнтам у Акадэміі навук БССР. З 1959 года з'яўляўся членам сцэнарнай калегіі, у 1967—1972 гадах — галоўным рэдактарам кінастудыі «Беларусьфільм».

На пасляваенны час і прыпадае асаблівая актыўнасць у творчай працы М. Лужаніна. Прытым — у розных галінах. Застаючыся паэтам па прызванню, ён усё больш упэўнена адчувае сябе ў прозе. Праўда, калі з'явілася кніга М. Лужаніна «Людзі, птушкі, прастор», у якой, як і ў «Дванаццаці вячорных вогнішчах», ажываюць вобразы тых, з кім аўтар меў магчымасць неаднойчы сустракацца, а з некаторымі і сябраваць, а таксама гучыць прызнанне ў любові да зямлі бацькоў, Анатоль Вялюгін пісаў: «За што б ён ні браўся — усюды, і ў прозе, і ў кінадраматургіі, перш за ўсё адчуваецца, што аўтар гэтых твораў — паэт».

На карысць таго, што проза ці кінадраматургія (разам з Аркадзем Куляшовым М. Лужанін напісаў сцэнарыі вядомых мастацкіх фільмаў «Першыя выпрабаванні» і «Запомнім гэты дзень») з'явілася з-пад пяра паэта, сведчыць тое, наколькі ў творах шмат яркіх і непаўторных малюнкаў, што вабныя (найперш у прозе) сваёй светлай напоўненасцю лірычнымі адступленнямі. Гэта заўважаецца і ў такой выдатнай кнізе М. Лужаніна, як «Колас расказвае пра сябе», адзначанай у 1965 годзе Літаратурнай прэміяй імя Якуба Коласа.

Увогуле, кніга «Колас расказвае пра сябе» — значная з'ява ў беларускай літаратуры, а калі канкрэтней — у мемуарыстыцы. М. Лужанін не адзін год працаваў у народнага песняра літаратурным сакратаром. Тым самым ён меў магчымасць шмат гадзін на дзень праводзіць з Я. Коласам. Канстанцін Міхайлавіч расказваў яму многае з таго, што можна даверыць толькі блізкаму чалавеку. Зразумела, М. Лужанін прапанаваў у друк далёка не ўсё, але гэтага дастаткова, каб пашырылася наша ўяўленне пра Я. Коласа, каб мы даведаліся шмат пра яго як пра чалавека і грамадзяніна. Кніга «Колас расказвае пра сябе» прываблівае тым, што ў ёй М. Лужанін бачыцца і цудоўным апавядальнікам, і зацікаўленым субяседнікам. І, канечне ж, творцам, які і сам схіляе галаву перад талентам народнага песняра.

Пра Я. Коласа М. Лужанін напісаў некалькі апавяданняў і для

самых маленькіх. Гэтыя творы склалі змест яго кнігі «Лесьнічоўка». Калі ж гаварыць пра прозу М. Лужаніна ў цэлым, дык яна вызначаецца сваёй жыццёвасцю і філасофскай напоўненасцю, дзе адчуваецца ўменне аўтара ствараць запамінальныя характары. У аднолькавай ступені — няхай гэта рэальныя людзі, як той жа Я. Колас, ці персанажы, народжаныя аўтарскай фантазіяй. Прозу М. Лужаніна лёгка пазнаеш і па яе моўнай насычанасці. Гэта тычыцца і аўтарскага пісьма, і мовы герояў, у тым ліку і дыялогаў.

Максім Лужанін, як далёка нямногія пісьменнікі, тонка адчувае слова, нярэдка ўжывае і такія словы, выразы, што пакуль не атрымалі шырокага распаўсюджання, але вартыя таго, каб гучаць не толькі ў гутарковай мове. Вядомы беларускі крытык і літаратуразнаўца Уладзімір Гніламёдаў, не без падстаў на тое, лічыць М. Лужаніна «адным з лепшых пісьменнікаў-моваз наўцаў». У сувязі з гэтым У. Гніламёдаў заўважае: «Майстэрня слова — гэтак можна сказаць пра яго творчую лабараторыю». А ў гэтай лабараторыі не знойдзеш слоў-новаўтварэнняў, якія асабліва любяць ужываць некаторыя пісьменнікі (паэты — таксама), калі хочуць падацца арыгінальнымі. У ёй годнае месца займаюць іншыя словы — народныя, пачутыя М. Лужаніным сярод сваіх землякоў ці ў іншых кутках Беларусі, дзе яму давялося пабываць.

Дарэчы, М. Лужанін гатовы палемізаваць з тымі, хто папракае яго за частае ўжыванне слоў, якія многімі ўспрымаюцца як ненарматыўныя, не характэрныя літаратурнай мове. Свайго роду адказам тым, хто, па сутнасці, выступае супраць жывой гутарковай мовы, успрымаецца верш «Крытыку, які дакараў мяне за архаізмы», напісаны ў 1972 годзе:

Старое слова! Ах ты,
Якая ж тут бяда?
А продак мой пра нафту
Казаў: гарывада.

Стаймуйцеся з імпэтам,
Шаноўны ягамосць!
Галоўнае не ў гэтым,
А ў тым, што нафта ёсць.

Нават па тым, што твор гэты ўключаны паэтам у кнігу, якая перад табою, юны чытач, можна меркаваць, наколькі ён дарагі аўтару, як і ўсё тое, змешчанае тут, сталася свайго роду выбраным з пройдзеных ім дарог. Вершы, напісаныя ў розныя гады, даюць вельмі поўнае ўяўленне аб мастакоўскай манеры паэта, ягоным светаўспрыманні і светабачанні. А яшчэ з іх бачна, як і з верша «Надыход слова», наколькі чуйны да самога слова М. Лужанін:

Згукі лаўлю і зрухі
Чуйна, як на паверцы:
Сэрцу хочацца слухаць,
Слухаць хочацца сэрцам.

І гэты працэс адчування наваколля, пазнання яго, спасціжэння ўзнаўляецца падрабязна, паэтычны малюнак разгортваецца паступова, а ў гэтай свайго роду замаруджанасці — свая перавага. Нішто не праходзіць міма позірку. Тым самым дасягаецца вялікая скандэнсаванасць радка, які знітоўвае між сабой розныя імгненні, што і нараджаюць яе вялікасць Паэзію. А ў гэтым сэнсе яшчэ больш характэрны верш «Мастак». М. Лужаніну ўдалося перадаць увесь працэс творчасці: ад нараджэння задумы — да яе поўнага ўвасаблення.

Згасала сонца. Ён пісаў
Карціну.
Здавалася, што прычакаў
Часіну
І перадасць
Адным рукі узмахам
Чаўны і снасць
І ўзлёт дзюбатых птахаў.

Мастаку хацелася дасягнуць як мага большай дасканаласці:

Ды каб чуваць было,
Аб чым
сумуюць чайкі,
Ды каб відаць было
На дне марскім
зары акрайкі.

Над карцінай «працаваў, аж покуль змрок не ўпаў на бераг». Ды і тады не сышоў з месца, каб раніцай зірнуць на палатно як бы новымі вачыма. Здавалася б, перадаў усё, што хацеў:

Схапіў ён тонка вагары
І колер хвалі,
І птушкі белыя ўгары
Нібы крычалі.

Але як прафесіянал хутка зразумеў, што карціна «жыла», «дыхала» не гэтымі падрабязнасцямі. Зусім не тое, над чым ён доўга разважаў, надавала твору непаўторнасць:

А ўсё ж не гэтым і не тым
Жыла карціна,
Зусім не дыхала яна
І не свяціла,

Каб не трымцеў між сінявы
Ледзь-ледзь прыкметны,
Але імклівы і жывы
Рыбацкі ветразь.

Аднак дамінанта верша «Мастак» у апошняй страфе:

І знаў мастак,
Хоць залічылі
Знаходку ў скарбы,
Што ветразь той
Быў выпадковы
Кавалак фарбы.

Завяршэнне твора нечаканае, але па-свойму характэрнае, бо лішні раз пацвярджае правільнасць думкі, што творчасць — з'ява заўсёды загадкавая. І наўрад ці ўдасца калі-небудзь спасцігнуць усе яе сакрэты. Хоць, калі разабрацца, да гэтага няма патрэбы імкнуцца, бо загадкавасць і нараджае паэзію ў самым шырокім яе разуменні. А асабліва эстэтычнае задавальненне атрымліваеш, калі знаёмішся з творчасцю прызнаных майстроў. Адным з іх у беларускай паэзіі і з'яўляецца Максім Лужанін, які, нягледзячы на свой вельмі паважаны ўзрост, працуе плённа, радуючы чытача ўсё новымі творамі, напісанымі па-мастацку дасканала, напоўненымі аптымізмам і верай у жыццё. Пацвярджэнне таму і падборкі яго вершаў, што з'явіліся ў друку летась, калі Аляксандр Амвросьевіч адзначыў сваё 90-годдзе.

Чытаць і перачытваць М. Лужаніна — гэта спасцігаць паэзію ў яе першароднай чысціні і свежасці, пастаянна адчуваць важкасць яго ўмалотнага радка. І радавацца, што паэт з намі гэтаксама, як і мы, радуецца новым жыццёвым будням. А з вышыні сваіх пражытых гадоў звяртаецца да новых пакаленняў, якія ўжо прыйшлі на зямлю і якія прыйдуць пазней, у XXI стагоддзі. Ім працягваць справу папярэднікаў. Але на іх ускладаецца і большая адказнасць, бо яны павінны дарабіць тое, чаго не паспелі зрабіць мы. Верыцца, што з пастаўленай задачай яны справяцца. Верыцца і па-добраму зайздросціцца. Таму і напісаўся М. Лужаніным верш «Моладзі», што ўвайшоў у яго падборку «Мы ж дома, не ў гасцях» («Літаратура і мастацтва». 1999, № 39, 1 кастр.):

Маладыя!
Зайздрошчу вам,
Вы страчаеце золак,
З беларускае рошчыны
Вашы думкі і голас.

А на вуснах краініных
Неўміручыя словы
Першадрукаў Скарынавых
І паэм Куляшова.

Вось калі аб'яднаюцца
Праўда вашая з нашай,
Свету хцівыя знаўцы
На нас глянуць іначай.

Людзі веры ўсялякае
Прынясуць нам павагу,
За адданасць падзякуюць,
Вернасць маці і сцягу.

У М. Лужаніна свае права на верш. І права гэтае ён набыў, дзякуючы нястомнай працы на творчай ніве — на паэтычнай ці не ў першую чаргу. Гэтае права ад яго не забралі жыццёвыя нягоды. Ён нязменна заставаўся з ім. З гэтым правам уступае і ў XXI стагоддзе:

Ідзі, хай агорне душу,
Нальe вастрынёю зрок
Трываласць твайго народа
На першай з людскіх дарог.

Ідзі, хай заробяць рукі
Горды яго мазоль,
Якім ён жыццё зыначыў,
Здабыў сабе хлеб і соль.

Углыб урасце карэнне —
Выбухам не ўзарвеш.
І скажацца ўсё дарэшты,
Што думаеш, што нясеш ты,
Так лёгка, нібы дыхнеш.

Гэтак яно прыходзіць,
Права тваё на верш.

...Высокім прафесіяналізмам, майстэрствам вызначаецца і творчасць лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова Сяргея Грахоўскага. Як і ў М. Лужаніна, за плячыма ў Сяргея Іванавіча — доўгія і пакручастыя жыццёвыя дарогі, яшчэ большыя выпрабаванні. Нарадзіўся С. Грахоўскі 25 верасня 1913 года ў мястэчку Нобель колішняга Пінскага павета былой Мінскай губерні (цяпер гэта Зарэчненскі раён Ровенскай вобласці на Украіне). Аб тых гадах засталіся ўра-

жанні, якія не згасаюць у памяці. І нараджаюцца ў С. Грахоўскага творы, напоўненыя ўдзячнасцю малой радзіме за тое, што стала для яго першай апорай. Ажываюць у іх і знаёмыя краявіды:

Цвіце за аселіцай грэчка
У роснай лясной старане.
Далёкае наша мястэчка,
Напэўна, забыла мяне.

А мне яно сніцца і сніцца
У пыле пясчаных дарог,
Апошні званар на званіцы,
Глухі, пасівелы Цімох.

*(«Мястэчка»)*

За Глускам у глухіх барах
Яшчэ маё блукае рэха,
І дзень суніцамі прапах,
І зоры плаваюць у рэках.

*(«Пачатак»)*

Літаратурай С. Грахоўскі захапіўся падчас навучання ў Глускай сямігодцы. У гэтым шмат паспрыялі настаўнікі. У першую чаргу Уладзімір Кандратавіч Сыцька, які ў свой час вучыўся разам з Якубам Коласам у Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Неўзабаве і С. Грахоўскі, па яго прызнанню, «пачаў спрабаваць нешта рыфмаваць, але не адважваўся нікому паказваць сваю пісаніну». Не паказваў сваіх першых твораў і дваюраднаму брату Янку Бобрыку, які вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, з'яўляўся членам «Маладняка», а на канікулы завітваў да родзічаў.

І ўсё ж у рэшце рэшт няўпэўненасць пераадолеў: «У 1926 годзе цішком паслаў некалькі вершаў у рэдакцыю часопіса «Беларускі піянер». Чакаў, чакаў адказу, кожны раз з надзеяю глядзеў на паштальёна, а ён мне так нічога і не прынёс. Толькі ў канцы ліпеня суседка паказала мне свежы нумар часопіса і абыякава спытала, ці не мой гэта часам верш у ім надрукаваны. Зірнуў я, і аж зрабілася млосна: «На змену Ільічу», а ўнізе подпіс «піянер Сяргей Грахоўскі».

Пасля гэтага рэгулярна друкаваўся ў «Беларускім піянеры». А пасля былі праца на дрэваапрацоўчым камбінаце ў Бабруйску, у які пераехаў увосень 1930 года, знаёмства з бабруйскімі літаратарамі. Пісаў новыя вершы, друкаваўся ў альманаху «Вясна». А пераехаўшы ў Мінск, працаваў карэктарам у Дзяржаўным выдавецтве БССР, пасля — у «Чырвонай змене»: «рыхтаваў літаратурныя старонкі, пісаў нарысы і замалёўкі, адказваў на пісьмы і ўсё вастрэй адчуваў, што не хапае мне адукацыі, ведаў, элементарнай

культуры». Таму і паступіў на газетна-выдавецкае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута, якое скончыў у 1935 годзе. Уладкаваўся на працу на радыё: «ездзіў у камандзіроўкі ў маладыя калгасы, на пагранічныя заставы і на заводы — пісаў рэпартажы, нават вёў спартыўныя перадачы, жыў імклівым, вясёлым жыццём нястомнага валацугі-журналіста». А яшчэ «з восені наступнага года, не пакідаючы радыёкамітэт, пачаў выкладаць літаратуру на рабфаку Беларускага дзяржаўнага універсітэта». Праца доўжылася, аднак, нядоўга: у кастрычніку 1936 года Сяргея Іванавіча арыштавалі. Дзесяць гадоў правёў у лагеры. Вярнуўшыся, настаўнічаў ва Урэцкай сярэдняй школе. Але ў 1949 годзе быў паўторна арыштаваны. Гэтым разам выслалі на вечнае пасяленне ў Новасібірскую вобласць. Справядлівасці дабіўся толькі 19 кастрычніка 1955 года, калі быў рэабілітаваны. Вярнуўся на Беларусь. Працаваў на радыё, загадчыкам аддзела часопіса «Бярозка», быў літаратурным кансультантам СП БССР, літаратурным рэдактарам часопіса «Вясёлка», а ў 1973—1974 гадах — адказным сакратаром па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

Такія складаныя жыццёвыя перыпетыі паўплывалі на тое, што першая кніга паэзіі С. Грахоўскага «Дзень нараджэння» выйшла толькі ў 1958 годзе. Многія аднагодкі на гэты час былі ўжо ўдастоены розных званняў і ўзнагарод, а яму давялося, па сутнасці, пачынаць усё нанава, навёрстваць упушчанае. Таму і працаваў так актыўна і мэтанакіравана. Найперш у галіне паэзіі, але хораша заявіў аб сабе і як празаік, публіцыст, аўтар кніг для дзяцей. Не цураўся і перакладчыцкай дзейнасці. Шырокі рэзананс мела мастацка-дакументальная аповесць С. Грахоўскага «Рудабельская рэспубліка», прысвечаная ўсталяванню савецкай улады на тэрыторыі цяперашняга Акцябрскага раёна. Паводле гэтага твора быў пастаўлены спектакль, зняты аднайменны мастацкі фільм. Апошнім часам Сяргей Іванавіч усё часцей звяртаецца ў перажытае, прыгадваючы тую праўду, пра якую не адно дзесяцігоддзе нельга было пісаць. Гэта тычыцца і кнігі «Споведзь», у якую ўвайшлі як вершы, так і аўтабіяграфічныя аповесці. За яе ў 1992 годзе пісьменнік і быў удастоены Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Мастакоўскія набыткі С. Грахоўскага важкія ў розных галінах, але ўсё ж яго талент, у чым пераконваюць і творы, апублікаваныя ў гэтай кнізе, ярка раскрыўся ў паэзіі, якую называюць традыцыйнай, а нярэдка і класічнай. С. Грахоўскі, у адрозненне ад многіх сучасных паэтаў, не эксперыментуе, у яго не знойдзеш нечаканых рыфмаў і параўнанняў, тым больш не напаткаеш вобразнай рэбусавасці. І разам з тым — усё радуе, усцешвае душу, прымушае задумвацца над вечнымі каштоўнасцямі жыцця. А яшчэ паэзія С. Гра-

хоўскага па-добраму публіцыстычная. Але гэтая публіцыстыка, за рэдкім выключэннем, не поклічная. Яна, калі можна так сказаць, як бы ўнутраная. Яна — споведзь лірычнага героя. Толькі споведзь гэтая адбываецца ў той момант, калі на сэрцы неспакойна, а ў душы бунтарна. Тады і хочацца абавязкова падзяліцца з чытачом набалелым. І жадаецца знайсці ў ім субяседніка, які абавязкова зразумее цябе, падзеліць тваю пазіцыю.

І такога субяседніка С. Грахоўскі знаходзіць. Асабліва калі ў вершах гучыць тэма Бацькаўшчыны. А яна пад яго пяром набывае розныя адценні. Гэта — і трывога за лёс роднай мовы, і занепакоенасць тым цяжкім становішчам, у якім апынулася Беларусь пасля катастрофы на Чарнобыльскай атамнай станцыі. Але гэта, што таксама вельмі важна, і гаворка ад імя свайго пакалення. Паэт нібы падрахункоўвае зробленае самім сабой і сваімі аднагодкамі. Адначасова ў асобных яго вершах гучыць і свайго роду запавет. Асабліва гэта тычыцца заключнага верша («Нашчадкам»), напісанага нядаўна, 22 жніўня 1999 года:

Праз войны, пажары, землетрасенні
У грозны знявечаны час
Прайшло беззваротна маё пакаленне,
Каб толькі пабачыць шчаслівымі вас.
Нялёгка і сёння, а будзе, а будзе
І радасць, і шчасце на нашай зямлі,
Шчаслівымі стануць сумленныя людзі,
Што тут нарадзіліся, тут узраслі.
Вы дзеці мае і любімыя ўнукі,
Агеньчык надзеі і сёння не згас.
Малюся за розум, за здатныя рукі,
За вашае шчасце.
Малюся за вас!

Як і ў кожнага паэта падобнага ўзросту, у С. Грахоўскага моцныя настальгічныя матывы. Але гэта не проста шкадаванне, што многае незваротна знікла. Калі такое шкадаванне ў творах С. Грахоўскага і прысутнічае, дык яно не асабістае, не прыватнае. Паэт далёкі ад таго, каб засяроджвацца на сваім. Вядома, не абыходзіцца без увязкі гаворкі з пэўнымі фактамі з уласнай біяграфіі, але не гэта дамінуе. На першым плане — матывы агульначалавечага кшталту. І гэта добра відаць з верша «Незваротнае». Лірычны герой твора адчувае і сваю асабістую віну, прыгадвае «бяссілле, што не многа значу». Але гэта віна нішто ў параўнанні з віной усіх нас. І не заўважылі, як адарваліся ад зямлі, ад вёскі. Не адчулі своечасова, што ўсё менш трывалымі становяцца ніці, якія лучаць нас з вечным на зямлі:

Пяюць дзяўчаты...
Так пяюць, што плачу
Па змрочных і па ясных вечарах,
Па ўсім, што страціў, і па ўсім, што трачу,—
Па смольных хатах, студнях і дварах,
Па песнях на зажынках і дажынках,
Па звонкіх падгалосках у палёх,
Па торных у трыпутніку сцяжынках,
Якіх ніколі абмінуць не мог
У некранутай чыстай прыгажосці,
Забытай і скалечанай дарма...
Цяпер не ходзім, не завем у госці,
Бо страчана паэзія сама.

Пяюць дзяўчаты...
Так пяюць, што плачу
З бяссілля, што не многа значу,
Што жытні дух, ружовы пыл дарог
Я толькі ў сэрцы і ў душы збярог.

Можна згадваць яшчэ многія вершы С. Грахоўскага, кожным разам радуючыся, наколькі ён уважлівы да слова, як умее знешне някідкімі моўнымі сродкамі перадаць многае. Ды так хораша перадаць, што ўсё гэта лёгка запамінаецца, чаруе сваёй прыгажосцю.

...Пачатак творчага дэбюту лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Анатоля Вярцінскага прыпадае на 50-я гады, калі ў газетах «Беларускі універсітэт», «Чырвоная змена», часопісе «Маладосць» былі апублікаваны яго першыя вершы. А нарадзіўся Анатоль Ільіч 18 лістапада 1931 года ў вёсцы Дзямешкава Лепельскага раёна. У 1956 годзе скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Да 1962 года працаваў у рэдакцыях раённых газет (Давыд-Гарадок, Камянец, Клімавічы, Рагачоў). Пераехаўшы ў Мінск, супрацоўнічаў у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», быў рэдактарам выдавецтва «Беларусь», літаратурным кансультантам, адказным сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. У 1986—1990 гадах — галоўны рэдактар штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Выбіраўся народным дэпутатам БССР, з'яўляўся намеснікам старшыні пастаяннай Камісіі па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека, членам Канстытуцыйнай камісіі Вярхоўнага Савета БССР. Цяпер — намеснік галоўнага рэдактара газеты «Культура».

Анатоль Вярцінскі — аўтар паэтычных кніг «Песня пра хлеб», «Тры цішыні», «Чалавечы знак», «З'яўленне», «Ветрана» і іншых.

Асобныя яго вершы пакладзены на музыку, а па паэме «Колькі лет, колькі зім!» пастаўлены тэлеспектакль. Хораша зарэкамендаваў сябе А. Вярцінскі і як драматург, напісаўшы п'есы для дзяцей «Дзякуй, вялікі дзякуй!», «Скажы сваё імя, салдат», «Гефест — друг Праметэя». Усе яны набылі сцэнічнае жыццё. У яго выйшлі зборнік літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі «Высокае неба ідэала» і кніга публіцыстыкі «Нью-Йоркская сірэна», за якую ў 1988 годзе Анатоль Ільіч і быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй. Выступае і як перакладчык.

Паэзія А. Вярцінскага моцная сваёй зямной асновай і глыбокай філасофскай напоўненасцю. І ў вершах, і ў паэмах нязменна прысутнічае высокі грамадзянскі пафас, а гэта і ёсць сведчанне жыццёвай пазіцыі аўтара. Наколькі А. Вярцінскі неабыякавы да працэсаў, што адбываюцца ў грамадстве, як актыўна ўмешваецца ў іх, адстойваючы ўласны пункт гледжання, палемізуючы з апанентамі, засведчылі яго гады дэпутацтва.

Але паэзія, як вядома, толькі тады становіцца з'явай літаратуры, мастацтва, калі нясе ў сабе і важкую эстэтычную каштоўнасць. І тут у А. Вярцінскага могуць павучыцца многія сабраты па пяру. Закранаючы балючыя моманты сучаснасці, ён паспяхова адмаўляецца ад гаворкі адкрыта-наступальнай. А плённае асэнсаванне рэчаіснасці, раскрыццё яе праблем адбываецца шляхам моўнага ўзбагачэння вершаванай структуры твора. Гэта тычыцца і паэм А. Вярцінскага, урыўкі з якіх змешчаны ў гэтай кнізе. Для прыкладу, крытыка высока ацаніла паэму А. Вярцінскага «Начны бераг», у якой лірычны герой вельмі цесна паяднаны з прыродай, усім навакольным асяроддзем. І ўвогуле паэта хвалюе, наколькі стасункі з прыродай уплываюць на паводзіны чалавека, як, калі можна так сказаць, адгукаюцца ў яго душы. Той, хто прывык глядзець на прыроду толькі як на аб'ект задавальнення пэўных сваіх патрэб, паўстае ў адносінах да яе звычайным спажыўцом, паступова ператвараецца ў індывідуума, пазбаўленага духоўнай напоўненасці. У творы сацыяльныя матывы перарастаюць у маральна-этычныя.

А як прыемна перачытаць раздзелы з паэмы «Песня пра хлеб»! Гэта і на самой справе песня. Найперш хлебу — як аднаму з самых дзівосных тварэнняў рук чалавечых. Але гэта і песня, у якой апяваецца людская праца ўвогуле, гучыць гімн роднай зямлі, паэтызуюцца першаасновы чалавечага быцця. А. Вярцінскі, закранаючы гэтыя важныя тэмы, ідзе і ад уласна перажытага, чэрпаючы з памяці тое, чаго не можа сцерці час. А гэта і згадкі маленства, па-майстэрску перададзеныя ў паэме, якія «выліліся» ў раздзел «Маці пячэ хлеб». І памяць аб басаногім маленстве:

Я помню заўсёды дарогі і сцежкі,
Вядуць што да роднае вёскі Дзямешкава,
Да поля з лашчынкамі ды бугаркамі,
Дзе ведаю кожны кусцік і камень.

Маленства ж (асабліва ў памяці дзяцей, якія перажылі вайну) — гэта і той незабыўны момант, калі ў хаце пяклі хлеб. Не забыўся ён з гадамі, а пад пяром А. Вярцінскага паўстаў як сюжэтна завершаны малюнак, асобныя дэталі ў якім выпісаны здзіўляюча перараканаўча. Яны настолькі выразныя, зрокава асязальныя, што, чытаючы, перажываеш уражанне сваёй асабістай прысутнасці, калі адбываецца гэтае... Чарадзейства, думаецца, найбольш прыдатнае слова ў дадзеным выпадку. Маці не проста робіць сваю звыклую работу, калі пячэ хлеб. Яна, нібы тая чараўніца, выконвае адной ёй вядомы абрад. Для дзяцей жа ён заўсёды чаканы:

Хіба забудзеш калі гэты момант!..
Ураз заціхае дзіцячы наш гоман.
Стаіць цішыня незвычайная ў хаце.
Збіраемся дружна мы ўсе каля маці.
Мы бачым адны толькі матчыны рукі,
адны яе рукі, адны іх рухі.
А маці з сваёй урачыстай усмешкай
нізка схіляецца над дзежкай
(над той, на якое сядзела нявестай).
Яна рашчыняе хлебнае цеста.
Цеста мясіла яна кулакамі,
сценкі дзяжы абірала рукамі,
вады падлівала, мукі падсыпала.
І нам было клопатаў тут нямала.
Былі мы ў мінуту гэтую рады
выканаць матчыны ўсе загады.
Мы ёй памагалі рукаў закасваць,
муку падсыпаць па яе заказу,
хусцінку мы ёй папраўлялі ахвотна
ці лоб выціралі матчын потны.
Было урачыста і ціха ў хаце —
хлеб з новага жыта ўчыняла маці.

У паэзіі А. Вярцінскага частыя асацыяцыі, якія пабудаваны на спалучэнні супрацьлегласцей. Характэрны верш «***Косім траву — яна не крычыць...». Паэт напачатку нічога новага як быццам не гаворыць, ён толькі канстатуе тое, што добра вядома кожнаму:

Косім траву — яна не крычыць.
Яна маўчыць адчайна.
Мы пачынаем камень крышыць —
зацятае тое ж маўчанне.

Тое ж маўчанне, калі тапаром
мы дрэва зялёнае нішчым,
калі мы за жабры рыбу бяром
і б'ём галавой аб днішча.
Рыба набрала ў рот вады...

Але такое стаўленне да верша (як і да іншых твораў А. Вярцінскага) падманлівае. Як падманлівая і звычайная прастата таго, што паведамляе ён. Галоўная думка твора ў заключных радках, у якіх і адбываецца сутыкненне супрацьлегласцей, узнікае той нябачны ланцуг, што павязвае ўсё жывое на зямлі. І чалавек толькі частка яго, хоць і найбольш значная. Яму многае дадзена, аднак з яго і шмат бярэцца, у яго вялікая адказнасць за ўсё, што знаходзіцца на больш нізкай ступені развіцця:

Затое, калі самім нам
бывае балюча, і тады
крычым мы крыкам нястрымным,
крычым мы не толькі ад болю свайго —
яго было б няшмат,—
крычым мы ад болю усяго
свету ўсяго зямнога.

Па-свойму сугучны гэтаму твору верш «Дзівак чалавек». Канечне, напісаны ён у іншы час і з іншай нагоды, але ўжо такая паэзія А. Вярцінскага, што асобныя творы як бы ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго. Часам і больш — думку, закладзеную першапачаткова, развіваюць далей. А пра гэта можна гаварыць і ставячы поруч вершы «***Косім траву — яна не крычыць...» і «Дзівак чалавек». У першым выпадку чалавек паўстае, па сутнасці, у дзвюх іпастасях. З аднаго боку, ён знішчальнік прыроды, а з другога — яму балюча за гэтую прыроду. Пра свайго роду раздваенне асобы гаворыцца і ў вершы «Дзівак чалавек». Але тут сэнс куды больш глыбокі, чым у першым выпадку. Чалавек бачыцца паэтам у душы:

Дзівак чалавек...
Глядзіць на расінку макавую
і цэлае сонца бачыць перад сабой.
Дзівак чалавек...
Бярэ звычайную ракавіну
і чуе ў ёй акіянскі прыбой.

Аднак дзівацтва чалавека раскрываецца і ў іншым, больш глыбокім аспекце. Акурат гэтае дзівацтва і дапамагае выжыць. І не асобнаму чалавеку, а ўсяму чалавецтву:

Дзівак чалавек...
Яму — Хірасіму, Асвенцім,
яму, замест імя,—
асвенцімскае таўро.

А ён паўтарае,
што ёсць дабро на свеце,
што будзе дабро
і што пераможа дабро.

А калі разабрацца, дык і не дзівацтва гэта, бо яно для чалавека вельмі важнае: «І гэта яго дзівацтва — ратунак яго, яго чалавечы знак». Таму мы і выжываем на нашай старой і грэшнай зямлі, што не проста існуём, а жывём. Пераадольваючы цяжкасці і перашкоды. У нечым памыляючыся, штосьці губляючы, але і набываючы вельмі многае. І А. Вярцінскі ў сваіх творах ніколі не забывае, што «чалавечы знак» і ёсць тое, што вылучае чалавека з усяго жывога на зямлі.

...А выбраныя старонкі паэзіі Змітрака Марозава адкрывае такі верш:

З баразны пачынаецца поле,
З жаўруковай запеўкі — вясна...
У мяне найшчаслівая доля
І Радзіма навекі адна.
Уяўлю сябе спелым насеннем,
Што калоссем імкне ў сіняву,
І, адчуўшы зямлі прыцягненне,
Прашапчу трапяткое: «Жыву!»

Баразна, поле, насенне — гэтыя паняцці з'явіліся ў творы не толькі як паэтычныя атрыбуты. Яны пастаянна жывуць і ў душы З. Марозава, бо асноўная прафесія ў яго — аграном. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў пасёлку Язбы Крупскага раёна, дзе нарадзіўся 2 студзеня 1954 года, паступіў на агранамічны факультэт Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У 1975 годзе, атрымаўшы дыплом аб вышэйшай адукацыі, пачаў працаваць старшым аграномам калгаса «Рэвалюцыя» Быхаўскага раёна. Пасля быў старшым аграномам Упраўлення сельскай гаспадаркі Магілёўскага аблвыканкома, галоўным аграномам калгаса імя Энгельса Бялыніцкага раёна, другім сакратаром Бялыніцкага райкома камсамола, лектарам ЦК ЛКСМ Беларусі. Працуе ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь.

Першы свой верш З. Марозаў апублікаваў у 1977 годзе на старонках быхаўскай раённай газеты «Маяк Прыдняпроўя». Аўтар некалькіх паэтычных кніг, сярод якіх «Ачышчэнне сяўбой» і «Сын чалавечы», адзначаныя ў 1995 годзе прэміяй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. А за кнігу «Хлебны верасень» З. Марозаў яшчэ ў 1988 годзе атрымаў прэмію Ленінскага камсамола Беларусі. На творчым рахунку З. Марозава таксама кнігі для дзяцей, зборнікі публіцыстыкі.

І калі ў адным са сваіх вершаў паэт прызнаецца:

Шчаслівы, бо зямлі
Заўжды быў хлебасеем,
Сам я ўзараў цалік
І сам яго засеяў,—

гэта не толькі паэтычная дэкларацыя. Хлебасеем быў З. Марозаў, калі працаваў аграномам. Сейбітам ён застаецца і сёння, толькі на ягоным полі, засеяным шчодра, цяпер буяе іншае калоссе — паэтычнае, а зерне ў ім таксама спелае, крамянае. Бо піша З. Марозаў так, што нельга не захапляцца яго ўменнем знайсці патрэбныя словы і вобразы, каб перадаць любоў да роднай зямлі, дапамагчы чытачу яшчэ лепш адчуць прыгажосць і непаўторнасць беларускіх краявідаў, прасякнуцца павагай і ўдзячнасцю да такой цяжкой, але гэткай патрэбнай хлебаробскай працы.

Але, гаворачы пра паэтычныя набыткі З. Марозава, спачатку трэба адзначыць, што ён адзін з нямногіх у сучаснай беларускай паэзіі, хто даўно і паспяхова абжывае жанр санета. Санет жа — арэшак цвёрды і далёка не кожнаму творцу па зубах. Прызнана, што санет — самая распаўсюджаная форма класічнага верша. Мае ён чатырнаццаць радкоў памеру пяці- ці шасцістопнага ямба, пачатак бярэ яшчэ ў XIII стагоддзі, а калі канкрэтней — у Італіі, пасля атрымаў пашырэнне ў іншых літаратурах. Беларуская паэзія пачала прыглядацца да санета ў пачатку XX стагоддзя. Першапраходцам стаў Янка Купала, першы санет якога быў змешчаны ў 1910 годзе на старонках газеты «Наша Ніва».

У эпоху барока ўзнікла яшчэ больш складаная форма — вянок санетаў. Пішацца ён з апошняга санета, так званага магістрала. І вось чаму: менавіта асобныя радкі магістрала абрамляюць папярэднія санеты. Паслядоўнасць тут вельмі строгая і дакладная. Першы санет пачынаецца першым радком магістрала і канчаецца яго другім радком. Другі санет адпаведна замыкаецца другім і трэцім радкамі магістрала. Чатырнаццаты ж — у «абдымках» апошняга і першага радкоў магістрала. Лідэрства ў гэтым жанры належыць Нілу Гілевічу. Першы ў беларускай літаратуры вянок санетаў ён надрукаваў у сваёй кнізе «Перазовы», што выйшла ў 1967 годзе. Пасля вянкі санетаў з'явіліся ў Хведара Жычкі, Анатоля Сербантовіча, Алеся Звонака, Янкі Сіпакова, Пятра Сушко, Уладзіміра Дзюбы і іншых аўтараў.

Нарэшце, ёсць яшчэ вянок вянкоў санетаў. Гэта калі самым цесным чынам звязаны па форме, зместу, сэнсу чатырнаццаць вянкоў санетаў. Апошні ж, пятнаццаты, атрымліваецца з іх магістралаў. Відавочна, што такім па-сапраўднаму віртуозным майстэрствам валодае далёка не кожны аўтар. У свой час марыў напісаць вянок вянкоў санетаў Анатоль Сербантовіч, ды ранняя смерць перашкодзіла яму ажыццявіць гэтую задуму. А першы вянок вянкоў

санетаў у беларускай літаратуры з'явіўся дзякуючы З. Марозаву і атрымаў назву «Апакаліпсіс душы». Па сцверджанню некаторых даследчыкаў, такі твор, напісаны латынню, быў у Петраркі. Як сведчыць вядомы рускі даследчык санетаў Рыгор Мяленцьеў, у калекцыі якога больш за восемсот вянкоў санетаў, вянок вянкоў З. Марозава пакуль адзіны ў еўрапейскім свеце[1].

Свой «Апакаліпсіс душы» З. Марозаў прысвяціў памяці А. Сербантовіча. І напісаў гэты твор не проста дзеля таго, каб даказаць, што і так складаны жанр падуладны яго пяру. А каб і павесці гаворку пра час і пра чалавека, прытым на матэрыяле надзіва скандэнсаваным. І зварот да вянка вянкоў — імкненне да дакладнасці. Ад непрымання вольнасці ў творы («Вянок санетаў — летапіс дарог, занатаваны ў строгія каноны...») да адмаўлення мастакоўскай славы дзеля славы («О колькі добрых геніяў сышло, змяніўшы славу звонкую на мукі»).

Канечне ж, выхопліваць асобныя радкі, строфы з санета, тым больш з вянка санетаў (а што ўжо казаць пра вянок вянкоў?!) — тое самае, што любавацца хмарачосам, узведзеным па арыгінальным праекце таленавітага архітэктара, звяртаючы ўвагу толькі на асобныя дэталі. Скажам, захапляцца прыгажосцю вітражоў, вестыбюляў, забываючы пра трываласць і зручнасць саміх перакрыццяў. Да санета неабходна падыходзіць, не забываючы, што менавіта форма ў дадзены момант вымагае і ўзвышанасці духу, і своеасаблівага эмацыянальнага настрою.

Чалавеку, далёкаму ад разумення ўсіх гэтых адметнасцей, можа падацца, што З. Марозаў залішне схільны да традыцыйных рэалій. Часам кідаецца ў вочы і пэўная дэкларацыйнасць. А як жа інакш?! Форма дыктуе ўмовы, і паводле гэтых умоў твор жыве, застаецца менавіта санетам, а не нейкім іншым жанрам. Хацелася б, каб чытач, які ў гэтай кнізе пазнаёміцца з урыўкамі з «Апакаліпсіса душы», а таксама з асобнымі вянкамі санетаў, узяў іншыя кнігі З. Марозава, у якіх гэтыя творы прадстаўлены цалкам. Тады ва ўсёй паўнаце можна адчуць, наколькі маштабна мысліць паэт, які знітоўвае ў сваіх санетах шлях, пройдзены чалавецтвам, а яго лірычны герой паўстае — нязменна і пастаянна — сейбітам-руплівыцам:

І я пасеяў жытняе насенне,
Што збажыной падымецца з раллі,—
У гэтым сэнс зямнога абнаўлення,
Той волі, што мы ў муках здабылі,

Нас не сагнуць, не кінуць на калені
Магнаты рынку, цемры каралі...
Пасля гадоў духоўнага зацьмення
Мы да вытокаў згубленых прыйшлі.

---

[1] Рэспубліка. 1995. 28 сак.

Імёны ім: Любоў, Свабода, Вера.
Жывое слова свеціць на паперы
Для самага апошняга сляпца...

Старонкі будня ў памяці гартаю,
Сяйву багатай руні пажадаю,
Гляджу ў палі з развагай мудраца.

Змітрок Марозаў умее быць і па-філасофску роздумным, і аналітыкам, што прасвечвае з'явы сучаснасці ў розных аспектах. А яшчэ ён нязменна — лірык, які ўмее знайсці дакладныя радкі, каб перадаць светласць пачуццяў закаханых, ненавязліва правесці думку аб тым, наколькі гаючая і жыватворная сіла — любоў. І, зразумела, сын вёскі, ён не можа не пісаць пра яе, а ў выніку ажываюць вобликі знаёмых і блізкіх людзей — часам з няпростымі лёсамі. А яшчэ ў лепшых лірычных вершах З. Марозава чуецца сама мелодыя роднай зямлі. Яго творы аб прыродзе — як адухоўленыя. Усё ў іх жыве, квітнее, напоўнена самім жыццём, а чалавек вельмі цесна знітаваны з гэтым хараством:

Ходзіць летні вечар паплавамі,
Спавівае рэчкі берагі
Шызымі, як воўна, туманамі,
Аглядае свежыя стагі.
На душы прасветлена і золка,
Пад бярозай матчынай стаю...
Недзе ў полі тужыць перапёлка,
Маладосць гукаючы маю.

...Чатыры паэты прадстаўлены ў гэтай кнізе. Чатыры — са слаўнай кагорты творцаў, дзякуючы якім беларуская літаратура годна адчувае сябе сярод іншых высокаразвітых літаратур свету. Творчасць Максіма Лужаніна, Сяргея Грахоўскага, Анатоля Вярцінскага, Змітрака Марозава лішні раз пацвярджае, наколькі ўсё наша жыццё саткана з паэтычных імгненняў, якія толькі трэба ўмець заўважыць, адчуць і па-сапраўднаму перадаць, каб усё гэта запомнілася чытачу і пакінула ў яго душы яркі след.

*Алесь МАРЦІНОВІЧ,*
*лаўрэат Дзяржаўнай прэміі*
*Рэспублікі Беларусь*



## *Прага крыла*

### МАЛАДЫМ

Маладыя!
Зайздрошчу вам,
Вы страчаеце золак,
З беларускае рошчыны
Вашы думкі і голас.

А на вуснах краініных
Неўміручыя словы
Першадрукаў Скарынавых
І паэм Куляшова.

Вось калі аб'ядналюцца
Праўда вашая з нашай,
Свету хціўвыя знаўцы
На нас глянуць іначай.

Людзі веры ўсялякае
Прынясуць нам павагу,
За адданасць падзякуюць,
Вернасць маці і сцягу.

## ПРАВА НА ВЕРШ

Калі ты ў шуканнях знямогся,
То пішаш, то ў шмацце рвеш,
Не засмучайся дужа —
Гэта яшчэ не верш.

Калі ты радком прачулым
Дзяўчыну да слёз кранеш,
Не ашукайся, дружа,—
Гэта яшчэ не верш.

Калі цябе, майстра, хваляць,
Не ўзносся, падумай перш:
Самае звонкае слова —
Гэта яшчэ не верш.

Ідзі, хай агорне душу,
Налье вастрынёю зрок
Трываласць твайго народа
На першай з людскіх дарог.

Ідзі, хай заробяць рукі
Горды яго мазоль,
Якім ён жыццё зыначыў,
Здабыў сабе хлеб і соль.

Углыб урасце карэнне —
Выбухам не ўзарвеш.
І скажацца ўсё дарэшты,
Што думаеш, што нясеш ты,
Так лёгка, нібы дыхнеш.

Гэтак яно прыходзіць,
Права тваё на верш.

## БЕЛАРУСКАМУ НАРОДУ

Не з імглы курганоў, задрамаўшых над стромай,
Не з паданняў, што вецер стагоддзяў растрос,—
Пасля мёрзлых акопаў паўстанневым громам
Пачынаецца век наш, гартуецца лёс.

Не раскрой тады свет напалам, навальніца,
Цар бы шлях заступаў, страшыў карамі Бог.
У краіне другой я не мог бы радзіцца,
Дацягнуцца да сонца ніколі не мог.

З нашых рук аж пад неба ўзняліся штандары,
Каб лунаць назаўжды і не чуць перашкод.
Дбайна ў працы жыве, ўсім народам таварыш,
Працавіт і вялік беларускі народ.

Поім газаю трактар уласнай гадоўлі,
Нашы нівы ў красе, нашы нетры ў хадзе.
Мой народ!
Ты гаворыш з палёў і будоўляў
І вышэйшай трыбуны не знойдзеш нідзе.

Не баяўся вайны, не цураюся працы,
Калі трэба — ускіну на плечы ўдвая,
А ў любві да цябе
мне нашто прысягацца!
Па той простай прычыне, што ты — гэта я.

Я — твой ранні гудок,
шум дубоў на узлессі,
Твой каваль,
я выкоўваю ў заўтра ключы.
Ты — крыніца мая
і гаючая песня.
Ты мой розум і кроў.
Нельга нас разлучыць.

## ХТО ТЫ?

Хто ты і чый? Якава твая постаць?
Хто ты — праўды здабытчык і праўды разьбяр?
Хто ты — заўтрашніх душ і шляхоў валадар?
Хто ты — самай высокай святарні святар?
Хто ты?
— Сын чалавечы.
І гэтага досыць.

## ГУРТАМ

Пры жыцці багата хто калоціцца,
Як ступіць, якім умыцца мылам,
Каб дапяць да бронзы хоць бы поцягам,—
А гісторыя — не чула ці забыла.

Чым мая асоба ушануецца,
Вы пра гэта клопату не майце,
Ну, нашто мне скверам быць ці вуліцай,
Лепей мною рэчкі называйце.

Калі дзён абоймы стануць мулкія
Або сэрца сціснецца ад болю,
Я здалёку хваляй вам пабулькаю
І паклічу жыць на вольнай волі.

Каб хлапцам на працы не драмалася,
Каб не шкадавалі чаравіка,
Абы скрыпка танцам абзывалася,
Як узняў смыка Сымон-музыка.

Хопіць лесу, знойдзецца начыннейка,
Гуртам зрубім дом
і
гуртам зробім стопку.
Што ж вы, дарагія суайчыннікі,
Ходзіце ўразброд і паасобку!

## ПАХВАЛА ЗБРОІ

Што для свабоды і супакою
Найперш патрэбна?
Зброя!

І па-першае, і па-другое,
І па богведама па якое —
Патрэбна зброя.

Каб ні ў Турэччыны,
Ні ў Расіі
Яе не выкленчвалі,
Не прасілі.

Ствол — і не болей,—
Уцэліўшы ў плечы,
Падсекчы здолен
Род чалавечы.

Аб тым штодзённа
Крычу, шчырую,
Вытворцаў смерці
У дол кірую.

Свету ахова,
Лепшая зброя —
Людская мова,
Слова людское.

## КРОПЛЯ КРЫВІ

Колькі б зорак ні ззяла
на ладных плячах генералаў,
Колькі б іх ні блішчэла
на самых дастойных грудзях,
А свінец перазззяць —
нетраў золата мала, ой мала,—
Дробны дзюблік свінцовы
людскі перарэзвае шлях.

Ён пагасне ў часы, як паплыўшы
пад шчоглай выноснай,
Ліне цвету Зямля на бязодню
знішчальнай дрыгвы:
Стане ясна цвіцець,
абудзіўшыся ў кожным пялёстку,
Безыменная кропля
бязвінна пралітай крыві.

## МАНА

Маны кавалак цягне за пуды,
Таму і ў глыбіню хаваецца заўжды,
А вырвецца, калі дастане днішча,—
Струмень заб'е і ліпкі бруд засвішча.

Шануйцеся! Хто першы раз трапляў
Пад вырушэнне брыдкага зламоўя,
Здавалася яму: хіснулася зямля,
Пратраціла вясна зялёнае здароўе.

Нялёгка змесці след маны ў нябыт,
А стань да сонца зыркага душою,
Паганы знак навекі будзе змыт
Адною кропляй праўды веснавое.

## ВЯРНУСЯ ВЕТРАМ

Калі паглыне мяне шлях няблізкі
У край курганаў і абеліскаў,
Абы навала дыхне над домам,—
Сустрэну громам.
А звянуць травы, асмягнуць вусны,—
Дажджом вярнуся.

Калі ж нашчадкам не будзе трэба
Ні збройны выбух, ні бохан хлеба,
У час іх зорны, час запаветны
Вярнуся ветрам.
Калі дзе знойдзем, слязу асушым,
Калі прыгаслі, раздзьмуем душы.

Нідзе не дзенуся з Беларусі,
Кім пажадае, тым і вярнуся,—
Жыло, жыве і жыць застанецца
Тут маё сэрца!

## ДРАЎЛЯНАЯ РАЗЬБА

Хлебасей ступаў па гонях
За сахою, не за плугам,
Напінаў пастронкі конік
І аж слаўся ад натугі.

Дзядзька сее — чэрці важаць!
Дык на ліха гэта праца —
Задарма жывёлу пляжыць
І самому падрывацца.

Як жа выйсці з каляіны? —
Ён знайшоў для мары спосаб:
Коней выпіліў з кляніны,
А прыгожых, а выносных.

І, вясёлых, круташыіх,
Узагнаў на стрэшку з долу.
...Паляцелі коні тыя
Са шчыткоў у свет па долю.

Выйграў майстар бітву з часам,
І чуваць аж па сягоння:
Прыпусціўшыся за шчасцем,
Капытамі б'е пагоня.

* * *

Заўжды была ў народзе майстру хвала,
Хто сэрцам чуў, на што пусціць сасну:
Стаўляў дамы, меў талент на цымбалы
І, што паробіш, браўся за труну.

Псуе вуглы не струмант, а няўмека —
Не ганьце звонкай славы тапара!
Натрудзь руку сякерай дрывасека,
Там, на лязе,— удача разьбяра.

## ШУМЕЛІ БЯРОЗЫ

*З кінафільма «Палеская легенда»*

Шумелі бярозы на гром ці на вецер,
Шумелі бярозы.
Паехалі хлопцы на дзень ці на тыдзень
Ад Белае Русі.

Паехалі хлопцы па долю, па волю
Да Чорнага мора.
А Чорнае мора белыя косці
Казацкія мые.

Паехалі хлопцы і шчасце і праўду
Шукаць на Дунаі.
А ў сінім Дунаі вада закіпае
Мужычай крывёю.

Жахнуліся хлопцы, пабеглі на конях
Да гораў Карпатаў.
А ў горах Карпатах падпалены хаты
Гуцульскай галоты.

Усюды на пана і ўвечар і рана
Працуюць і гнуцца.
І з кожнай бярозкі насечаны розгі
Для беднага люду.

Пачулі за ветрам, што коні заржалі
З парогаў дняпроўскіх,
І далей на Доне казакі гамоняць —
Пачулася хлопцам.

— А мы не казакі, а мы не ваякі? —
Прамовілі хлопцы.—
Мы жывы не будзем, а волю здабудзем
Навекі, навекі.

Спрабуем, ці моцна прышыты галовы
Да панскага карку! —
Ды так спрабавалі, што ў копы складалі
Паноў і падпанкаў.

Заціснула войска, як чорная хмара,
Адважных малойцаў:
Стралялі, рубалі, схапілі, пагналі
На кару, на мукі.

Ты слухай-паслухай: з халоднага жвіру
Гучаць галасы іх.
І тымі ж мячамі ваююць з панамі
Другія малойцы.

## МАТЧЫН ПОКЛІЧ

Не было таго дня,
Каб у пекле халодным, за дротам,
Палявога відна
Беларусі мае не плыло там.

Скінеш камень з плячэй,
Калі ўявіцца ў лагернай скрусе
Бляск азёрных вачэй,
Плёскат крыл на маёй Беларусі.

І куды б ні ішоў,
Як па компасе, ўміг павярнуся
На гамонку бароў,
Што жывуць на грудах Беларусі.

Дзе б мой дзень ні ільдзеў,
Дзе б пад сонцам гарачым ні гнуўся,
Чую голас людзей,
Што чакаюць мяне ў Беларусі.

Будзем жыць, не блажэць,
Не сатромся на тло ў землятрусе,
Толькі б рос і дужэў
Волі дух над чалом Беларусі.

Вось і кліча ў разгон,
Ломіць грудзі бяссонны кавалак,
Што ад сэрца свайго
Беларусь на маё адарвала.

## ПЕРШАЕ СЛОЎКА КУПАЛЫ

Дабро на глум шпурляць
Цяпер шырока ў модзе.
І гаварыць пасля:
Не страціўшы, не знойдзеш.

Па мне, хоць з сэрца луб
Лупіце, а не страцце
Пад Вязынкаю дуб,
Амаль пры самым тракце.

Калі ён быў малым,
Дубочкам мог бы звацца,
Тут, першы раз, пад ім
Сказаў Купала:
«Маці!»

## СЛЯПЫ САЛДАТ

І колькі б ні прайшоў дарогі,
Дзе ні пабыў,
Што б ні зрабіў для перамогі,
Але зрабіў.

За гэта разлічыўся люта
Свінцу драбок:
Байца нізрынуў у пакуты,
У вечны змрок.

Сядзіць у скверы, сінім цветам
Ільсніць касач,
Ды нешта не ляцяць манеты
Яму на плашч.

Ці сплавы ўсе перакавала
Вайна ў штыкі,
Не зберагглі ані метала
На медзякі?

Прасіць? Не ў гонар для салдата
Руку цягнуць.
Яму ўсе людзі вінаваты,
Усе ў даўгу.

Людская памяць век не змеркне
Праз боль нястач.
Ляцяць паперка за паперкай
Яму на плашч.

Сляпы, не можа ён дазнацца
У юнакоў,
Што ў дараваных імі «зайцаў»
Няма падкоў.

## ЛЮДЗЬМІ СТАЦЦА

Ніяк не выветрае з дому
Аброк, прыняты не з дабра:
Згінацца моўчкі ў крук самому,
Каб нехта вус угору драў.

Будзіў прарок нас — людзьмі звацца!
Пара, пара ўжо людзьмі стацца,
Рабіць, як хочам, адмыслова
І разумецца родным словам.

## ЧАРНОБЫЛЬСКІ ВЕЦЕР

Вёска.
Золак.
Зор скупая жменька.
Сама раз турботы пачынаць.
Ані кім — кагенька, ані чым — чагенька,
Не чутно ні вераб'я, ні певуна.

Можа, пад нядзельку позна спаць палеглі,
Ціха і ў суседзяў на двары.
Дзе ж ты, дзядзька Лаўрык, дзе ж вы,
цётка Тэкля?
Было ўсюды поўна вас аб той пары.

Дзверы незамкнуты. Выйшлі ненадоўга:
Можа, дзе бяруць баравікі,
Ці каровы пасвіць выпала радоўка,
Ці ў царкву на споведзь клікнулі грахі?

Пэўна, заблудзіў я, не туды прыехаў,—
Мне павінен ціўкнуць голас хоць адзін...
З вокнаў хат гарбатых вецер гоніць рэха
Пад крыжы.
За вёску.
З палыну ў палын.

* * *

І не сказаць, прыгожая —
Два возеры пад хусткаю.
Аднекуль з-пад Валожына
Дзяўчына беларуская.

Чаму ж дасюль мне марышся,
Даўнейшая таварышка?

Спявала нешта сумнае,
З вачэй кудысьці знікшае,
Не пра мяне ты думала —
Пра некага, пра іншага.

Ці з ім калі сустрэліся,
Ці хоць паразумеліся?

## СКАРБЫ

Ад рук, якія мяне насілі,
Свет паказваючы малому,
Я прыядноўваўся светлай сіле —
Летняму грому, роднаму дому.

Ліст на бярозе, пахучы, клейкі,
Па-над страхою буслiны клёкат,
Песню жнейкі і спеў жалейкі
Я сэрцам бачу і чую вокам.

Нашу ў сабе, я прыняў навекі
І ў матчына слова нітую строга.
Не ганьце, новыя чалавекі,
Усё, што чуеце ад старога...

## ВЕЧНАЕ СЭРЦАМ

Як ён душы ні збыткаваў,
Яе ўсё прыбывала.
А колькі ж сэрца ён раздаў
На сэрцы нам, Купала!
І мы пяём, адна бяда,
Што з губ не спеў, а пара.

Хай памагаюць мне багі!
Аддам жыццё, з паходам
Сплачу свае і ўсіх даўгі,
Каб зноў ступіў на берагі,
Дзе дыхаў ён з народам.

Хай песняры з усіх краёў
Трымаюць свята звычай —
Сягаць яго нязгасных слоў,
Каб людзі ўсе да нас, дамоў,
Ішлі агню пазычыць.

* * *

Калі ў паход зайграў сігнал,
Без песень, без віна
Рассекла вусны ў нас вайна
І рукі развяла.

Байцы ідуць і — не пяюць!
Я стаў, зусім няўзнак,
І ролю ўспомніўшы тваю,
Цябе ў жыцці пазнаў.

Тых словаў, што ляцелі з губ,
Адкрыўся сэнс крадком:
«Вучоны кот на ланцугу
Абходзіць дуб наўкол».

Цяпер няма туды пуцін,
Дый лёсу не мінеш,
Табе ж з падмосткаў не сысці,
Каб адвітаць мяне.

А што, калі вясновы дождж
Між нас паставіць шчыт,
Ты пойдзеш лугам, басанож,
А я зірну ў блакіт.

І ў росным кіпні, ў мураве
Засну, ужо навек,
А васілёк табе сарве
Нягоршы чалавек.

* * *

З ясных часін юнацтва
І да сівых гасцін
Многа з кім развітацца
Змусіў лёс у жыцці.

Можа, з другой хадою,
Маюць другі зарок,

Але яны са мною
Дыхаюць...
Крок у крок
Ходзяць...
Яны маною
Не агнюсілі зрок.

Спорным дажджом дамоўка
Мые дзень спакваля,—
Гэта мая сяброўка
Хмараю прыплыла.

Там вунь — для сэрцаў слабых
Покліч ідзе між дрэў.
Гэта ў гаі мой сябар
Ясенем зашумеў.

Дзе ж у надвор'і хіжым
Знойдзеш такі хаўрус,
Каб над магілай крыжам
Не вырас бы беларус.

## РЭПЛІКА ФІЛОСАФУ

Не дзівіся, што шлях укрываецца дзёрнам
І на ранах душы нарастаюць струпы,
Аніколі ў свой дом не зайсці нам паўторна,
Аніколі другі раз у свет не ступіць.

А чаму тады крок, старадаўні філосаф,
Я мачаю у кроў і з зямлі, і з нябёсаў?

## ПЕРАЕМНАСЦЬ

Як дзяды трымалі спрэчку?
Цэп на цэп і меч на меч.
Век кароткі чалавечы,
Хто слабейшы — не пярэч!

Ад тае ліхой спрадвечнасці
Выбухаюць супярэчнасці:
То за воды, то за рынак
Людзі цэляць даць па брылах.

І цаляюць, ды бяда,
Што ліецца не вада.

## УЗДЫХНУЎШЫ

А пачалося з думкі глумнай:
Людзей разумных шумны рой,
Кніг наглытаўшыся разумных,
Паверне свет на іншы крой.

Як не зляцець слаўцу грубому!
Ад гэтых пустабайскіх мэт
Штодня шырэлі забабоны,
Маўляў, будуем новы свет.

Хто працаваў, хто агінаўся,
Усім адбой, усім прывал,
Той свет, на жаль, не збудаваўся,
Хоць хораша сябе назваў.

* * *

Возера — цудоўнае!
Блісне, усё роўна як...
Ды хіба ж галоўнае —
Як і што
Паблісквае.
Возера мне блізкае:
Крокаў сто —
І бераг.
Сіні верас.
Не хадзіў бы лепей —
Гэта хараство
Вочы слепіць.

***

Як цёпла носіць у гадах,
Як гэта сэрца помніць!
Нібыта ранак, першы той,
Аблашчаны тваёй рукой,
Што зараз — толькі прыгадай —
Зачырванеецца вада,
Абуджаная промнем.

***

З тою злоснай вайной
Я расстаўся амаль незачэплены,
Толькі з марай адной
Засадзіць папялішчы прышчэпамі.

На разлог
Прыйдзе друг:
На дваіх — пара ног,
Столькі ж рук.

А пачнём, нешта ж будзе,
Памагайце нам, людзі!

## ЧАСУ

Нязломна верачы ў свой чын,
Паўсвету абабег,
Не дбаў, не думаў ні аб чым,
А толькі аб табе.

Табою жыў, табою быў,
Масты да сэрцаў слаў,
Ты ж стаў дубка, і закружыў,
І выкінуў з сядла.

Усяк бывае на вяку,
Мой часе малады!
Я ўстаў, мяне на ўсім скаку
Ты не стаптаў тады.

## СЕНТЭНЦЫЯ

Да такое высновы самому пара дайсці,
А не — слухай старэйшых, умельцаў хады.
Ад жуды і бяды — паўдарогі да радасці,
А з дарогі па радасці — крок да бяды.

* * *

*П. К.*

Гукнуў за морам наш хлапчына:
«О, Беларусь, мая шыпшына!»
Каб ведаў свет, што гэта слоўка
Тваё, Уладзімер Дубоўка.

Сівабароды летапісец!
Ты шмат пражыў, а не нажыўся,
З крыніц да схочу не напіўся,
З радзімай не нагаварыўся.

І я ў самоце ўспамінаю
Юнацкі май у нашым краі,
Калі так дыхалася лёгка,
А бачылася так далёка!

Няўжо ж яно, жыццё, мінула,
Няўлоўнай зданню прамільгнула
І мы з таварышам стаім
Над сумным курганом тваім?

Расстацца рана давялося...
І ў марах аб святлейшым лёсе
Жыць на зямлі адна прычына:
«О, Беларусь, мая шыпшына!»

* * *

Цямнее.

Крок за крокам
Смутнее шум дуброў:
Сягоння Налібокі
Праводзяць жураваў.

Я іх не дакараю —
Дарога, шмат турбот,
Я ім рукой махаю,
Прашуся сам на ўзлёт.

Астаўся? Перабудзем
Як-небудзь, пакрысе,
Мы ўжо старыя людзі —
На скварцы, на аўсе.

Канае дзень балесна —
Ні два, ні паўтраця,
Абы зіму правесці,
А птушкі — прыляцяць.

І днее...
Пад аблокі
Чутнее шум дуброў.
Вясёлка ў Налібокі
Зазвала жураваў.

## НАТАТКІ КОЛІШНЯГА ДЭПУТАТА

### 1

Адседзеў я ці мала год
У круглай светлай залі.
Ад палкіх слоў растаў бы лёд,
Якія там казалі.

І веяў мар салодкі мак:
Ну, выйдзем, зрэшты, ў людзі,
А што не так, дык зробім так,
Праб'ём, не замарудзім.

Над жытнім полем, як на звод,
Хістаўся колас посны,
Я ж неўмалоты за ўмалот
Прымаў — аднагалосна.

Пасля, каб не выносіць звад,
Ізноў жа — адназгодна! —
За ўзлёт прымаў я занякпад
На ніве мовы роднай.

І ўпотай думкаю грашыў:
Дарвацца б да трыбуны,
Уміг зляціць з жывой душы
Прыкрасаў груз чыгунны.

Засвеціць праўда з чорных рыз
І век ужо не змеркне,
Але на мой дэмакратызм
Зірнулі скосу зверху.

І не ўдалося дзіваку
Патрэсці слоўным бубнам.
Я слова ўзяў у хмызняку
На лістабоі буйным.

Чаму я рад, па чым сляза —
Стаўляў пытанні рубам,
А ўсё, чаго не даказаў,
Шпакі разнеслі ў дзюбах.

2

Стаяць у чарзе дэпутаты
Па ўсё, што ляжыць на вазе,
Па кніжкі, пласцінкі, цукаты
Стаяць дэпутаты ў чарзе.

А дзеці іх дома цікуюць,
Прыпаўшы да пыльных акон,
Што таты дзяржавай кіруюць,
Што мамы прымаюць закон.

Даруйце, сяўцы і ткачыхі,
Усе, перад кім я ў даўгу.
І я, уздыхнуўшы паціху,
Апошні займаю чаргу.

* * *

Мой дружа, скаргамі ты збрыдзеў
На горкі лёс, на цесны бот.
Было раджацца ў Антарктыдзе,
Гаворацць, там няма турбот.
Не спраўдзіш, жалься ці не жалься,
Яшчэ ніхто там не раджаўся.

* * *

Усім часáм радня,
Народжан не на дзень я,
Але цярплю штодня
Другое нараджэнне.

Пакуль ты сны гартаў,
Свет на паўлокця вырас,
І сёння светлым стаў
Туманны ўчора вырас.

Аб гэтым і жыву
З непагасальнай верай.

Угнуўшы галаву,
Не зазірнеш наперад.

* * *

Цесна і душна па нетрах таіцца...
Кропля,
Адчуўшы ў сабе акіян,
Грунт пратачыла, забіла крыніцай,
І засмяяўся ручай між палян.

Дык паспяшай за люстранаю ніткай —
Блізка ад рук і пакуль што — твая.

Чуеш, як цёпла плюскоча на плыткім,
Як пачынае спяваць акіян.

Светлыя рэкі ў прадоннае мора
Срэбра нясуць, выгінаючы стан,
Буры ўзлятаюць, збіраюцца штормы —
Дыхае ў твар малады акіян.

Можа, за свет карабель пакіруеш,
Голас крыніц правядзе праз туман,
Вось і адчуеш ты кроплю малую,
Што абудзіла ў табе акіян.

* * *

Перад разяўленай пашчай вайны,
Людзі, адчуйце сяброўскі мой локаць.
Не абвяшчайце вялікай віны,
Калі не даў дзе ў дарозе палёгкі.

І не кажыце, нібыта забыў
Тых, што мне грукалі ў дзверы начныя,
Што над сябрамі курганаў гарбы
Сыпалі моўчкі. Яны — нежывыя.

* * *

Мой друг! Ці бачыў дзе ты
Такога малайца:
Намесніка ў паэта
Ці, скажам, у шаўца?

А ў пральні або ў швальні —
Які ні возьмеш кут,
Усюды, дзе начальнік,—
Намеснік тут як тут!

Нібыта без яго мы
Не вылепім збанка,
Не атынкуем дома,
Не ўквасім малака?

Не трэба, ды не зволіш!
І ўмельцаў кіраваць
Бывае многа болей
За ўмельцаў працаваць.

Дык вось, падумаць трэба,
Дзе горай мець прарыў:
У выпяканні хлеба
Ці хлебных дырэктыў!

## ВЫПАДАК НА ФРОНЦЕ

Залп захлынуўся ў залпе
Абкружаны медсанбат.
Доктар кідае скальпель
Хапае свой аўтамат..

А на стале — салдат

— Ты пачакай, салдаце,
Зараз канец баёў.
Маці? Пабачыш маці.
Любоў? Прыхінеш любоў.

— Ды ты папраў хоць шыну,
Дай мне падацца ў рух...

Хвіліна.
А праз хвіліну
Бой прынялі сам-друг.

А потым чай пілі ўдвух.

* * *

Спуджаныя вясной,
Нікнуць снягі з пагоркаў,
Шэранькіх туманоў
Зыбаецца пераборка.

Слова падперазаў
Шляхам —
вясна ж як быццам!
Толькі б усё сказаць,
З праўдай не рассварыцца,
Каб і мая тваёй
Стала ў любой нягодзе.

Хлеб, перш чым стаць сабой,
Цяжка ў дзяжы падходзіць.

## НЯДАЎНЯЕ ПАДАННЕ

Пад шэрым змрокам —
Час быў такі! —
Ма́кі з-пад вокан
Беглі ў макі́.

Сыны айчыны —
Ніхто не слаб —
Мы з павучыных
Вырвемся лап.

Мы вернем волю
Пад родны дах,
Чырвоны колер,
Гары ў грудзях!

Запаў у сэрца
Той вугалёк
Не аднаверцу,
Хлопцу здалёк.

Хоць наймалодшы —
Не голен вус —
Смелы быў хлопчык
Той не француз.

Зняў вартавога,
Разрэзаў дрот.
Трубіць трывога,
Аж рвецца рот.

Шаптаў у скрусе
Ад цяжкіх ран:
«Я — з Беларусі...
Янка...
Іван».

І той краіны,
Дзе паміраў,
Ён родным сынам
Навечна стаў.

Ды не прыснула
Часаў вясло.
Было-мінула,
А не прайшло.

Хоць на магіле:
«Янка...
Іван»,—
Памяць не гіне,
Жыў партызан.

І агнявыя
Ма́каў збанкі
Яму̀ былыя
Нясуць макі́.

* * *

Зайцы напрышывалі гузікаў
На пух даліны снегавой.
Свет аглядаю, не абвузіўшы
На свет, які жыве са мной.

Для прадзіва ці то ад крадзіва
Два вокі ў хмары б'юць наўсторч:
Падоўжваць дзень мне сонца дадзена,
А месяц — падкарочваць ноч.

З чаго яны? З агню ці з вадкасці,
Што ў іх — ці золата, ці медзь?
Хай знаўцы важаць тыя якасці,
А я вазьму, што трэба мець.

Ці ім нядужыцца, бо кружацца —
Чортведама! — ў высачыні,
А час часом, бывае, мружацца,
Не дасылаюць прамяні.

Тады я сам надвор'е яснае
Пад белы звон калакалуш
Раблю, гляджу вачыма ўласнымі
У сховы долаў, сховы душ.

Дарма, што блытаецца заячы
След у даліне снегавой,
Буджу свой свет, не наракаючы
На свет, прыдуманы не мной.

* * *

Увечар пальцы лягуць
На сцішаныя клавішы.
Адвага не знявага,
А як ты жыў не граючы?

Душа жыве шуканнямі
І працаю, знаходзячы
Здабытае вякамі
У маладзейшым родзічы.

## ВЫСТАІМ

Ізноў падаражала...
Але найгорш баліць:
Чарга перадрыжала —
Стаіць каля бальніц.

Яна хвастом замлелым
Загнулася ў двары:
Так ведаць закарцела —
Што скажуць дактары.

Не, праз другое гора
Чарга ў мароз паўзе:
Прынесці нешта хворым,
Здабытае ў чарзе.

Бальніца можа вобмаль
Паставіць на стале:
Паветра зжор Чарнобыль,
Няўмекі глумяць хлеб.

Дарадцы за мяжою,
З высакародных мэт,
Памогуць нам дажоўваць
І суверэнітэт.

Калі ўсе чэргі выстаім,
Дык, можа, праўда, выстаім.

## ПАЧАТАК ЧАЛАВЕКА

Дзе паўвека, дзе ўвесь свой век,
Быццам жар у глухой загнетцы,
У чалавеку спіць чалавек,
Ён пачнецца, калі прачнецца.

Не гукайце яму — ўставай! —
Не ўшчувайце, чаму спазняецца,
Не турбуйце яго, няхай
Пачынаецца, прачынаецца.

Хоць шуфлюе аўсы ў засек,
На падмуркі ўзрывае гнейсы,
Але спіць яшчэ чалавек —
Ён прачнецца, калі пачнецца.

Можа міма прайсці балід,
А вось бразне вядзерцам вочап —
Ён прахопіцца і наўзрыд
Будзе плакаць ці зарагоча.

Хлыне дзень да яго вачэй,
І жыццё здасца добрым святам,
Прыме ў сэрца бары, дзяцей —
Гэтак прыйдзе яго пачатак.

А задыхае смерць за метр,
Ён падымецца,
без прыжмуру
За хвіліну агледзіць свет
І, ўздыхнуўшы,— на амбразуру.

Не ўскладайце тады вянцоў,
Не спявайце хвалы па часе.
Гэта — доля жывых байцоў:
Ён не скончыўся, ён пачаўся.

## НАДЫХОД СЛОВА

1

У чалавечых тлумах
Чуюся аднаверцам:
Сэрцу хочацца думаць,
Думаць хочацца сэрцам.

Згукі лаўлю і зрухі
Чуйна, як на паверцы:
Сэрцу хочацца слухаць,
Слухаць хочацца сэрцам.

Золак людской удачы
Поўніць вачэй азерцы:
Сэрцу хочацца бачыць,
Бачыць хочацца сэрцам.

2

Сцежка ідзе, не збочыць,
Шляхам у век прарвецца:
Сэрца ўражае вочы,
Вочы глядзяць у сэрца.

Хтосьці пашэпча ціха —
Рэха мне адгукнецца:
Сэрца кранецца слыху,
Слых пазвініць у сэрца.

Жыць не па звыклай мерцы —
Лёгка шукаць ратунку:
Думка бунтуе сэрца,
Сэрца раджае думку.

## ПУШКІНУ

Раптам лісце засвіціцца,
Зацвіце у красках луг:
Уваходзіць у святліцу
Даўні друг і лепшы друг.

З тою песняй, як сініца
За марамі дзесь жыла,
Як уранні да крыніцы
Па ваду дзяўчына йшла.

І, жывы, вясёлы, блізкі,
Цісне ён табе руку,
Спадарожнік ад калыскі
Да надтруннага пяску.

У грудзях кіпіць свабода,
Бачыць мару ён сваю:
Аб'ядналіся народы
У вялікую сям'ю.

І нясе пашану кожны,
Імя шырыцца наўкруг:
Пушкін!
Слаўны спадарожнік,
Першы друг і лепшы друг.

Ці ж даўно ў мяхах вайсковых
З перачэрсцвелым пайком
Мы насілі твае словы
І пад кананадны гром

Іх, як клятву, паўтаралі
Мы — сыны адной зямлі,
Разам смерць перамагалі
І ў бяссмерце перайшлі.

## ЭКЗАМЕН

Даўно мінуўся гэты час,
Юнацтва клопат даўні.
...Прасторны тэхнікумскі клас,
І за сталом — настаўнік.

Уважна з-пад брывей густых
Глядзеў, падсочваў крышку,
Каб мы не спісвалі ў другіх,
Не заглядалі ў кніжку.

А ўсё ж здавалася, вось-вось
Ён ціха пажартуе:
— Я, хлопцы, бачу вас наскрозь,
Ды што рабіць — дарую.

Тады мы ўспомнілі партрэт
Са сцен вясковай школы:
Насупраць нас сядзеў паэт —
Жывы, сапраўдны Колас!

Ні пра пагляд, ні пра падказ
Мы думаць больш не смелі
І свой нязграбны пераказ
Пісалі, як умелі.

Цераз гады, праз вір падзей
Усплыў перад вачамі
Юнацкі ўсхваляваны дзень,
Уступны мой экзамен.

Стаю на вуліцы, відзён
Высокі дом паэта,
І заклікае ў госці ён
Прыхільна і прыветна.

Шумяць хваіны ў халадку,
Сінее адвячорак.
Не раз падумаю, пакуль
Ступлю на панадворак.

А што скажу? А з чым прыйшоў?
Ці варт паказваць вершы?

Нібы мяне чакае зноў
Экзамен самы першы.

Мы заўжды шлях кіруем свой
І строім песні голас
На тую песню, ад якой
З зярняці вырас Колас.

## СОН

Я падымаўся на гару,
І дрэвы талакою —
Чаму, ладу не дабяру —
Услед ішлі за мною.
Я клаў зарубкі на кару,
Каб знаць, адкуль якое.

Каб ведаць, дзе іх пасадзіць
Зноў у лясной гасподзе.
Яны павінны свет будзіць,
Жывіць красу ў народзе,
Яны ж не людзі, каб хадзіць
Па бітым шкле стагоддзі.

Спынюся, спыняцца яны,
Зірнём за акаёмы:
Налева — грозяць перуны,
Направа — страшаць стромы,
І за імглою не відны
Шляхі на дол, дадому.

Хоць ні ступіць, ні добра стаць
Нагімі каранямі,
Стаіць сяброў зялёных раць —
Расткамі крышыць камень!
І пачынае заклікаць
У засень салаўямі.

Як ні стаўлялі мой народ
На босае карэнне,

Як ні араў мяне нарог
Нялюдскага знішчэння —
Я аджываў, як назнарок,
У новым пакаленні.

І зноў, і зноў у свой прастор
Яно ўрастала з болем:
Касіў віхор, складаў тапор,
А падымала голле!

Ад зор да зор чуцён мой бор
На ўсім зямным застоллі.

## ЗДАРЭННЕ Ў САНАТОРЫІ «НЯСВІЖ»

У даўнім замку Радзівіла,
Дзе восень дыхала з муроў,
Мяне гарачка паваліла
І не ўцякла ад дактароў.

Тады праз ласку гэтай цёткі,
Паміж трызнёй і забыццём,
Я сівых сцен выслухваў плёткі,
Быў старасветчыны гасцём.

Бляшаны круг каціла поўня
На здзірванелыя валы...
Здалося мне, ў палацы поўна
Яго насельнікаў былых.

Пазнаў адразу, толькі глянуў,
Як дама трэф між дробных карт,
Княгіня з роду Каштэлянаў,
Што насадзіла дольны парк.

Князі, хто ў цёмных сутарэннях
Знайшоў касцям надзейны спрат,
Жывыя нашчадкі з прагненнем,
Каб спадкі адхапіць назад.

На залу біў агонь каміна,
Быў стол накрыт на сто персон,
І тут
не ў крэсле —
на драбінах
Сядзеў знаёмы нехта...
Ён!

Пры самай плыні аксамітаў,
Што з танца ў танец гнаў габой,
Драмаў, знябыты, абабіты,
Канёк з адвешанай губой.

Але яздок!
На твары веліч,
Нібы гасціць у панства звык,
Слуга князёў, Міхал Міцкевіч,
З-пад Мікалаўшчыны ляснік *.

Яго падступна падбівалі:
— Міхал! Пакінь ты нам хлапца...
І частавалі:
падлівалі
І падкладвалі без канца.

Хоць чарку мог ён добра лыкаць,
Не расшчапіў замкнёных губ:
Каля драбін стаяў музыка —
Ці то Сымон, ці то Якуб.

— Ты чуеш гэтую катрынку?
Міхал паскардзіўся яму: —
Ану іх к ліху! Едзьма, сынку,
У Стоўбцах зойдзем у карчму.

Згас княжы вензель на балконе,
Растала ўсё — і шум, і сквіл,
І пацягнуў калёсы конік
У прадсвітальны небасхіл.

---

* Міхал Міцкевіч — бацька народнага паэта Якуба Коласа.

## НА РАСКОПКАХ

Устаўшы да сонца,
Папіўшы кваску,
Выходзіў цясляр,
Аблюбоўваў сасну.

З пляча замахнецца
Сякерaю цяжкай,
Камель распадзецца
На смольныя плашкі.

Старанна за долата
Возьмецца волат,
У кожнай палове
Выдзёўбвае жолаб.

І слухае ўмелец
Падзяку людскую...
Мы даўнія дзівы
З пашанай турбуем.

Зямля іх глыбока
Схавала ад часу...
Вось тут чаравічак
З высокім абцасам.

А поруч — аздобы,
Рыбацкія восці,
Паўміскі, з якіх
Частаваліся госці.

Што далей, то болей,
Штодзень па знаходцы!
Вось гэта майстры —
Беларускія хлопцы!

## ДОМ ПАЭЗІІ

Пры самым ганку — зор папас,
Пяе пявун, чувацъ сабаку,
Тут сцены, праўда, без акрас,
А ў іншым не дасі ім браку.

Сам будаваў. Хоць часам дуб
Падасца воку шэрым звонку,
Кранi рукою гэты зруб —
Ён абзавецца рэхам звонкім.

І тканак дрэва тайны ход
Адкрыецца ясней, як слова,
І ўчуеш ты, на колькі год
Мая пастаўлена будова.

## БЯРОЗАВІК

Аж змогся парны вецярок,
Хоць клікні сонца — памагай!
А ўсё ж ён хмару прывалок
І выверну ў на белы гай.

Ад галавы да ног
Намок,
Ды нездарма — прачнуўся сок!
І гай узяў ды зашумеў,
Як у зіме шумець не ўмеў.

І тут жа пранізала снег
Зялёным вусам дзераза,
А сок галінкі абабег
І, як сляза,
Упаў з ляза.

## КАМЕННЫ СПЛАЎ

Сябры мае!
Хто ўласнымі вачмі,
Калі ў агні даходзілі руіны,
Ліпнёвай раніцай пабачыў горад Мінск,—
Збяромся і адзначым гадавіну.

Каторую?
А гэта ўсё адно —
Дзесятую або саракавую,
Для нас яна ў наступнае —
акно,
Прасека ў час, які людзей гартуе.

Не сумны дзень прыгадак пра бяду,
Хоць мы не так і мала гаравалі,
Я на бяседу хлопцаў прывяду —
Смерць прынялі
і зноў насмерць стаялі.

І вось яны:
як быў хто на пасту,
Ды толькі ў рудах, глыбах камянёвых.
Прыпала мне іх вызваліць адтуль,
Даць уздыхнуць і крок ступіць са сховаў.

Каменны сплаў! Цвярдзейшы за метал,
Алмазам не дарадзіш гэтай крушні.
Як лішкі зняць?
Хоць лазерам прастай,
Інакш не вырвеш постаці з-пад стружкі.

Мне б да напалу слова давясці,
Каб падняло, злучыла іх з жывымі!
А не — дык рашчынюся ў пачуцці
І ацвярдзею ў камень разам з імі.

* * *

Ёсць у нашай краіны
Ад дзён яе раніцы
Дарагія мясціны,
Дзе шапка здымаецца.
І хоць крыгі вякоў
Прайшлі над гарадзішчамі,
У імя ваякоў
Тыя месцы ахрышчаны.
Там народнае гора
Пад жвірам засыпана,
Там падцята пад корань
І панства і прыпанак.
Колькі помніць Палессе,
Гаі нарачанскія,
Дый уся ж ты, як песня,
Зямля партызанская.
О зялёны мой дом,
Падпяразаны рэкамі!
Мы цябе не спяём,
Даспяваецца некалі.

***

Зноў у вокны дарогі глядзяцца вагоны,
У кур'ерскіх вятроў крадзе сны далячынь,
І бяжыць праз лясы, і глядзіць з-за ваконня,
Мітульгою і пеўнямі поўнач крычыць.

Я не ведаю цёплай краіны гасконца,
Ды не горшай уцехаю лёс абдарыў:
Мне руку падавала каўказскае сонца,
На хрыбтах прыкурыць памагалі вятры.

Загатоўваюць гусі.
                    У вырай станіцу
Кізяковым дымком павялі каміны.
Вось бы крылле каму!
                    Ім жа так не сядзіцца,
Белым хаткам...
                    Няўжо зазімуюць яны?

Я ў расстаннях жыву і сустрэчамі поўны,
Хоць не часта на колы стаўляю свой дом,
А ўсё роўна, ўсё роўна, сасмаглы вандроўнік,
Выпіваю блукальніцкі кубак нагбом.

І мне зноў давідна не давалася слова,
Штохвіліны кідала і ў холад і ў пот,
І дыміла папера, крышыўся аловак,
І басіў паравоз, як гугнявы фагот.

## У АМЕРЫЦЫ

За штатам штат...
                    Гляджу ў людзей,
Гляджу і сам сябе пытаю:
Ці то лятункаў, ці надзей,
Чаго ў іх тварах не хапае?

Бягуць патокі гарадоў,
Бяжыць жыццё — арол і рэшка! —

Бягуць шляхі, і пагатоў
Бягуць натоўпы —
без усмешкі.

Напэўна, колаў ураган
Яе змахнуў, як пыл з асфальту,
І з губ людскіх...
зрабіла сальта
І пырхнула за акіян.

Зноў дзень у дзень гляджу ў людзей,
Свідрую нетры, можа, цудам,
Пласты прабіўшы пацвярдзей,
Я госцю мілую здабуду.

Хаця б адну!
На ўвесь абшар,
Дзе з марай я вандрую пешкі,
Дзе над усім — змарнелы твар
Краіны беднай, без усмешкі.

Не здыхаецца...
Пакрысе
На луг бы ёй сысці, разуцца,
Прысесці ў цень і —
па расе!
А можа, ўдасца пасміхнуцца.

* * *

Мусіць, тут удачы многа,
Што даводзіцца вяртацца
З вельмі бойнае дарогі
У хлапецтва ці юнацтва.

Свет мой мілы — незнаёмы!
Быццам першы раз пазнаны,
А зірнеш — і ўсё ж ты дома:
Ходзяць людзі, бліщча ранак.

Бачу ту́ю залатую,
Кацярок каля тэрасы,
І як быццам зноў я чую
Капітана Гатэраса.

Восень сушыць ліст грабовы,
А шпачкі пяюць навысціг,
І ўсё міла, гэтак нова,
Нібы толькі нарадзіўся.

## ЗІМОВЫ МАЛЮНАК

Бягуць снягі з імглы сляпое,
Прадзе завея.
За акном
Пірамідальная таполя
Закручана верацяном.

Сціхае...
З шэрых,
пасівелых
Хмар
вылятаюць матылькі
На ўмёрзлы бераг.
Беляць белы
Ручнік ракі.

## ЖЫЦЦЮ

Заўсёды поўнай меркаю
Цябе я чэрпаў, хмельнае,
І ты яшчэ не змерклася,
І зморany не вельмі я.

Ад сталасці да старасці
Не выспеліцца ягадзе...

Яшчэ яны не сварацца,
Душа з хадой у злагадзе.

Я толькі болей думаю
Над ніваю, над пожняю,
Ганю з вачэй бяду маю,
Трывожную, апошнюю.

Яна ў ваенным галасе,
Пад ядзернымі пытлямі...
Хай тое, што зазналася,
Ніхто нідзе не спытвае.

## ШЫПШЫНА

Сустракала навалы ўсе ў чыстым полі,
Ворагі тапталіся — людзі зайздросныя:
Наквеці зрывалі, абломвалі голле.
Сабралася ў куст, сплялася ад болю,
Гэтак і жыве, як вятры ні выпроставаюць.
Вось чаму калючкі на шыпшыне павырасталі!

* * *

Ліла.
Адмарасіла.
Пасля —
                    ізноў ліла.
Стары ў ватоўцы сівай
Пахуквае на шкло.

Махне рукой на шыбу,—
Давай наводзіць нож.
Паруе за сялібай,
Як з лазні, цёплы
                                        дождж.

Каб крышку падсушыла...
Хоць брый, гарыць лязо.
Хацеў вязаць фашыны,
Паваяваць з лазой.

Зноў шапачка-магерка
Паглядвае ў акно...
За поясам сякерка,
Навострана даўно!

— Падмочана работа,—
Мармыча:
— А няўжо ж
І заўтра будзе слота?
Дакучыў чортаў дождж!

## МАСТАК

Згасла сонца. Ён пісаў
Карціну.
Здавалася, што прычакаў
Часіну
І перадасць
Адным рукі ўзмахам
Чаўны і снасць
І ўзлёт дзюбатых птахаў.

Ды каб чуваць было,
Аб чым
сумуюць чайкі,
Ды каб відаць было
На дне марскім
зары акрайкі.

Ён працаваў,
Аж покуль змрок
Не ўпаў на бераг
І фарбы сіняе не мог
Адрозніць зрок
Ад шэрай.

Аднак ён з месца не сышоў.
І вось уранні
Зірнуў на твор
І на прастор
Бяскрайні.

Схапіў ён тонка вагары
І колер хвалі,
І птушкі белыя ўгары
Нібы крычалі.

А ўсё ж не гэтым і не тым
Жыла карціна,
Зусім не дыхала б яна
І не свяціла,
Каб не трымцеў між сінявы
Ледзь-ледзь прыкметны,
Але імклівы і жывы
Рыбацкі ветразь.

І знаў мастак,
Хоць залічылі
Знаходку ў скарбы,
Што ветразь той
Быў выпадковы
Кавалак фарбы.

## «МАЗ» НА ВЫСТАЎЦЫ Ў НЬЮ-ЙОРКУ

У неонавым ззянні, ва ўзрушаным гомане
Разнастайных натоўпаў, клаксонаў, гудкоў,
За люстранай вітрынай, што зварана ў Гомелі,
Ператворана ў шкло з найбялейшых пяскоў,
Ён стаіць, растапырыўшы дужыя рацыцы,
Галаву падымае, пазнаўшы мяне,
А ўсім іншым цікаўным не варта тут кратацца,
Ён раўне, і за ім Белавежа раўне.

* * *

Прад аблiччам вечнай далi
Выбачай! — кажу зямлi —
Як цябе мы шанавалi,
Са штыкамi межавалi,
Капытамi рунь таўклi,
Палiвалi кроўю, потам,
Пралi жылы калаўротам,
Рвалi мiнамi палi.

Праўда, шмат дасталi сталi,
Солi цяжкiя кулi.
Асушалi,
Абваднялi,
Веж да зор набудавалi,
Ды вось — друз не падмялi!

Не ўшчувай — старыя чэрцi! —
Не паспелi, стала сэрца,
Ну, а то б не падвялi.

## ПОЗНIЯ ГРЫБЫ

Вечар топiць
Сонца ў балоцiне.
Натупаўся, хопiць,
Сэрца калоцiцца.

Столькi хвойнiку —
Не выездзiць коннiку!
Ды ў беразакi
Збеглi баравiкi.

Браў бы таўстухi,
Брыду якую —
Сядзяць, псяюхi,
З травы цiкуюць.

Сустрэць бы зайца,
Спытаць,
як маецца,
Даць акрайца,
Ды не трапляецца.

Дрэвы пад гафтам.
Пуста скрозь.
Раптам
Змора i млосць
Мiнулi,
Рогi мiльгнулi.
— Лось!

* * *

Падманулі на ладушкі,
Падманулі на казку
І за лапачкі-драпачкі
Палажылі ў каляску.

Ціха песня пагодная
Тую казку змяняла.
Ноч вагоны пагойдвае
Ад перона вакзала.

І на вокнах у шэрані
Беразак закусціўся...
Спі, маленькая, ў шэранькай,
У благенькай хусцінцы.

* * *

На ўскраіне горада ў новай хаціне
Адчыняю акешкі, гукаю ў прастор
І змаўкаю...
Адкуль жа яно, павуцінне?
Што прынесла з сабой — успамін ці дакор?

Белым-белае плеціва — бабіна лета —
Восень шчодрай рукою снуе з рукава...
Сейбіт першы назваў яго добрай прыкметай,
А хто імя дабраў?
Не інакш удава.

Ёй здаваліся косы тады шаўкавісцей,
Стан тужэй і зграбней, сэрца многа паўней.
А на клёнах успыхвала зыркае лісце
Перад тым, як апасці...
Дадолу, пад снег.

## ЛАСТАВІННЕ

Ведаў я адну прыкмету,
Не рабіў ёй насупроць:
Каб не псуць сабе партрэту,
Нельга ластавак пароць.

Птушкі добрыя, а сплямяць
Самы твар — не абы-дзе! —
І навечна ляжа памяць
Аб разбураным гняздзе.

Як бы шчокі ты ні мыліў,
Выглядаць пачнеш якраз,
Быццам мухі заслядзілі
На сцяне стары абраз.

Ластавінне — брак дзяўчыне,
Ды не ў гонар і хлапцу:
Ні любіцца з ластавіннем,
Ні тым больш ісці к вянцу.

Ад такой напасці грознай
Я ўцякаў, як толькі мог,
Дзе былі пры хатах гнёзды,
Не ступаў я на парог.

Ды, аднак, прыйшла марока,
Нейк завёўшыся з гульнёй,
Я пацэліў ненарокам
У гняздзечка пад страхой.

Ведаў я: ні ў чым не вінен,
Але ж смешак перанёс
За абліты ластавіннем
Мой, крыху задзёрты, нос.

Ды не так прыкмеце дробнай
Людзі верылі з сяла,
Як любоў да птушкі добрай
Тыя гнёзды берагла.

## ЯБЛЫНЯ

На яблыні ружовы цвет —
Галіна пры галіне.
І дрэўца, нібыта букет,
Бяры, нясі дзяўчыне.

Яна ў гушчарыне лясной
Была відна з дарогі,
Яе, нагледзеўшы вясной,
Забраў садоўнік строгі.

А потым, выбраўшы пару,
Прыйшоў у агародчык
І прышчапіў ёй пад кару
Цудоўных пару вочак.

Яна тады на белы свет
Зусім інакш зірнула
І зноў, прыбраўшыся у цвет,
Вясну інакш адчула.

Стаіць, падобна да тае
Дзяўчынкі невялічкай,
Што ножкі босыя свае
Абула ў чаравічкі.

Пайшоў па голлі свежы сок,
Калючкі пагубляла,
Пабелкі чысты хвартушок
На стане завязала.

Хоць рада сонечнаму дню,
Не зварухне галіны —
Там завязаўся ўпершыню
Вялікі яблык вінны.

## ДЗЯЎЧЫНА

Паправі́ла ражкі́
Зялёнае хусціны.
Змарылася-такі —
Дзесятая гадзіна.

Вільготны цёплы змрок
Аблічча абвявае,
А вось і аганёк
Вячэрняга трамвая.

Цяпер яна спачне.
Дастала вершаў кніжку.
На лаўцы пры акне
Не трэба лепш зацішку.

Пад роўны туркат кол
Мінае шлях кароткі...
Прыкрыла твар рукой —
Як дрэмлецца салодка!

Якое дзіва тут,
Што змружацца павекі:
Ад рання інстытут,
Пасля — бібліятэкі.

Прыехала? Дарма!
Задрэмлецца ж знянацку...
Ды ўсіх яшчэ няма
Сябровак інтэрнацкіх.

У іх адны гады,
Здружыліся, зжыліся...
І гэткі ж маладых
Шуміць ёй скверык лісцем.

Яшчэ дыхнула раз,
Ступіўшы на прыганак.
Напэўна, заўтра ў нас
Пагодны будзе ранак.

Прачнуцца ў халадку,
Надзець на пераменку

Адзіную пакуль
Парадную сукенку.

Ісці з рукой рука,
З самой вясною ў пары
Па сонечных баках
Маёвых тратуараў.

Як добра ўсё, што ёсць,—
Канспекты і залікі...
А дзень, а маладосць,
А цэлы свет вялікі!

## ПАЦАЛУНАК

Раскажу, што пабачыў
Сваімі вачыма:
Закахаліся раптам
Хлапец і дзяўчына.

Не ўлічыўшы,
Што з крытыкай дрэнна жыву я,
Не ўтрымаў я героя —
Няхай пацалуе!

І хоць рад быў юнак,
Я не рад пацалунку:
Мне да смерці яго
Ўжо не спішуць з рахунку.

Будуць пальцамі поркаць,
Праз лупу ўглядацца:
— Васемнаццаць гадоў —
І паспеў закахацца!

Трактарыстам не стаўшы,
Салдатам не быўшы,
Прафсаюзнага стажу
Яшчэ не набыўшы...

Дарагія мае!
Вы ж успомніце самі:
Не плыло хіба
Зорнае неба над вамі
І не вабіла
Жытняя даль каласамі,
Не гукала вясна
У прастор салаўямі?

І няўжо вы ніколі
Сваімі рукамі
Вашай мілай сяброўцы
Рукі не сціскалі,
Не чакалі
Над хваляй,
Лістоў не пісалі!
Дарагія мае,
Вы падумайце самі!

Не за выслугу год
Нам каханне даецца,
Яно проста прыходзіць,
Як сэрца заб'ецца,
І здаецца —
Сады зацвітаюць зімою,
Калі поруч ступае
Дзяўчына з табою.

А часамі
Душа засмыліць, як у прыску:
Ты яе пакахаў,
А яна — ані блізка!
Нехта іншы
У любай тваёй на прыкмеце...
І пажоўклым здаецца
Зялёнае вецце.

Я сваім закаханым,
Сустрэўшы на нівах,
Не чыніў перашкоды —
Кахайце шчасліва!

Я глядзеў, як гулялі,
На рэчцы сядзелі...

Пажаніць іх, ці што,
У апошнім раздзеле?
Не!
Хай самі мяркуюць,
Паспеем з вяселлем.

Вельмі ж лёгка у творах
Мы жэнім ды жэнім.
А каханне прайшло —
Не ўтрымаеш у жмені!

Пачынаем разводзіць,
Жыццё разбіваем...
Хай каханне само
Лепей пары складае.

Мы наладжваем шлюбы
Не меней як знатныя:
Брыгадзіры абое,
Абое выдатныя.

Маладая як след
Да грудзей не прыгорнецца,
А глядзіш,
Выклікае хлапца
На спаборніцтва.

А няўжо не здалося тут
Неба ёй сіньшае,
А няўжо не знайшлося тут
Слова пра іншае!

Эх, жыгнуць бы дубцамі
Са свежага веніка,
Не героя, вядома,
Вядома, пісьменніка!

Тут нічога не здумана
І не прымыслена,
Гэта многімі пісана,
Пісана,
Пісана!

Не сагрэта жыццём,
Пачуццём не запалена,

Але многімі хвалена,
Хвалена,
Хвалена!

Тут хвалі ні хвалі,
А ніхто не прабачыць нам,
Што мы дрэнна сказалі
Пра тое, што бачылі.

Бо жывецца не гэтак,
Як баецца ў казцы,
І не скача герой
Па крытычнай указцы.

Ён і сее, і жне,
І заўзята будуецца,
І смуткуе па-людску,
І моцна цалуецца.

Дык забудзем,
Што нашы галовы сівеюць
І што нашы сяброўкі,
На жаль, нѐ страйнеюць.

Будзем слухаць,
Як б'ецца жыццё маладое,
Пра каханне напішам,
Пра шчасце даўгое.

І калі я
Пра ўсё раскажу па сумленню,
Дык за што мне,
Ў каго мне
Прасіць прабачэння?!

## ЗАПРАШЭННЕ НА ВОЗЕРА НАРАЧ

Хто быў на Байдарах, хадзіў па Эльбрусе,
Рукой дакранаўся алтайскіх снягоў,—
Збярыцеся ў гэты куток Беларусі,
Я шлях вам паказваць заўсёды гатоў.

Я бачыў не раз, як буруны ўставалі
І з мора спяшаліся ў порт караблі,
Мне месяц сцяжыну прасвечваў на хвалі
І ў снежні сухумскія ружы цвілі.

У гэтай красе б'ецца сэрца маё!
Таму вось і клічу сяброў і суседзяў:
Пагосцім у Мінску, на Нарач паедзем,
Усмак паблукаем і ўсмак папяём!

Давайце агледзім наш добры прастор,
Каналы ў Палессі, наднёманскі поплаў,
У люстра зірнём палачанскіх азёр,
Паслухаем песні над пожняю цёплай.

Няхай сабе тут не зрабілася гор
І высахла мора старое да кроплі,
Але калі громам расколе абшар,
Збяруцца цяжкія ліловыя хмары,—
Упоравень з морам тады, не на жарт,
Да зор ускалышацца возера Нарач.

І вырвецца з бору паўсотні вятроў,
Забомкаюць сосны, лясныя званіцы,
І белая кнігаўка, як альбатрос,
На шпаркім крыле пранясе навальніцу.

Памкнуцца ўзляцець ад зямлі ветракі,
Наўзавад жыта́ пабягуць ад нягоды,
Зажмурацца, глянуўшы з берага ў воды,
І рынуцца з круч стрымгалоў васількі.

А пойдуць удаль грукатаць перуны,
Расправяцца ветразі, высахнуць снасці,—
Адзін за адным павяслуюць чаўны,
Закінуць у хвалі рыбацкае шчасце.

Спакойна іх возера будзе гайдаць,
І стане такое яно, адшумеўшы,
Што іншаму здасца — і ў лыжцы вада
Наўрад ці бывае калі спакайнейшай.

Празрыстае — можна каменне злічыць,
Блакітнае — неба ў ім палавіна,

Багатае — рыба лускою блішчыць,
Магутнае — слава ад бацькі да сына.

З касою ішлі на паноў бунтары,
Калі ж заявіўся нядаўні наш вораг,—
Пры беразе ўспыхнулі мсціўцаў кастры,
Шугнула свінцом партызанскае мора.

А сёння тут важыцца мірны улоў.
Няхай бы і ўсюды! Не — горка і крыўдна —
На жоўтыя твары заморскіх лаўцоў
Імглою апаў папялок рэактыўны.

Нядоўга пакруціцца д'ябальскі чад!
Наш колас цяжэе і горан іскруе.
Стаяць рыбакі з нарачанскіх брыгад,
Сваё працавітае мора вартуюць.

Сябры мы намоцна, работы не зганіш,
Адстойвалі разам наўкола аблонь.
Ад'едуся часам — не чую расстання,
А возера ўсплясне і сцісне далонь.

Адчуй гэта ўсё, і ты скажаш, таварыш,
Святлейшага лёсу і ты б не хацеў,—
Хадзіў бы на тоні па возеры Нарач,
І золак страчаў, і душою мужнеў.

## НАРАЧАНСКІЯ НАКІДЫ

### 1

Сады з румянкай белаю,
Палеткі з нівай спелаю
сінечу п'юць нагбом.
І столькі ў хмарах чысціні,
І столькі ў марах вышыні,
што мы з табой — пяём.

2

Шляхі мае вандроўныя,
Турботай лета поўныя!
Зірнеш — не налюбуешся,
Заснеш — у сне дзівуешся,
патрапіў самараз:
На белы грыб — па верасе,
На рыбіну — па беразе,
а потым на папас!

3

За вёскаю, за Купаю,
Дзе тоўкся чорт са ступаю
у даўнія гады,
Дажджы, як коні, тупалі
І рвалі пад Лынтупамі
паводкі павады.
Лілося перагонамі,
Святлела над адхонамі,
сціхала пакрысе,
І ўсё далей за хатамі
Грымела перакатамі —
змагліся хмары ўсе!
І раніца — ў адведзіны —
Аж слепіць сінявой,—
Дарма, што дождж праседзела
У сукні пад сасной.
Якраз як ты са мной!

4

Ізноў па сінім верасе
Ідзём у хвойны дзень,
І верасень намерыўся
Сарваць табе прамень.
Адзін, хоць самы тоненькі,
Абручык залаты.
Ад ветру, ад дуроніка
Для кос тваіх густых.
І хораша, і молада
Ішлося ў той глушы,
І сонечнае золата
Смяялася ў душы.

* * *

Пахне спелай антонаўкай восеньскі сад...
Пастаю, адыду і вярнуся назад.
Ціха, яблык, не падай,
Не будзі маю радасць,
Давідна не будзі,
Пасядзі
На галіне —
Хай паспіцца дзяўчыне.

А крыніца паціху булькоча ў кустах
Аб зялёных вачах і аб мілых руках,
Што красуня лясная
Пра мяне ўспамінае...
Дык, ручай, не шапчы,
Зацурчы
Па даліне,—
Час прачнуцца дзяўчыне!

І мы самі, як хвалі крынічнай пары,
Цераз луг, цераз свет паплывём на зары.
Ужо нашы прасторы
Там, дзе месяц і зоры.
Хутка ноч праміне,
У акне
Стала сіне,—
Час выходзіць дзяўчыне!

* * *

Яшчэ цяпла папачакай,
А ўжо кідаюць пералёткі
Свой вырай, свой птушыны рай,
Што быў людскім, казалі продкі.

Калі нас выгналі за грэх,
Адтуль і птаства ўсё з імпэту
Шугнула следам, ледзь не збег
І сам — з нуды — стваральнік свету.

І вось — ляцяць! З усіх дарог.
Насустрач згубам у вандроўцы,
Пад сіні ліст, на спелы мох
Звіваць гняздо, спяваць сяброўцы.

Ляцяць у край згрызот людскіх —
Хай выбачае вырай вечны
За той жыцця кароткі міг,
За грэх салодкі, чалавечы.

* * *

Галлё шуміць...
Як дзень, так ноч
За вокнамі хістаецца,
З вятрамі сварыцца яно,
І з лістам ліст спрачаецца.

І я ўлагоджваю вятры,
Міру лісты апошнія,
Палю асеннія кастры
І зоры наддарожныя.

А можа, згледзеўшы здалёк,
Душа душы паклоніцца,
Падхопіць зыркі вугалёк
Мае лясной бяссонніцы.

## КРЫТЫКУ,
## ЯКІ ДАКАРАЎ ЗА АРХАІЗМЫ

Старое слова! Ах ты,
Якая ж тут бяда?
А продак мой пра нафту
Казаў: гарывада.

Стаймуйцеся з імпэтам,
Шаноўны ягамосць!
Галоўнае не ў гэтым,
А ў тым, што нафта ёсць.

* * *

Каб жа, маці, не была
Я ў цябе дзяўчынаю,
Я б шумела ўскрай сяла
Гонкаю хваінаю.

Гнала б сцюжу да тае
Горкае разлучніцы,
Ды ступлю, і растае
Бель зімы пякучая.

Углядалася б я ўдаль,
Як асвер над студняю,
Але ж кроў, а не вада
Тахкае, не студзіцца.

Я за мілым наўздагон
Бегла б шпаркай рэчкаю,
Празвінела б праз агонь
Не арлом, дык рэшкаю.

Я не сцюжа, не віхор
І не воран з глюгаю,—
Дзеўка стала з летніх гор
Любая — нялюбаю.

Вось і клічу град і гром,—
Чорнай хмарай пала б я...
Папялей, зямля, суздром
Пад немілай параю.

А завея след у след
Слепіць вочы сечкаю:
— Пасвяці ты ў белы свет
Самай тоўстай свечкаю.

Тут хоць сонцам пасвяці:
— Адступі, вірутніца!
Не хачу яго пасці,
Можа, сам прыкруціцца.

* * *

Толькі вока заплюшчу —
Лячу за віхурай
З Белавежскае пушчы
У восеньскі Тураў.

На дарожных развілках
Сівеюць паданні
Аб народных асілках,
Народных паўстаннях.

Дрэмле ціхае месца,
Буяюць ажыны,
Мы тут вогнішча з сэрцаў
Сваіх разлажылі.

І гарэў тры прадвесні
Касцёр партызанскі.
...Не даспевана песня,
Не складзена казка.

Але сэрцы — пад прыскам,
Яны не сатлелі,
З той жа самаю іскрай
Той першай нядзелі.

Вы нас, добрыя людзі,
Для свят не шчадзіце,
А спатрэбіцца —
ў будзень
Агонь узбудзіце.

## ТЫЯ, АБ КІМ ПІСАЎ

Яны не былі мне знаёмы з маленства,
Я іх падымаў і расціў уяўленнем,
Здаралася часам злавіць падабенства,
А болей было ад жыцця адхіленняў.

Як зараз...
Да мачты прывязаны паскам,
Днём сыплючы зоры, варыў ён апоры.
І холад, і вецер, а ён — калі ласка! —
Сяброў выкпівае, гукае ў прасторы.

Я думаў — асілак, жахнешся, як злезе,—
З шырознай грудзінай, стальнымі вачамі...
Ён змёрз і абмок, і зусім не жалезны
Вось гэты бязвусы кірпаты хлапчына.

* * *

...Асеннія дні. Чырванее рабіна,
І просіцца з купіны ў рот журавіна.
Я гэтай празрыстаю, яснай парою
Ніяк не дараджу, дзе дзецца з сабою.

Уночы не спіш, дачакаешся рання —
І цягне і вабіць на шлях вандраванне!
Напэўна, напэўна, за тым небакраем
Я нешта нязнанае раптам спаткаю.

Іду і тапчу туманок вераснёвы,
І сонца ўсплывае лісцінай пунсовай.

Ніколі не бачыў, ніколі не быў,
Ніколі так моцна зямлі не любіў!

## РАЯЛЬ

Выганяючы статак, вясновай парой
Разлучаў я хваіну з пахучай карой,—
Скруціш дудку, праржэжаш у ёй галаснік,
Сэрца ўставіш — і ты ўжо музыка з музык.

Ажывала свісцёлка ў дзіцячых губах,
Пыльны шлях мае мары на спіне зыбаў.
Зазывала ў дарогу, вяло без канца
Не хваініна сэрца, а сэрца хлапца,
Дый найбольш запявала на смутным ладу —
Пра бяду гаварыла душа праз дуду!

Нечакана вярнуў мяне ў даўнюю даль
Наш тутэйшы, барысаўскі звонкі раяль.
Ад блішчастага века над безліччу струн —
Басавітых — на радасць і тонкіх — на сум —
Ледзь відзён быў музыка, няраслы хлапчук,
Як ні распасцірай — не стае ў яго рук.
Ды мяцеліца ў полі круціла, мяла,
І Лявоніха вочкам пабліскавала,
І дзяўчына шаптала, і штось гаварыў
Перад вечнаю ростанню бацька стары.
Гэта ведаў адзін я...
                    А як жа хлапчук
Вывеў з цемры той свет і надаў яму гук?

Ды яшчэ адгадаў, чым я зараз жыву,
З чым у заўтра іду...
                    Я схіліў галаву
Перад поўнай душой,
Перад спеўнай рукой,
Перад той, што ўмывалася ў Нарачы з хваль,
Перад елкай, чый голас сышоў у раяль.

* * *

Рэчка Паратунка на Камчатцы!
Якава ты, мілая рака?
Мусіць, перад тым як так назвацца,
Дзесьці ўратавала земляка.

Доўга я лавіў цябе на картах,
Сіні хвост вільне — і ў акіян.
З берагоў тваіх жалезным гартам
Мне звініць бяроз каменных стан.

У гады сягаю пільным вокам:
Ці салодкі меў ці горкі лёс
Той дзівак, што ў гэты край далёкі
Наша слова добрае прынёс.

Кім ён быў? Відаць, землепраходцам,—
Крок ступі і цуды прыкмячай:
Снег ляжыць, а дно ягонай лодцы
Грэе кіпню чыстага ручай.

Чалавек ці звер яго параніў,
Як з прасторам біўся за ключы,
А з цябе зачэрпаў цёплай твані,
Прылажыў і раны падлячыў.

Можа, ў сэрцы здарыцца нястача
І рабіць адмовіцца рука.
Рэчка Паратунка! У няўдачы
Выратуй другога земляка.

Я сябе даўно ўжо цешу думкай,
Што калісь, на ростані дарог,
Наша слова стане паратункам
Ад тугі, ад болю, ад трывог.

* * *

Часцей і часцей на сябе наракаю —
І сэрца не тое, і тонус не той,
А раніца гляне — за працу сядаю,
Бо сам не зраблю — не даробіць ніхто.

Нічога з таго, што самім перачута,
Чым сэрца закута было ці раскута,
Што меў за жалобу, што ведаў за свята,
Як промнем і хлебам рабіўся багаты,
Што знойдзена мною, не мною пабіта,
Забыта і зноў, як навінка, здабыта.

Каму перадам і каму я даверу
І шчасце даверу, і радасці меру,
Пагоду краіны, садоў яе цвет
І вока людскога завоблачны свет.

Не страшна аддачы, на ўзгор'ях удачы
Яшчэ даражэйшае чую і бачу
І вам аддаю, покуль сэрца стае...

Не трэба шумець, дарагія мае!

* * *

Шаўкі і дарогі па-рознаму мераюць
І плаціну жвірам не мыюць, як медзь,
А сэрца шаруюць наждачнай паперaю,
Як быццам бы сэрца павінна блішчэць.

Лязо адаб'еш, і — работа не цяжкая:
Спявае краса, і спявае рука,
І сэрца мянташаць сухою мянташкаю,
Як быццам бы сэрца пяе ад бруска.

Пагодна ў душы, ні хмурынкі над кручамі,
Ідзеш, і крыло вырастае з пляча,
А ты падліваеш у сэрца гаручага,
Як быццам бы ў сэрца завод ад ключа.

А стане само ці пакончыць з вандроўкамі,
Тады ўжо дакор пекане палыном:
Агрэхі з яліны здымаем габлёўкаю,
А з сэрца сякерaю трэску дзяўбём.

Ідзе праз вятры чалавек неаблашчаны,
Не хоча цяньку, не шукае сядла,
А сэрца чакае, каб сэрцам абнашчылі,
Каб сэрцу ад сэрца палёгка прыйшла.

І як ні было б тое сэрца знявечана,
А з добрага вока павее цяпло —
Паціху кранецца і, сэрцам прывечана,
Глядзіш, аджыло...
Пакульгала.
Пайшло!

* * *

Спяваем лепей або горай —
Адным хвала, другім дакор,
А колькі песень села ў горле,
Не вырваўшыся на прастор.

Пачадзеўшыя ў курных хатах,
Паглухшыя па казематах,
Пастаўленыя да сцяны,
Пазасыпаныя ў акопах,
Замёрзшыя на горных тропах,
Не заспяваліся яны.

А каб на свет ім нарадзіцца,
А каб на дол не ўпалі ніцма,
О, як бы чутна стала нас,
Мой час!

## ДВА ГАЛАСЫ

— Вясна ў лясной глушы...
— Садзіся і пішы!

— Сышліся дзве душы...
— Садзіся і пішы!

— Палаюць дзён лаўжы...
— Садзіся і пішы!

— Ліецца кроў з душы...
— Садзіся і пішы!

* * *

Я дзесьці прачытаў:
ТЭАТР ВАЕННЫХ ДЗЕЙ...
І ўбег
у бег атак,
У крык,
у кроў людзей.

Агонь — гусцей, гразней,
Рады — вузей, радзей.
І раптам —
сціхата...

Хіба ж гэта спектакль?
Не гаварыце так!

Што, можа, быў тэатр,
Калі, аматар здрад,
Прывязваў белы кат
Сіпаяў да гармат?

Ці граў тады тэатр,
Калі ў пушчанскі спрат
Вёў за сабой Кастусь
На бітву Беларусь?

Снарадам рве снарад,
Б'е мінны вадаспад,
А крок — і Сталінград,
А перад ім салдат.
Стаяў.
І стаў сівы,
Стаяў і нежывы,
Стаіць з магільных крат.
Няўжо ж і тут тэатр?

Цаляе ў мірны борт,
Дзе толькі рыс і корт,
Бамбіць заморскі чорт
Бальніцу і курорт.
На прысак дзьмуць вятры,
Прымае сэрца гарт.
Сябры і несябры,
Зноў скажаце — тэатр?

І Брэст, і схілы Татр,
Крывавых сотні рат,
Што сплочваў сын і брат,
Каму ў зямлі спакой
Даў край удзячны мой?

І гэта ўсё — спектакль?
Не гаварыце так...

* * *

Ні ў якім доме не хапіла б
Ім месца...
Нават пастаяць.
А да мяне такая сіла
Збіраецца вечараваць!

Без іх святочныя парады
Блішчаць,
без іх шумяць бары...
З сланечнікаў, з-пад Сталінграда,
Ідуць прыснуўшыя сябры.

Зірнём у свет, і стане горка...
Я чую зноў, што я салдат,
Яшчэ не здзеўшы гімнасцёркі,
Не разрадзіўшы аўтамат.

Жыву, чакаючы адведзін,—
Хутчэй, таварышы мае!
Нам на самоце і ў бяседзе
Адно спакою не дае.

## ДОЖДЖ. КРАСАВІК, 1945

Растуць агністыя слупы
Удзень і ўночы.
З руін ляціць гарачы пыл
І слепіць вочы.

Расстрэляны схіліўся гмах
Над самай Эльбай.
Дождж пякае на чарапічны дах
Па кроплі, слухаць нельга.

Прыйшоў у розведкі да нас,
Засек балкончык,
Пытае шэптам соты раз,
Калі ўжо скончым?

Гатоў ён кінуць аўтамат
І — на пшаніцу:
Ёй сёння-заўтра, акурат,
Пара кусціцца.

## ПАЧАТАК

1

Стаміўшы голле духатою,
Ліпнёвы дзень, як звон, стаяў:
Жыта́ па плечы, травы ў пояс,
Лісты па сажню выганяў.

І першы раз таму, што мае,
Сама дзівілася зямля:
Ад нечуваных ураджаяў
Аж угіналася ралля.

2

Я ў бор прыйшоў і доўга слухаў:
Як працавіты дрывасек,

Гром уздыхаў і грукаў глуха
На скрыжаванні шумных рэк.

А потым, стукнуўшы ў акешкі,
Каб не запальвалі агню,
Дождж паляцеў ламаць алешнік,
Трасці сады, хвастаць хвайню.

3

...Пара ў дарогу. Хатніх рэчаў
З сабой забралі мы душу...
Тады, прарваўшы млосны вечар,
Ступілі танкі на шашу.

Яны паўзлі далей, за балку,
З гармат прытоеным агнём.
І падлажыў я сам падпалку
Пад свой абжыты, добры дом.

Пайшлі, не знаючы спачынку,
Бездапаможныя слядкі
Мае разутае дзяўчынкі,
Мае маленькае дачкі.

4

Каржакаватымі нагамі,
Карэнне вырваўшы з зямлі,
Лясы пайшлі услед за намі,
І ўслед нам рэкі паплылі.

На шлях вясновай бліскавіцы
Раптоўна сталі халады,
У глыбіню сышлі крыніцы,
Каб вораг не дастаў вады.

У грудзі ўпершыся напасці,
Наш воін у мяжу ўрастаў,
І ўжо не мог ён доле ўпасці,—
І, мёртвы, кулю пасылаў.

5

А мы — таксама як салдаты,
Сыны парушанай сям'і,
Змянілі ўжо на аўтаматы
Свае дарожныя кіі.

Мы ўсё здабудзем, возьмем, вернем,
Жыццё ўзрасціўшы цераз смерць,
Каб век наш, высеяны зернем,
Уздужаў коласам шумець.

## НА ПЕРАДАВОЙ

Нас праводзілі сціпла, без маршаў і слёз,
Прагукаў ды крануўся цягнік,
А на пятыя суткі у стэпы прывёз,
Дзе ўсё неба гарэла ў агні.

Мы прагрызлі рыдлёўкамі гліны пласты,
Прыстралялі вінтоўкі свае,
Чулі мы, атрымаўшы ад блізкіх лісты,
Што ўвесь край нам руку падае.

Памагаў абагрэцца маленькі касцёр,
Піць насілі крыніцы з лугоў.
Нас любіла жыццё, мы любілі жыццё
І стаялі насмерць за яго.

Нашу прагу тварыць потым вызваліць час,
Як метал вызваляюць з руды.
За Радзіму, сябры!
Яна помніць пра нас
І дадому чакае заўжды.

## ФРАНТАВІК

Гэта ён, да пляча прытуліўшы прыклад,
Трапным стрэлам фашыстаў здымаў,
Гэта ён ваяваў за спакой нашых хат
І грудзямі навалу стрымаў.

А ў самога хацінка на вецер пайшла
Ў дзень, калі затрубіла вайна,
Калі горкай часінаю бежанства шлях
Сын маленькі яго пачынаў.

І калі загадае вайсковы шпіталь,
Каб салдат пры сям'і адпачыў,
Першы стрэчны тады падыдзі і спытай,
Дзе ён спыніцца сёння ўначы.

Зазаві яго ў дом свой і ежу пастаў,
Пайку хлеба пакрой папалам.
Хай не ломіцца стол пад раскошаю страў,
Абы ветласць у хаце была.

Ён успомніць працяты упартасцю год,
Поўны слаўных і горкіх прыгод,
Ён раскажа, як тупала смерць паўз яго,
А праз друга прайшла навылёт.

Поўнач скончыць гаворку, і дружба навек
Возьме сэрца ў высокі палон.
Ён устане, суровы, мажны чалавек,
Пацалуе дзіцёнку чало.

А праз тыдзень раскажуць з пазіцый лісты,
Як ідзе за вярстою вярсту.
Будзе ён непахісным заўсёды, а ты
Ласкай сэрца яму загартуй.

## ПАЛОННЫ

Што ж, разбойнік! Паказвай мне вочы свае
З-пад бялёсых арыйскіх павек.
І забіць цябе мала, і слоў не стае
Абняславіць, зняважыць навек.

Ты падкраўся, як злодзей, да нашых прысад,
Да свабодных, шчаслівых сядзіб,
Ты пасек мой зарой пазалочаны сад,
Што я дзецям і ўнукам садзіў.

Ты мой дом загнюсіў, ты зламаў маю клець,
Ты спаліў ураджаяў тарпы,
Ты прымусіў дзяўчыну маю загрубець
І пад мостам свой боль утапіць.

Больш не ўдасца святлом магілёўскіх шаўкоў
Заліваць плечы Март і Гертруд,
Вам дамоў не данесці паходных мяхоў,
Не адмыць вечны сорам і бруд.

Сцежкі памяці яркнуць крывавай травой,
Сум з жалобай ідуць з-пад вянца.
Надыходзіць часіна злічыцца з табой
Куляй слова і словам свінца.

## ЖАНОЦКАЕ СЭРЦА

Неслі варту абапал шляхоў ветракі,
Дзе ішлі мы з відна да цямна.
Вы прыміце салдацкае дзякуй, жанкі,
Што, як родных, прывечвалі нас.

Вы спяшаліся з вёсак да нас на прывал,
У збанкі пераліўшы удой,
Падыходзілі блізка, заглядвалі ў твар:
Можа, часам патрапіцца свой?

І хацелася ўсім як мага пасабіць,
Ласкай сэрца да сэрца ішло:
Ці падкінуць блінца, ці кашулю памыць,
Ці падшыць ператлелае шво.

А як рушыць наперад, за сонцам, у свет
Клікаў нас перакатамі бой,
Праглынуўшы слязу пад хусцінай, услед
Доўга-доўга махалі рукой.

І дрыжала рука, і слязіна плыла...
Прыгадала тады не адна,
Як, праводзячы мужа, з ім поруч ішла,
На дарозе стаяла яна.

І хоць тут на пяску яго след не ачах,
Ён ідзе па гасцінцы другім,
І другія жанчыны выходзяць страчаць
Самым лепшым дастаткам сваім.

## МАЦІ

Запытаецца ў суседкі:
— Ці здаровы вашы дзеткі?

А пасля пры студні стане,
З-пад рукі на вёску гляне.

Толькі ведае, нябога,
Што не ёй пыліць дарога.

* * *

А навокал стаіць заварожаны бор,
Восень горкі дымок пасцілае за хатамі,
Расцвілі верасы, дацвітае чабор,
І ўсплывае дакор: ці былі мы салдатамі?

Паўз благое і добрае роўна ідзём...
Шмат палегла сяброў, а не ўсё зваявалася,
Не зламалася зло, што пускалі на злом,
А, здаецца ж, хапала адвагі і сталасці.

* * *

Курацъ кнаты...
                    Вакол мяне
Нібы яшчэ адно ўзрушэнне,
Каб свет паставіць на калені...
Два перажыў, а гэта — не!

Нагамі я зямлю качу,
Каб ёй не жыць у паняверцы,
Я шмат магу прыняць на сэрца,
Ярма ж нікому не хачу!

І вось дасюль трымаеш строй,
Хоць не падобен да героя:
Народ за зброю — ты за зброю,
Народ — герой, і ты — герой.

## 1914

### 1. МЯСАЕД

Там,
Дзе ў пушчах асіны ад страху калоцяцца,
Выліваецца Морач праз берагі,
Ёсць засценак Пасынічы,
Вёска Балоцічы
І, радзіма старое мужыцкае рочаці,
Ёсць сяло Мурагі.

Убаку ад сяла, моцна ўдачай аблашчаны,
Агароджу на сажань падняўшы вакол,
Сабакарняю шчэрыцца хутар Дамашчыка,
Знаны тым, што не ўпусціць анучы валяшчае
Ды ласінаю сілай сыноў і бацькоў.

А пачатак той справе — з пітва ды ад ежыва...
За паўгода
Ад першай з германцам вайны
Сустракаліся хлопцы, гулякі і нежані,
Валачыліся,
Елі, пілі, як належала,
Ды валілі па вёсках са стрэх каміны.

Пад святочныя світкі хаваючы бічыкі,
На ўсяночную рушылі праз паплавы
І давалі ў каршэнь
Засцянковым панічыкам,
І стаўлялі дубка старамодныя брычкі іх,
І шляхцяначак ціснулі
Каля царквы.

Іх было чатырох —
Здараўцы, задзірастыя! —
Быццам нехта ў гаі навыкопваў дубоў:
Міканор Налівайчанка,
Яначка Ластаўка,
Дарафей Перасада
Ды Зміцер Падшастуха,
Крываносы дурніла з мянушкаю Боўць.

Пазбіваўшы замкі,
Клямкай свірнавай бразгалі;
Пад мяцёлку засек і — ні шум баравы!
Латашылі гароды, па пчэльніках лазілі,
Каб юнацтва пацешыць, пакідаць абразікі
У Зіноўкі, не вельмі скупой удавы.

Не шманалі нічога,
Ані,
Нічагусенькі!
Ні сабака не гаўкнуў, не піснула мыш.
Не хавайце, дзяўчаты, крамяныя вусенкі,
Не ўратуецца сад ад зялёнага вусеню.
Рад не рад, а маўчыш!

* * *

Пачынаў мясаед свае ўцехі вясельныя,
Бразгаталі шамкі, і званілі ў званы.
Людзі пляжылі качак,
Крапілі гарэліцай,
Патыхала сівухай рака за аселіцай,
Верашчалі пад швайкамі кабаны.

П'яны дым
Падымаўся над п'янаю вёскаю.
Камячыліся самі сабой кулакі,
Трэба ж рады ім даць —
Грае кроў!
І на ростанях
Пачыналіся кепікі,
Жарцікі вострыя —
Задзірацца выходзілі перш хлапчукі.

А пасля —
Маладых сваіх, вэльмам аздобленых,
Жаніхі пакідалі.
Які там вянец!
Паважнейшыя справы былі не дароблены —
Калацілася вёска,
Каламі, аглоблямі
Біў мужык мужыка,
На хлапца пёр хлапец.

Поп стаяў у царкве, не дакончыўшы пацеры,
Ручнікі паздзіраўшы, ляцелі сваты.
— Пачакай, Мікалай!..
— Я яго...
— Трасца матары!
Вось тады ўжо
Нарэшце —
Старыя аматары! —
Выпаўзалі пабіцца
Дзяды.

Асцярожна,
Лядок прабіваючы мыліцай,
З непагасшымі люлькамі,
У кажушках,
Даставалі адзін аднаго па патыліцы,

Паглядалі —
каторы не ўстоіць, скапыліцца,
А як не —
Памагалі дручком, па нагах.

## 2. ВЯЛІКДЗЕНЬ

Мне свет сягонняшні мілей стаў
Без таннай дробязі акрас:
Я адгарнуў ражок маленства —
Далёкі, даўкі, горкі час.

Той горад толькі разаспаўся,
Калі гукнулі на паклон:
Нібыта цяўкнуў, абазваўся
Раней за ўсіх малодшы звон.

Старшэйшы — ўслед,
яшчэ старшэйшы
Ударыў.
Біла прытрымаў,
І сціхлі ўсе, нібы самлеўшы,
А самы старшы гахнуў:
— Б-баў!

Скубуць дзядоў за крыссе ўнукі,
Трашчаць ракеты, відната!
І зноў усе пагрэлі рукі
Каля васкросшага Хрыста.

У торг ішлі
падэшвы, свечкі,
Вяндліна, дзеўкі, абады
І пасвянцаныя яечкі
З накрапамі святой вады.

Ад чорных душ быў чорны рынак,
Хапала іх —
чаго-чаго! —
Як, зрэшты, на яго радзінах,
На танным продажы яго.

### 3. ЛІПЕНЬ

З газетнаю позвай ліпень
Ступіў хутарам на парог:
Зямлі вам нарэзаў Сталыпін,
А збожжа зародзіць Бог.

Дык прыйдзецца кола хатніх
Парушыць —
прыйшла вайна!
Няхай паспяшае ратнік,
Ён прыйдзе дамоў, аднак.

Яшчэ не ўзыходзіць сонца,
Пакуль не ўстае народ,
У воласць на параконцы
Шыкуецца —
патрыёт!
Пакуе мяхі з дарамі,
На заклік той у адказ
Здасць ратніка хутаранец —
Не сына, а батрака.

За ветрам, не па газетах,
Прыбегла бяда наўскач.
У вёсцы, прачуўшы гэта,
Жанчыны —
у крык, у плач.

За суткі усім сабрацца! —
Гукае паходны шлях.
Людскуюцца навабранцы
У новенькіх шынялях.

Спявалі «Варага» — песню,
Крычалі не ў лад «ура!»,
Штыкі за плячыма неслі —
«За веру, айчыну, цара!».

Іх вера маной паіла,
Айчына пад кулі вяла,
Сіліла царова сіла —
Не вылужашся з сіла.

У полі, пад ветракамі,
Злажыў іх упокат бой
З раскіданымі рукамі,
З адкінутай галавой.

З папамі, пры конскай падле,
Адпелі, зварылі боршч...
А дома — яблыкі падалі
І новы збіралі набор.

## ПРАГА КРЫЛА

Каля сутокі дзікіх рэк,
Падняўшы вочы ў неба,
Стаяў без шапкі чалавек
І еў кавалак хлеба.

У пушчы вырваўшы загон
Дзярніны векавое,
І рады быў і горды ён
Сякеркай ды сахою.

Сузор'яў белаваты дым
Да долу падаў хваляй.
Мільёны светаў перад ім
Знікалі і ўставалі.

Здавалася, яго знарок
Не прыкмячаюць зоры —
Зямнога пылу камячок,
Загублены ў прасторы.

Глядзець уззяючы сусвет
Было б не гэтак горка,
Каб ведаў ён:
з другіх планет
Зямля здаецца зоркай.

Сава-начніца праз гушчар
Залапатала крыллем...

Ці раз ён марай учашчаў
Да дзіў на небасхіле.

Сніў: уздымаецца, ляціць
І нібыта крыламі
Над міскай возера ў трысці
Памахвае рукамі.

Нясе на мілю кожны ўзмах —
Між воблакаў дарога...
...А хто ж з нас не лятаў у снах
Маленства залатога!

Ён меў тады такі ж узрост,
Па моцы і па думках.
За ноч, намуляўшы рабро,
Абуджваўся з лятункаў.

Злятаў з нябёс на бедны глей
І разважаў за сошкай:
«Вось верабей — куды драбней,
Але ж ляціць патрошкі!»

Здзіўленне брала, што жаўрук
Упасці не баіцца,—
Няўжо за хмарай, як павук,
Вісіць на ўласнай нітцы?

Ён майстраваць пачаў крыло
З прутоў і апранахі,
Прыжмурваў вочы і далоў
Скакаў з царкоўных дахаў.

Смяяўся ўласнік дробных крам,
Клялі ў царкве нябогу:
— Не можа стаць спрадвечны хам
Анёлам, роўным Богу.

Пан ушчуваў, аконам сек:
— Пільнуй свайго акрайца!
І горка думаў чалавек
Больш з небам не займацца.

Аднак жа чуў ён: спакваля
Расце, бушуе сіла,

Вучыла кроку перш зямля
І лёту навучыла.

---

Крыло, палёт і вышыня!
Да сініх зор спрадвеку —
Зірнуць, ці ёсць на іх радня,—
Карцела чалавеку.

Яму хацелася займець
Крылатага багацця
На самай горкай між зямель,
У самай курнай хаце.

Махаў з-пад хмар яму Ікар
Крылом на плыўкім воску,
Цераз суцём з ягоных мар
Раджаўся Цыялкоўскі.

Глядзіць, рагоча гурт сялян,
Чуцён з-пад неба лёскат:
Ледзь-ледзь вышэй плыве біплан
За бусла з нашай вёскі.

Ды вось між зор ляціць зямляк,
Адзін смаленскі хлопец.
Ніхто не скажа — сілы брак,
За крылы Бог не схопіць...

Ты крылы нам усім дала,
І подлеткі лятаюць,
Радзіма прагі да крыла,
Краіна залатая!

# СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ



## *Табе зайздросціць сонца*

### ДУБОВЫ ЛІСТ

Стаяць дубровы ў чэрвеньскай красе,
Дарогі — у аўсянай пацярусе.
Дубовы ліст у жылках і ў расе
Мне нагадаў абрысы Беларусі.

Яго мая кранаецца рука,
А ён нібыта выкаваны з броні,
І жылка кожная дубовага лістка
Злілася з кожнай жылкай на далоні.

### ПАЧАТАК

За Глускам у глухіх барах
Яшчэ маё блукае рэха,
І дзень суніцамі прапах,
І зоры плаваюць у рэках,

І золкі золак на Пцічы
Мяне туды заўсёды кліча,
Дзе расцвітаюць касачы,
Дзе мне гады зязюля лічыць,

Дзе каля цёмнае вады,
На вузенькім пясчаным мысе,
Здаецца, і мае сляды
Яшчэ дагэтуль засталіся.

Хоць я ніколі не знайду
Сваіх слядоў і хісткай кладкі,
А ўсё ж лячу к свайму гнязду,
К свайму адзінаму пачатку.

## МАМА

Калі пушок прабіўся над губою
І ў сны прыйшло дзявочае імя,
Я ні аб чым не раіўся з табою,
Матуля адзінокая мая.

Мне сорамна здавалася часамі
Сярод хлапцоў — цыбатых забіяк —
Назваць цябе, як у маленстве, «мама»,
Таму часцей не называў ніяк.

А вечарамі, слова не сказаўшы,
Ішоў блукаць каля чужых варот
І пазіраў, як у акенцы нашым
Дрыжаў у лямпе да світання кнот.

Не спала ты асеннімі начамі,
Хоць падала ад зморы галава,
Глядзела ў змрок вільготнымі вачамі,
Прывычная да гора удава.

Ты прала кужаль, ты капала гліну,
А ў час жніва зусім не чула ног
Ды гаварыла ласкава пра сына:
«Хай падрасце, няхай паспіць сынок».

І зноў сама збіралася па дровы,
А ў валасах гусцела сівізна.
«Хоць бы сказаў ён ласкавае слова,
Хоць бы, як калісь, мамаю назваў».

Прайшлі гады. Мы пасівелі самі.
І, мабыць, крыўдна мне не аднаму,
Што гэтае святое слова «мама»
Сказаць цяпер ужо няма каму.

## НАРОДНАЯ НАСТАЎНІЦА

Дакошаны лугі, адшапацела жыта,
На сцежкі падаюць пажоўклыя лісты.
Пра што ты думаеш і марыш, раскажы ты,
Куды ідзеш, каго шукаеш ты?
Ці ні сяброў сваіх успамінаеш
І думаеш, што тут зусім адна?
Чаму начамі роснымі блукаеш,
Чаму не спіш да самага відна?
Усе заснуць, а ты святла не гасіш,
У шыбу стукае асенні матылёк,
Ты думаеш, якім у першым класе
Твой будзе першы у жыцці урок,
Якім святлом, якім гарачым словам
Дарогу к сэрцу кожнаму знайсці,
Каб гэтым хлапчукам светлагаловым
Патрэбнай быць заўсёды у жыцці,
Каб кожны стаў і мужны, і шчаслівы,
Каб з імі ты шчасліваю была...
За вокнамі шумяць у садзе слівы,
І месяц стаў над стрэхамі сяла.
А раніцаю ясна сонца свеціць,
Сланечнікі даспелі на градзе,
І ціха шэпчуць за парканам дзеці:
«Вунь новая настаўніца ідзе».
Настаўніца! А ці даўно самую
Вяла у школу маці за руку?
Яна і сёння па табе сумуе
У ціхім прыдняпроўскім гарадку,

Яна штодня лістоў тваіх чакае
І журыцца: «Ну як яна адна?»
Але цябе, як маці, сустракае
Ласкавая лясная старана,
Шумлівыя бары, рачныя кручы
І белыя лілеі на вадзе.
І хлапчукі бягуць табе насустрач
І кожны раз гавораць: «Добры дзень!»
Ты узышла на ганак новай школы,
Ты гэтым дзецям блізкая, свая
І ўжо сябе не лічыш навасёлам,
Бо тут твой дом і тут твая сям'я.
Тут будуць слёзы, тут і шчасце будзе
І — першыя маршчынкі на ілбе.
А ўжо і сёння называюць людзі
Народнаю настаўніцай цябе.

## СЕЙБІТ

Плыве, як човен, вузкая труна
Над полем, над даспелымі жытамі —
Дзяды, кабеты і малыя дзеці
Хаваюць сейбіта, аратага, касца.

Хаваюць без аркестраў і вянкоў,
Без ганаровай варты і прамоўцаў,
Без ардэноў, без некралогаў,
І толькі ў полі гнуцца каласы.

Ён пяцьдзесят разоў пасеяў жыта
І пяцьдзесят разоў абмалаціў,
Ён пяцьдзесят гадоў карміў уволю
Людзей, якіх ні разу не сустрэў.

Ніхто яму не дзякаваў ніколі,
Не віншаваў за шумнаю бяседай
Таго, што малаціў, араў і сеяў
І аддаваў усё, што мог аддаць.

Хаваюць сейбіта.
Маўчаць дзяды і дзеці,

Нясуць у жменьках вялыя рамонкі,
А над палямі не заходзіць сонца,
Якое ён заўсёды сустракаў.

Стаяць прысады ў ганаровай варце,
А ластаўкі лятаюць нізка-нізка
Над пыльным шляхам, над высокім жытам,
І журацца пры студнях жураўлі.

Ён першы раз патурбаваў вяскоўцаў,
І ўпершыню ўзнялі яго высока
Мужчыны над жытнёвымі палямі,
А недзе песня жніўная звініць.

## ПОЛЕ, ПОЛЕ

Звініць начная цішыня,
Да коласа хінецца колас,
І, зажурыўшыся, да дня
Заплача перапёлка ўголас.

Красуе жыта. Над палямі дым
Плыве, празрысты і зеленаваты,
А хутка поле стане залатым,
Нахіляць колас цяжкія зярняты.

У кожным — сонца, кропелькі расы,
Салёныя крупінкі поту,
Ад іх цяжэюць каласы
Ад красавання да ўмалоту.

Іду па сцежцы праз жыты,
І акрыялы, і шчаслівы,
Што ад сяла за паўвярсты
Запахне маладое мліва,

А неўзабаве пад астылым небам
Сустрэне ранне цёплым хлебам.

## ДОМА

У кляновую замець, у сіні прастор
Зноў паклікала восень на матчына поле,
Дзе палае ракіты празрысты касцёр
І чужая бяда адзываецца болем.

Хоць уласнай тугі не пазбыцца ніяк:
Развітанні...
адны развітанні.
Абшарпаны вятрамі апошні вятрак
З перабітымі крыламі змоўк на кургане

І пустымі вачніцамі ўдалеч глядзіць,
Дзе прыціхлі даўно сілікатныя вёскі,
Быццам некаму хоча і ён дагадзіць,
Каб даслухаць яшчэ журавоў адгалоскі.

Вось і сцежка праз поле бяжыць і бяжыць,
Пратаптаная, пэўна, дзядамі калісьці,
І каліна на колішняй колкай мяжы
Асыпае на пожню барвовае лісце.

Я губамі лаўлю гаркаваты лісток
І прыгадваю ўсё, што пакінуў і страціў,—
Сураваю аснову, кужэльны уток
І вячэрнюю песню самотнае маці.

Каля нашае студні сланечнік сухі,
Пакляваны халодным дажджом і вятрамі,
І буслянку на вільчыку шэрай страхі,
І начлежную ноч над крутымі вірамі.

Гэта роднае ўсё і даўно не маё,—
Незнаёмыя дзеці, чужыя жанчыны,
Маляваныя хаты, і засень гаёў,
І шурпаты лісток адзічэлай ляшчыны.

Тут усё забуяла ў асенняй красе:
Пасвятлела наўкол, расцвіло, налілося.
Мне насустрач малая дзяўчынка нясе
І працягвае цяжкі вяночак з калосся.

Я бяру і паціху з гарачай шчакі,
Хоць і яснае неба, сціраю дажджынку,

А за полем гудуць і гудуць бальшакі,
І кляновая замець спраўляе дажынкі.

Тут мой дом, хоць ад дому і следу няма.
Забываюцца толькі пустыя кватэры.
Зносіць вецер сухія лісты,
і зіма
Неўзабаве пастукае ў нашыя дзверы.

## СПАГАДА

Баліць душа за кожнага калеку:
Сляпога праз ручай перавяду,
Бязногага сустрэну чалавека
І кланяцца гатовы на хаду.

Ідуць на мулкіх мыліцах салдаты
Далёкай і нядаўняе вайны,
А я пакутую, нібыта вінаваты,
Што за мяне пакутуюць яны.

Ім, мабыць, сніцца кожнаму начамі
Спеў салаўіны, і пунсовы мак,
І дзеўчына з вільготнымі вачамі,
Што толькі з ім танцуе кракавяк...

Як выбух, голас камандзіра,
І гром, і бляск каля чужой ракі...
Таму хачу, каб дзве мае рукі
Заўсёды працавалі за чатыры.

## КРУГАЗВАРОТ

Ад першай да апошняй зоркі
Дзень прамільгнуў і пакаціўся ў змрок.
Сунічны водар з малачаем горкім
Ідуць са мною як знарок.

Нас абняло азоранае неба,
Такое, як вякі назад.
З тае пары па волі Феба
Становіцца бязладдзем лад.
Прарокі кажуць: «Так знікаюць душы,
На адзіноце перамогшы страх,
Дзе б лёс ні стрэў,
На моры і на сушы
Узыдуць і яны на Млечны Шлях».
Прыходзяць і адходзяць род за родам —
Прарокі, геніі, вар'яты, дзівакі.
І так Зямля сваім кругазваротам
Адлічвае хвіліны і вякі.
Стаю адзін пад зорна-цёмным небам,
Малюся або каюся ў цішы,
Каб стаць не зоркай, а скарынкай хлеба
Для адзінокай праведнай душы.

## ТАБЕ ЗАЙЗДРОСЦІЦЬ СОНЦА

*Тані*

Твайму юнацтву пазайздросціць сонца,
А радасцей хапае на дваіх,
Табе ужо не трэба абаронцы,
Ты абароніш і сябе і іх.
Ад зайздрасці і крывадушнай злосці,
Ад чэрствасці, спакусы і хлусні
Па праву непадкупнай маладосці
Ты і сябе і блізкіх барані.
І не прасі ні ласкі, ні апекі,
Ні дапамогі чулае радні.
Ты ж напрасткі пераплываеш рэкі,
Гартуешся на сцюжы і агні.
І не шукай удачы выпадковай,
Што крышыцца і гнецца у руках
Стаптанаю іржаваю падковай,
Пакінутай на пыльных бальшаках.

Лаві губамі пругкі вецер мая
І абдымі асмужаны прастор,
Твая ж рука гарачая трымае
Сцяблінку, што дацягнецца да зор.
Ты перайначыш колеры і формы,
Ты выратуеш кволых, ледзь жывых,
У навальніцы, у завеі, штормы
І горы схіляцца да ног тваіх.
Ты сілу сэрца, розуму і цела
Сваёй зямлі хоць сёння б аддала.
Табе у вочы сонца паглядзела,
Зажмурыўшыся ад твайго святла.

## БЛАКІТНАЯ ЗІМА

Прыйдзі непрыкметна сцяжынкай нямою
У сінім святле да знаёмых дзвярэй.
Цябе я чакаю блакітнай зімою,
Прыйдзі і настылае сэрца сагрэй.

Я трачу надзею, а ты нечакана,
Калі ні цяпла, ні спакою няма,
Зайшла, зачыніла фіранкі старанна,
Каб сэрцы двайм не студзіла зіма.

У змроку падыдзеш нячутнай ступою
І цёплыя рукі раскінеш шырэй,
Мы ў казачным свеце пабудзем з табою,
Ты толькі настылае сэрца сагрэй.

Я ўсе разгадаю тваё таямніцы,
А ты пазіраеш дабрэй і дабрэй.
Я буду табе на каленях маліцца,
Ты толькі настылае сэрца сагрэй.

# КУПАЛЛЕ

*Славу Купалу пяём, пяём...*
*З народнай песні*

На Купалле зорна-зорна,
На Купалле росна-росна,
На Купалле хлопцу горна,
А дзяўчыне млосна-млосна.

Дагараць кастры над рэчкай,
За вадою, за туманам
Паплывуць за свечкай свечка
І вянкі Яніны з Янам.

Можа, сыдуцца вяночкі,
Загайдаюцца на хвалі?
Ой, кароценькія ночкі,
Ой, трывожнае Купалле.

Ціха дзеўчына спявала:
«Хоць кароценькая ночка,
Азавіся мне, Купала,
Каб сысціся удваёчку,
Каб пабегчы па пракосах
Непрыкметнымі, як здані,
Каб ніхто слядочкаў босых
Не разгледзеў на світанні.

Перапёлкі за дубровай,
У нявыпрастаным жыце
Варажбою і замовай
Нашы сэрцайкі звяжыце».

Доўгі век ім накувалі
Дзве зязюлі ў жытнім полі:
Ні Купаўка, ні Купала
Не разыдуцца ніколі.

# КУПАЛАЎ ЗАПАВЕТ

> Чаго вам хочацца, панове?
> Які вас выклікаў прымус
> Забіць трывогу аб тэй мове,
> Якой азваўся беларус?
>
> *Я. Купала*

Схіляюся да долу нізка-нізка,
Душою прыпадаю да зямлі,
Дзе некалі Купалаву калыску
Гайдалі і буслы, і жураўлі.

І салаўі спявалі напрадвесні,
Звінелі на цымбалах капяжы,
І жніўная зажураная песня
Кранала струны кожнае душы.

Спавітаму у кужаль немаўляці
Знаёмы і ад зморы ледзь жывы
Ласкавы голас маладое маці
Расказваў казку пра курган сівы...

Змянялі лета восені і зімы,
Завеі замяталі след у след,
Шляхамі заняволенай радзімы
Пайшоў прарок з жалейкаю у свет.

Спазнаў ён і знявагу, і нягоду
І матчыныя песні прыгадаў
І ў спадчыну пакутніку-народу
Ўсё, што бурліла ў сэрцы, перадаў.

Святло Купалавай навукі
Праз церні забаронаў і пагроз
Нясуць у свет няскораныя ўнукі,
Каб Беларусь спазнала лепшы лёс.

## МУЗА

Яна прыходзіла таемна, то дзяўчынкай,
То нёманскай русалкай у пакой,
Звінела жаўруком, то чарацінкай,
Да скроні дакраналася рукой,
Нябачанаю, тонкай і гарачай,
Кранала струны чулае душы,
Прарочыла натхненне і удачы,
Ласкава паўтараючы: «Пішы».
Прыходзіла ў халодны мур, за краты,
І там свайго абранніка знайшла,
У змрок прынесла нечакана свята
З іскрынкамі натхнення і святла
І пахам рошчыны у роднай хаце
Пад крыкі развітальных жураvоў,
З журботнай песняй і слязінкай маці
Самотных вераснёвых вечароў.
Нябачаная Муза сон сагнала
І прашаптала у начной цішы:
«Жыццё ўсяго адно, і часу мала,
Таму спяшайся і пішы, пішы».
На досвітку сініцай пазваніла
У вузкае астрожнае акно.
«Мой родны кут, як ты мне мілы...»
Было ужо напісана даўно.
Радок нізаўся да радка трывала,
Прыходзіла ўсё роднае здаля,
Рука пяро упэўнена трымала
І напісала: «НОВАЯ ЗЯМЛЯ».

## У ДОМЕ ПЕСНЯРА

Тут па начах такая цішыня,
Чуваць, як маладзік адлічвае хвіліны.
На схіле лета і на сконе дня
Свой дом нястомны гаспадар пакінуў.
Плыве з нябёсаў сіняе святло,
Праз вокны зоркі за спакоем сочаць.

Усё жывое ў свеце ажыло,
І за парканам тры дубы шапочуць.
    Маснічыны ад шэпту зарыпяць,
У навісі дубоў пульсуюць сокі,
Адвечныя вандроўнікі не спяць,
Не замаўкаюць іх ніколі крокі.
    Дачасна дом пакінуў гаспадар,
А голас не замоўк ні на хвіліну:
З душы ў душу нясе ён вечны жар,
Каб зберагчы і ўратаваць краіну —
    Адзіны дарагі і родны кут,
Тым даражэйшы, што ніколі
Ён, апрача знявагі і пакут,
Не бачыў ні дабра, ні вольнай волі.
    Пайшоў у свет нястомны гаспадар.
Яго пакуты і гады не зморадь
Ад сэрца сэрцу несці жар
Нязгаслых слоў, што з душамі гавораць.
    Іх нёс і панясе, як боскі дар,
Дум і пачуццяў нашых уладар.

## ВЕЧНЫ ВУЧАНЬ

Пераступіўшы ўзрост Купалы,
Я ўбачыў больш і зведаў больш
І вось нясу да п'едэстала
Бяссмертнікаў калючы боль.

І зноў па памяці чытаю:
«Ад прадзедаў спакон вякоў...»
І тчэцца пража залатая
Жывых і трапяткіх радкоў.

Як першы раз яны палоняць
І зноў вядуць у даль дарог.
Хоць і ў мяне даўно на скроні
Неспадзявана іней лёг.

Я пад сузор'ямі Купалы
Хадзіў услед за гусляром,

І ў сон трывожны прылятала
Жар-птушка з вогненным крылом.

З тае пары няма спакою
І шчасця лёгкага ў жыцці:
Як ні шукаю — пад рукою
Пяра жар-птушкі не знайсці.

Я зведаў і пражыў нямала,
Ужо і мой рубеж відзён,
А ўсё вучуся у Купалы
Ад першых да апошніх дзён.

## ПРАРОК МАКСІМ

Народ, Беларускі народ!
Ты цёмны, сляпы, быццам крот,
Табою ўсягды пагарджалі,
Цябе не пушчалі з ярма
І душу тваю абакралі,
У ёй нават мовы няма.

*М. Багдановіч, 1913*

Які быў слых, душа і зрок
У юнака на волжскім узбярэжжы!
У дваццаць два гады — Прарок
У зорных высях і ў бязмежжы.

Усё ён бачыў навылёт —
Жабрацтва, кайданы і путы,
І анямелы свой народ,
І вечныя яго пакуты.

Няўжо на клін сышоўся свет?
Не разумее, што ён творыць?
Маўчыць народ. Але паэт
І сёння голасна гаворыць.

## ВІШНІ

*Памяці*
*М. Ю. Лермантава*

На санцапёку даспяваюць вішні,
І на шчацэ густога соку след.
Нацяты павады, і толькі лішні
Халодны, цяжкі пісталет.

Па горнай сцежцы цокаюць падковы,
Гарачы конь кусае муштукі.
Здаецца ўсё трызненнем выпадковым,
Ды нехта ўпарта сочыць з-пад рукі

І гоніць, гоніць. Страшна азірнуцца —
Ратунку не прасі і не чакай,
Здаецца, больш па сцежцы не вярнуцца,
Што круціцца, як росчырк — «Нікалай».

А можа, гэта толькі так здаецца,
Магчыма, ўсё пустой трывогі груз.
Ён спрытна ловіць вішні і смяецца,
Што здаўся белым ветразем Эльбрус,

Што цёплы вецер ясені калыша,
Што ён яшчэ усіх пераҗыве,
А каля сцежкі костачкі ад вішань
Крывінкамі мільгаюць у траве.

Ён і дагэтуль не прыйшоў дадому:
Ударыў стрэл і пакаціўся гром...
Але яму, заўсёды маладому,
Зрабіўся родным домам кожны дом.

Праз буры, рэвалюцыі і войны
Ён дойдзе і ў наступныя вякі...
Шумяць, шумяць, як ветразь неспакойны,
На лермантаўскай сцежцы вішнякі.

## МУЗЫКА

Звініць над вадой чарацінка,
Гудзе на ўзбярэжжы сасна,
У вербах салоўка заціськаў,
Грамы раскаціла вясна,

Дажджынкі шумяць на лістоце,
Расінкі дрыжаць на траве,
У паўзе кожнай і ў ноце
І радасць, і гора жыве.

Заходзяцца срэбныя трубы,
Пялёсткі ляцяць на зямлю,
І шэпчуць гарачыя губы
Адвечнае слова «люблю».

Самотны ад шчасця, нямею
На роснай палыннай мяжы,
Што часам падслухаць умею
Мелодыю шчодрай душы.

## ПРАВА НА ПРАЎДУ

У кожнага на праўду права ёсць,
Але не ў кожнага хапае сілы волі,
Каб выказаць і пахвалу, і злосць,
Што некаму часамі вочы коле.

У кожнага на праўду права ёсць,
Але не ўсе аднолькавай пароды...
Ды не зважай — хто гаспадар, хто госць,
А гавары, што думаеш заўсёды.

## КАЗКА

Не верачы ні ў прымхі, ні ў прыкметы,
Ачуняю, толькі памажы:
Завары мне ліпавага цвету
І старую казку раскажы.
Задрамлю, і, мажа, зноў прысніцца,
Што з Пцічы прынесла аж сюды
Вечна маладая чараўніца
Прыгаршчы гаючае вады.
Смагаю апаленыя губы
Да яе далоняў прыкладу
І, сябе ратуючы ад згубы,
Вып'ю ўсю да кропелькі ваду.
Водар дзівасілу і жывіцы
Па гарачых жылах пацячэ.
Ачуняю. Толькі чараўніца
Ад мяне нікуды не ўцячэ.
З ёю ўсе падзелім абавязкі —
Набярэм чабору у траве.
Хто заўсёды верыць добрым казкам,
Той на свеце за дваіх жыве.
Расчыні акно насустрач лету,
Не хвалюйся і не варажы.
Завары мне ліпавага цвету
І другую казку раскажы.

* * *

Мы выраслі на хлебе і мякіне,
З рубцамі на руках і на спіне,
Таму ніхто ў нас каменя не кіне
І ні за што нідзе не папракне.

Таму рублі ў скарбонкі не збіраем,
Не гнёмся ад няшчасця і бяды:
Жывём складана, проста паміраем,
Не скончыўшы галоўнага заўжды.

## АСЕННІ ДЗЕНЬ

Дзень па-асенняму кароткі.
Зганяе вецер з хваль луску,
І перавернутыя лодкі
Гудуць на стоптаным пяску.
Празрыста, пуста і сцюдзёна,
Бярэзнік, як манетны двор,
Чаканіць золата штодзённа
І шчодра кідае ў касцёр,
Што задыміўся верасамі,
Што тлее жарам журавін
І між празрыстымі лясамі
Іскрыцца полымем рабін.
Ляцяць лісты з няўлоўным рэхам,
Укрылі сцежкі і сляды,
А мне здаецца, пахнуць снегам
Мае наступныя гады.

## ВЫШЭЙШЫ ЧЫН

Калі акраец хлеба браў ты
Рукой шурпатай са стала,
Скарынка чэрствая, як праўда,
Тваім пасведчаннем была,

І атэстатам, і дыпломам,
Рэестрам радасцей і мук,
А ты нікому не вядомай
Быў акадэміяй навук.

Выходзіў дзень у дзень у поле,
Хоць і ўчарнеў, і перапаў,
А досвітку яшчэ ніколі
У дождж і ў сцюжу не праспаў.

Араў і стагаваў гадамі,
Не для сябе, не для радні,—
Пасталі доўгімі радамі
Твае пустыя працадні.

Не паддаваўся ты хваробам
І не прасіўся на спачын,
Таму, што званне хлебароба —
Твой вечны і вышэйшы чын.

Ты чуў парады і загады,
Ды не спяшаўся іх прыняць,
Бо не маглі з твае пасады
Цябе ні вылучыць, ні зняць.

Табе другіх чыноў не трэба:
У градабой і ў недарод
Усю дзяржаву свежым хлебам
Карміў і корміш з году ў год.

Калі тарпы на полі склаў ты
І выцер свой змакрэлы лоб,
Бо у імя вышэйшай праўды
Жыве на свеце хлебароб.

* * *

Нельга ні забыцца, ні адкласці
На наступны, на прыёмны дзень
Нечае маленечкае шчасце,
А самому знікнуць, быццам цень,
Праз другія дзверы на нараду,
Дзе і без цябе ваду стаўкуць,
І спакойна ў доўгую шуфляду
Спадзяванні нечыя замкнуць,
Нельга абмінуць і адмахнуцца
Ад чужой трывогі і бяды,
Нельга ні пачуць, як сэрцы б'юцца,
Як змаўкаюць сэрцы назаўжды.
Толькі, ўзяўшы гора пад апеку,
Можна адагнаць злавесны цень.
Чалавек павінен чалавеку
Радасці прыносіць кожны дзень.

* * *

Не спакушай мяне, змяя,—
Твайму не пакланюся дрэву,
Бо ведаю спрадвек і я,
Якой атрутай спакусіла Еву.

Яе нашчадкі і сыны,
Падобныя у кожнай рысе
На змея дзікае вайны,
Па белым свеце разбрыліся.

Напэўна, цешылася ты,
Лічыла чорны дзень за свята,
Калі ўзяліся за мячы
І замахнуўся брат на брата.

## ВЕЧНЫ СЛЕД

Простите, верные дубравы!
Прости, беспечный мир полей,
И легкокрылые забавы
Столь быстро улетевших дней!

*А. Пушкін*

Над Сорaццю спяваюць салаўі,
Чаромхаю туманіцца зарэчча
І журацца дубровы і гаі,
Што з ім не дачакаюцца сустрэчы,

Што не пачуюць цокат капытоў
І строфы вершаў і паэм пачаткі,
Што мяккімі далонямі лістоў
Не дакрануцца да яго крылаткі.

Адвечны дуб каля трыгорскіх стром
Сумуе і ўглядаецца заўсёды,
Калі ў самотны апусцелы дом
Паэт прыедзе праз усе нягоды.

А ён ніводнай сцежкі не забыў,
Ён недзе тут, яго не моўкне голас
На той зямлі, якую так любіў,
Дзе дуб шуміць і даспявае колас.

У кожным сэрцы ён пакінуў след
Дабра, спагады, шчырай ласкі,
І куляю няскораны паэт
Жыве, смяецца і складае казкі.

Чаму ж не едзе? Можа, з Чорнай рэчкі
Сумётамі дарогі замяло?
Варожым стрэлам патушылі свечку,
А над зямлёю Сонца узышло.

* * *

Жыццё часамі мачахай было,
Сляпіла вочы, шчокі секла,
То праз чысцілішча вяло,
То зноўку кідала у пекла.

А я не здаўся, не зачах,
Не набрыняў атрутай злосці,
Таму і сёння у вачах
Гарань іскрынкі маладосці,

Таму так прагна я люблю
Жыццё, людзей
І веру свята:
Чаго не мог зрабіць — зраблю
І пражыву другую рату.

# СПАЛЕНЫЯ МАСТЫ

*Памяці Аляксандры Мураўёвай*

Вы сталі сапраўдным узорам самаахвярнасці, мужнасці, цвёрдасці...
Няхай будуць незабыўнымі імёны вашы.

*Дзекабрыст А. П. Вяляеў*

I

Мяцеліца завеяла дарогі,
Каторы дзень калючы снег мяце
З пустой Сенацкай плошчы да астрога
У заінелай вёсачцы Чыце.

Сабралася за дзень, як па трывозе,
Забыла муфту, шалік не ўзяла,
Здалося — сэрца стыне на марозе,
Адна душа не страціла цяпла.

Матляе вецер на раскатах сані,
Фурман замоўк і галавой панік,
Дарожныя слупы, нібыта здані,
Вядуць начам, і дням, і вёрстам лік.

Графіня ледзь кранула ездавога
I слёзна моліць паганяць хутчэй.
Знікае ў белай замеці дарога,
Сухія іскры сыплюцца з вачэй.

З разлёту хвошча па кібітцы вецце,
Зрываюцца з прысадаў груганы,
А ёй часамі сніцца і вярзецца,
Што ў замеці скрыгочуць кайданы,

I чуе голас царскага загаду:
«Пазбавіць званняў, скарбу і чыноў
Усіх злачынцаў першага разраду,
А разам з імі жонак і сыноў!»

— Я згодна, згодна. Я на ўсё гатова.
Пусціце толькі да яго ў астрог!
Дрыжыць рука.
I подпіс Мураўёвай
Пад выракам ніхто б пазнаць не змог.

Сібірскі шлях рыпіць пад палазамі,
Даўгі, як гора, як прысуд прамы.
Яго калоднікі касцямі і слязамі
Масцілі ад турмы і да турмы.

У замеці аглухлі нават бомы,
І толькі сэрца стукае часцей.
Яшчэ вярста.
І ўсё далей ад дому,
Ад маці і заплаканых дзяцей.

Душа збалела, як скразная рана,
Скіпеліся ў адно і боль, і злосць:
Закуты ў ланцугі яе каханы
І ў дваццаць год мінула маладосць.

Яна спяшалася і з кожным крокам траціць
Надзею ўбачыць пецярбургскі свет,
Ёй часта сняцца Міша, Ліза, Каця —
Бягуць за ёю басанож услед.

Ці ж давядзецца іх яшчэ пабачыць,
Калі ўпадзе астрожная сцяна?
Дрыжыць сляза, але байцы не плачуць,
Не мае права плакаць і яна.

І не заплача ні цяпер, ні потым,
Хоць і злічыў крумкач яе гадкі.
У сцюжу грэюць сэрца пад капотам
Схаваныя гарачыя радкі.

«Цяжкія кайданы спадуць...» — на памяць
Сама сабе чытае соты раз
І часам бачыць праз крутую замець,
Як мільгануў агеньчык і пагас.

Паветра — як настылае жалеза,
Аж скроні працінае боль тупы,
Заплюшчыць вейкі — зноў у вочы лезуць
Жандар і паласатыя слупы.

Шлагбаўм рыпіць у ранішнім тумане.
Вось і яе апошняя вярста.
Замецены па стрэхі край выгнання —
Астрожнае зімовішча Чыта.

Мядзведзем з каравулкі паласатай
Вылазіць мікалаеўскі салдат,
Залубянелы, згорблены, вусаты,
І ціха шэпча:
«Свят, свят, свят!

Жанчына! І ў такую непагоду!
Адна! Як матылёк сярод зімы.
Па ўсім відаць — дваранскае пароды,
Чаго ж яна дрыжыць каля турмы?

А ў падзямеллі, ледзь затлее ранне,
У непралазных норах Сатаны
Былыя графы, знатныя дваране
Дзяўбуць руду сабе на кайданы

І ўспамінаюць муштру і парады,
Як сам Кутузаў у паход вадзіў,
Але яго вялікасць імператар,
Відаць, не нам адным не дагадзіў».

Ад холаду не вымавіць ні слова,
І ўсё ж над беднай злітаваўся Бог:
За месяц Аляксандра Мураўёва
Прыехала у катаржны астрог.

Яе з дарогі не вярнула сцюжа,
Ні царскі гнеў, ні завірухі свіст,
І дзень, і ноч спяшалася да мужа,
Цяпер з адзіным званнем — дзекабрыст.

Падумала, як у паэме Дантэ,
Прайшла усе пякельныя кругі.
Але не ўсе. Ва ўладзе каменданта,
Турэмшчыка і вернага слугі

Сустрэчы іх і лёс пад гэтым небам,
Сярод тайгі і адзічэлых скал.
— Перш чым сустрэцца, падпісаць вам трэба
Апошні вырак,— кажа генерал.

— Няўжо яшчэ хоць нешта засталося,
Чаго яшчэ пазбавіць можна нас?
— Сустрэчы вашы будуць у астрозе,
Пры афіцэру. На кароткі час.

І генерал Ляпарскі хмурыць бровы:
— Я не люблю дыскусій і прамоў...
Забараняю лішнія размовы
І ужыванне чужаземных моў.

— Не верыцца, што кажаце сур'ёзна...
Бесчалавечна гэта, генерал!
Няўжо дзеля таго, каб жыць нам розна,
Спяшалася я ў сцюжу за Урал?

— Не ад мяне, шаноўная, залежыць.
Выконваю не ўсё, што сам хачу.
Вы ж дзёрзкасці павінны ведаць межы.
Я пра яе пакуль што памаўчу.

А мушу вам пакорлівасць парадзіць,
Для вашага спакою і дабра,—
І выцягнуўся, быццам на парадзе,
Перад партрэтам новага цара.

Застыла Аляксандра Мураўёва,
Празрыстая ад сцюжы і дарог,
І патрабуе:
— Я абавязкова
Павінна сёння ж трапіць у астрог,

Хоць на хвілінку, каб убачыць мужа,
Не думаю, што вы такі педант...
— Дазволім. Ён, здаецца, занядужаў,—
Суровы здаўся камендант.

II

Шуміць пурга.
Адразу за парогам
Правальваецца і знікае след:
За сценамі чыцінскага астрога
Канчаецца, здаецца, белы свет.

За вузкімі жалезнымі дзвярыма
Ні свечкі, ні агеньчыка няма,
Астылым чадам, плесняю і дымам
Прапахла ўся чыцінская турма.

Александрына падабрала футра
І вобмацкам бяжыць да той сцяны,
Адкуль рвануўся нехта ёй насустрач
І глуха зазвінелі кайданы.

Спынілася няпрошаная «світа» —
Салдат і захмялелы афіцэр.
Ускрыкнула жанчына:— Мой Мікіта,
З табой мы неразлучныя цяпер.

Цалуе потны лоб.— Ды ты ў гарачцы,—
Кладзе на скронь настылую руку.
— Не дзіва, Саша, дзень пры дні на тачцы
Важу руду на лютым скразняку.

Яна трымае любага за плечы
І ціха шэпча:— Я з табой навек...
— Развітвайцеся! Кончана сустрэча! —
Нібыта шабляй, афіцэр адсек.

Жанчына ледзь стрымала хваляванне,
У зрэнках бліснуў ледзяны агонь,
І непрыкметна Пушкіна пасланне
Паклала мужу ў жорсткую далонь.

Натхнёны верш бадай што на край свету
Прывезла Мураўёва нездарма:
З тае хвіліны вераю паэта
Жыла і хвалявалася турма.

Заходзіліся сэрцы, як на плошчы,
Калі прыйшла жаданая пара,
Калі і залп і барабанаў пошчак
Спалохалі расійскага цара.

Выстуквалі начамі катаржане
За словам слова, за радком радок,
І кідала ад грознага паслання
Ахоўнікаў то ў жар, то ў халадок.

Спынілася графіня за парогам,
Куды ні гляне — свет сцінае зло.
І толькі ў цёмным небе над астрогам
Палярнай зоркі яркае святло.

Правальваюцца ў снезе чаравікі,
Губляецца сцяжынка уначы,
А ў стражнікаў няма такое звычкі,
Каб хоць жанчыне ў горы памагчы.

Яна масціла ля астрога сцежку,
Што замасціць не здолела казна,
Яна хавала слёзы за усмешку,
А гора выдавала сівізна.

Яна лячыла боль ласкавым словам,
Іскрылася праменьчыкам святла —
Для вязняў Аляксандра Мураўёва
Сумленнем і надзеяю была.

III

Надзеяй і сумленнем засталася,
Няскоранай і кволай, як дзіця,
І не хавала ў маладушным страсе
Яна чарнавікі свайго жыцця.

Жыццё ніхто наноў не перапіша,
Не выкрасліць пакутныя гады,
Уратаваць не здолее ў зацішшы
Сябе ад нечаканае бяды.

Быў кожны дзень цяжкою заваёвай
Кахання, вернасці і шчодрай дабраты:
Паехалі ў Сібір сяброўкі Мураўёвай,
Спаліўшы за сабою ўсе масты.

Вясёлую на людзях Аляксандру
У адзіноце немачы гнялі:
Балела сэрца, набухалі гланды
І прыстывалі ногі да зямлі.

За мужам вандравала па Сібіры,
Але яшчэ не верыла сама,
Што, як гадзіннік з адарванай гірай,
Прабіла дваццаць восьмая зіма.

Ужо не ўстаць. Рука, як у шкілета,
Падняць не можа кубачак вады,

Туман заслаў яе дзяцей партрэты,
І свечка дагарэла назаўжды.

Нібы прысуд, жалобны звон ударыў,
Пагостам стала стылая гара,
І кожны раз за новаю ахвярай
Сачыла здань няўмольнага цара.

Так з веку ў век у памяці суровай,
У вернасці каханню і красе
Жывая Аляксандра Мураўёва
Свой боль, і гнеў, і радасці нясе.

Змяняліся цары, адзін другога варты,
Мяняліся крыжы і ардэны,
Падвуснікі, бароды, бакенбарды,
Але звінелі тыя ж кайданы.

На Ангару, на Енісей, на Шылку,
У ціхае сяло на рэчцы Шуш
Няскораных у катаргу і ў ссылку
Жандары гналі сотні соцень душ.

За імі даўнім шляхам без вагання,
У замець ад сяла і да сяла,
Як вера, як надзея,
у выгнанне
Бязмежная любоў услед ішла.

З гарачым сэрцам, з яснымі вачыма
І праз гады яна усім відаць...
Перад святою рускаю жанчынай
Гатовы кожны на калені стаць.

## ПАЭТЫ

Чаму цары баяліся паэтаў
І распіналі кожны раз?
Адважных пазбаўлялі эпалетаў,
Пад кулі гналі ўпартых на Каўказ,

У Нерчынск, у Іркуцк і Шылку,
Каб у капальнях замаўчаў і чэз,
На неслухаў, адпраўленых у ссылку,
Знаходзіўся Мартынаў і Дантэс.

Спрадвеку лёс паэтаў горкі —
У Дантэ, у Сервантэса, у Лоркі.

Паэты блаславёныя, жывыя,
Каб мудрае ў вяках тварыць,
І кайданы, і раны нажавыя
Сцярпець гатовыя, каб праўду гаварыць.

Пара царам няўмольным і суровым
Не верыць болей шаптунам сваім,—
На дабрату адказваць шчырым словам,
Каб, як паэтам, верылі і ім.

## ПАПЯРЭДЖАННЕ

Непагодныя дні: ні прасвету, ні сонца,
Толькі вецер гудзе і гудзе увушшу,
І пякельным туманам нябачаны стронцый
Раз'ядае істоту усю і душу.

Я нікольні наступнай бяды не баюся,
Не, Зямля у бязглуздай вайне не згарыць,
Не загіне дашчэнту яна ў землятрусе,
Ні агнём, ні паводкай яе не скарыць.

Нас трывожаць трагічнага лёсу прыкметы,
Што ратунку не знойдзе ніхто і нідзе:
Смерць ідзе па Зямлі, выбіраючы мэты
У паветры, на сушы, у мёртвай вадзе,

Мы патруцім сябе радыяцыяй, газам,
Выесць вочы і душы настылыя дым.
Смерць нячутна ідзе, каб не згінулі разам,
А знікалі, як здані, адзін за адным.

За мільёны гадоў не здалелі скалечыць
Так Зямлю, як яе пакалечылі мы,
І сябе і яе давялі да галечы,
А яна ўсё маўчыць, як цярплівы нямы.

А каб мела язык, як яна б закрычала:
«Пашкадуйце, няшчасныя, хоць бы сябе.
Ці не бачыце вы, што атрутнае джала
І бяздумная пыха ўсё жывое заб'е.

Знікнуць людзі і рэкі, салавей адспявае,
І, магчыма, з галактык убачаць здаля,
Як павольна плыве у Сусвеце нямая,
У адвечнай жалобе пустая Зямля.
Пашкадуйце Зямлю, апантаныя людзі.
Можа, шчасце хоць нашым прапраўнукам
будзе!»

## НЯМІГА

Іду па Нямізе.
Нямігі няма:
Глыбока ў бетоне булькоча рачулка,
Увесну яна не раскоціцца гулка,
Яе не зашкліць, не заснежыць зіма.

І зоры ў Нямізе сябе не пазнаюць,
Праз брук не праб'ецца чарот і аер,
Напіцца не прыйдзе затомлены звер,
Ліні ў глыбокіх вірах не зліняюць.

На дне іржавеюць тупыя мячы,
Пустыя шаломы, каляныя стрэлы.
Тут некага горкая доля сустрэла,
А нехта адбіцца не мог і ўцячы.

Крывёю курыліся поймы Нямігі,
У прорву ляцелі чаўны і стругі,
Пякельны пажар папяліў берагі,
І толькі на свеце нятленныя кнігі,

Як вечныя сведкі пакутнай зямлі,
Расказваюць горкую праўду сурова,
Як замкі і вежы знікалі, а слова
Чужынцы ніяк спапяліць не змаглі.

...Іду па Нямізе адзін уначы
У замеці лютай, калючай і белай,
Здаецца, што свішчуць каляныя стрэлы
І глуха грымяць аб кальчугі мячы.

## АДДАНАСЦЬ

Без жалю і адчаю гавару:
Надыдзе дзень, і я памру,

Пакіну свет, пакіну дом,
З жабрацкім развітаюся дабром,

Пакіну ўсе пакуты і трывогі
І на парозе вечнае дарогі

Пакіну ашуканства і хлусню,
Бо не ўмеў маніць і не зманю.

Застаўся гонар у мяне адзін,
Што я сваёй зямлі грамадзянін,

Што ні ад кога не залежу,—
Належаў Беларусі і належу

І на тым свеце застануся
Адданы толькі Беларусі.

## МЯСТЭЧКА

Цвіце за аселіцай грэчка
У роснай лясной старане.
Далёкае наша мястэчка,
Напэўна, забыла мяне.

А мне яно сніцца і сніцца
У пыле пясчаных дарог,
Апошні званар на званіцы,
Глухі пасівелы Цімох.

Старыя замшэлыя дахі
Гарбарняў, дамоў і адрын,
Сады і садкі каля шляху
І хмельны салодкі язмін.

Да самай апошняе рыскі
Усё тут знаёмае мне:
Пад бэлькаю крук ад калыскі,
Шпакоўня на гулкім гумне.

Складаю далоні і клічу
Равеснікаў даўніх маіх
І юныя бачу аблічча
Жывых і даўно нежывых.

Мяне не пазналі суседкі
Сівога, такога, як ёсць,
Таму запрашаю у сведкі
Забытую тут маладосць.

Калісьці рыпелі качоты,
Плылі пад чаромхай чаўны,
І месяц глядзеў на пяшчоты
Семнаццатай нашай вясны.

Маўчаць і схіляюць галовы
У рэдзенькіх пасмах сівых
Даўно адзінокія ўдовы
Сяброў незабыўных маіх.

У будні і ў гучныя святы
Схіляю і я галаву,

Нібы сапраўды вінаваты,
Што за аднагодкаў жыву.

Смыліць, як у сэрцы насечка,
Як самы шчымлівы радок:
Мястэчка, мястэчка, мястэчка —
Навек дарагі гарадок.

## СІВІЗНА

Як некалі ў далёкія часы,
У сына маці гладзіць валасы.
Прыгледзелася і сказала ўголас:
«Глядзі, сыночак,— пасівелы волас».
Яна крадком слязінку выцірае
І думае: «Якая ж я старая!»
А сын суцешыў: «Мабыць, для красы
На сонцы выгараюць валасы».

* * *

Каго ты цураешся?
Маці сваёй?
Бо рукі яе ў мазалях
І апёках,
Злінялыя вочы,
Ватоўка на ёй,
Застылі струменьчыкі
Поту на шчоках.

Чаго ты стыдаешся?
Слова яе,
Празрыстага, чыстага,
Быццам званочак?
Яна ж не гаворыць,
А ціха пяе:
«Вярніся дадому,
Сыночак».

Цябе не чакаюць
Ужо на сяўбе —
Да іншай работы
Душа прыкіпела.
Глядзі ж, каб хоць
Дома пазналі цябе,
Каб родная маці
Цябе зразумела.

## АПОШНЯЯ

Разбіты комін, парадзелы дах,
Вісіць адна кашуля на вяроўцы.
— А людзі дзе?
— А людзі на кладах.
Туды адправіліся ўсе аднавяскоўцы,—

Азвалася бабуля з-пад радна
З маленькаю сівою галавою.
— Лічы, што дажываю век адна
І гора мыкаю адна-адною.

Так і гібею з году ў год,
Глухою, невідушчаю, слабою.
Адна уцеха — толькі кот,
То з ім сваруся, то сама з сабою.

Гады пытаеце? Усе мае гады
Прабеглі, дзеткі, у бядзе і ў працы,
А час надыдзе, на клады
Самой прыйдзецца дабірацца.
Каб даў Гасподзь хоць дачакацца лета
І свежае з гарода навіны...

А на бабулю весела з партрэта
Глядзелі два прыгожыя сыны.

## АСЕННІЯ ГНЁЗДЫ

Пусцеюць гнёзды ў чорным вецці,
І ўслед за песнямі тугі
Птушыны пух адносіць вецер
На пасівелыя лугі.

Злятае ліст на дол настылы
З чырвоных клёнаў і калін,
Пад воблакі тугія крылы
Нясуць за клінам новы клін.

Іх шлях нікому не вядомы,
Але ў блакітны дзень вясны,
Хоць і не ўсе, але дадому,
Напэўна, вернуцца яны.

Настылыя пустыя гнёзды,
Як хаты без дзвярэй і шыб,
Усцелюць скруткамі бярозы
І парудзелым лісцем ліп.

І бусел заклякоча зранку,
Вяртаючыся на пастой
У незабытую буслянку
Над хатаю даўно пустой.

Пусцеюць гнёзды. За ракою
Мільгнуў агеньчык і патух.
Над неспакоем і спакоем
Ляціць халодны белы пух.

## КАЛЯ ВОГНІШЧА

*Памяці Аркадзя Куляшова*

Мне сняцца твае непрапетыя песні
І вербы над Бесяддзю ў ціхай журбе,
Самотная ў ветраным полі Алеся
Шукае, чакае і кліча цябе.

Цябе ж не даклікацца з дальняй дарогі,
З яе не вярнуцца ніколі назад
На ростані, на курганы і аблогі,
У твой лістабоем завеяны сад.

Зажурыцца восень журбой жураўлінай,
Заплачуць дажджы, загалосіць зіма
Над шляхам Варшаўскім, над горкай калінай,
Дзе вогнішча згасла і прыску няма.

Калі нечакана скацілася знічка
У вечную цемрадзь, у холад ільдзін,
Слязьмі захлынулася ў полі крынічка,
І толькі ўжо ты не заплачаш адзін.

Другія паплачуць. Збяруцца другія,
Распаляць агонь ля Варшаўскай шашы.
У золкія ранні і ў ночы глухія
Ім свеціць святло непагаслай душы.

## ВОСЕНЬ

Сцяжынка збягае з пагорка,
Унізе шуміць лістапад,
І сумна, і крыўдна, і горка,
Што ўжо не вярнуцца назад

У звонкае шчодрае лета,
У водар даспелых суніц,
Дзе столькі яшчэ не дапета,
Дзе столькі гуло навальніц.

Шкада, што назад не вярнуцца,
Што лета прайшло да пары,
Што вербы сівеюць і гнуцца,
Што сцежка збягае з гары.

І толькі адно засталося —
Прыпомніць усё, што было...
Сцяжынка збягае у восень,
Кароткае лета прайшло.

## АПУСЦЕЛЫЯ ПАРКІ

Фантаны змоўклі,
Апусцелі паркі,
Не засталося нават ліхтароў,
І толькі водзяць мопсы і аўчаркі
На павадках сваіх гаспадароў.

Трава няскошаная стыне,
Іскрыцца павуціна на галлі,
На пачарнелым бэзе і язміне
Пасядуць хутка першыя гілі.

Яшчэ шуміць апалая лістота
І з кожным ранкам пахне саладзей,
Азімак-дуб не скінуў пазалоту
І журыцца, што стала менш людзей,

Што многія датлелі, як агаркі...
Пусцеюць душы,
і пусцеюць паркі.

## ГЛУХАТА

*С. Г.*

Я непрыкметна глухну пакрысе —
Не чую ні пахвал і ні праклёнаў,
Але часцей сумую па красе
Сапраўднай музыкі натхнёнай.

Мой слых і навальніцу заглушыў,
Сірэны гул і трубны рык ласіны,
Але дайшоў таемна да душы
Трывожны шэпт асенняе асіны.

Не чую «зорак» буйных і малых,
Калі яны равуць, калі крычым мы,

Калі знікае безнадзейна слых,
Я чую ўсё і сэрцам і вачыма.

Я глухну ад бязлітасных прамоў,
І дэманстрацый слухаць не хачу я,
Ні выбухаў, ні стрэлаў, ні грамоў,
А салаўя і звон пчаліны чую.

## ЗАКАХАНЫМ

Гляджу на маладых і закаханых,
Нібы здалёку на сябе гляджу,
Вясновай стомаю закалыханы
І шолахамі першага дажджу.

Здаецца, расхінаю гронкі бэзу,
Што расцвіце сягоння давідна,
І праз густы шыпшыннік пералезу
Да цёмнага высокага акна.

Дрыжаць на шыбах кропелькі і зоры,
І маладзік глядзіць у твой пакой.
Ты расхіні хоць напалову шторы
І ўсмешкай сэрца супакой.

Далёкае прыпомніцца, як сёння,
Хоць зморшчыны не сцерці на ілбе
І сівізна пасерабрыла скроні
Не толькі у мяне, а і ў цябе.

Мінула ўсё, і казачная стома
З табою разлучыла назаўжды.
Дзе ты цяпер? Нікому не вядома,
І назаўсёды страчаны сляды.

Успамінаю даўнія гады я
І шчасце ад вясны і да зімы...
Шкада, калі такія маладыя
Расстануцца дарэмна, як і мы.

# ЗАІНЕЛЫЯ ЖУРАВІНЫ

*З паэмы «Ростань на світанні»*

7 студзеня 1901 года славутая паэтэса Леся Украінка прыехала ў Мінск да свайго лепшага друга і аднадумцы хворага Сяргея Мяржынскага і даглядала яго да апошняга дня — 3 сакавіка.

На колішнім Траецкім рынку, купляючы для Сяргея журавіны, яна разгаварылася з Дамінікам Луцэвічам — бацькам будучага Янкі Купалы.

Цяпер у Мінску ёсць вуліцы імя Лесі Украінкі і Сяргея Мяржынскага.

Надыдзе час, і кайданы спадуць,
І ўстрапянецца у палёце песня,
І вырвецца з няволі, як рыданне,
Што доўга стрыманым было
У таямніцах сэрца.

*Леся Украінка. Рытмы*

## *Нядзеля, 14 студзеня*

Гудзе Траецкая гара,
Крычыць, галёкае, смяецца.
Якога тут няма дабра!
І ўсё, што трэба, прадаецца.

Вішчаць на санях парсюкі,
Іскрыцца на марозе сала,
Шумяць цыбульныя вянкі,
З аглобляў лыка пазвісала.

Катрынка плача і пяе,
І папугай ружовай масці
Няшчасным шчодра прадае
Пяцікапеечнае шчасце.

А ў самым цэнтры, на буі,
Каб лепей бачылі і чулі,
Ў далонях свішчаць салаўі
І алавяныя зязюлі.

Пад пугаўём звіняць глякі,
Як ветразі, шумяць шпалеры,
Пяюць сляпыя жабракі
Пад плач патрэсканае леры.

Даёнкі хваляць бандары,
Гандлююць зёлкамі бабулі,
На рушніках ляжаць сыры,
У сіце — куханы з цыбуляй.

Прывёз, нібы лясун стары,
Дзядок настрамак акалоту,
Як лес, аглоблі угары.
І ўсё прапахла конскім потам.

У тлуме рогату і кпін
Сярод кашоў, гладышак, клункаў
Старанна Леся журавін
Шукае, быццам паратунку.

— Сюды, паненачка, сюды,
Дарэмна не тапчыце рынку,
Зірніце, як з тае грады,
Як боб, з Лагойску журавінкі! —

З падпаленай бародкай дзед
Разгаварыўся не на жарты
І Лесі ягады як след
Усыпаў болей за паўкварты.

— Яны за Селішчамі ў нас
Растуць, бывае, па арэху.
Прыедзьце, калі будзе час,
На саладзейшыя, з-пад снегу.

Мы іх збіраем па кашу,
А ўродзяцца, не знаем ліку.
Да нас збярэцеся, прашу,
Спытайце дзядзьку Дамініка.

А мой старэйшы хлопец, Ясь,
Сам з галавы складае вершы.
Вунь і сусед схлусіць не дасць,
Што быў і ў школе самы першы.

Калі б вы, панечка, змаглі
Паспагадаць чужому гору,
Дык, можа б, хлопцу памаглі
Убіцца ў нейкую кантору.—

— Я ведаю, як цяжка жыць,
Бо і сама такога роду.
А сын павінен перш служыць
Замардаванаму народу.

Хай піша, чым душа гарыць,
Шукае сілу ў кожным слове
І не забудзе гаварыць
На матчынай пявучай мове.

Падзякавала і пайшла,
Сказаўшы, можа, для прыліку.
І ўсё ж нялёгкую дала
Яна задачку Даменіку.

Пад крутаярам — стылая рака,
Над пелькай — крыж ружовы з лёду.
Зірнула Леся, і рука
Зайшлася, як на непагоду:

Прыпомніла у Луцку дом стары,
Які дасюль адведаць не збярэцца,
Вадохрышча, і вецер на Стыры,
І сцюжу, ад якой не адагрэцца.

Баліць слабое цела дзень пры дні,
А сэрца палымнее несціхана,
Бо самы блізкі з блізкае радні —
Яе і аднадумца, і каханы
Згасае, як агарак васкавы,
На дзікім ветры у нягоду,
Але гатовы, хоць і ледзь жывы,
Аддаць душу за шчасце і свабоду.

Яна б сама усю да кроплі кроў
І ўласнае жыццё ахвяравала
За мінскіх змардаваных гарбароў,
За кіеўскіх рабочых з «Арсенала».

Спяшаецца з Траецкае гары
Да страшнае пакутніцкай пасцелі.
Застылі рукі, а душа гарыць,
Ад сцюжы журавіны заінелі.

* * *

Люблю зямлю, што пахне лесам,
Люблю густой жывіцы дух,
Вільготны водар свежых трэсак
І скрыпеню ружовы пух,

Зялёнае святло іглiцы
І пах сунічнае расы,
Што, як іскрынкі навальніцы,
Усе асыпала лясы.

Люблю сівых дубоў калоны,
І соснаў стромкія ствалы,
І мёду поўныя калоды,
І звон нястомнае пчалы.

Я сок бярозавы з надрэза
Губамі прагнымі лаўлю.
І рэкі, што прапахлі лесам,
І зрубы звонкія люблю.

Здавён зялёнаю, лясною
Завецца наша старана,
І пахнуць звонкаю сасною
Калыска, хата і труна.

## НА ТАЕЖНАЙ ДАРОЗЕ

Вецер вые ў заломах рудое кугі,
Завіруха шляхі замятае дазвання,
Па дарогах блакітнай сібірскай тайгі
Ледзьве чутна рыпяць адзінокія сані.

Ад сяла да сяла каля сутак язды —
Ні жывое душы, толькі вецер калматы
Замятае пры самай дарозе сляды,
Што прабіў праз сумёт адзінокі сахаты.

Пры дарозе гудуць ледзяныя слупы,
Вецер тонкую пражу снуе на сумёце.

Завіруха лютуе. Глядзіш, як сляпы,
І на конях, здаецца, прымерзлі аброці.

Завіруха лютуе, мяце і мяце,
Закавала сасоннік у белыя латы.
Але ў змроку на доўгай трыццатай вярсце
Мільгануў аганёк адзінокае хаты.

Над высокім сумётам пакатай страхі
Нахілілася голае шэрае вецце,
І у змроку глухой і бязлюднай тайгі
Два акенцы да самае раніцы свецяць.

Увайшоў, пагукаў і — нікога нідзе,
На камінку яловы смаляк дагарае.
Каля печы — карэц у крынічнай вадзе,
Соль у шклянцы і свежага хлеба акраец

На шырокім і чыстым піхтовым стале,
На паліцы — газеты за першае снежня.
Нехта печ напаліў і паехаў далей,
І сляды прападаюць у замеці снежнай.

Нехта хлеба пакінуў і трэсак насек,
Запаліў каганец, каб у змроку не збіўся
Незнаёмы, ды блізкі яму чалавек,
Што прыстаў, перамёрз і дарэшты змарыўся.

Вось і я, абагрэўшыся, дровы прынёс,
Хлеб паклаў на стале, пастаяў ля парога.
Завіруха сціхае, мякчэе мароз,
І далёкая болей не страшыць дарога.

## ЛАСІНЫ СЛЕД

На досвітку па хрусткай стыні,
Паміж алешын і асін,
Страсаючы рагамі іней,
Брыдуць мацёрыя ласі

І ловяць мяккімі губамі
Тугія парасткі альхі.
Над пасівелымі гарбамі
Ляціць слупамі снег сухі.

На досвітку у лесе ціха,
Курыцца сіняя імгла,
Але трывожная ласіха
Угору вушы падняла,

І праз завеянае вецце
Глядзіць за снежныя валы
І слухае, як свішча вецер
У варанёныя ствалы.

І лес, і снег у чыстых зорах,
У срэбных пацерках кусты,
Але ласіха чуе шорах,
І скрып, і пах за тры вярсты.

Завея замяла дарогі...
Якочуць недзе ганчакі,
Закінуў лось на спіну рогі,
Бяжыць ласіха ў хмызнякі.

Праз буралом і крутаяры,
Шарпак ламаючы таўсты,
Яны ў гушчар ляцяць у пары
І ў кроў зразаюць капыты.

Гарачы след у змроку тоне.
З густое снежнае імглы
Шуміць шалёная пагоня,
І свішча вецер у ствалы.

Дыміцца сцежка колкім снегам,
Клубамі сцелецца гання...
На стрэл гушчар азваўся рэхам.
І ўсё замерла. Ці-шы-ня.

Адразу стала пуста ў лесе,
Смала іскрыцца на кары,
І толькі кроў на стылым снезе
Гарыць палоскаю зары.

## НА СІБІРСКІМ ТРАКЦЕ

Коні захлынаюцца ад сцюжы,
Лейцы задубелыя трашчаць,
Завіруха вые, свішча, кружыць,
Сцішыцца, каб нанава пачаць.

Сыкае сухімі языкамі,
Засцілае снегам белы свет,
Шчэрыцца халоднымі клыкамі,
Следам замятае белы свет.

Коні захлынаюцца ад ветру,
Грузнуць у сумётах, шыі гнуць.
Хоць бы чатырнаццаць кіламетраў
Завідна да вёскі дацягнуць.

І нягода кожная мінае:
Вось на ўзгорку — пяцісценны дом
З заінелай шыльдаю «Чайная»,
З песнямі, гармідарам, вінам.

У зацішным нізенькім прыгоне
Ціха і глыбока, як праз сон,
Уздыхаюць змораныя коні,
Хрумстаючы сенам і аўсом.

У чайной накурана і цесна,
Звалены ў парозе кажухі,
Хмельная прастуджаная песня
Аж займае кожнаму духі.

Тут гамоняць і пяюць не меней,
Тут на сотні вёрст усе свае,
Шклянкі і гарачыя пельмені
Статная кухарка падае.

Леснікі, шафёры, лесарубы
За яе здароўе п'юць да дна.
Сцюжаю апаленыя губы
Ціха шэпчуць: «Ты ў мяне адна...»

Скачуць хлопцы каля дзеўкі,
Сыплюць жарты і прыпеўкі:

Ой ты, Машка, ой ты, Машка,
Я цябе адну прашу,
Каб замест густое бражкі
Падарыла мне душу.

Вось табе пельмені з перцам,
Вось кажух твой і піла,
І чашы дамоў, бо сэрца
Я другому аддала.

Павяла крутым плячом дзяўчына,
У вачах — усмешачка і злосць,
А з парога яснымі вачыма
Усміхаўся заінелы госць.

Можа, стала дзеўчыне няёмка,
Мо чакае любага даўно...
Толькі ўсе пачулі, як пазёмка
Білася ў настылае акно.

Павітаўся хлопец па парадку,
Юшкі папрасіў і чабака...
А ў вачах Кучумавых нашчадкаў
Бліскалі іскрынкі Ермака.

## ШАМАН

*Памяці паэта Івана Ласкова,*
*пахаванага ў Якуцку*

То ў бубен б'е, то скача,
То канае,
То кліча духаў з пекла і нябёс,
Звініць шамкамі
І камлае —
Прарочыць шчаслівейшы лёс.
Падскочыўшы, заплюшчыць вочы
І абвядзе за кругам круг,
Слязу страсе, то зарагоча:

Ён — служка
І ўладар пакорных слуг,
Захопленых саміх сабою,
Магутных славіць, а слабых кляне,
Чаруе танцам, бубнам, варажбою,
То замармыча, як у страшным сне.
Глядзяць зачараваныя тунгусы,
Як, выпетраны, кружыцца шаман
З надзеяй на заклёны і спакусы,
На абяцанні і падман.
Жыць, лічаць, без шаманаў немагчыма
У тундры ні старым, ні маладым
І не ўглядацца вузкімі вачыма
Праз слёзы і кізячны дым.
У бубен б'е шаман і плача,
То зарагоча ля кастра,
Што прыйдзе некалі удача —
Яго надзея і яго пара.

## МАЁ БАГАЦЦЕ

Я трацІў усё без звароту
Не раз, і не два, і не тры,
У гулкія стукаў вароты,
Чужыя абходзіў двары.

Казалі — работнік не трэба,
Начлежнікам — месца няма,
Галодным скарыначкі хлеба
Нідзе не давалі дарма.

О, божачка, колькі я траціў!
Знайсці ж анічога не змог
І рана у матчынай хаце
Пакінуў стаптаны парог.

Гайдаўся, як тычка у полі,
Нібы чарацінка ў трысці.
Ні скарбу, ні лепшае долі
Ніколі не здолеў знайсці.

З дзівацкага я пакалення,
За самых працейшых працэй
І толькі не страціў сумлення,
Таму я за ўсіх багацей.

А страчу сумленне, ад страху
Пустая душа задрыжыць,
Зайдуся ад зайздрасці птаху,
Што ўмее сумленна пражыць.

## ДУША

Мяне выхоўвалі і перакоўвалі.
Я то з'яўляўся, то знікаў,
Мяне на сцюжы загартоўвалі.
Я і да сцюжы прывыкаў.

Часамі ў цягніках пад пломбамі,
Нібы каштоўнасць, бераглі
І неба клеткамі і ромбамі
Размалявалі, як маглі.

Мяне ўзважвалі і мералі,
Здымалі ў профіль і анфас,
Але ні разу не праверылі
Душы наяўнасць і запас.

Шкада, што не здымаюць копію
З яе юрысты і ўрачы,
І ні адна дактыласкопія
Не можа тут дапамагчы.

Мая душа супрацiўлялася,
Бо верыла і тым жыла,
Не чэрсцвела і не ламалася —
Была такою, як была,

Хоць дзіўна, ў чым яна трымалася,
А паспрабуй яе сагні!
Яна ж з маленства гартавалася
На чыстым, праведным агні.

* * *

Я — малады, пакуль жывая маці:
Ссівелага яна заве: «Сынок»,
І тупае, і тупае па хаце,
Здымае з куфра клямку і замок.

Усё адчынена — і сэрца, і шуфляды,
Дыміцца з цёплай бульбай чыгунок.
Я ўзрушаны, расчулены і рады,
Пачуўшы зноў: «Дзіцятка і сынок».

І за надзеяй свеціцца надзея,
Хоць непрыкметна час бяжыць,
А мне здаецца — маці маладзее
З адзінай прагай жыць і жыць.

А грымнуў гром. І маці рукі
На сэрцы склала без пары...
Я не забуду мудрае навукі
І зразумею, што і я стары.

Расстануся з хацінаю пустою
І ў белы свет падамся сіратою.

## МАЯ РАДАСЛОЎНАЯ

Сваіх не ведаю вытокаў
І радаслоўную забыў:
Здаецца, дзед быў так далёка,
Не ведаю, кім прадзед быў.

Забыты прашчураў магілы
І грозных вояў курганы,
Свае няскораныя сілы
Нашчадкам аддалі яны.

У радасці, бядзе і горы,
У змроку ветраных начэй
Глядзяць прапрадзеды на зоры
З маіх зажураных вачэй.

Маё здзіўленне — іх здзіўленне,
Іх неспакой — мой неспакой,
І ловяць прашчуры праменні
Маёй гарачаю рукой.

А кім яны былі калісьці,
У гэтакі далёкі век?
І як яны шукалі выйсця
З лясоў, з дрыгвы, з разліваў рэк

І з тупікоў чужой улады?
Як іх лупілі цівуны
Па дзікім беззаконні ўлады,
Але ўскрасалі зноў яны?

Не знаю, хто ў маёй аснове —
Вандроўнікі ці асначы —
І хто ў маім азваўся слове —
Радзімічы ці крывічы.

А можа, ў грэнадзёрскай шапцы,
Ў мундзіры на заморскі лад,
Прыйшоўся да душы прабабцы
Напалеонаўскі салдат?

Магчыма, ёсць пачатак польскі?
Аднойчы, мне зірнуўшы ў твар,
Віталі Фрыдрыхавіч Вольскі
Сказаў, нібыта я з татар.

Усё магчыма, ўсё магчыма,
Калі згубіўся продкаў след,
Калі наіўнымі вачыма
Гляджу, як і яны, на свет.

І тым заўсёды ганаруся,
Што у шчаслівую пару
Я нарадзіўся ў Беларусі
І так, як продкі, гавару.

## ПАВАЛ

Яшчэ не патрывожаныя намі,
Не верачы ў пагібель без пары,
Зачараваныя завеямі і снамі,
Яны маўчаць да студзеньскай зары,

Глядзяць, нібыта літасць просяць,
Слязінкамі скацілася смала,
Трывожны пошчак ледзь даносіць,
Як снег рыпіць і дзесь звініць піла.

Яны стаяць, магутныя, на ўзлессі,
А побач тлее учарашні хлуд,
І лесарубы з піламі, як змеі,
Сыходзяцца, каб выканаць прысуд.

Яшчэ паўзмрок і снег не абтаптаны,
А ўжо кастры палаюць і гудуць...
Пахукаем на рукі, і тытаны,
Ламаючы падлесак, упадуць.

Я не спяшаюся, я пазіраю з жалем
На гонкі стан і пасівелы чуб,
І раімся, куды і як павалім,
А пара застывае каля губ.

Бяру настылую і вострую сякеру,
А мне сумленне шэпча: «Не валі»...
Я поглядам яе да вецця змераў,
І... паляцелі смольныя скрылі.

Піла ўпіваецца ў жывое цела.
Пакутую, хоць не мая віна.
Піла звініць, і... па-ля-цела
У снежны дым з праклёнамі сасна.

За ёй — другая, трэцяя, дзесятак
Кладзецца, як гарматныя ствалы,
І капаюць на снег з ружовых пятак
Слязінкі бурштыновае смалы.

О, Божа, Божа! Колькі я іх сплюжыў,
Шкадуючы, ў заснежанай глушы.

Магчыма, каменем адзіным ляжа
І застанецца грэх той на душы.

Гады міналі, адгулі завеі,
Адкочваўся за валам грозны вал.
А як успомню, сэрца млее,
Што не канчаецца яшчэ павал.

## НАЙЛЕПШЫ ТВОР

За Уралам, за белай тайгою
Кожнай шыбай, зашклёнай ільдом,
Пазірае у замець з тугою
Мной калісьці пастаўлены дом.

Хтось рыпучыя топча масніцы,
Замятае на ганку сляды,
І нікому цясляр не прысніцца
У пару і пакут і бяды.

Кожны вугал трашчыць на марозе,
Вецер свішча ў расколах тайгі.
Хто ж ступае па хісткай падлозе,
Я гадаю у вечар даўгі,

І прыпомню стажок пад павеццю,
Завірухай замецены двор,
І шчаслівы, што некаму свеціць
Мой найлепшы пакінуты твор.

## КОНІ

У цокаце, тупаце, звоне
Па гулкай вячэрняй зямлі
Ляцяць закілзаныя коні
І срэбныя мнуць кавылі.

Імчацца гарачыя коні,
Падковы звіняць і звіняць,
На белай і чорнай папоне
То месяц, то зоркі гараць.

Прароку ў шалёнай пагоні
Усё да драбніцы відно —
І коннікі ў шлемах, і коні,
Што недзе прысталі даўно.

Галодная зграя завые,
У зрэнках агні замігцяць...
Крылатыя коні, жывыя
Ляцяць ад пагоні, ляцяць.

## САКСАФАНІСТ

Іграў на рынавым стракатым фоне
Заслужаны артыст на саксафоне.
Яму было на золку не да сну —
Завейваў снег густую сівізну.
Гучалі вальсы Штрауса і туш,
І падалі рублі часамі ў капялюш.
На лютай сцюжы ледзянелі пальцы,
У кедах ногі стылі на асфальце,
А ён іграў то маршы, то сюіты,
Як некалі, дзеля чыноўнай світы.
І вось нарэшце атрымаў свабоду
Іграць, што хоча, простаму народу.
Іграў натхнёна, як заўжды,
Перабіраў настылыя лады.
Забыўся ён на колішняе званне
І не сыходзіў з месца да змяркання.
«Адзначыліся» сорак тры душы
Ў паношаным яго капелюшы.
Я непрыкметна, быццам цень,
Яго прыходзіў слухаць кожны дзень.
Але замоўк раптоўна саксафон...
Міналі тыдні. Не прыходзіў ён.
Стаяў базарны лямант, як бывала,

А мне усё чагосьці не хапала.
Расказвалі, што нават і на-сконе
Ён ціхенька іграў на саксафоне,
Што засталася ў музыканта змена,
Што сын іграў жалобны марш Шапэна
І не змаўкаў да самае імшы...
Гудзе базар, ды пуста на душы.

## ТОСТ

Даўней пілі за тых, што ў моры,
Каго дратуюць штормы і мароз,
Я келіх узніму за тых, хто ў горы
Не выплакаўся да апошніх слёз.

І без ваганняў вып'ю чарку
За вечную гарэтніцу-ўдаву
І за нястомную даярку,
За кошт якой і я жыву,

І за настаўніцу, што слепіць вочы
Над сшыткамі і глупствам справаздач,
Што ў класе усміхаецца, а ноччу
Ніхто яе не чуе плач.

За вокнамі заходзіцца завея,
І дамавік грукоча па страсе,
А прыгажуня юная сівее
І, не расцвіўшы, вяне пакрысе.

Я п'ю за тую, што не стане маці,
Сагнутую у дваццаць восем год,
І горка плачу, бо у кожнай страце
Знікае непрыкметна мой народ.

Няма шампанскага, дык вып'ем квас
За ваша будучае і за вас.

## МОЙ СВЕТ

Тады сваіх здабыткаў кайстру,
Што не дабраў, што стойваў сам,
Я перадам другому майстру,
Другому сэрцу перадам.

*Уладзімір Хадыка*

Я бачыў свет:
Бадзяўся па тайзе,
Лятаў, і пада мной
Плылі аблокі.
Мае гады
Мiналі па чарзе,
І я не быў ніколі
Адзінокі.

Я бачыў свет:
Везувій у смузе,
І форумы і дворыкі
Пампеі,
На хаце — бусла
На адной назе,
Слату, і спёку,
І завеі.

Прыпамінаю часам
Змрок густы,
Глыбокае,
Суладнае дыханне,
Часамі быў то грэшны,
То святы
Ў палоне нечаканага
Кахання.

Я бачыў Таўэра
Замшэлыя муры,
Варон з падрэзаным
Крылом, нясмелых...
Я бачыў Мікеланджэла
Дары
У цішыні Сіксцінскае
Капэлы.

Я колісь быў
Асушку хлеба рад.

Я ўсе драбніцы
Ў памяці збіраю:
Лаваш і спелы
Вінаград
Каля «фантана слёз»
Бахчысарая.

Я бачыў акіян
І горы,
Ішоў над прорваю,
Як па лязу,
Пачуўшы «Рэквіем»
У цішыні сабора,
Не мог стрымаць
Гаручую слязу.

Я тры разы экватар
Абышоў,
Калі ў адну злучыць
Усе дарогі.
Чаго шукаў,
Не ўсё знайшоў,
Апроч надзеяў
І трывогі.

Я бачыў з нараджэння
Белы свет,
Бязлітасны, ласкавы
І крывавы.
Калі ж замкнецца круг,
Мой непрыкметны след
Укрые снег
Або густыя травы.

Спакойны я:
Жыццё ідзе кругамі.
Пабачыць свет
Нашчадак без мяне —
За доўгі век
Нястомнымі нагамі
І ён экватар
Тройчы абагне.

* * *

Незавершаны верш — маладое віно
Без іскрыстага клёку і сілы,
А калі праз гады устаіцца яно,
Ад глытка праразаюцца крылы.

Калі ў склепах само па сабе адшуміць,
Калі ў бутах і чанах астыне,
Не спяшайся яшчэ, не каштуючы, піць,
Калі ўсё не сышло шумавінне.

Пах і смак вінароб давядзе,
І аддзячаць яму пры нагодзе,
Калі келіх у радасці або ў бядзе
На бяседу збярэ ў наступным стагоддзі.

Так і верш, калі ён, як віно, не даспеў
І здалася няўдача удачай,
Захлынецца натхненне і радасны спеў,
Бо у келіху — горкая чача*.

* * *

Тваe далоні пахнуць першым снегам,
А познімі антонаўкамі — снег,
Над цішынёю нечаканым рэхам,
Званочкам коціцца дзявочы смех,

Што заблудзіўся у блакітнай ночы
За белаю застылаю ракой,
І радасць бесклапотную прарочыць,
І першага кахання неспакой.

Па-стой... Паслухаем і пазайздросцім,
Пакуль праменьчык радасці не згас
Бяздумнай і вясёлай маладосці,
Якой не будзе больш у нас.

---

* Самаробнае пітво з вінаградных адходаў.

## ПАКАЯННЕ

Дарагая! Ну, вось мы з табой і сівыя.
Дачакаліся ўнукаў, а шчасця чакаем дарма:
За акном то дажджы, то завея завые,
То пастукае ў дзверы сівая зіма.
Мы з табою жылі пад захмараным небам.
Нам здавалася — шчасця з гарчынкай стае,
Як настылае лусты казённага хлеба,
Як усмешкі, як горкай слязінкі твае.
Мы чакалі сустрэч, але толькі разлукі
Чарадою адна за другою ішлі,
Сэрца сэрца шукала, а кволыя рукі
Нечакана шурпатыя рукі знайшлі.
Маладосць нечакана ўваходзіла ў сталасць,
І з паўслова душа разумела душу.
На апошнім вітку нам чагось не ставала...
Я і суд над сабой і расправу вяршу
І караю сябе за пралікі і страты
І за тое, што толькі адзін вінаваты.
Нас калісьці лічылі шчаслівымі ў свеце:
Гасцявалі ў сяброў і збіраліся ў нас.
Мы любілі дзяцей, шанавалі нас дзеці,
А з гадамі і гэты агеньчык пагас.
На апошняй вярсце, на апошнім парозе
Сэрца сэрцу патрэбна, рука — саслабелай руцэ,
Каб у згодзе прайсці, што яшчэ засталося,
Покуль знікнем бясследна у вечнай рацэ.
Ты прыйшла на Зямлю пад каляднаю зоркай.
Я цябе не збярог, нас не мілуе лёс.
Як цяпер ні балюча, ні цяжка, ні горка,
Ты ўсё церпіш адна і маўчыш, як Хрыстос.
Дай табе Усявышні хоць трошачкі шчасця,
Без трывог, і пакут, і бяссонных начэй,
Каб яшчэ пратрымацца, каб разам не ўпасці,
Покуль дзецям і ўнукам не стане лягчэй.
Божа, дай табе сілы да новага веку
Як святому, няскоранаму чалавеку.

## КРЫЛО — ДА КРЫЛА

Яшчэ адзін месяц закрэслю
Я ў табелі-календары,
А мне за любоў і за песню
Усмешку хоць ты падары.
Нас цёплыя грэлі пракосы,
Над намі аблокі плылі,
Як з келіха, срэбныя росы
Мы з белай лілеі пілі,
Шаптала на досвітку вецце
Нам зачараваныя сны,
Нібы ў супакоеным свеце
Былі мы з табою адны.
Юнацкае лета далёка,
Як ціхая песня без слоў,
І толькі — ўстрывожаны клёкат
Зажураных ранніх буслоў.
Я веру у сны і не веру:
Было яно ці не было,—
Пах спелых суніц і аеру,
Ці ўсё назаўжды адышло?

Навошта расчуліўся сёння,
І памяць ізноў ажыла:
Ў тумане — начлежныя коні,
Ў буслянцы — крыло да крыла.

* * *

Алены, Броні і Надзеі,
Хаваліся мы колісь, як зладзеі,
За шатамі то бэзу, то язміну
У самую шчаслівую хвіліну.

Як толькі нашы сэрцы затрымцелі,
Не зразумелі мы, чаго хацелі,—
Цягнуліся да вуснаў вусны,
І першы пацалунак быў спакусны.

Гарачыя дрыжалі рукі,
Не ведаючы, ад якое мукі,
Жытнёвай сцежкаю хадзілі да світання,
Сціраючы расінкі развітання.

Раскідалі нас нечакана лёсы,
Гады пасерабрылі вашы косы,
А я запомніў вас па школе
І не забыў нікога і ніколі.

Даходзілі часамі пагалоскі,
Што зніклі вы, хто з горада, хто з вёскі...
У полі наша зрэзана калоссе,
І нас на свеце мала засталося.

Даходзяць сумныя часамі весткі
То ад унука, то нявесткі,
Што я шукаю вас дарма,
Што вашы сцежкі замяла зіма.

А я вас юнымі запісваю у святцы
І стаўлю свечкі Божай Матцы.
Я хутка ўслед за вамі панясу
І вашы воблікі, і вашую красу.

## ВЯРТАННЕ

Усё вяртаецца назад,
Пагодных дзён не засталося,
І Млечны Шлях і зарапад
Прыносіць нечакана восень.

Ляцяць пажоўклыя лісты,
Счарнелае намокла вецце,
Сумуюць поле і кусты
Па ціха дагарэлым лецце.

Вось-вось ударацъ халады,
Завея навылёт прастружа,
Як і ў далёкія гады,
Да сэрца дакранецца сцюжа.

Пра ўсё, што канула даўно,
Напамінае восень глуха,
Што зноў пастукае ў акно
Раз'юшаная завіруха.

Прымроіцца ліпнёвы пах,
Блуканне ў поцемках прысніцца...
У новы дзень пакажа шлях
І да каханай Мілавіца.

## СЦЮЖА

Прадыхаю ў шыбіне вочка,
Зірну на блакітны мароз:
Трашчыць на вяроўцы сарочка,
Як ветразь завейных пагроз.

Вось-вось завіруха завые
І сцежкі усе замяце,
І дзесь хадакі, як сляпыя,
Саб'юцца на дальняй вярсце.

Ад сцюжы душа ледзянее,
Завея гудзе і гудзе.
У сцюжу знікае надзея,
Бязвер'е у прорву вядзе.

Ні сцюжа, ні горкая доля
Маю не астудзяць душу,
І ў дзікай стыхіі ніколі
Я літасці не папрашу.

Лепш рынуся ў вір крутаверці,
Завеі пайду напралом,
Каб шлях не заблыталі чэрці,
Анёл абароніць крылом.

## ПАЛАЕ РЫМ

*Да рымскіх малюнкаў нашага мастака*

Над Рымам ноччу каркала варона:
«Ці чулі вы, ці бачылі Нерона*?»
Я быў на Калізеі, ды не бачыў,
Хоць добра ведаю, чаго ён значыў:
Ён быў відовішчаў аматар,
Калі крывёю захлынаўся гладыятар.
Спрадвеку ўсе Неронавы нашчадкі
Таемна носяць Каіна пячаткі
І на ілбе, і на душы
З дэвізам: «Непакорнага душы».
Са свету маці звёў Нерон,
Хоць узвяла сама яго на трон,
Сенеку данялі абразы і пакуты,
І загадаў яму Нерон прыняць атруты.
Змяняўся час, мяняліся нероны
З каронамі і без кароны,
З учэпістымі кіпцюрамі,
Хоць катамі былі, лічыліся царамі.
Калі патрэбен ты, ён мякка гладзіць,
Непаслухмянага на кол пасадзіць,
Заве падданых сёстрамі, братамі,
Калі маўчаць з заткнутымі ратамі.
Калі б нероны сталі ўладарамі свету,
Крывёю залілі б усю планету.
А баязліўцы, хоць і церпяць мукі,
Ім ліжуць пяты і цалуюць рукі.
У вочы моляць: «Дарагі і мілы»,
А кол асінавы рыхтуюць для магілы,
Маўчаць ад страху, бо няўмольны ён,—
Падпальшчык Рыма, люты кат Нерон.
Палае Рым. Ён рады, воч не зводзіць
І верыць, што няшчасных улагодзіць.
Калі ж нарэшце выпрастаўся люд,
Нерон смяротны вынес і сабе прысуд.
І ўсім багам маліўся урачыста,
Што страцілі у ім вялікага артыста.

---

* Нерон — самы жорсткі рымскі імператар з 54-га па 68 г. Ён знішчыў сваіх праціўнікаў, родную маці, брата, жонку, настаўніка Сенеку. Каб суняць народны гнеў, ладзіў гульбішчы і дармовыя пачастункі, лічыў сябе вялікім артыстам. Скінуты народам, скончыў жыццё самагубствам.

## БЯССМЕРЦЕ

Я не развітваюся з моваю:
Яе не выкрасліць з душы
Ні пастановаю, ні змоваю,
Навідавоку і ў цішы.

Ёй сотні год, а не ссівела,
Хоць і спазналася з бядой,
Яна і плакала, і пела,
А засталася маладой.

Яна жывучая, як песня,
Яна не ведае спакус —
Уваскрасала і ўваскрэсне,
Пакуль жывучы беларус.

## У ЗОРНАЙ ВЫШЫНІ

Душа душу шукала і знайшла,
Ўваскрэсла і другую засвяціла
Праменьчыкам блакітнага святла
Ад недасяжнага Свяціла,

Паклікала, сагрэла, павяла,
Каб на жалобны дзень не азірнуцца,
Каб вуснамі да светлага чала
І да гарачых вуснаў дакрануцца,

Каб стаць яшчэ ласкавей і дужэй
І з першае сустрэчы заручыцца,
Каб з кожнаю хвілінай быць бліжэй
І не заўважыць, як жыццё імчыцца.

Пры месяцы ў блакітнай цішыні
Нам радасці наступныя прысняцца...
Душа душу у зорнай вышыні
Знайшла, каб на Зямлі не разлучацца.

## ЗАВЯЛЫЯ РАМОНКІ

Чаго ў нас толькі не было?
Былі і слёзы, і усмешкі,
Быллём і снегам замяло
Твае сляды і нашы сцежкі.

Куды ні кідаў горкі лёс,
Як ні караў па поўнай мерцы,
Ад патаемных нашых слёз
Рубцы не гояцца на сэрцы.

Ты іх таіла ад мяне,
Я плакаў у таежных нетрах
І спадзяваўся, што міне
Боль на апошніх кіламетрах.

Не, не мінула, не прайшла:
Гады бязладна праляцелі,
І не відаць дасюль святла
Ў канцы халоднага тунеля.

Свайго гнязда мы не звілі,
Рамонкі нашыя завялі,
І мы па-людску не жылі,
А толькі доўга існавалі.

* * *

На ўзлессі дзічка расцвіла,
А ў лесе пуста, гола,
І відна ад яе святла
Зрабілася наўкола.

На ўзлессі у начной цішы
Шуміць густое вецце.
Вось так і ад адной душы
Святлей бывае ў свеце.

# СУСТРЭЧА Ў ПЕКЛЕ З МУРАЎЁВЫМ

*Памяці Кастуся Каліноўскага*

…А толькі гонар выпаў мне належаць
Да Мураўёвых, не да тых, якіх
Калісьці вешалі, а да жывых,
Прыбыўшых з місіяй караць і вешаць.

*А. Куляшоў. Хамуціус*

Не ведаю, ці сон з галюцынацыяй
На схіле невясёлых дзён
Мяне, заморанага працаю,
Звалілі, і прысніўся сон:
Мяне нібыта ў Вільні секлі
Пасля прыдушаных баёў,
Я папрасіўся, каб у пекле
Зірнуць, як правіць Мураўёў.
Нарэшце собіла сустрэцца.
«Прабачце, пане генерал,
Пастаўце лепш смалы вядзерца,
І зробім мы катлом прывал.
Я — не вучоны, не аратар,
Збіраўся больш за сто гадоў
Зірнуць, які быў губернатар
Літоўска-беларускіх гарадоў,
Паветаў, воласцей і вёсак,
Хоць чуў нямала пагалосак:
Казалі, што пры вас народ
Быў запалохана цярплівы,
Бо наваліўся дзікі зброд,
І стаў багаты і шчаслівы,
Ён вытрасаў апошні грош,
Складаючы запасы ў склепе.
Жылося сейбіту найгорш,
А прыхадню — за ўсіх найлепей.
Усё ішло на поўны ход:
Народ зрабіўся без'языкі,
А непакорных дзікі зброд
Караў за плач, лупіў за крыкі.
Служакі добра разумелі,
Каму яны шліфуюць зад,
А самі з боязі нямелі,
Калі траплялі неўпапад,

Выслужваліся, дагаджалі
І жыравалі, як паны,
Так «цёмным людам» кіравалі
Чыноўнікі з «большой страны».
І кожны генерала ведаў,
А на людзей глядзеў сычом
І Кастуся, і касінераў
Касіў і куляй, і мячом.
У скутых голадам і страхам,
Нібы званы, гулі галовы,
Каб генерал зрабіўся прахам
І не ўскрасалі мураўёвы.
А вы настолькі папулярны,
Што людзі аж да гэтых пор
Запомнілі парадак карны,
Як вашай лютасці узор».—
«Па глупству стаў я дзекабрыстам,
Умеў з Рылеевым дружыць,
А зразумеўшы, слаўся лістам,
Каб Бенкендорфу паслужыць.
Выконваў я усе загады,
Што часам лютымі былі,
Каб толькі мужыкі да ўлады
І ў Пецярбург не дапаўзлі».—
«А ці былі на вас паклёпы,
Скажыце шчыра, генерал?» —
«Я быў узорам для Еўропы...
Усё! Пара канчаць прывал.
Бярыце шуфер і рыдлёўку,
А я — вядзерца і пілу,
Каб не засек Люцыфер зноўку
І каб не боўтнуў у смалу.
А што ў вас цяпер чаўпецца
Без нас і мудрага цара?
Ці вуліца дасюль завецца
У гонар віленскага ўладара?» —
«Скажу вам шчыра, акрыяў народ,
Зламаў ярмо і скінуў з выі,
Да лепшай долі з году ў год
Ідуць наступнікі жывыя,
Каб не гібець у вечнай скрусе,
Каб ведалі на ўсёй зямлі
Імя і гонар Беларусі,
А вас клянуць, як і клялі».

## ВЕРАСНІЦА

Не ведаю, чаму дагэтуль сніцца
На Тураўшчыне вёска Верасніца,
Над Прыпяццю зімовыя дубы,
У пасівелым небе — галубы,
Гладышкі і даёнкі на платах,
Гарбузніку і канапляны пах,
Каляндры і завялых мальваў подых
І шум сухога лісця на гародах,
На беразе засмоленыя лодкі
І на вірах лілеі, быццам сподкі,
Гайдаюцца на пацямнелай хвалі,
Дажджынкі, як крыштальныя каралі,
Звіняць па затуманенай вадзе,
Зажураны па вішаі ідзе
Павольна бусел адзінокі
І з сумам паглядае на аблокі,
Што праплываюць нізка-нізка,
Пад імі, як ружанца нізка,
Спяшаюцца у вырай журавы,
Ім высцілае шлях туман сівы,
А наўздагон ракітніку кусты
Шлюць каляровыя паштоўкі і лісты.
Не ўспомню, колькі прастаяў гадзін
Я над асенняй Прыпяццю адзін.
А і дагэтуль часта сніцца
Зажураная вёска Верасніца.
Наўкол — лясы, лясы, лясы
І верасы, і верасы.
Забыцца Верасніцу не магу
І ў памяці, і ў сэрцы берагу.

## БАБІНА ЛЕТА

Ты часта казала, што песенька спета,—
Вясна прамінула, а бабіна лета
Цябе замятае сухімі лістамі,
Што болей ніхто не трывожыць лістамі,

Ніхто не чакае цябе на спатканне,
Ніхто, як калісьці, здалёку не гляне.

А колісь глядзелі, а колісь чакалі,
Спачатку ля школы, пасля на вакзале.
Ты ночы не спала, чакала мінуты,
Калі ён прыедзе дамоў з інстытута.
Да рання сядзелі у скверы, ля клуба,
І доўга смылелі гарачыя губы.

Ты шчасцю свайму пазірала у вочы,
Ты чула, як соладка сэрца стукоча.
Пад ліўнямі вы не баяліся мокнуць,
Хадзіць, аж пакуль салаўі не замоўкнуць,
Глядзець, як знікае каханы ў тумане,
І думаць: «А колькі ж гадзін да спаткання?»

Вы разам чыталі, купаліся, пелі,
І ўсе гаварылі, што хутка вяселле,
А ты жартавала: «Ніколі не позна».
І бегла дадому сцяжынкаю роснай.
Цяпер ты шкадуеш, што ў майскія ночы
Дарэмна сумленна заплюшчвала вочы,

Што сцерлася ў памяці нейкая рыса,
Што болей нікому не скажаш: «Вярніся».
Другога не стрэнеш, другіх не шукаеш,
Калі аднаго назаўжды пакахаеш,
Табе нічыёй не патрэбна спагады,
Што бабіна лета, што час лістападу,

Што косы завеяла першая замяць,
Што нумар застаўся на целе на памяць.
А памяць, яна не старэе ніколі:
Дарога ў Майданак, і голае голле,
І сівер насустрач, і тысячы босых,
Скаваныя рукі, абрэзаны косы.

Куродым, як хмара, вісіць над парканам.
«Як хутка мяне разлучылі з каханым,
Нявестай была, а зрабілі ўдавою...»
Ды свішча бізун над тваёй галавою.
Цябе бессаромна салдаты раздзелі
І ўсе запісалі радзімкі на целе.

У вочы глядзелі і з нейкаю мэтай
Запісвалі прозвішча, рост і прыкметы.
Ты тройчы ўцякала ад смерці і згубы,
Свістала завея ў жалобныя трубы,
Як здані, стаялі касцёлы, фальваркі,
І рвалі дзявочае цела аўчаркі.

Цябе на світанні вялі ў крэматорый,
Апошняя хмарка плыла над табою...
Ды раптам аднекуль чырвоныя зоры
Ляцелі насустрач, як выбухі бою.
Чырвоныя зоркі, знаёмыя твары,
Ласкавыя вочы глядзелі з-пад каскі,
Засмяглыя вусны шапталі: «Та-ва-рыш!»
І падалі слёзы ад братняе ласкі.

Чамусьці сягоння ты ўспомніла гэта —
У час лістападу, у бабіна лета.
...Не ведаеш ты ці паверыць не хочаш,
Што вернуцца зноў салаўіныя ночы,
Што познім каханнем зардеюцца шчокі,
Калі ты пачуеш знаёмыя крокі.

Каханне ніколі нідзе не знікае,
Каханы каханую скрозь адшукае.
Ты чуеш — вясной і асенняю ноччу
Ляцяць самалёты і поезд грукоча,
У дзверы твае нечакана, нясмела
Пастукае любы, ледзь-ледзь пасівелы.

Ты скажаш, што песня яшчэ не прапета,
Што сёння вясна, а не бабіна лета.

## ХВІЛІНА МАЎЧАННЯ

Хвіліна маўчання. Хвіліна маўчання,
І цішыня сцеражэ цішыню,
Толькі на ветры
Жывым хваляваннем
Б'ецца гарачае сэрца агню.

Вочы заплюшчы і памаўчы,
Слухай
Святую хвіліну маўчання:
Спяць ленінградцы,
Спяць масквічы,
Сібіракі, украінцы,
Мінчане.

Разам палеглі яны маладымі —
Сейбіт і дойлід, каваль і паэт.
Неба звалілася ў хмарах і ў дыме,
Глеба асела, рассыпаўся свет.
Сейбіту свежай запахла раллёю,
Дойлід аслеп ад дзівоснай красы,
Выкаваў сонца каваль над Зямлёю,
Песня скацілася кропляй расы.
І цішыня,
Цішыня,
Цішыня,
Кроўная спіць у абдымках радня.
Маці, не плачце,
Вашыя дзеці
Вечна жывымі сузор'ямі свецяць.

Вецер пялёсткі над плошчаю кружыць,
Косы завеяны чэрвеньскай сцюжай,
Сцюжай далёкага чорнага года,
Пылам паходаў
І соллю паходаў:
Муж не вярнуўся,
Сын не вярнуўся,
Плачуць прысады па ўсёй Беларусі,
Плачуць, чакаюць на ўскрайку дарог
Непераможных сыноў перамог.

Людзі! Маўчыце толькі хвіліну!
Людзі па стратах і святах радня,
Думаць павінны, адказваць павінны
За неба, Зямлю і за стронцый штодня.

Людзі! Маўчыце не болей хвіліны.

## БРОНЯ

*Памяці Броні Ліпскай і маіх землякоў, расстраляных фашыстамі ў Глуску каля Мыслачанскай гары.*

Калісьці быў і я ў палоне
Пяшчотнай прыгажуні Броні.
Над Пцiччу, на зялёным вале
Свае пачуцці мы яшчэ хавалі.
Маўчалі на пахіленай вярбе,
І я часамі думаў сам сабе:
«Наўрад ці давядзецца у жыцці
Яшчэ такую слаўную знайсці».
Хіліўся да ружовае шчакі,
Кранаўся непрыкметна да рукі.
Калі ўзнімалася у небе поўня,
Мы адплывалі ў сіні змрок на чоўне,
Плылі павольна на Высокі бераг,
Дзе плёскаліся то шчупак, то жэрах.
Вярталіся з бярэмам бэзу,
І я лічыўся часам за гарэзу:
Туліўся да ласкавай Броні
І дакранаўся вуснамі да скроні.
Яна ўглядалася ў азоранае неба
І мне шаптала: «Лепш не трэба,
Вунь нават месяц з нас смяецца
І чуе, як няроўна сэрца б'ецца».
Мы развітацца не маглі да дня,
Плыла ў тумане наша чысціня.
...Калі нахлынулі крывавыя нягоды,
Мне вочы Броні сніліся заўсёды,
Яны патухлі ў вогненным віры
На схіле Мыслачанскае гары.
І навылёт прабіла куля скроні
Такой ласкавай і пяшчотнай Броні.
Палеглі тысячы на жоўтым схіле,
Узняўся белы камень на магіле.
Схіляюся ў нямым маленні
І станаўлюся моўчкі на калені,
Глытаю слёзы горкія на сконе...
«Не плач, не трэба»,— шэпча Броня.

* * *

> Бачыць несправядлівасць і маўчаць — гэта значыць саму ўдзельнічаць у ёй.
>
> *Ж.-Ж. Русо*

Чаго мы не бачылі толькі,
Які мы не зведалі смак?!
Мінаюць гады, але болькі
Не гояцца ў сэрцы ніяк.

Да трэцяга можна калена
Паклёпнічаць, біць, вынішчаць,
Судзіць і караць несумленна
І несумленна маўчаць.

Ад злосці і страху нямеюць
Майстры непрыкметна ўкусіць,
І толькі ў ахвяраў не ўмеюць
Яны прабачэння прасіць.

## ГАРАЦЬ ЛЯСЫ

Гарацць лясы. Як помнік пасталі
Ўчарнелыя яловыя ствалы,
На попел спаленых канвалій
Сцякаюць кроплі чыстае смалы.

Дыміцца мох, і курчыцца чарнічнік,
Пажар карчуе леташнія пні.
Бярэзінка, нібы трывожны клічнік,
Калоціцца цярпліва на агні.

Усё жывое гіне ўвачавідкі,
Знікае незваротнае дарма,
Няма злачынству аніякай скідкі,
І толькі вінаватага няма.

Жывую прыгажосць на глум і здзек
Бяздумна кінуў чалавек.

## АГАСФЕР

Пад поглядам злавесна-хіжым,
Далёкі ад зямных спакус,
Ледзь-ледзь ступаў пад цяжкім крыжам
На смерць асуджаны Ісус.

Ніколі ён не траціў веры
Ні пад крыжом, ні на крыжы
І, глянуўшы на Агасфера,
Ледзь прашаптаў: «Дапамажы».

Той, баючыся пакарання,
Не падышоў, не дапамог.
За гэта ў вечнае выгнанне
Паслаў яго ўсявышні Бог.

Шумяць адлівы і прылівы,
Прайшлі стагоддзі, і цяпер
Прадбачлівы і баязлівы
Усё блукае Агасфер.

## СЕРАФІМ

И вырвал грешный мой язык,
И празднословый, и лукавый.
*А. Пушкін*

Усё жыццё — адны памылкі,
Адны пралікі і грахі,
Зламаны крылы і закрылкі,
Язык засмяглы і сухі.
Сурова ўрэшце пакараны
За слова кожнае і сказ,
Што ў зман уводзілі старанна
Кагосьці мы, а нехта — нас.
Мана развейваецца дымам,
Дэмагагічны прывід знік.
Пара сустрэцца з серафімам,
Каб вырваў грэшны ён язык.

Што славіў змрочныя хімеры
І ласкі для сябе прасіў,
Дрыжаў ад страху і не верыў
У тое, што другім хлусіў,
Уводзіў небыліцы ў вушы
Пра радасці ў ліхім жыцці,
А хто калечыў нашы душы,
Тых з ліхтарамі не знайсці...
О, шасцікрылы серафім,
Дапамажы і нам, і ім.

## МЕЛОДЫЯ

Пад гукі музыкі расцві-
таюць кветкі.

*Прыкмета*

Заўжды гучыць мелодыя ў душы,
Яе я слухаю, яе люблю я,
Агеньчык толькі гэты не тушы,
Што свеціць, грэе і хвалюе.

Не заглушай ні крыкамі, ні крокам,
Што і глухіх не здолеюць змарыць,
Шалёным рыкам і чугунным рокам,
Не здатным ні спяваць, ні гаварыць.

Мелодыя вышэйшага даверу
Мой акрыліла незайздросны лёс,
Чакаючы блакітную Венеру,
Мая душа імкнецца да нябёс.

Раскрыліся і лотаць, і купена
Пад гукі Баха і Шапэна.

## СТАРОНКА КАЗКІ

Дабро адольвае у казках зло.
Маё жыццё — даўгія казкі.
Чаго ў ім толькі не было?
Былі завязкі і развязкі:
Завязвалі тугім вузлом,
Што не развяжаш і зубамі,
А я ішоў, ішоў на злом,
Нібы вярблюд з двума гарбамі,—
Чужую ношку нёс і нёс
Ці на пагрузкі, ці разгрузку,
І лаяўся калматы пёс,
Не даючы нікому спуску.
Ад страху часам я нямеў,
А даць не мог нікому здачы,
Бо нават голасу не меў,
Не меў ні шчасця, ні удачы.
Завязвалі, развязвалі вузлы
Хоць на кароткія палёгкі,
А я не быў ніколі злы,
Хоць і не быў ніколі крохкі.
Матлялі з боку ў бок вятры,
Душу скаваў набраклы верад.
Я ведаў: «Вочы лепш пратры
І толькі пазірай наперад».
Як толькі мой датлее каганец,
Складу свае ўсе абавязкі,
Бо набліжаецца канец
Вясёлае і сумнай казкі.

## НЕЗВАРОТНАЕ

Пяюць дзяўчаты...
Так пяюць, што плачу
Па змрочных і па ясных вечарах,
Па ўсім, што страціў, і па ўсім, што трачу,—
Па смольных хатах, студнях і дварах,
Па песнях на зажынках і дажынках,
Па звонкіх падгалосках у палёх,

Па торных у трыпутніку сцяжынках,
Якіх ніколі абмінуць не мог
У некранутай чыстай прыгажосці,
Забытай і скалечанай дарма,
Цяпер не ходзім, не завём у госці,
Бо страчана паэзія сама.

Пяюць дзяўчаты...
Так пяюць, што плачу
З бяссілля, што нямнога значу,
Што жытні дух, ружовы пыл дарог
Я толькі ў сэрцы і ў душы збярог.

## МОЙ ВЕРАСЕНЬ

У верасні ветрана ў полі,
Шапоча сухая трава,
Заходзіцца сэрца ад болю,
Як жорны, гудзе галава.

Да лужыны з лужыны крочу,
А ў небе — ні знічкі, ні зор,
І сам сабе долю прарочу,
Прымаю папрок і дакор.

Дажджлівае змрочнае заўтра
І гне, і гайдае мяне,
Хоць веру, што гэтая квадра
Калісьці, як прывід, міне.

Далёка агеньчык засвеціць,
У змроку сцяжынку знайду,
Не я, дык унукі і дзеці
Забудуць ліхую бяду.

Бацькі і пакутнікі-продкі
Прайшлі за кругамі кругі:
Быў досвітак дужа кароткі,
А вечар бясконца даўгі.

Маўчыць вераснёвае поле,
Забыўшыся пра даўніну,
І веру, што горкую долю
Да скону усё ж абміну.

Сухая трава адшумела,
Лістота шляхі замяла,
Здаецца, душа адбалела
Ў чаканні дабра і цяпла.

## ВЕРА

Не скрою тревоги, не скрою
Обиды в холодной золе.
Всё больше друзей под землею,
Всё меньше друзей на Земле.

*Міхаіл Дудзін*

Адыходзяць мае аднагодкі,
Іх сляды замятае пурга,
Пахвалы замаўкаюць і плёткі,
З часам пройдзе і боль, і туга.

Ўсё звычайна, разумна, лагічна —
Ёсць пачатак, узлёт і канец.
Ледзь прыкметна мільгае лірычны
Адзінокі і мой каганец.

Звянуць кветкі, жалобныя згадкі,
Наш трывожны забудзецца час,—
Узмужнелыя нашы нашчадкі
Шчаслівейшымі будуць за нас.

## СВЕЧКА

Ты пабудзь са мною, дарагая,
Хай душа адкрыецца душы.
Не зважай, што свечка дагарае,
І яе дачасна не тушы.

Памаўчым, паверым у надзею,
Як у шчасце верылі спярша,
Не зважай, што сэрца халадзее,
Не застыла б чулая душа.

Мрояцца то росны луг, то рэчка,
Над шляхамі белы пыл курыць.
Ты пабудзь, пакуль не згасла свечка,
Каб старонку новую адкрыць.

## САТЛЕЛЫЯ ЛІСТЫ

Твае лісты прапахлі лесам,
І пылам жытняе красы,
І рошчыны крутым замесам,
І кропляю скупой слязы.

А я паміж радкоў чытаю,
Чаго не напісала ты,
Бо я не той і ты не тая,
І толькі — даўнія лісты

З далёкай нашай маладосці,
З тае вясны, з тае зімы,
Калі ні крыўды і ні злосці
Не ведалі ніколі мы.

Пытальнікі, шматкроп'і, кропкі,
Паперы колішняй памер,
І почырк дробны і таропкі
Мяне хвалююць і цяпер.

Лісты, сатлелыя на зломах,
Сухі, збялелы васілёк
І слабы пах лясоў знаёмых
Хвалююць і цяпер здалёк.

Гартаю ў апусцелай хаце
З лістамі даўнія гады,
І нельга даравадь, што страціў
Твой адрас і твае сляды.

Куды, каму цяпер напішаш
Даўно запознены адказ?
І недалёка тая ціша,
Калі ніхто не ўспомніць нас.

## САЛОДКАЕ ВІНО

Давай з табой на развітанне
Дап'ём салодкае віно,
Успомнім першае спатканне
І ўсё, што канула даўно,

Як разам салаўінай ноччу
Збівалі срэбную расу,
Як я шаптаў, што не сурочу
Тваю дзявочую красу.

Ты ўпершыню назвала: «Любы»,
Як толькі маладзік зайшоў,
Твае асмужаныя губы
Я, не шукаючы, знайшоў.

Так праляцела паўстагоддзя,
Нібыта у нямым кіно.
Давай цяпер у поўнай згодзе
Дап'ём салодкае віно.

## НА АПОШНЯЙ ВЯРСЦЕ

Позні мой вечар,
як ціхая восень,
Долу злятаюць лісты.
Гэта — пара і жніва, і дакосін
Каля апошняй вярсты.

Сонца заходзіць, плыве павуціна,
Ціха і пуста ў палях,
І на змярканні журбой жураўлінай
Млечны гайдаецца Шлях.

Дзе мая радасць?
Дзе маё гора?
Дзе мая папараць-кветка цвіце?
Можа, калісьці, а можа, учора
Звяла яна на апошняй вярсце.

Не адшукаў яе, не дачакаўся.
Падаюць восенню зоры часцей.
Як ні гукаю, не дагукаўся
Шчасця свайго на апошняй вярсце.

## НАШЧАДКАМ

Праз войны, пажары, землетрасенні
У грозны знявечаны час
Прайшло беззваротна маё пакаленне,
Каб толькі пабачыць шчаслівымі вас.
Нялёгка і сёння, а будзе, а будзе
І радасць, і шчасце на нашай зямлі,
Шчаслівымі стануць сумленныя людзі,
Што тут нарадзіліся, тут узраслі.
Вы дзеці мае і любімыя ўнукі,
Агеньчык надзеі і сёння не згас.
Малюся за розум, за здатныя рукі,
За вашае шчасце.
Малюся за вас!

# АНАТОЛЬ ВЯРЦІНСКІ



*Любоў адкрывае скарбы*

## МАЦІ ПЯЧЭ ХЛЕБ

*З паэмы «Песня пра хлеб»*

Хіба забудзеш калі гэты момант!..
Ураз заціхае дзіцячы наш гоман.
Стаіць цішыня незвычайная ў хаце.
Збіраемся дружна мы ўсе каля маці.
Мы бачым адны толькі матчыны рукі,
адны яе рукі, адны іх рухі.
А маці з сваёй урачыстай усмешкай
нізка схіляецца над дзежкай
(над той, на якое сядзела нявестай).
Яна рашчыняе хлебнае цеста.
Цеста мясіла яна кулакамі,
сценкі дзяжы абірала рукамі,
вады падлівала, мукі падсыпала.
І нам было клопатаў тут нямала.
Былі мы ў мінуту гэтую рады
выканаць матчыны ўсе загады.
Мы ёй памагалі рукаў закасваць,
муку падсыпаць па яе заказу,

хусцінку мы ёй папраўлялі ахвотна
ці лоб выціралі матчын потны.
Было урачыста і ціха ў хаце —
хлеб з новага жыта ўчыняла маці.

* * *

Усё захавалі памяці нетры.
Я водар рашчыны чую ў паветры.
Я столькі ўдыхаў калісь гэтага водару!..
Хадзіла ў дзяжы рашчына ходырам.
Хадзіла-брадзіла хлебнае цеста.
Было ў дзяжы яму, цесту, цесна.
Яно шапацела, прасіла ходу,
хацела вырвацца на свабоду.
Ды коўдра яго закрывала шчыльна,
сачыла яна за рашчынаю пільна.
І вось, пашаптаўшыся аб нечым ціха,
яно знаходзіла ўсё-ткі выхад.
Яно запаўняла тады ўсю хату
водарам хмельна-кіславатым.
І ён пабіваў да самага рання
пах адцвітаўшых гваздзік і герані,
якія раслі каля самага дома.
П'яніў ён дзіцячую свядомасць,
спаць не даваў нам да паўночы.
Калі ж мы нарэшце заплюшчвалі вочы,
нам сніліся казачныя караваі,
сніўся хлеб новага ураджаю.

* * *

Назаўтра мы ў лес сабіраліся рана,
выконвалі матчын наказ старанна.
Яна напярэдадні нам казала:
«Каб заўтра, дзеці, хлеб пёкся ўдала,
па лісце кляновае раніцай збегайце».
Мы іншы раз прачыналіся б нехаця.
А тут была справа іншага роду —
яна абяцала ўзнагароду.
І беглі мы з братам сцяжынкай роснай
туды, дзе шумелі клёны і сосны.
Мы знали да клёнаў шлях самы кароткі —

хадзілі да іх мы па сок салодкі.
На самы узлесак выходзілі клёны.
Любілі прастор яны сонечны, дзённы.
Калі ж адчувалі дыханне слоты,
яны пакрываліся пазалотай.
І падаў уніз пад яе цяжарам,
на ранішнім сонцы ўспыхнуўшы жарам,
ліст за лістом. Аблятаў паўкружжа...
Мы іх на ляту лавілі дружна.
Збіралі, нанізвалі іх у вязку,
пакуль не рабілася вязка важкай.
За гэткі гасцінец шчодрым клёнам
мы ледзь не казалі «дзякуй» з паклонам.
Лісце ўручалі мы маці ўрачыста.
«Дык гэта ж не лісці,
а золата чыстае!
На цэлую восень хопіць яго мне.
Вы малайцы ў мяне сягоння.
За справу такую даць вам трэба
першую лусту новага хлеба»,—
казала маці, узняўшы звязак.
А мы, свой выканаўшы абавязак,
сабой ганарыліся не на жарты,
на меншых сясцёр глядзелі з пагардай.

* * *

Дзяцінства — мінулае далёкае —
у памяці толькі рэхам галёкае,
калі яго клікнеш-гукнеш парою,
дзяцінства — за казачнаю гарою.
І хлеб той чарэневы, гарачы
для памяці — казка з пары дзіцячай.
Для сэрца ж і сёння ён — быль непазбыўная,
звычайная самая і самая дзіўная.
Пакуль з маім сэрцам нічога не станецца,
яно з гэтай быллю не расстанецца.
Яно з ёю б'ецца верна і спраўна,
для сэрца яна — і сіла, і праўда.
Я ведаю: выкінуць з сэрца быль гэту —
здрадзіць бацькоўскім запаветам,
шукаць шляхоў лёгкіх і лёгкага хлеба.
У хлебе ж такім я не маю патрэбы.
Другое жыццё мне больш даспадобы.

Мне прыклад —
сумленныя хлебаробы,
мне прыклад —
умелыя хлебапёкі.
Душою быць з імі — гонар высокі.
Я помню заўсёды дарогі і сцежкі,
вядуць што да роднае вёскі Дзямешкава,
да поля з лашчынкамі ды бугаркамі,
дзе ведаю кожны кусцік і камень.
Парою мне хочацца да болі
вёску наведаць, выйсці у поле,
сустрэцца з сваімі землякамі,
з іх дужымі, моцнымі рукамі,
з іх словам, як рунь вясной, сакавітым,
жывінкаю цёплаю перавітым,
з іх поглядам мудрым на справы і рэчы,
з іх радасцю шчыраю чалавечай.

## ЛЕТА 1965 ГОДА

Няхай будзе пагодачка,
хай спорыцца работачка.
*З народнай песні*

Маці яшчэ была жывая.
Маці яшчэ збіралася жыць...
Шчыруе, запашвае, зажынае,
ледзь-ледзь адпачне і зноў бяжыць.
І ўсё глядзіць з-пад рукі угору,
і ўсё чакае, чакае дажджу.
Гляджу таксама ўгору з дакорам,
таксама на неба з надзеяй гляджу.
Схіляюся з маці над ссохлым цветам,
які на бульбяным полі знайшоў.
І тут я хачу быць не паэтам,
не нейкім іншым аўтарытэтам,
а заклінальнікам дажджоў.
І я шапчу, заклінаю хмару:
«Не будзь за гарой,
не хадзі старанои,
ідзі да маці маёй старой!
Быць сляпой табе не да твару...»

Маці пра лёс ураджаю дбала.
Ды хмара недзе міма плыла...
Апроч дажджу, яшчэ не хапала
тым летам летняга цяпла.
Маці казала: «Што гэта за лета,
калі не сагрэешся як след?
Бачыла шмат я зім і лет,
ды нешта няўцям мне надвор'е гэта...»

Маці на лета спадзявалася.
А лета зрывалася,
                не ўдавалася.
Ішло яно неяк наўскасяк.
Вецер круціў і так і сяк.
Быў ён засушлівы і халодны,
быў недародны, быў бясплодны,
быў той з вятроў, які не нёс
ні ліўняў, ні цяпла, ні рос.
Маці за лета турбавалася.
Маці хацела, каб лета было.
Ды лета ўсё не адбывалася —
як быццам некаму назло.

А скора на лад асенні шумела
рана пажоўклае лісцё.
І доўга шчымела, доўга шчымела
лета няздзейсненага пачуццё...

* * *

Мы жывём, каб вяртацца
час ад часу туды,
дзе мінула юнацтва,
дзе маленства сляды.
Мы жывём, каб вяртацца.
І лепшага шляху няма.
Мы жывём, каб вітацца:
«Мама! Дзень добры, ма!»
Ну, а раптам напасце,
бяда ў той хаціне старой!

Ну, а раптам няшчасце —
і маці ў зямлі сырой!
Мы жывём, каб вяртацца.
А куды тады вернешся ты?
З кім так будзеш вітацца,
як тады, да бяды?

## МАМА МЫЛА РАМУ...

*Паводле буквара*

Была і ў мяне мама.
Мыла раму таксама.
Мыла раму яна
дабяла, даясна.

Ці то ішло свята,
ці то прыйшла вясна.
Мама была занята —
мыла раму яна.

Мама раму мыла,
мама мыла шкло,
каб сонца не йшло міма,
а ў нашу хату ішло.

Стала светлай хата,
рады былі мы.
Ці то было свята,
ці то канец зімы...

Было ў мяне дзяцінства,
маці ў мяне была.
Раму мыла дачыста,
даясна, дабяла.

Потым не стала мамы.
Астыла наша гняздо.
Ніхто не мыў там рамы,
вокан не мыў ніхто.

Колькі святла навокал!
А мама туды пайшла,
дзе ні рам, ні вокан,
дзе ні шкла, ні святла.

Не мыць ёй болей раму.
Свята абходзіць маму.
Святло абходзіць весняе.
І — маё акно
глядзіць на свет нявесела,
пацьмянела яно.

## ЗАМЕСТ ЭПІТАФІІ

Спі, родная.
Ты мала спала.
Ты неспакойна спала на зямлі,
дзе мала цішыні і ладу мала,
і сны твае трывожныя былі.
Спі, родная.
Ты мала спала.
Дзяцей прыспіш —
сама ўсё не спіш,
усё глядзіш у цемнату, бывала,
усё ўздыхаеш у начную ціш.
Тады была вайна, гула навала,
трымцеў начамі водсвет на сцяне,
звінелі шыбы...
І ты мала спала,
сама не знала,
спала ты ці не.
Былі нястачы, крыўды, непарадкі.
І ўсё будзіў, як злы нядрэмны пёс,
цябе твой лёс —
лёс маткі і салдаткі
і працаўніцы ніцай лёс.
Спі, родная.
Ты мала спала.
Ты з дня у дзень і з году ў год
рук не складала —
мала спала.

Нас гадавала —
мала спала.
Была навала —
мала спала,
навала мінавала —
мала спала.
Ты знала больш бяссонніц і турбот.
Тваім спакоем мала даражылі.
Ты старажыла сон усёй зямлі,
а твой, а матчын сон не старажылі,
а твой, а матчын сон не сцераглі.
Спі, родная.
Ты мала спала.
Нас гадавала —
мала спала ты.
Нас выпраўляла —
яшчэ болей дбала,
зноў не да сну
табе было тады.
Ах, дзеці! Як вы там, на свеце, дзеці?!
Штось загулі трывожна правады.
Ну, хопіць, правады, гудзеці,
не нагудзелі б вы якой бяды...
Бяда прыйшла.
І ты зусім не спала.
Які там сон мог быць ужо тады!
Ты мала спала
і жыла ты мала —
заўчасна памірала ў муках ты.
Спі, родная.
Ты мала спала.
Ты болей знала неспакой начны.
Нас гадавала —
мала спала,
нас ратавала —
мала спала,
шмат працавала —
мала спала,
шмат бедавала —
мала спала...
Спі, родная.
Хоць там спачні.

## ТАМ ДОМА, У ВЁСЦЫ

*Пераймание народнага*

Раслося там мяце,
раслося там руце...
А ў маёй маці
балелі грудзі.

Раслося там руце,
раслося там мяце...
Рукі і ногі
балелі ў маці.

Балелі рукі
ад працы, ад мукі.
Балелі ногі
ад доўгай дарогі.

Ад чаго, людзі,
балелі грудзі?

* * *

«Гора — не бяда, бяда — не гора:
пабыла — сплыла, нібы вада.
Няма праўды — гэта ўжо горай,
гэта ўжо цэлая бяда.
Гора — не бяда, бяда — не гора...» —
гаварыў так часта дзед Рыгор,
хоць да майго дзеда да Рыгора
гора і заходзіла на двор.
Спіць мой продак, соснамі адпеты.
Я жыву — яго і плоць і косць.
На маім рахунку ёсць і беды,
на маім рахунку гора ёсць.
Знаю добра іхні горкі прысмак,
іхні смак. І знаю я яшчэ —
як несправядлівасць, нібы прысак,
тваё сэрца раптам апячэ.
Я спасціг, што беды — непазбежнасць,

немінучы спадарожнік мой.
Я прызнаў жалезную залежнасць
ад прыроды — мёртвай і жывой.
Я сцярплю усе яе няміласці,
і капрызы, і сюрпрызы ўсе.
Толькі аднаго — несправядлівасці
чалавечы дух мой не знясе.
«Гора — не бяда, бяда — не гора,—
я кажу, як гаварыў мой дзед.—
Вось несправядлівасць — гэта горай,
гэта горай ад усякіх бед».

* * *

Цётка плакала па ўсім свеце...
Былі ў цёткі муж і дзеці.
Іх забрала ў цёткі вайна,
засталася цётка адна.
Вылівала цётка ду́шу,
цётка плакала па мужу,
цётка плакала па дзяця́х,
цётка плакала па людзях...
Па ўсіх раненых і забітых,
незабытых і забытых,
па ўсіх, хто ў палоне-няволі,
па ўсіх, хто замярзае ў полі,
па ўсіх тых, каму не салодка,
горка плакала цётка.
Цётка свету ўсяму спагадала,
яго раны лячыла аддана.
Які б вылечыў іх урач,
каб не цётчын спагадлівы плач?
Цётка плакала па ўсім свеце...
Пахавалі цётку суседзі,
пахавала цётку сяло,
бо радні ў яе не было.
Былі калісь муж і дзеці,
ды загінулі на вайне...
Цётка плакала па ўсім свеце,
а па цётцы хто плакаў ці не?

## УСПАМІН БЫЛОГА ВЯСКОЎЦА

У горадзе жыць зручна.
Кран павярнуў — і тут жа
вада ў цябе пад рукой.
А помніцца, як ад студні
нёс ты поўныя су́ды
вады сцюдзёнай, важкой.
Вада калыхалася ў вёдрах,
І ў двух тых люстрах водных
успыхвала святло,
плыло ўсё сяло.
Вёдры калыхаліся...
З другога краю сяла
дзяўчынка, з якой кахаліся,
насустрач табе ішла.
Ішла па ваду і пела:
«Ой, сохне рута ў саду,
палью я тую руту,
па ваду пайду.
Палью я руту-мяту,
пайду я па ваду.
А як прыйдзе восень,
замуж я пайду...»
Вёдры калыхаліся.
Мы з дзяўчынай усміхаліся.
Можа, таму, што кахаліся,
а можа быць, таму,
што ўсё так адбывалася,
што вада разлівалася,
што ў вёдрах адбівалася
па сонцу аднаму.
Ты смяяўся: «З поўнымі!»
Яна чырванела: «З пустым...»
Чамусьці ўсё тое помнім,
не забываем аб тым.

## СТАТАК ВЯРТАЕЦЦА З ПОЛЯ

Статак вяртаецца з поля.
У цішыні вечаровай
бягуць авечкі і козы,
спаважна ідуць каровы.
Статак вяртаецца з поля.
Што трэба вёсцы болей?
Вёска святкуе падзею.
Выйшла ўся насустрач —
ад гаспадынь руплівых
да дзетвары шустрай.
Бляюць авечкі і козы,
ціха мычаць каровы.
Людзі ўздоўж пасталі —
як каравул ганаровы.
Людзі рады жывёле.
Ціха каровы рыкаюць.
Знаюць, што іх чакаюць,
рады, што іх сустракаюць.
Статак вяртаецца з поля
доўгаю чарадою.
Над вёскаю пах духмяны,
пах густы сырадою.
Статак вяртаецца з поля...
За полем тым, за лесам,
недзе горад вялікі
ляскае жалезам.
Недзе спяшаць на дыспут.
Недзе спяшаць на прэм'еру.
Недзе прэм'ер-міністр
дае абед ці вячэру.
Нехта робіць адкрыцце,
нехта рыхтуе прамову,
нехта гаворыць тайна
па праваду прамому.
А ў вёскі свая надзея.
А ў вёсцы шуміць тапола.
А ў вёскі свая падзея —
статак вяртаецца з поля.

## ЖАДАННІ

1

Знайсці б які пакойчык кутні
і там, забіўшыся ў куток,
аддацца радасці пакутнай —
пісаць: радок! Яшчэ радок!

2

Забрацца б на пустынны востраў,
за трыдзевяць зямель і вёрстаў,
узяўшы толькі стопку кніг.
І — начытацца ўволю іх!

3

Разуцца б і пайсці сцяжынай —
то травяністай, лугавой,
то гладка ўбітай, палявой —
нагамі ўбітай, не машынай.

4

Вярнуцца б зноў у маладосць,
цябе сустрэць, яшчэ чужую,
і жыць пачаць без гэтых вось...
Ты ведаеш, пра што кажу я.

5

Вось твой лясок.
Вось твой пясок.
Вось твае сосны.
Твая яма.
Пачуць бы яшчэ раз:
«Сынок».
Паклікаць бы яшчэ раз:
«Мама».

# ПАЕЗДКА НА РАДЗІМУ
# СА СТУДЭНЦКІМ ТЭАТРАМ
# «ЖЫВОЕ СЛОВА»

*А. Калядзе*

Выбраў харошую гадзіну —
вясна дыхнула з усіх бакоў,—
і еду да сябе на радзіму,
да лепяльчан, да землякоў.
На душы ў мяне вяснова.
І яшчэ ад таго мне святлей,
што побач — гурт маладых людзей,
цэлы тэатр «Жывое слова».
Усё супала як нельга лепей —
прадвесне, дарога на родны Лепель
і тое, што весела так шумім...
Нямарна завёмся «Словам жывым».
Ні болей ні меней: жывое слова.
Слова інакшым не можа быць.
Іначай што яно можа зрабіць?
Іначай не зерне яно, а палова.
А слова павінна быць —
як насенне,
якое сеем у дзень вясенні,
слова павінна прарастаць,
даваць усходы,
рунець,
красаваць.
Жывое слова — увасабленне
любові жывой, жывога сумлення.
Калі яно робіцца нежывым,
тады нічога не выкажаш ім.
...Вёсачка родная чакае,
чакаюць Матырына і Камень.
Не расчаруй, не ашукай,
жывое слова ў душы шукай.
Яно будзе лепшаю справаздачай...
Вось-вось убачу радзімы кут.
Са мной студэнтаў цэлы гурт,
тэатр «Жывое слова» — іначай.

## ДЫНАМІК

Ён пасіпеў, пахрыпеў і змоўк.
Болей нічога сказаць не змог.
Падышла старая, паслухала.
«Што гэта сёння з ім?»
Падышла бліжэй, пастукала.
«Маўчыць, не гаворыць зусім».
Хуценька ў печы дапаліла,
трохі прыбрала, падмяла.
Пайшла вуліцай тапалінай
у другі канец сяла.
Кажа ўсім: «Іду да радзіста.
Нешта радзіва маўчыць».
А ў радыста сын нарадзіўся,
сын нарадзіўся і крычыць.
«У вас весела,— кажа старая.—
Гэта добра, што сынок.
Бач, крычыць як, як стараецца...
Галасісты крыкунок.
Так крычаў і мой малодшанькі,
што забілі на вайне...
Бач, выпроствае аж ножанькі.
Імя выбралі ці не?
Так крычаў і мой сярэдненькі,
не вярнуўся што з партызан...
Бач, які галасок сярэбранькі!
Слаўны, слаўненькі пацан!
А старэйшы быў ціхоня.
Як радзіўся — спаў і спаў...
Можа, дзе жыве і сягоння,
раз без весткі ён прапаў?
Ні сынкоў няма,
нікога.
Толькі радзіва адно.
Толькі радзіва —
мне падмога.
Што б рабіла, каб не яно?
І пагаворыць, і паспявае,
добрай ночы жадае мне.
І паплачам з ім, бывае,
як успомнім аб вайне.
Ды здарылася з ім штосьці,
не гаворыць яно зусім.

Падбяжы як-небудзь, Косця,
паглядзі, што гэта з ім.
Дык падыдзеш?
Пастарайся...
Добра ў вас, ды я пайшла».

І пайшла дамоў старая,
у другі канец сяла.

* * *

*Дзецям, якія ваявалі і загінулі ў дні Вялікай Айчыннай вайны*

Яны да вайны гулялі «ў вайну».
Не ведалі яны
простую ісціну адну:
далёка гульні да вайны.
Калі ж пачалася вайна сапраўды,
калі баі загулі,
думалі яны і тады,
што гэта — працяг іх гульні.
Вайна грымела усур'ёз,
а ім было няўцям.
Хацелася ім ваяваць да слёз,
як хочацца бегаць дзяцям.
Радасці колькі было малым,
калі, ідучы на бой,
давалі воіны зброю ім
і бралі іх з сабой!
І толькі ў самы апошні міг,
калі агнём вайны,
смяротным агнём апаліла іх,
штось зразумелі яны...

## БАЛАДА ПРА СПАЛЕНУЮ ВЁСКУ І ЖЫВОГА ПЕЎНЯ

Гэта была не проста вайна.
Гэта было нешта больш страшнае, больш дзікае.
Помню, міма маёй роднай вёскі ішлі карнікі — маю вёску яны абышлі.
А праз нейкі час мы пачулі страляніну, убачылі дым — чорныя клубы дыму.
Назаўтра мы даведаліся, што спалена вёска Кісялёва (вы знойдзеце гэтую назву на могілках вёсак у Хатыні), а жыхары яе забіты, ад старога да малога.
І яшчэ мы пачулі жахлівы расказ пра тое, як некалькі дзён «дыхала» магіла, куды карнікі скідалі кісялёўцаў, як крычаў на вогнішчы здзічэлы певень.

...І толькі апоўначы,
прарэзліва, з усіх сваіх сіл,
свой векавы абавязак помнячы,
певень запеў, загаласіў.
Запеў і здзівіўся ён, напэўна:
«Чаму не спяваюць іншыя пеўні?»
А потым крычаў і двойчы, і тройчы,
на золаку вёску будзіць пачаў.
Крычаў, на абпаленым плоце стоячы,
крыламі лопаў і крычаў.
Ён вёску будзіў, крычаў да хрыпу.
Будзіў у каторы ўжо раз.
А вёска маўчала — ні рыпу, ні скрыпу,
ні груку, ні гуку ў адказ.
Ён вёску будзіў, галасіў адчайна,
пакуль не здзічэў, пакуль не знямеў.
А вёска маўчала, вёска маўчала.
Яна ўжо не чула той ранішні спеў...
Быў дзень вызвалення,
Дзень Перамогі
вячыстай.
Вярталіся людзі да мірных спраў і сноў.
І пеўні — нястомныя фанфарысты —
мірныя дні абвяшчалі зноў.
Будзяць яны на досвітку сёлы,
і ў сёлах пачынаецца рух.
Яны, жывыя сёлы — не соні,

спяшаюцца рана на ніву і луг.
З пеўнямі сёлы прачынаюцца...
Толькі нічым не разбудзіш яе —
вёску,
 дзе ранак інакш пачынаецца,
вёску,
 дзе певень больш не пяе.

## ПЛАЧ СПАЛЕНАЙ ВЁСКІ

*У жалобным хоры зліваюцца галасы
жанчын, дзяцей, старых*

Людзі добрыя, рады прывеціць бы вас,
ды прыйшлі мы ў нядобры час,
 у нядобры час,
 у нядобры час,
 у нядобры час.
Рады сустрэць бы вас хлебам ды соллю,
ды вось сустракаем смяротным болем,
 смяротным болем,
 смяротным болем,
 смяротным болем.
Рады сустрэць бы крынічнай вадою,
ды вось сустракаем вялікай бядою,
 вялікай бядою,
 вялікай бядою,
 вялікай бядою.
Хто вы, скажыце? Вакол нас змрок.
Спаліў вораг вочы, адняў у нас зрок.
Не бачым мы ні зямлі, ні неба...
 Ўсё слепа,
 ўсё слепа,
 ўсё слепа.
Адкуль яно бралася, гэтае ліха?
Не чуем мы вас, няма у нас слыха.
Нас ахапіла глухая скруха...
 Ўсё глуха,
 ўсё глуха,
 ўсё глуха.

Хацелі б сказаць мы вам добрыя словы,
ды вораг люты пазбавіў нас мовы.
Не вымавіць слоўца, бязмоўныя ўсе мы...
Ўсё нема,
ўсё нема,
ўсё нема.
Не можам прывеціць, не можам праводзіць.
Не мы на сяле — цені нашыя ходзяць.
Ні бачыць, ні чуць, ні слова сказаць мы не ў стане...
Мы попелам сталі,
мы попелам сталі,
мы попелам сталі.

## РЭКВІЕМ
## ПА КОЖНЫМ ЧАЦВЁРТЫМ

У часе мінулай вайны загінуў
кожны чацвёрты беларус.

*З дакумента*

Ой, хацела мяне маці
за чацвёртага аддаці...

*З народнай песні*

### УСТУП

Вы бачылі лес,
дзе прагал скразны?
Скажыце, вы бачылі бор той,
дзе кожнай другой няма сасны
ці сама меней — чацвёртай?
Тое ж было з народам маім.
Сякера ваеннай навалы
прайшлася бязлітасна па ім,
і — прагалы, прагалы.
Яны і сёння не зараслі,
свіцяцца прасторай мёртвай...
Вы бачылі лес,
дзе прагал скразны?
Скажыце,
вы бачылі бор той?

### ЧАСТКА ПЕРШАЯ

Зямля мая бой прымала
ад стара і да мала,
ад стогадовага Талаша
да Казея — малыша.
І падаў, распасцёрты,
кожны чацвёрты.

Часта згаралі знічкі тады.
Быў небасхіл чорны.
А на зямлі стылі сляды —
кожны чацвёрты.

Мір асвятліў нас сваім святлом.
Грымелі ўрачыста акорды.
Толькі не быў за святочным сталом
кожны чацвёрты.

Доўга не трацілі ўдовы надзей,
доўга чакалі маці дзяцей.
Не верылі ўсё, што мёртвы
кожны чацвёрты.

Помнім болі і страты свае.
Памяць шуміць, як чароты.
О, як нам вас не стае,—
кожны чацвёрты.

### ЧАСТКА ДРУГАЯ

Кожны чацвёрты быў мёртвы —
мір і спакой ім вечны!
Кожны трэці быў зморany,
скалечаны і знявечаны.

Кожны другі на целе
меў раны, апёкі ці шрамы.
І ўсе мы, усе мы мелі
на душы сваёй раны.

Зеўралі ямы, траншэі,
зеўралі печы ў друзе —
ранай адной страшэннай
на целе маёй Беларусі.

## ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

Лічым: чацвёрты кожны.
А можа, кожны трэці?
Голадам падкошаныя,
паміралі дзеці.

Яшчэ мы не ўлічылі
тых, што лячылі раны,
раны не залячылі,
рана паміралі.

Колькі прапала без вестак,
без пахаванняў, памінак!
А колькі потым дзетак
ўзарвалася на мінах!

Лічым: кожны чацвёрты,
а той рахунак прыблізны,
а той рахунак няцвёрды,
а ўрон яшчэ больш вялізны.

## ЭПІЛОГ

*Урок спражэння*

Не забываецца той урон,
не зарастаюць прагалы...
«Дзеці, вы вывучылі урок?
Дзеці, вы праспрагалі?
Я іду,
ты ідзеш,
а ён не ідзе,
ён мёртвы.
Я пяю,
ты пяеш,
маўчыць кожны чацвёрты.
Мы ідзём,
ідзеце вы.
Грунт пад нагамі цвёрды.
Яны не ходзяць — не жывы
кожны чацвёрты.
Любім мы,
любіце вы.

Колькі травы,
ліствы,
сінявы!
Хоць сэрца насцеж разгортвай,
А каб яшчэ ды быў жывы
кожны чацвёрты.

## ДВА ПОЛІ

*Песня*

Было ў салдата два полі,
поле, дзе кветкі ірваў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён ваяваў.
Ціха было і чыста
ў полі яго дзяцінства,
былі агонь і дым
на полі ратным тым.
Два полі было ў салдата.
Адно зелянела травой,
другое было ўзарата
вайной і паліта крывёй.
Было ў салдата два полі,
поле, дзе кветкі збіраў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён паміраў.

## НЕ НАЗЫВАЙЦЕ РАКЕТЫ КРЫЛАТЫМІ

Не называйце ракеты крылатымі.
Такім эпітэтам іх называць —
гэта амаль што паэтызаваць.
Тут памяркоўныя занадта мы.
Пакінем прыметнік гэты за рэчамі,

за тымі справамі чалавечымі,
з якімі здаўна стасуецца ён:
крылаты вецер, крылаты звон,
крылатая мара, вера крылатая,
крылатая муза, крылаты Пегас...
Паэт маладых называў арлянятамі,
арліна-крылатым назваў свой час.
Не называйце ракеты крылатымі.
Ракеты грозяць вялікай бядой.
Завіце дакладнымі, завіце праклятымі,
завіце д'ябальскімі апаратамі,
але не завіце толькі крылатымі.
Не тая крылатасць, выпадак не той.

* * *

Косім траву — яна не крычыць.
Яна маўчыць адчайна.
Мы пачынаем камень крышыць —
зацятае тое ж маўчанне.
Тое ж маўчанне, калі тапаром
мы дрэва зялёнае нішчым,
калі мы за жабры рыбу бяром
і б'ём галавой аб днішча.
Рыба набрала ў рот вады...
Затое, калі самім нам
бывае балюча, і тады
крычым мы крыкам нястрымным,
крычым мы не толькі ад болю свайго —
яго было б нямнога,—
крычым мы ад болю усяго
свету ўсяго зямнога.

## МАЯ ВІНА

*З паэмы «Даруйце!»*

> **І будуць прасіць даравання,**
> **як просяць дзецi.**
>
> *Л. Талстой*

Даруйце, даруйце!..
Даруйце, ахвяры!
Па небе маім плывуць,
нібы хмары,
маўклівыя вашы сілуэты.
Плывуць вашы цені ў другія сусветы.
Дзе вашы целы,
дзе вашы твары?
Плывуць вашы цені...
Ахвяры, ахвяры!
Ахвяры вядомыя і невядомыя.
Ахвяры свядомыя і несвядомыя.
Ахвяры нявінныя, незлічоныя.
Плывуць вашы цені задымлена-чорныя...
А можа, агонь, што спаліў вас,—
свяшчэнны?
А можа, і трэба гарэць нам дашчэнту?
А можа, і трэба жыць нам ахвярна?
А можа, ўсё і не марна?
А можа, у гэтым гарэнні-маўчанні
наша вышэйшае прызначэнне?
Ахвяры, плывуць вашы цені,
як хмары.
Ніяк не разгледжу вашыя твары.
Даруйце, даруйце!

* * *

Даруйце, даруйце!..
З віною хаджу,
як з гарою.
Даруйце, героі!
Даруйце, усе змагары і спадзвіжнікі!
Быў цяжкі,
быў трудны,
быў горкі
той крыж, які

вы неслі —
сумленныя,
мужныя,
ўпартыя.
Вы кроў пралілі.
Ці варты, ці варты я?!
Ці варты я вашай веры і мары?
Ці варты вялікай вашай ахвяры?
Вы кроў пралілі.
З крыві той
ўзыходзяць гваздзікі.
А побач растуць, як раслі,
быльнёг і дзядоўнік дзікі.
Вы прыклад высокі далі.
Успыхнуў ваш подзвіг.
А колькі яшчэ на зямлі
іх, пошлых і подлых!
Даруйце, даруйце!..

* * *

Даруйце, даруйце!..
Даруйце, мае дарагія!
Даруй мне, мой дружа!
Сягоння — другі я.
Сягоння такі я,
якім я хачу сябе бачыць!
Быць можа, змагу
я сябе перайначыць.
І будзе мне боль твой
балесней,
чым боль уласны.
І шчасцем тваім
я больш за цябе буду шчасны.
І будзе ўзаемна ўсё,
і будзе ўсё двухадзіна.
Нібыта ў жыццё
нас маці адна нарадзіла,
дала нам на двух
яна двухадзінае цела,
дала адзін дух.
Такую кашулю надзела,
якая ўжо не бліжэй
да цела майго,
майго духа,

з якою за ўсё даражэй
жыццё майго друга.
Даруй мне!..
Даруй мне!..

***

Даруйце, даруйце!..
Я так вінаваты.
Маўчыце вы лепей,
мае адвакаты!
Не трэба тут доказаў вашых разумных.
Сумленне — заўсёды
на лаўцы падсудных.
Само сябе садзіць,
само сябе судзіць.
Тым самым ратуе
яно сваю сутнасць.
Сумленне, што алібі пэўна сцвярджае,
тым самым на гібель сябе асуджае.
Усе мы за ўсіх і за ўсё ў адказе,
і ўсе вінаваты,
ва ўсякім разе.
Раскайся, злачынца!
Забойца, раскайся!
Я каюся з вамі —
за вас я ў адказе.
І вы ўсе — суддзя,
пракурор,
адвакаты,—
за ўсё, што здарылася,
вінаваты.
І ты, херувімчык ружаваты,
за ўсё і ва ўсім вінаваты.
І ты, задаволены абывацель,
за ўсё і ва ўсім вінаваты.
А болей за ўсіх
я сам вінаваты.
За ўсе нашы ганьбы,
пакуты
і страты.
За ўсё вінаваты!
Даруйце, даруйце!

## ПАД НЕБАМ АДКРЫТЫМ

Адкрытае неба!..
Адкрытае ўсім і ўсяму.
Спявае птах срэбна
гімн светламу небу свайму.
Пад небам адкрытым
так хараша дрэвам расці,
плыць рэкам блакітным
і нам з табой разам ісці.
Пад небам блакітным
саромімся мы галізны.
Пад небам адкрытым
саромся хлусні і грызні.
Пад небам адкрытым,
дзе светла, куды ні зірні,—
няпраўдам і крыўдам
не месца зусім на зямлі!

* * *

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Каб светла-залатую яго ніць
віць і далей — любоўю, справай дзейнай
ды словам, што ад справы неаддзелена.
Тварыць!

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Надзеяй, праўдай, мужным парываннем,
высакародным, дружным намаганнем,
што потым зоркай у вяках гарыць.
Тварыць!

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Маральны самы, самы натуральны
пачатак гэты вось жыццестваральны.
Інакш — якая ад жыцця карысць?
Тварыць!

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Не марнаваць, не нішчыць, не бурыць,—
Тварыць!

* * *

Люблю зямлю,
дзе ёсць дзіцячая казка,
дзе ёсць дзяцінства
і ёсць маладосць.
Люблю зямлю,
дзе ёсць жаночая ласка,
і дружба ёсць,
і многае іншае ёсць.
Люблю зямлю.
Зямлю і праклінаю —
дзе казкі таюць, як ранішнія дымы,
дзе здрады знаю
і страты знаю,
дзе ўсё праходзіць
і дзе праходзім мы.
Люблю зямлю я
сэрцам сваім натхнёным.
І праклінаю,
і тым жа сэрцам тужу.
Так і жыву —
паміж любоўю й праклёнам,
так і дзялю між імі сваю душу.

* * *

Любоў адкрывае скарбы,
абсягі новых зямель.
Варожасць кідае на скалы,
нянавісць садзіць на мель.
Любоў і лад узвышаюць,
вядуць за далягляд.
Варожасць і злосць прыніжаюць,
адкідваюць назад...

## З'ЯЎЛЕННЕ

З'яўленне зор і сонца ў вышыні.
З'ўленне сокаў з глыбіні карэння.
З'яўленне траў у веснавыя дні...
І вось маё, і вось тваё з'яўленне.

Як быццам бы дамовіліся ўсе —
глыбіні цёмныя і залатыя высі,—
як быццам бы сказалі ўсе: «З'явіся!» —
і ты з'явілася ва ўсёй красе.

Як быццам нечакана ўсё было,
як быццам выпадкова.
А на справе
увасабленне гэтае наяве
чакалася, як ранняе святло.

А каб ты нам з'явілася як след,
падмогаю было благаславенне:
благаслаўляў тваё з'яўленне свет,
сусвет благаслаўляў тваё з'яўленне.

## ПОЗІРК З КОСМАСУ

Шлях да зорак —
шлях скрозь ружы і скрозь церні.
Колькі дзён жывём
сярод касмічнай цемры.
Пачынаеш тут цаніць
усё, што зведана
на зямлі, якая ўтульна так асветлена.
Сонцам, месяцам асветлена зямліца.
І яшчэ адна там ёсць святла крыніца.
Калі лёс табе ўсміхнецца —
табе стрэціцца
тая дзіўная жанчына,
што ўся свеціцца.
Ты ў лятунках
з той жанчынаю вітаешся.

Ты ў думках
                    да жанчыны той звяртаешся:
«Мала сонца, мала зорак, мала месяца.
Падары святло, якім жанчына свеціцца!
Перад ім любая знікне беспрасветнасць...
Мая яснасць, мая светласць, мая ветласць!»
Тут, у космасе, мы бачым зорак многа.
Не хапае сэрцу тут святла зямнога...

* * *

Будзе шкада, як шкада бывае,
калі раптам гіне істота жывая.
Будзе шкада, як шкада бывае
птушкі, якую хтось забівае,
дрэва, якое сякера сячэ,
слязы, што сцякае па шчацэ.
Будзе шкада, як шкада бывае
воблака, што ўдалеч сплывае...
Што нарабілі мы з табою!
Шкада да болю...

## ТОЙ ГОД НЕЗВЫЧАЙНЫ...

Той год незвычайны я не забыў,
той год незвычайны.
Той год ураджайны вельмі быў,
надзіва ўраджайны.
Шмат снегу было,
                    шмат сонца было
і ліўняў нямала.
Зімою было — гуло і мяло,
а летам — расло і буяла.
Яблыкі спелі, спеў белы наліў
пад промнямі поўдня.

Той белы наліў я з табою дзяліў.
І плавала поўня...
Той год не забыць мне, той крыгаход,
вясёлы, вясенні.
Той год не забыць мне, той карагод,
святочны, вясельны.
У тым карагодзе кружыліся ўсе,
як дружныя дзеці,—
і зоры, і росы, і сонца ў расе,
і вецер, і квецень...
Ці, можа, той год прысніўся ў сне
мне на дасвецці?

## ПІСЬМО, КАХАННЕ І ДАЖДЖАВАЯ КРОПЛЯ

З паўдня яно ляжала ў скрынцы,
звычайнай металічнай скрынцы,
старэнькай, заржавелай дзе-нідзе.
І калі дождж пайшоў, касы і спорны,
то кропель яго некалькі тады
дасяглі і пісьма. Адна
разбавіла чарнільны завіток,
якім заканчвалася на канверце
прыгожае імя дзяўчыны.
Пад вечар за пісьмом прыйшлі,
дасталі яго рухам звычным.
На пошце тым жа рухам сувязіст,
гаворачы з суседкай аб надвор'і,
паставіў спрытна штэмпель на пісьме.
Калі пісьмо прыйшло у гарадок,
яшчэ раз штэмпелем яго сустрэлі,
глядзелі, як на сотню іншых пісем.
А паштальён (яна была жанчына,
любіла папляткарыць іншы раз)
наконт пісьма сяброўцы штось шапнула,
загадкай падзялілася сваёй.
Калі ж дайшла да дома адрасата,
не трэба ёй было ісці у дом —
сама дзяўчына выбегла насустрач.

Убачыўшы пісьмо, заззяла.
Чыё пісьмо — па почырку пазнала,
прыціснула да сэрца, да грудзей.
А пачала чытаць — сляза упала.
На тое месца, дзе застаўся след,
ледзь бачны след ад кропелькі-дажджынкі,
што абляцела цэлы свет
і даляцела да паштовай скрынкі,
старэнькай, заржавелай дзе-нідзе.

## ПАРАДА
## ЮНЫМ ЗАКАХАНЫМ

Вы самыя шчодрыя з людзей.
Вашая шчодрасць не знае меры.
Да скарбаў сваіх, як чарадзей,
вы расчыняеце насцеж дзверы.
І безаглядна — куды шчадрэй! —
адно аднаго асыпаеце скарбамі —
ласкамі, марамі светлазарнымі,
клятвамі і гэтак далей.
Як шчодрымі вам не быць, калі
няма багаццю вашаму меры,
калі вы багатыя, як каралі
ці, лепей, як мультымільянеры.
Ды што там мільёны ці мільярды,
калі вам, як лепшы самацвет,
ззяе ўвесь свет,
увесь сусвет,
калі вам належаць зор мірыяды.
Святлеюць сузор'і ўгары,
палаюць зоркі на небаглядзе,
звісаюць нізка, як яблыкі ў садзе,—
толькі бяры іх і дары!
І я вам кажу:
у добры час!
Бярыце, дарыце сваё багацце!
Нічым не хачу азмрочваць вас.
Толькі параду адну хачу даць я:
пакіньце што-небудзь пра запас,

скарбы свае да канца не трацце.
Я не кажу: на чорны дзень.
Я не кажу: на час няшчасны.
Хай вас міне няшчасця цень,
гэтак жа, як і разлік мяшчанскі.
Ёсць дні, калі канчаецца штось,
калі канчаецца зорны дождж,
а пачынаецца шэры, не зорны,
не залаты, не ілюзорны.
Вось тут і спатрэбіцца якраз
той вашай шчодрасці запас,
гатоўнасці той варочаць горы,
дарыць адно аднаму зоры.
А зрэшты,
                    што толку з карысных парад,
якія заўсёды чамусь неўпапад!
Ешце з голаду,
                    кахайце змоладу,
іначай вы —
                    ні к сялу ні к гораду.
Кахайце, ляціце да сонца ікарамі,
адно аднаго асыпайце скарбамі,
асыпайце самацветамі —
ласкамі, клятвамі, марамі светлымі!
Пакуль кахаецца — кахай!
А там што будзе — і будзе няхай!

* * *

Мужчына. Жанчына. Чаканне.
Шуканне. Блуканне. Час.
Жанчына. Мужчына. Спатканне.
Вітанне. Пытанне. Адказ.
Мужчына. Жанчына. Дыханне.
Сэрцабіццё. Забыццё.
Жанчына. Мужчына. Каханне.
Мужчына. Жанчына. Жыццё.

## ПЕРАД СВЯТАМ ПАЭЗІІ Ў ВЯЗЫНЦЫ

У нейкі жыццёвы міг,
на нейкай вярсце жыццёвай
прыслухаўся я, прыціх,
і ўлавіў мой слых
ціхі шэпт раніцовы.
Шапталіся вецер з дажджом,
шапталіся хмара з зямлёю,
шапталіся дождж з лісцём...
І нехта шаптаўся са мною.
І ўжо не слыхам — душой
адчуў я, што пошум той дзіўны —
не проста вецер з імжой,
а голас самой Радзімы.
Прыйшла і сказала: «Мой сын!
Была я, я ёсць і я буду!
Буду да вечных часін
явай тваёй, тваім цудам.
Ніщто не падзеліць нас,
у нас шлях і лёс адзіны...»
У гэты ранішні час
усё было — ад Радзімы.
І след дажджу на акне,
і першая чырвань рабіны —
усё было ад Яе,
усё было — ад Радзімы.
Наяве было, як у сне,
усё ў гэта ранне летняе...
Усё было запаветнае,
усё было ад Яе.
Я ёй падбіраў імя,
шаптаў у душэўным уздыме:
«Госпадзі, Гаспадыня,
Святыня, Маці мая!..»
Калі ж выбіраўся ў шлях,
было святочна і ясна.
Радзімы ўвесь абсяг
бачыўся мне выразна.

## КУПАЛА ІДЗЕ ДА КОЛАСА

«У суботу еду ў Стоўбцы да Коласа».

*З пісьма Янкі Купалы ад 26 ліпеня 1912 года*

Да Стоўбцаў Купала ехаў.
Сышоў з цягніка спехам...
Значыць, недзе тут
родны Коласаў кут?
Родны, ды паднявольны.
Калі што не так — у астрог.
«А як дабірацца да Смольні?
Хто б тут параіць мог?
Дарога зусім незнаёмая...»
Чуе Купала ў адказ:
«А вы ідзіце да Нёмана.
Вось гэтай сцяжынай якраз.
Пойдзеце па-над ракою,
не збочвайце нідзе.
Рака вас і прывядзе.
Да Смольні падаць рукою...»
Так і кіруе Купала.
Купала прыспешвае крок.
Шыр нёманская заззяла,
завабіла здалёк.
Плынь нёманская дыхнула
свежасцю густой,
сустрэла прахожага чула —
з яго імклівай хадой.
Нібы благаслаўляла,
давала сілы і ўздым...
Ідзе, ідзе Купала
нёманскім берагам тым.
Купала да Коласа ідзе,
Купалу Нёман вядзе.
Рака вяла, спрыяла,
бы ведала, што да чаго,
хто ідзе да каго...
Да Коласа — Купала.
Ведала як быццам,
што нельга іначай тут,—
сустрэча павінна адбыцца,
павінен збыцца цуд.
Не вылазка на прыроду,

не святочны пікнік...
Тут — служэнне народу,
тут — сумлення крык.
Купала да Коласа ідзе,
Купалу Нёман вядзе.
Ускрыкнула звонка, голасна
птушка недзе ў трысці.
Купала ідзе да Коласа,
не можа не ісці.
Ці рана на Івана,
ці ў нейкі іншы дзень
так ім наканавана:
адзін аднога сустрэнь!
Адзін з другім сустрэнься,
дайце братні зарок —
па-брацку — да песні песня,
па-брацку — да кроку крок!
Адзін у полі не воін.
Два берагі ў ракі.
Купала і Колас — двое,
як гэтыя два берагі.
У гэтым краі хапала
міжусобіц і здрад...
Да Коласа — Купала
ідзе, як да брата брат.
Каб шэрагам адзіным
пайсці на вялікі сход —
па Бацькаўшчыну, па Радзіму,
па шчаслівы народ.
Купала да Коласа ідзе,
Купалу Нёман вядзе...

## ЛЯ МАГІЛЫ МАКСІМА ТАНКА

*Гучыць яго голас...*

Ну вось я нарэшце і дома.
Вярнуўся я ў родны кут.
Бацькі тут, Іван ды Домна,
і дзядзька Фадзей недзе тут.

Са мною Любаша, вядома,
Любаша, Люба, Лю...
Нарэшце мы з ёю дома.
Душу да душы тулю.

Апошні наш прыстанак.
Сабраліся тут назусім.
І тут ніякі не Танк я
і нават — не Максім.

Прыдумвалі ж псеўданімы!
Мой быў накшталт брані.
Маўляў: «Абарані!
Бо ўражлівы я і ранімы».

А Жэнем быў я з нараджэння.
Жэнем вярнуўся дамоў.
Матчынае «Жэня!»
мне соладка чуецца зноў.

«Жэня!» — шапочуць хваіны,
што ў песнях славіў я.
Бярозавыя галіны
шэпчуць маё імя.

Змружыла вейкі стома.
Набыўся ў гасцях — людзях.
Я тут спачываю. Я дома.
...А вы ўсё яшчэ ў гасцях?

## СУСТРЭЧА НА ПАРКАВАЙ МАГІСТРАЛІ*

*Памяці Яўгеніі Янішчыц*

Не ведаю, як хадзіла Містраль.
Ды бачу: парывіста, крылата
ідзе, відаць, да свайго інтэрната,
па вуліцы Паркавая магістраль
Жэня Янішчыц... Як ідзе!

---

* Зараз праспект Машэрава.

Як чарадзей ідзе па вадзе.
Як самнамбул ідзе у сне.
Ці як маладзіцы з яе Вілясніцы
бягуць ранічкою па расе —
у грыбы альбо ў суніцы.
Калі яна і ад «мира сего»,
то ад таго, які лятае,
ад свету Цёткі і Сафо,
ад свету Ахматавай і Цвятаевай.
Бачу: Янішчыц ідзе цераз мост...
Спыніся, імгненне! Спыніся, Яўгенія!
Не чуюць Яўгенія і імгненне.
Ляцяць яны над мастом, наўпрост.
Вецер, гляджу, абвявае іх.
Ляцяць над прахожымі, над машынамі,
над нашымі клопатамі мышынымі.
Ляцяць, пакідаючы нас, зямных.
Вось вам і разгадка, і адказ,—
абагульняю я прыватнасць,—
што ў вершах Янішчыц уражвае нас:
крылатасць!

## НА ПАКЛОН ДА КАБЗАРА

> У трэці раз адбылося Шаўчэнкаўскае свята паэзіі. Яно пачалося ў Кіеве, потым працягвалася на гасціннай радзіме паэта, у Чаркаскай вобласці, у Каневе. Госці пабывалі на Тарасавай гары...

Я рана прачнуўся —
стукнула ў шыбы дзянніца.
Мне голас пачуўся: «Пара пакланіцца!
Пара на паклон да Кабзара!»
Раз голас пачуўся — значыць, пара.
Біў не гадзіннік і не званіца.
Білася сэрца: «Пара пакланіцца!»
Жыве чалавек не хлебам адным,
жыве чалавек і паклонам зямным.

Шмат мітусні, а паломніцтва мала.
Як бы душа не падупала.
Збіраюся ў шлях, усім гавару:
«Іду пакланіцца Кабзару».
Дні значым такія
мы белым каменем.
Шлях ляжа да Кіева,
шлях ляжа да Канева,
шлях прывядзе да магілы той,
што на дняпроўскай строме крутой.
Бог з ёю, святыняю боскаю Меккай.
Паклон — Людыне, паклон — Чалавеку,
паклон — таму, хто столькі нягод
сцярпеў за народ, за людскі ўвесь род.
Паклон — таму, хто не біў паклоны,
паклон — таму, хто не быў пакорны,
хто праўду казаў цару і двару...
Іду пакланіцца Кабзару!
Удзячная памяць — найлепшы помнік.
Тарас Рыгоравіч, я ваш паломнік.
Мне праз адлегласці зім і лет
чуецца вешчы Ваш запавет.
Праз далеч гадоў, Тарас Рыгоравіч,
Ваш боль і веру, любоў і горыч
я падзяляю... Паклон Вам зямны!
Сніце свае вечныя сны...

## БАЦЦА БЫЦЬ БЕЛАРУС БЕЛАРУСАМ...

Жыў пад прыгнётам ды пад прымусам,
зваўся ліцвінам, русінам, русам,
зваўся тутэйшым, мяшканцам, мяшанцам...
Не знае, рабіць што з апошнім шанцам,
які ён сягоння атрымоўвае,
як быць з сваім імем, з сваёю мовою,
быць ці не быць беларусам нарэшце...
Пытанне няпростае, канешне.
Дазволю сабе тут крышку іроніі.
(Характар наш тут як на далоні.)

Не знае?
        Не хоча?
                Не смее?
                        Баіцца?
Вялікая гэта таямніца.
Зведаў ён ліха апраметнага.
Ён не баяўся таго і гэтага.
Хапала адвагі, каб з ворагам біцца,
ад голаду-холаду каб бараніцца...
Ды вось быць самім сабою баіцца.
Прайшоў праз Хатынь, праз Курапаты,
зносіць цярпліва Чарнобыль праклятым,
упарта крыніца яго бруіцца...
Ды быць беларусам ён баіцца.
Вось ды ноумен, вось ды феномен —
гэты ўнук бабін, сын гэты ўдовін.
Казалі «не будзь!» — ён схіляўся ніцма.
Гавораць «будзь!» — усё роўна баіцца.
Вось што робіцца з беларусам.
З сінявокім, з белавусым,
не з недарэкам, не з няўмекам,
з добрым увогуле чалавекам.

Баіцца быць беларус беларусам...
Ці, можа, ужо не баіцца?

## КАЛІ ГВАЛТУЮЦЬ АЙЧЫНУ...

> Грудзьмі тулюсь к ёй, як да матчыных грудзей.
> І калі здзекуецца нада мною хтосьці —
> Над Бацькаўшчынай здзекуецца ён маей,
> Калі ж над ёй — мяне тым крыўдзіць найцяжэй.
>
> *Янка Купала. Бацькаўшчына*

> О, Русь моя! Жена моя!..
>
> *Аляксандр Блок*

Так, кожны гвалт — злачынны,
справа рук Сатаны.
Але гвалт над Айчынай —
гвалт двайны, трайны.
Калі гвалтуюць Айчыну —

гвалтуюць тваю жанчыну,
гвалтуюць маці тваю,
гвалтуюць тваю радню,
гвалтуюць цябе самога,
кроўны пачатак твой,
існасць тваю, твайго Бога
(тут сходзяцца Бог з Сатаной).
І з гэтым гвалтам мірыцца —
цябе самога забыць,
найбольшаму злу скарыцца,
найгоршым адступнікам быць.
Калі гвалтуюць Айчыну —
мужчына, будзь мужчынам,
яе ратаваць ідзі,
яе заслані грудзьмі.
Няма вышэйшага чыну —
няма і не было,—
чым бараніць Айчыну,
калі ёй робяць зло.

## РАЗМОВА З СОЖАМ

*Раздзелы з паэмы*
*«Начны бераг»*

А вось і Сож... Вітаю, друг!
Сустрэчы нашай рад я вельмі.
(Заўсёды рады я, дарэчы,
сустрэчы з рэчкай, з ручаём.
Так адчуваю пры сустрэчы,
нібы ў адной сям'і жывём.
Я брат ім, родны ці стрыечны.
І вось вярнуўся я з далечы —
адзін аднаго пазнаём.)
Як, Сож, жывеш? Як, Сож, плывеш?
Гляджу, трымаешся належна
таго ж кірунку, тых жа меж —
не знаеш нашага бязмежжа.
Гляджу, не гонішся за модай,

а з годнасцю раўнінных рэк
спакойна, вольна коціш воды...
І гэта ў атамны наш век.
І гэта ў час наш ліхаманкавы,
калі ўсё з хуткасцю маланкавай
бяжыць, мяняецца, цячэ,
парой цячэ не ў тым ручве.
Ты малайчына! Твой спакой
гаворыць, што ты робіш справу
не дзеля выгады якой
не напаказ і не на славу.
Не, проста верны ты прыродзе
сваёй рачной, сваёй зямной,
і астаешся ў згодзе з ёй
ты пры любой пагодзе, модзе.
Шчаслівае тут супадзенне!
Спакой і рух супалі тут,
супалі мэта і маршрут,
супалі бытнасць і надзея.
Зайздрошчу рэкам я заўсёды.
І часта думаю я, Сож,
што правільна жывуць усё ж
рачныя, грунтавыя воды.
Сож, навучы мяне, як быць,
каб аставацца ў сваім рэчышчы,
да свайго мора вольна плыць,
спакойна плыць да сваёй вечнасці.

* * *

Яшчэ адно ў мяне пытанне.
Даруй, што назаляю, Сож,
але ў мяне іх цэлы кош,
і пацярпі ўжо да світання.
Скажы, не вельмі мы стамілі,
не вельмі змучылі цябе
плытамі, баржамі сваімі?
Ты ж, як цягло, тут у цане.
Гляджу я: пляма брудна-тлустая
пагойдваецца на вадзе.
Кранула, Сож, цябе індустрыя?
Не абышла ў сваёй хадзе?
Прызнаюся, мы, людзі, Сож,

народ не вельмі чыстаплотны,
народ няўдзячны да таго ж,
а да таго ж і бесклапотны.
Нам рэкі — чыстую ваду,
нам рэкі — свой разліў блакітны,
мы ім — адходы і адкіды,
мы ім — усякую брыду.
Не скажаш, што любоў ўзаемная,
хутчэй за ўсё — наадварот.
Так, Сож, такі мы ўжо народ.
Сабе за правіла нязменнае
аднойчы лозунг мы ўзялі
(на шчыт мы ўзнялі той лозунг):
«Пакольні дадзены нам розум,
то мы — уладары зямлі,
то мы — гаспадары планеты.
Таму для нас за ўсё вышэй
патрэбы нашы, нашы мэты,
таму для нас за ўсё бліжэй
кашуля наша і кішэнь...»
І мы рашылі, што скарым
і нетры, і лясы, і воды,
як некалі магутны Рым
скараў і рабаваў народы.
З такой і падыходзім мераю:
у цэнтры — мы, уладары,
вакол — прырода, як імперыя,
ляжыць, прынёсшы нам дары.
У ваяўнічым тым запале,
на бале заваёў сваіх
(галовы кружацца на бале)
мы факт той просты занядбалі,
што самі — дзеці сіл зямных.
Мы — тое ж цеста, тая ж плоць,
залежнасць самая сыноўняя.
Для нас прырода — маці, хоць
і маці строгая, суровая.
Якія ж мы, калі з мячом
ідзём, накшталт варожай раці,
скараць і рабаваць багацці
(чые багацці? — роднай маці!),
сук, на якім сядзім, сячом!
Тут непазбежная адплата.
Нам не даруецца, калі

ідзём супроць маці-зямлі,
сястры-вады і дрэва-брата.
Адплата йдзе...
Чытаю ў прэсе
(ты не чытаеш, Сож, газет?):
«На самай воднейшай з планет
вады хапаць не будзе прэснай...»
Была, плыла, цякла вякамі,
і больш не будзе тых крыніц,
і будзе ўся зямля, як каня,
прасіць адчайна: «Піць-піць-піць!»

* * *

Сож маўчаў. І ноч маўчала.
Спала лодка ля прычала.
Раптам песня загучала.
Адкуль бралася яна?
Дзе паспела? Дзе запелася?
Можа, пелі на тым беразе?
Ці ўсплыла яна са дна?
З дна пясчанага, рачнога?
Ці, быць можа, з дна другога,
дна дрымотнага, глухога,
дна глыбіннага душы?
Сож маўчаў. І ноч маўчала.
Толькі песня ўсё гучала
у начной цішы-глушы.
«Ой, у полі, ой, у полі
ды не рэчка цякла.
Ой, у полі, ой, у полі
ды не быстра цякла.
Былі рэчкі — паўсыхалі, харошыя —
паўміралі.
Така доля мая, горка доля мая...»
Былі рэчкі — паўсыхалі,
харошыя паўміралі,
харошыя — паўміралі...
Лёс гарчэй ад палына.
Аб якім пяецца часе?
Што тут маецца на ўвазе?
Што за песня ўсплыла?
Калі клопат ёсць любоўны,

тады сэрцы паўнакроўны,
тады рэкі поўны, поўны,
серабрыцца плёс рачны.
А не любяць — тады губяць,
а не любяць — і не рупіць
захаваць, засцерагчы.
Небяспечней ад халеры
душ і рэчак браканьеры,
няма шкодзе іхняй меры,
няма горш на свеце зла,
няма волі, злейшай болей...
«Ой, у полі, ой, у полі
ды не рэчка цякла...»

***

Калі чакаў я ранку
у парку над ракой,
мне трызніліся словы
песенькі такой:
«Жылі-былі мы з Сожам,
былі-плылі.
Хацелі мы з Сожам
цеплыні.
Гулі завеі, сцюжы,
былі ільды,
мы не спынялі з Сожам
сваёй хады.
Мы зналі: калі мала
цяпла сасне,
то мы павінны самі
сагрэць сябе.
Плылі-былі мы з Сожам
на сонцы і ў цяні.
Хацелі мы з Сожам
чысціні.
Думалі мы з Сожам
пра адно:
каб бруд усялякі —
на дно, на дно,
каб даплысці ўсё ж нам
да мэты, што ўдалі...
Жылі-былі мы з Сожам,
былі-плылі».

***

Хто быў у Гомелі аднойчы —
запомніў парк...
У парку тым,
на беразе рачным, крутым,
пракаратаў я рэштку ночы.
Пад дрэвам —
ясенем ці вязам —
пасаджаным калісьці князем
(пасаджаны шмат год назад
быў феадалам гэты сад),
я прымасціўся з сакваяжам.
Стаміўся усё-ткі, проста скажам.
Спачатку сеў, пасля прылёг,
працягваючы дыялог
з ракою, з цішынёй начною,
з жанчынай слаўнаю адною.
Так і сустрэў я сонца ўсход,
які не бачыў я сто год.
Шчакою, звернутай да ўсходу,
адчуў я цёплую лагоду.
Я па шчацэ правёў рукой
і зноў цяпло адчуў шчакой.
Адчуў той дотык я на скроні.
Прачнуўся, вочы я працёр...
Перада мной палалі промні,
палала сонца, як касцёр!
І быў касцёр той —
на паўнеба!
Быў той касцёр —
на паўзямлі!
І я сказаў сабе: замры!
Глядзеў, захоплены, я нема.
Гуляла сонца.
Свежа, весела.
Гуляла молада яно.
Так разгулялася — ажно
запырскала прастор увесь яно.
Прыціхлі дрэвы,
травы,
ветры...
І з той гульні, з таго агню
шар выкаціўся ясна-светлы

і набіраць стаў вышыню.
І засвяціў ужо ўсур'ёз —
гульня гульнёй,
а справа справай,—
адбіўся ў мірыядах рос,
і зашумелі ветры, травы,
у рух прыйшлі, пайшлі у рост.
Цягнуліся ўсе да свяціла,
яго лічылі ўсе сваім,
яно ж сваімі ўсіх лічыла,
яно свяціла ўсім жывым.
Такое тут было сваяцтва,
такая еднасць тут была —
жыцця зямнога і святла,
быцця зямнога і цяпла,
што я не мог не засмяяцца,
не ўзрадавацца у душы!
(І сам сабе сказаў пры гэтым:
калі ты лічышся паэтам,
дык вось пра гэта напішы.)
Усе былі мы сонцу рады...
Ды вось, нахмурыўшы чало,
падумаў я, што недзе гады
павыпаўзалі з нор і рады,
што сонца і для іх ўзышло;
яго цяпло, яго святло
пераўтвараюць гады ў яды.
Настрой мой крыху быў азмрочаны.
Ды тут жа адмахнуўся я
ад думкі той, ад гадаўя
з яго балотнаю абочынай.
Яно было, і ёсць, і будзе.
Ды справа ўсё-такі не ў ім,
а справа ў гэтым светлым цудзе,
якое сонцам завуць людзі,
якое робіць вёсны з зім,
дзень з ночы і вясёлку з хмары,
якое свеціць зноў для нас,
не патрабуючы ў адказ
ні ўзнагароды, ні ахвяры.
Нам сонца, думаў я далей,
дае высокі ўзор служэння,
вялікадушнага свячэння...
Свяціла сонца ўсё святлей.

Свяціла сонца, ярка ззяла.
Надзею новую ўсяляла.
Я паглядзеў уніз, на Сож,
і толькі вымавіў:
«Прыгож...»
Ён быў амаль непазнавальны,
паўночны субяседнік мой.
Іскрыліся на сонцы хвалі
ва ўсёй сваёй красе рачной.
Дымкі апошняга туману
сплывалі ў сінь, сплывалі ўдаль.
І не было ўжо амаль
трывожнага начнога стану.
Што, Сож, жывём?
І жыць-плыць будзем?!
Цябе мы, можа, не забрудзім
і не загубім цябе ўсё ж?
Ёсць шансы, Сож!
Ёсць сонца, Сож!
Яго мы скінулі з рахунку,
шукаючы ўначы ратунку
ад нечыстот,
брыдот,
атрут,
а сонца, бачыш, тут як тут.
Выходзіць, каб рабіць прагнозы,
патрэбен не адзін настрой,
тым больш настрой пары начной,—
патрэбен і разлік цвярозы.
Патрэбен сонечны усход,
яшчэ з усходам трэба раіцца.
Заўважыў правільна народ:
мудрэйшая за вечар раніца.

## ЯБЛЫНЯ Ў ГОРАДЗЕ

Сумнае, трэба сказаць, відовішча —
яблыня ў горадзе,
на месцы былога дворышча.
Той дворык, той домік
пайшлі на знос.

І ў яблыні нашай такі вось лёс...
Ля тратуара, навідавоку
стаіць яна, яблыня,— збоку прыпёку.
Яе абыякава абцякае
рака людская, гарадская.
Хто гляне на яблыню, а хто — не,
а хто безуважна абміне.
Міма ідзе лектар, ды не садоўнік.
Міма ідзе дырэктар, ды не садоўнік.
Міма ідзе інспектар, ды не садоўнік.
Ды не садоўнік, не садавод.
Дзічэе яблыня з году ў год.

Ну так. Як гэта ні парадаксальна,
а побач з культурай асляпляльнай,
сярод яе даброт і выгод
дзічэе яблыня з году ў год:
драбнее ліст, гарчэе плод.

Міма ідзе аператар, ды не садоўнік.
Міма ідзе інкасатар, ды не садоўнік.
Міма ідзе літаратар, ды не садоўнік.
Ды не садоўнік, не садавод.
Дзічэе яблыня з году ў год.

Праўда, кажуць, мінулай вясною
дзіўнае штосьць адбылося з ёю:
яблыня раптам заквітнела,
закрасавала ружова-бела.
Як быццам брала яна рэванш.
Як быццам казала камусь: «Заўваж!»

Што адбылося з дрэвам? У чым сакрэт яго цудоўнага ажыўлення? Сакрэт увогуле просты. Да аднаго з жыхароў дома, што насупраць, прыехаў на зіму аднекуль з-пад Бачэйкава яго стары бацька, заўзяты садавод. Сядзеў безвылазна цэлымі днямі ў цёплай гарадской кватэры. У адзіноце, калі сын і нявестка былі на працы. З сумам выглядаў у вокны — то ў адно, то ў другое. Заўважыў яблыню. І вось калі крыху пацяплела, стала брацца на вясну і стары выйшаў з дому, то першым чынам накіраваўся да яблыні. Пады-

шоў да яе, абышоў яе з усіх бакоў, дакрануўся да ствала, пакратаў галінку... Назаўтра падаўся зноў да яблыні з нажоўкай і скрабком і стаў абразаць сухія галіны і ваўчкі, саскрабаць адмершую кару. На наступны дзень стары зноў пайшоў да яблыні, зноў доўга завіхаўся каля яе. І калі ў яго пыталіся вечарам, што ён рабіў, чым займаўся днём, ён так і адказваў: «Хадзіў да яблыні». І яшчэ дадаваў: «Да пепінкі, што праз вуліцу расце. Закажанела яна зусім». Так вось садоўнік і яблыня знайшлі былі адно другога. Але ненадоўга. Бо вясной дзядуля падаўся дахаты ў сваё Залессе, што пад Бачэйкавам.

І невядома, што будзе з яблыняй далей...
Міма ідзе кандуктар, ды не садоўнік.
Міма ідзе канструктар, ды не садоўнік.
Міма ідзе інструктар, ды не садоўнік.

І гэтак далей.

## ДЗЕЦІ РАТУЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ...

*З паэмы «Ствараецца новая казка»*

Яна, новая казка,
атрымала нечаканы паварот.
(Ці, можа, не такі ўжо і нечаканы?)
Які, на жаль, не мае нічога агульнага
з перамогай дабра над злом, з хэпі энд.
Ледзьве дарослыя разам з дзецьмі
крыху утаймавалі ваенны атам,
як выбухнуў атам «мірны»,
як дыхнуў смертаносным самумам
чарнобыльскі рэактар
і апаліў перш за ўсё дзяцей,
крохкія дзіцячыя істоты...
І вось нашых прыхопленых радыяцыяй дзяцей
ратуюць дзеці другіх краін,
працягнулі руку дапамогі скауты
з іх высакародным даўнім дэвізам
«Ні дня без добрага ўчынку!».
(Тут новая казка пераклікаецца са старой.)

Дзеці з «чыстай зоны»
частуюць дзяцей з «зоны бруднай»
чыстым малаком і чыстымі гамбургерамі,
і, трэба думаць, чыстыя,
у адрозненне ад нас, дарослых,
іх агульны дзіцячы смех,
іх гульні, іх пачуцці, іх сяброўства.
Газеты, чытаю, паведамляюць,
што фінскія скауты нават гатовы паказаць
сваім беларускім равеснікам Лапландыю,
дзе, як вядома, «нарадзіўся» Дзед Мароз
і дзе можна сустрэць сапраўднага шамана...
Ствараецца новая казка
з чарнобыльскай быллю папалам.
Ствараецца новая казка на тэму:
«Дзеці і атам, дзеці і тэрмаяд».

## ПЕРАСЦЯРОГА

Людзі, не збівайцеся у статак!
Знаю: моцны статкавы пачатак,
знаю: тужым мы па ім падчас,
знаю: так і падмывае нас —
збіцца ў статак,
збіцца і згубіцца
недзе ў самай гушчыні яго,
збіцца ў статак,
збіцца і пазбыцца
вобліку і голасу свайго.
Збіцца ў статак,
важаку скарыцца
і ў той пакорнасці сляпой
тупаць да агульнага карытца,
тупаць на агульны вадапой.
Гэта так спакусліва:
скарыцца,
у саку агульным растварыцца.
Гэта так спакусліва,
так цешыць:
ад цябе нічога не залежыць.

Гэта так заманліва,
так вабіць:
спіць тваё сумленне,
твая памяць.
Гэта так заманліва...
І ўсё-ткі
як бы гэты зман ні быў салодкі,
не прымайце, людзі, гэты зман,
не прымайце стаднасці дурман.
Вы рабіце разам свае справы,
вы варыце разам свае стравы,
ешце разам з аднаго катла,
грэйцеся ля аднаго кастра.
Пры жаданні праспявайце хорам,
павадзіце разам карагод.
Ёсць пытанні — сабірайце кворум,
сабірайце форум, веча, сход.
Можаце патупаць нават строем,
калі вас збярэцца больш чым трое
(калі менш, які там будзе строй,
не скамандуеш: «Рады уздвой!»).
Толькі не збівайцеся ў атару,
толькі не губляйце свайго твару.
Вы жывіце разам, ды не ў гурце,
а на іншым, на разумным грунце.
На другой яднайцеся аснове —
на аснове дружбы і любові,
на аснове чалавечай роднасці,
на аснове чалавечай годнасці.
Збіцца ў статак —
гэта не адзінства,
збегчы ў статак —
гэта дэзерцірства.
Гэта дэзерцірства пад агнём,
пад святлом, што розумам завём.

## ДЗІВАК ЧАЛАВЕК

Дзівак чалавек...
Глядзіць на расінку макавую
і цэлае сонца бачыць перад сабой.
Дзівак чалавек...
Бярэ звычайную ракавіну
і чуе ў ёй акіянскі прыбой.
Дзівак чалавек...
Бачыць сцяжынку гладкую,
а марыць аб трудных, цярністых шляхах
з іх круцізною, з іх небяспечнай загадкаю
і будзе ісці, пакуль мае сілу ў нагах.
Дзівак чалавек...
Са стратаю непапраўнаю
не мірыцца ён нізашто ў душы.
З няпраўдай не мірыцца
і з крыўднаю праўдаю
не хоча мірыцца —
хоць кол ты на ім чашы.
Дзівак чалавек...
Яму ў многім адмовілі.
А ён не здаецца,
а ён не спіць па начах.
Ён верыць усё ў свой перпетуум-мобіле,
у панацэю, у цудадзейны рычаг.
Дзівак чалавек...
Яму — Хірасіму, Асвенцім,
яму, замест імя,—
асвенцімскае таўро.
А ён паўтарае,
што ёсць дабро на свеце,
што будзе дабро
і што пераможа дабро.
Дзівак чалавек...
Не можа не спадзявацца,
не можа не верыць,
не можа ніяк!
Дзівак чалавек...
І гэта яго дзівацтва
ратунак яго,
яго чалавечы знак.

* * *

Маўчанне бывае celebrate рознае.

«Спартак, Спартак...
Хоць слова мне скажы!..»
У роспачы хапаецца за ногі.
«Спартак, Спартак...»
У зале плачуць многія.
Ды і ў мяне самога ў горле ком,
і сам слязіну я змахнуў тайком...
Спартак, Спартак!
Героі ўсіх эпох!
Ці не такі ваш лёс быў у фінале?
Як нехта моцна спаў, вас распіналі,
вы ціха на крыжы сваім каналі,
і білася жанчына каля ног.

## ВАРЫЯЦЫІ НА ТЭМУ «ГЕФЕСТ — ДРУГ ПРАМЕТЭЯ»

### 1. ДАВЕДКА

— Ваша імя Праметэй?
— Так, Праметэй.
— Вы здабылі агонь для людзей?
— Агонь для людзей.
— Нацыянальнасць — міфічны грэк?
— Міфічны грэк.
— Час нараджэння — антычны век?
— Антычны век.
— Вы па паходжанню тытан?
— Так, тытан.
— Вашым ворагам быў тыран?
— Так, тыран.
— Ён прыкаваў вас да скалы?
— Так, да скалы.
— Вашу печань ірвалі арлы?
— Ірвалі арлы.
— Вы абліваліся крывёй?
— Так, крывёй.
— Вы пакрываліся карой?
— Так, карой.

— А дзе былі людзі, дзеля якіх?..
— Дзеля якіх...
— Не памаглі ні грэк, ні скіф?
— Ні грэк, ні скіф.
— Ды вы не былі адзін як перст?
— Не быў як перст.
— У вас быў добры друг Гефест?
— Быў друг Гефест.
— Што ён рабіў, ваш добры друг?
— Мой добры друг...
— Каваў па волі багоў ланцуг?
— Каваў ланцуг.
— Каваў ланцуг з жалеза таго?..
— З жалеза таго...
— ...Што здабылі вы для яго?
— Здабыў для яго.
— І ў кузні той, дзе разам з ім?..
— Дзе разам з ім...
— Кавалі вы шмат лет і зім?
— Шмат лет і зім.
— І сам Гефест, ніхто другі?..
— Ніхто другі...
— Надзеў вам тыя ланцугі?
— ...Мне ланцугі.
— І распінаў вас на скале?
— ...Але...

## 2. ПЕСНЯ КАВАЛЯ ГЕФЕСТА

Высока мой молат ўзлятае: гэ-эх!
Горн мой шугае.
Толькі ўздыхае стары мой мех.
Сумна ўздыхае.
Як быццам вядома меху таму
нешта такое,
што не дае адному яму
сёння спакою.
Як быццам прадбачыць бяду адну,
што наплывае.
Як быццам сваю і маю віну
ён прадчувае.
Горн мой іскрыцца і гудзе.

Молат лятае.
А Праметэй усё не ідзе.
А мех уздыхае.

### 3. ПРЫЗНАННЕ ПРАМЕТЭЯ

Не страшны мне, Гефест, багоў пагрозы.
Страшней мне друга даўняга згубіць.
І ў тым сакрэт маёй метамарфозы,
што з нейкае пары я стаў любіць.
Калі сышоў аднойчы на зямлю —
адчуў я раптам, што зямлю люблю...
Люблю зямлю, люблю я ўсё зямное,
люблю я ўсё і ўся жывое,
і мой агонь — агонь любві маёй,
не ведаю, нябеснай ці зямной.
Глядзеў на свет я новымі вачыма,
не ведаючы, як далей мне быць.
Ды ведаў: не любіць больш немагчыма,
магчыма толькі ўжо адно — любіць.
Любіць...
Нязвыклым быў мне новы стан.
Па-новаму душа была сагрэта.
Сказаў я: «Праметэй, сын Іяпета,
тытана сын і сам тытан!
Даволі без любові жыць! Любі!
І імем той любові ўсё рабі!»
Стаў іншым я ў сваім змаганні.
Па-іншаму я гавару з багамі.
Зеўс хоча пасварыць мяне з табою,
уводзіць у душу мне: ненавідзь!
А я ў адказ яму: «Буду любіць!
Любоў даражыць цаной любою!»
Зеўс пагражае гнеўна: «Пагублю!
Я да скалы прыб'ю на краі света!»
А я ў адказ яму на гэта:
«А я край света палюблю...»
«Арол піць будзе кроў тваю!»
«Арла таго я палюблю...»
«Святла пазбаўлю, асляплю!»
«А я змрок вечны палюблю...»

* * *

А ты ідзі, брат, чынна,—
так раіў мудры грэк,—
а ты ідзі як мужчына,
ідзі як чалавек.
Справа будзе вораг,
злева будуць сябры,—
а ты ідзі, бо дораг
табе твой шлях зямны.
Будуць пагрозы, парады,—
не вельмі напружвай слых.
Будуць знаходкі і страты,—
спыняйся толькі на міг.
Бо ўсё гэта не прычына,
каб дальніх не бачыць вех...
І ты ідзі як мужчына,
ідзі як чалавек.

* * *

Ваўкоў баяцца —
у лес не хадзіць.

Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць.
У лес не хадзіць — не мець лясіны.
Лясіны не мець — не мець хаціны.
Хаціны не мець — дзяцей не радзіць.
Словам, баяцца ваўкоў —
не мець дачок і сынкоў.
Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць...
Не бачыць ні грыба, ні арэха,
не чуць ні шуму ляснога, ні рэха,
па сцежцы цяністай не блудзіць,
цудаў не адкрыць,
казак не стварыць,
вершаў не пісаць,
праўды не казаць
і нават саміх ваўкоў
не бачыць павек вякоў...

* * *

Абрастаем.
Паперамі, рэчамі,
абавязкамі,
звычкамі,
стрэчамі.
Абрастаем болямі, охамі.
Як валун абрастае мохам,
абрастаем мохам абставін.
Абрастаем даўгамі, хвастамі.
Абрастаем, як бераг кустамі.
«Дзе чужое, дзе наша? —
пытаем.—
Дзе расцём, а дзе абрастаем?» —
Мы пытаем.
Гэта няпроста —
абрастанне адрозніць ад роста.
На душы маёй —
шчэць густая.
Адчуваю:
ідзе абрастанне.
Адчуваю: ідзе абрастанне.
Ды спыніць яго я не ў стане.
А быць можа,
спыніць я ў стане?
Можа, ўзяць
ды узняць паўстанне?
Можа, ўсёю першаасноваю
абудзіцца па-вясноваму?
Жыць пачаць са старонкі новай —
яшчэ чыстай,
яшчэ вясновай?
Толькі як жа мы паўстанем,
калі кожны міг абрастаем,
расстаёмся з самімі сабою —
нехта з боем,
а нехта без бою...

* * *

Мы напачатку зазналі страху,
перад прыродай падалі ніц.
Потым лятаць вучыліся ў птахаў,
агонь здабываць — у навальніц.
Плаваць — у рыб,
у пароды кацінай
мы вучыліся паляваць,
шумець — у ветра,
у кракадзіла —
фальшывыя слёзы праліваць.
Быць задуменнымі — у воблак,
быць спакойнымі — у дрэў.
Да зор узнімаў чалавек свой воблік
і, гледзячы на іх, мудрэў.
Па прыкладу скал
ён незгінальны.
І тут, і там, як бачым, ён
і не такі ужо арыгінальны,
і не такі геніяльны ён.
Проста вучыўся ён заўсёды,
і тут, і там — вучобы плён,
уплыў настаўніцы-прыроды,
яе палон, яе шаблон.
Іншая справа —
стаць чалавечным.
Тут узорам не можа быць
прырода з законам яе адвечным:
«З ваўкамі жыць —
па-воўчы выць».
Гэты закон не патурае
чалавечнасці.
Згодна з ім,
добрым быць — не натуральна,
больш натуральна —
жорсткім і злым.
І ўрок, і ўзор, і прыклад добры
тут у самім сабе знайдзі
і ў тых, хто да цябе падобны,—
знайдзі і ў новы свет ідзі!
Ідзі! Будзь мужным і неспакойным
і на шляху сваім крутым
ірві з законам тым спаконным,

з законам тым,
шаблонам тым!
Ідзі! Адольвай самавукам —
няма ж узору навакол! —
сваю нялёгкую навуку,
сваю цяжэйшую са школ!
Ідзі! Хоць век,
хоць цэлую вечнасць! —
як ходзяць ветры супраць рэк.
Ідзі і помні:
чалавечнасць,
яна — ад слова «чалавек».

* * *

Хто вынайшаў веласіпед? —
над гэтым не вельмі думае свет.
Ён круціць сабе педалі,—
што яму паданні!
А першыя паязды, масты?
Ці важна, кім яны створаны?
Важна тое, што паязды
сёння бягуць ва ўсе стораны.
Лямпачка над маёй галавой —
крыніца энергіі светлавой.
Каму тут належыць прыярытэт?
Не думаю ніколі,
хаця, здаецца, і бачыў партрэт,
хаця і вучыў у школе.
Проста ўдзячны я яму,
удзячны за ўсё за гэта.
І ў гэтым сэнсе продку майму
не пагражае Лета.
Справа не ў нашых імёнах, не ў тым,
хто, дзе і калі,— не ў славе.
Слава, як вядома, дым.
Справа — у добрай справе.

## ЗАКОН ШЧОДРАСЦІ

Не ведаю, колькі патрэбна вучонасці
для шчасця, для дружбы, для любві.
Ды паспрабуй усё гэта ўяві
без шчодрасці!
Нічога не выйдзе ў цябе, бадай.
Добрыя нашы ўсе парыванні,
як кветкі, хочуць, каб іх палівалі,
як поле, хочуць: расці, ўраджай!
Тут, як на сяўбе парой вясновай,
дзе поўнаю мерай сей і рабі!
У шчасця, у дружбы, у любві —
тая ж аснова.

* * *

Не ўсе і не заўсёды
вяртаюцца пчолы ў соты
з ношаю сваёй —
гінуць разам з ёй.
Не ўсе дапаўзаюць мурашкі:
груз у мурашкі цяжкі.
І птушкі па вясне
не ўсе далятаюць, не.
Упаў журавель на дасвецці,
выбіўся з сіл і надзей...
Тое ж і ў нашым свеце,
тое ж і ў нас, у людзей.

* * *

Ляцеў груган.
                    Сеў на курган.
Агледзеўся навокал.
Знаёмае штосьці заўважыў груган
сваім старэчым вокам.

Ці то гэты дуб, ці то гэта косць,
ці роў той — яму нагадалі
яго, груганову, маладосць,
яго, груганову, балі.
Здаецца, вось тут,— бо той жа роў,
тыя ж валун і дрэва,—
ляжалі трупы, стаяла кроў,
еш — колькі табе трэба.
Здаецца, вось тут
                    і быў той баль,
тая салодкая трызна.
Калі то было? Яму ж амаль
дзвесце, калі не трыста.
Калі насыпаны гэты курган?
Хто ведае, хто знае...
Сядзіць груган.
                    Глядзіць груган.
Сваю маладосць ўспамінае.

## ТУГА МЕТЭАРЫТА

Адвергла мяне неба.
Зямля не прыняла.
Ляжу на зямлі я нема.
Чужая мне яна.
І я для яе іншародны.
Гляджу ў блакіт мне родны.
Я перад ім у даўгу.
Ды ўжо ўзляцець не магу...

* * *

Паміраюць ад кулі шалёнай,
ад вады, ад жуды, ад бяды.
І яшчэ — ад зялёнай-зялёнай,
ад зялёнай, як раска, нуды.

Паміраюць марудна-марудна.
Паміраюць шмат дзён і начэй.
Паміраюць марудна і трудна,
паміраць нечакана лягчэй.
І я лёс свой прашу:
«Калі ласка,
дай пражыць мне мае гады
без зялёнай-зялёнай, як раска,
без зялёнай смяртэльнай нуды!»

## ТРЫ ЛЕПШЫЯ СПОСАБЫ ЗАВАРВАННЯ ЧАЮ

### Першы

Лепшы спосаб заварвання чаю —
калі тым чаем сяброў прывячаю.

### Другі

Лепшы спосаб заварвання чаю —
калі любоў яго суправаджае:
усмешка... пяшчотны позірк... лагода.
Словам, заварка, любоў ды згода.
Тады да чайнай самой цырымоніі
яшчэ дадаецца і водар гармоніі,
тады ў дадатак да цвету чайнага
дае знаць і прысмак шчасця звычайнага.

### Трэці

Лепшы спосаб заварвання чаю —
той, што без злосці, без адчаю,
без слова нядобрага, аблыжнага,
без абварвання костачак бліжняга,—
той, што радасць жыцця пацвярджае.

## АПТЫМІСТЫЧНЫ ВЕРШ

Пройдзе дзень без падзеі,
без сустрэчы, без песні...
Нехта прыкіне ў пасцелі:
«На суткі бліжэй да пенсіі».
Нехта адзначыць сонна,
зробіць вывад сумны:
«Што ўчора, тое і сёння,
дзень і ноч — прэч суткі».

Пройдзе дзень без падзеі,
без любві, без надзеі,
схіліцца дзень да вечара,
вечарам рабіць нечага.

А трэба, каб нешта рабілася,
каб нешта адбывалася,
каб хмара аб хмару білася
і дажджом праліvалася.
Трэба, каб пчолы раіліся,
трэба, каб песні складаліся,
трэба, каб гнёзды рабіліся,
трэба, каб казкі стваралiся.
Каб людзі сустракаліся,
зналіся ў дружбе шчырай,
каб зналіся-кахаліся
мужчына і жанчына.
Калі сустракаюцца двое,
сваё каханне падзеляць,—
гэта найлепшая доля,
з усіх падзей — падзея.
Трэба, каб нехта, каб нешта...
Хай там адчай ці трывога!
У Бога дзён не рэшата?
Дык не ў нас, а ў Бога.
А нашы дні ўжо злічаны,
а нашы суткі ўжо змераны.
Згараюць зоркі-знічкі,
а новых няма ў рэзерве.
І ў нашага лёсу ў запасе
не цэлыя стагоддзі,
і мы за тое ў адказе,
як нашы дні праходзяць.

Хай там узлёт ці падзенне,
удача ці няўдача,—
толькі ні дня без падзеі,
без радасці і плача.
Толькі ні дня без падзеі!

## ЖЫЛІ-БЫЛІ...

Жылі-былі...
Так пачынаюцца казкі.
Задоўга да нас людзі жылі-былі.
Справы рабілі, хацелі любові і ласкі,
ірвалі краскі.
І адышлі, адплылі.
Жылі-былі...
Словы гучаць эпітафіяй.
Жылі-былі.
І адышлі, адплылі.
Толькі над намі лятаюць іх душы птахамі,
толькі сляды іх цямнеюць усё на зямлі.
Жылі-былі...
Скончацца нашы краскі,
справы і ласкі,
скончыцца наш час.
Жылі-былі...
Так пачынаць будуць казкі.
І гэтыя казкі будуць ужо і пра нас.

## ТРЫ ЦІШЫНІ

Аднекуль з касмічнай вышыні
зыходзяць да нас тры цішыні.
Першая — вечаровая.
Тая, што, як маг,
ахутвае, зачароўвае —
лёгкі ў мага ўзмах.

Тая, што на вейкі
і вусны кладзе пячаць:
«Хопіць з вас,
чалавекі,
хопіць дбаць!
Спаць, спаць!
Спяць куты і нішы,
спяць каты і мышы,
дзеці і птушкі спяць.
Людзі, цішай, цішай!
Люлі, хопіць дбаць!
Спаць, спаць!
Чые там крокі скрыпяць?
Спаць, спаць!»
Ёсць цішыня-паўночніца,
начная цішыня.
Дум бяссонных памочніца,
вярхоўны іх старшыня.
Застацца з той цішынёю,
з ёю, сівой савой,—
стаць сутнасцю сваёю,
стаць самім сабой.
Застацца з ёю — гэта
у той увайсці Сезам,
дзе сам-насам з сусветам,
з вечнасцю сам-насам.
І ёсць цішыня світальная,
ёсць яшчэ цішыня
першага вітання,
першага агня.
Яна заводзіць гадзіннікі,
і разам з імі яна
пазвоньвае-падзіньквае,
і — трубіць цішыня.
Трубіць ціша світальная
у свой сярэбраны рог,
заве ў далі дальнія,
да новых спраў і дарог.
Трубіць ціша світальная,
крыштальная, развітальная,
і патанае яна
у вадаспадзе дня.

## ХЛОПЧЫК ГЛЯДЗІЦЬ

*Унуку Янку*

Хлопчык глядзіць...
Вачам сваім веру — не веру.
Адкуль ты прыйшоў
у дом гэты, гэту кватэру?

Хлопчык глядзіць...
О Божа! О маці часна́я!
Нічога не знае ён.
Мяне ж ён, здаецца, знае?

Хлопчык глядзіць...
Глядзіць проста ў вочы.
Хлопчык глядзіць...
Як быццам спытаць нешта хоча.

Я ведаю — што.
Няма ў мяне толькі адказу.
Калі ж ён і ёсць —
не вымавіш так вось адразу.

Хлопчык глядзіць...
Позіркам, поўным наіву.
Поўніцца сэрца маё
трывогай шчымлівай, шчаслівай.

Хлопчык глядзіць...
Я ў позірку тым дзіцячым
бачу пачатак сябе,
сваё прадаўжэнне бачу...

# ЗМІТРОК МАРОЗАЎ



## *Парог сумлення*

* * *

Сэрца вёскі маёй —
Студня з чыстай вадой,
Ты дазволь мне з дарогі
Табе пакланіцца,
Каб з крыніцы жывой
Жураўлінай рукой
Зачарпнуць мёд зямны
І са смакам напіцца.
Мне спасцігнуць дазволь
Твой нязведаны боль,
Ты дазволь мне трывогай
Тваёй прычасціцца.
Сэрца вёскі маёй —
Студня з чыстай вадой,
Хай ніколі твая
Не знямее крыніца.

## ПАРОГ СУМЛЕННЯ

У кожнага ён свой, парог сумлення,
Яго пераступіць — сябе згубіць.
«Ніколі, сын, не падай на калені,
Бо на каленях век ты будзеш жыць»,—

Матулі вобраз выплыў на імгненне
І згас... А ў цішыні начной гучыць:
«У кожнага ён свой, парог сумлення,
Яго пераступіць — сябе згубіць».

* * *

З баразны пачынаецца поле,
З жаўруковай запеўкі — вясна...
У мяне найшчаслівая доля
І Радзіма навекі адна.
Уяўлю сябе спелым насеннем,
Што калоссем імкне ў сіняву,
І, адчуўшы зямлі прыцягненне,
Прашапчу трапяткое: «Жыву!»

* * *

Даўніной прычашчоны не раз,
Як акрайцам духмянага хлеба,
Берагу я матулі наказ:
— Паважаць, сыне, працу трэба!
...Паважаць, сыне, працу трэба —
Гэтым дзень пачынаецца мой.
Словы тыя — ўрадлівая глеба,
Я ж — зярнятка малое у ёй.

* * *

Калі сцякае з небасхілу
Па кронах дрэў святло зары
І пад туманам шызакрылым
Прыціхнуць жвавыя вятры,
Калі стамлёны сейбіт з поля
Вядзе дадому будня цень,
Тады я думаю міжволі
Пра свой прапахлы потам дзень.
Адыдзе ён...
Ды на світанні
Праз век, а мо праз сто вякоў
Пасля пакутнага чакання
Дзень гэты вернецца ізноў.
І ты, нашчадак яснавокі,
З ім адпалаеш на сяўбе...
І раптам я, такі далёкі,
Зраблюся блізкім для цябе.

* * *

У бясконцых пошуках роднай душы
Я ўвесь час натыкаюся
на скамянелыя постаці,
Якія некалі называліся людзьмі.
Гэтак жа, як і я, яны любілі жыццё,
Кахалі, верылі, спадзяваліся
І... спакваля камянелі,
Не знаходзячы для сябе апірышча
У гэтым непагодлівым, трывожным жыцці.
Здзіўляе тое, што кожная постаць
Не адчувае сваёй скамянеласці
І па-ранейшаму лічыць сябе жывой істотай.

## ЧЫТАЮЧЫ ВЕЧНУЮ КНІГУ

«Не забі.
Не ўкрадзі.
Не змані...» —
Як маленне, шапчу ў цішыні.
Ажывае ў глыбінях душы
Вешчы голас: «Жыццё беражы».

Покуль зла ў белым свеце стае,
Памятай запаветы мае:
«Не забі!..»
Катаў я пракляну!
«Не ўкрадзі!..»
Лепш сам лягу ў труну!
«Не мані!..»
Божа мой, барані!
Бо такія падманныя дні...

## МОЙ ЛЁС

Зярнятка. Колас. Жытні хлеб...
Праз пакаленні...
Мой прадзед з голаду аслеп,
Але насенне
У жмені сыну перадаў,
Каб той пасеяў...
Дзядуля жыта сам не зжаў —
Вайны завея
Яго пад Гдыняй узяла...
Бабуля жала,
А бацьку плуг перадала
Свайго Міхала.
Пасеяў бацька...
Да нябёс
Мой дзень вясенні...
Зярнятка. Колас. Хлеб... і лёс —
Праз пакаленні.

* * *

Карэц вады і луста хлеба
Ды солі горкае драбок...
Пад поўняй матчынага неба
Я ціха баўлю вечарок.

Сад пахне яблычным туманам,
Знямоглы ветрык лашчыць скронь,
І свеціць мне лісток барвяны,
Як развітальная далонь.

Матуля спіць пад іншым небам,
Мне перадаўшы, як зарок,
Карэц вады і лусту хлеба
Ды солі горкае драбок.

* * *

Ноч сышла нячутнаю хадою
На палі, мядовыя сады,
Басаногі месяц за ракою
Пасвіць гурт хмурынак маладых.

Спяць лугі і ціхія прысады,
Вецер дрэмле, як залётны госць,
І халодных зорак мірыяды
Аздабляюць неба прыгажосць.

Ды няма чамусь заспакаення
Ад спаткання з роднай стараной.
Мне б упасці моўчкі на калені,
Да зямлі прыціснуцца шчакой.

Мо тады спачну я ад трывогі
За куточак гэты, за людзей
І за той вунь месяц басаногі,
Што за статкам воблачкаў брыдзе.

* * *

Землякоў пазнаю па мове,
Меладычнай, як песня жней,
Дзе пяшчота у кожным слове
Да глыбіняў душы кране,

Па напеве жанчын у свята:
«...у чужым двары ваду бяру...»
І па шчырасці рук шурпатых...
Землякоў пазнаю па дабру.

* * *

Аляксандры, Марылі, Домны —
Сінь вачэй і пяшчота рук.
Беларусі маёй мадонны,
Мовай вольнаю гавару.

Цемрай ночы вам зрок калолі,
Не хапала вам днём святла,
Ды ніколі ў жыццёвым полі
Вы не сеялі зерне зла.

Падраслі непрыкметна ўнукі,
Кожны ў хаце жаданы госць...
Я цалую бабулі рукі —
Пазірае мне ў твар маладосць.

## РОДНАЕ

Хлебная, спеўная вёска Язбы́,
Шэпчуцца з вечарам цёплым дубы,
Поўня мядовая з бору ўстае,
Ходзяць на дыбачках мары мае,
Каб незнарок цішыню не спужаць,

Жаўранкі, буднем стамлёныя, спяць.
Коней дзяцінства не чуць у лугах,
Слёзы — расою буйной на вачах.
Жытняя родная вёска Язбы —
Ціша і жаль, верставыя стаўбы...

* * *

Лісцвянае полымя з гаю
Паволі спадае на дол,
З палёгкай зямля спачывае
І ловіць лістоту ў прыпол.
Салодкая восені стома
Кладзецца і мне на душу.
Што будзе са мной, невядома,
Ды сну для сябе не прашу.
Хай спяць валуны ля дарогі,
Спавітыя мохам вякоў,
Мяне ж яшчэ клічуць дарогі
Да новых таемных высноў.
А значыць, патрэбна спяшацца
І крочыць наперад хутчэй,
Туды, дзе вятры табуняцца
Пад свіст ачышчальных завей.

* * *

Будзіць у людзях чалавечнасць
Не гучным словам — дабратой...
Імкнуся ў час падставіць плечы
Тым, хто падсечаны бядой,
Бо ўдвух лягчэй праз дні і ночы
Нягоды ўсе перамагчы...
Хто зведаў гора хоць аднойчы —
Услых аб гэтым не крычыць...

* * *

Матчыным парэпаным рукам,
Што мяне кармілі, апраналі,
Жыту, перапёлчыным лугам,
Што маё маленства калыхалі,—
Пакланюся!

Бацькавай крыніцы, што вадой
У спякоту песню наталіла,
Той сцяжынцы вузкай палявой,
Што мяне вяла праз небасхілы,—
Пакланюся!

Добрым, шчырым людзям, без якіх
Я б не зведаў чар зямнога раю,
За цяпло, якое я спасціг,
І за горыч, што яшчэ пазнаю,—
Пакланюся!

* * *

У штодзённай пагоні
За прывідным багаццем,
У бясконцых пошуках часовых выгод
І капеечных забаў
Марнуецца самае дарагое — жыццё.
Як шкада, што амаль кожны з нас
Пачынае разумець гэта
Занадта позна,
Калі ўжо ні казачнае багацце,
Ні сусветная слава
Не могуць папярэдзіць непазбежнае.

* * *

Люблю цябе, матчына мова,
Да болю. Да слёз уваччу.
Ды толькі сумленнае слова
Па праву свабодным лічу.

Яго не прадаць за даляры,
За танны тавар не купіць,
Яно, быццам Божая кара,
Над здраднікам кожным гучыць.

Дарэмна зласлівец жадае
Да слова ману прычапіць.
Народ мой і гэта стрывае,
І слова ярчэй заблішчыць!

* * *

Калі душа працята болем,
Якога розум не спасціг,
З апошніх сіл бягу на волю,
Да траў і кветак лугавых,
Да дрэў магутных і вячыстых
Пад вечаровай сінявой,
Ад іх размоў і песень чыстых
Сам ачышчаюся душой.
І боль знікае нечакана,
І разумею спакваля:
Нішто не гоіць гэтак раны,
Як мацярынская зямля.

* * *

Бярозавая светласць,
Асінавая сінь,
Рабінавая ветласць,
Кляновая цяплынь,
Ліпнёвая лагода...
Шмат сонечнасці ў дрэў,
Ля іх душа заўсёды
Становіцца мудрэй.

* * *

Аддаю ўсяго сябе дарогам,
Аддаю ўсяго сябе вятрам,
Клопатам штодзённым і трывогам
І жаночым ласкавым рукам,
Тым, што у завею абагрэюць
Кветку, птушанятка і дзіця,
Тым, што ўсе няўдачы перамелюць
У імя кахання і жыцця.

* * *

Той, хто светла кахае,
Не шукае выгод,
У нябёсах крыляе
Ён з душой з году ў год.
Закаханасцю смешны,
У пачуццях — паэт,
Ён з дзіцячай усмешкай
Углядаецца ў свет.
...Я і сам, як выгнаннік,
Сярод тлуму і зла...
Хто не зведаў кахання,
Той не бачыў святла.

* * *

Не будзіце любых на світанні,
Атуляюць сны іх, нібы дзеці.
Слухайце пяшчотнае дыханне,
Цішыню на ўсім бялюткім свеце
Слухайце... Не будзе ўжо вяртання
Гэткаму дзівоснаму дасвеццю...
І, магчыма, выспее прызнанне,
Што навекі любых абяссмерціць.

* * *

Басаногае сэрца спаткаў я ў дарозе,
Адзінокае, як у пустыні агонь.
Я яго да грудзей прытуліў асцярожна,
Ды яно не адчула пяшчоты маёй.

Я маліўся яму, я ў любові пакляўся
Басаногаму сэрцу, што стала маім...
Ды яно на далонях маіх скамянела
І пад ногі мне ўпала праклёнам цяжкім

* * *

Палёт натхнёны пачуцця...
Як самы светлы сон жыцця — каханне.
Пяшчота вуснаў і вачэй,
Напал пачуццяў і страсцей — каханне.
Ласкавы дотык любых рук,
Цяпло спатканняў, золь разлук — каханн.
І пекла рэўнасці, і рай...
Пакуль жыву — не пакідай, каханне!

## БЕРАГІНЯ

*Трыпціх*

*Л****

1

Я б шмат хацеў табе сказаць
Пра нечаканае каханне,
Ды не магу ніяк суняць
У чуйным сэрцы хвалявання.

Відаць, патрэбна памаўчаць,
Бо словы сэнс заўжды губляюць,
Калі пачуццяў не суняць
І вочы ў вочы размаўляюць.

2

Стрымаць пачуцці немагчыма,
Жыву, нібы ў чароўным сне,
Калі дзіцячымі вачыма
Ты пазіраеш на мяне.

У іх пяшчота, і здзіўленне,
І таямнічасць пачуцця,
І лёгкі смутак, і натхненне,
І квецень весняя жыцця.

Здаецца, што за тыя вочы
Я б мог жыццё сваё аддаць,
Каб толькі іх завейнай ноччу,
Як Божы крыж, пацалаваць.

3

Твар прасветлена-млечны,
Белы лён валасоў...
Я шукаў цябе вечна
І нарэшце знайшоў.

Апякла, як маланка,
Мне душу незнарок,

Я цябе не каханкай,
А каханай нарок.

Прыгажуня, багіня,
Беларусі дзіця...
Ты — мая Берагіня
Аж да скону жыцця.

* * *

Вечар. Ціхая дарога.
Колькі ў сэрцы згадак-дум!
То салодкая трывога,
То, як ветру подых, сум.
Лугавых абсягаў млечнасць,
Спавядальны жыта сон...
Дзе імгненне? Дзе тут вечнасць?
Воля дзе? А дзе — палон?

* * *

Сасновы бор гудзе, нібы арган,
Ад каранёў да крон зеленакосых,
Тут заспявае нават безгалосы,
Аднойчы ўчуўшы музыку палян.
І з пачуццём удзячнасці зямной
Я з кожным дрэвам роднасць адчуваю,
Нібы ў падзол усё глыбей ўрастаю,
А да нябёс цягнуся галавой.

* * *

Расчаруй, вясна, таполю
Ад завейных сноў,
Адпусці яе на волю
Да густых вятроў.

Хай яна лістотай спелай
Грае нада мной,
І што ў сэрцы набалела,
Забярэ з сабой.

Каб забыў я ўсе турботы,
Што гнятуць мяне,
І пад музыку лістоты
Сам забыўся ў сне.

* * *

Хаты. Жытняя палоска.
А далей — шаша, шаша...
Паміж горадам і вёскай
Разрываецца душа.

Кліча бацькаў клён самотны,
Гарадскі гаркавы дым...
Нібы жораў пералётны,
Б'юся я між дзвюх радзім.

Калі ж вырай жураўліны
Забярэ мяне з сабой,
Сэрца гораду пакіну,
А душу — зямлі сваёй.

* * *

**Дацць сасмяглай кветцы вады,**
**Галоднай птушцы — зерня,**
**Зняволенаму зверу — волі,**
**Гаротнаму — спагаду і цяпло свайго сэрца...**
**У гэтым тваё прызначэнне — Чалавек.**

* * *

**Я кінуў жменю слоў жывых**
**У сэрца, зраненае болем,**
**Але яно адвергла іх...**
**І я засеяў зернем поле.**

* * *

Мне Богам дадзена Радзіма.
І адабраць яе ў мяне
Пад страхам смерці немагчыма
Тым, хто жыруе на мане.

Мне Богам дадзена Радзіма.
І я заручаны душой
З яе азёрнымі вачыма,
З яе жытнёвай цішынёй.

Мне Богам дадзена Радзіма...
Зноў, як замову, паўтару:
«Мне без яе жыць немагчыма,
Без Беларусі я памру».

* * *

Галосяць у дажджлівым небе гусі,
Старонку пакідаючы маю...
І зноў душа баліць па Беларусі,
Я гэты боль ужо не загаю.

Ды і навошта? Трэба да драбніцы
Аддаць людзям апошняе цяпло,
Каб цераз век на белы свет з'явіцца
Душой, што выпраменьвае святло.

* * *

«Скажы, зямля, чаму бяднееш?» —
«Таму, што зерне злое сееш.
І хлеб гарчэе з году ў год
Ад спрэчак, боек і нягод».

«Скажы, зямля, у чым збавенне?» —
«У працы вольнай і стварэнні,
У той любові, без якой
Змарнее колас, голас твой!»

## ВАЛУНЫ

*З вянка санетаў*

1

Маўчаць на ўзмежку поля валуны.
Зноў на паклон да іх з-пад небакраю
Вятрыска гоніць хвалі збажыны,
Сцябліны долу ўладна прыгінае.

Ці налятаюць хмараў табуны,
Патоп біблейскі ніву залівае...

І радасна рагочуць груганы,
Калі трава калоссе спавівае.

І я, нібы язычнік малады,
Малюся небу цёмнаму тады,
Ды кожны з нас прад ім безабаронны...

Як непаўторны клінапіс вякоў,
На камянях чытаю знакі слоў.
Яны — як патаемныя пісьмёны.

2

Яны — як патаемныя пісьмёны,
Дзе спрасаваны эры і вякі,
Іх прыкацілі з далечы замглёнай
Калісьці ў родны край ледавікі.

Як іклы выкапнёвага дракона,
Выворвае нарог патайнікі,
Ды засяваю поле не праклёнам —
Зярнятамі з мазольнае рукі.

Але чаму мой клопат хлебароба
Не кожнаму сягоння даспадобы?
Не адчуваю суднае віны

У тым, што валуновыя высновы
Запаланілі свет стары і новы,
Няволяць праўду мудрай даўніны.

* * *

Не бярыце грыбоў —
радыяцыя!
Не касіце лугоў —
радыяцыя!
Не збірайце суніц —
радыяцыя!

І не піце з крыніц —
радыяцыя!
Не частуйце гасцей —
радыяцыя!
Не раджайце дзяцей —
радыяцыя!
Род?..
Радзіма?..
Народ?..
Нацыя?..
Як даць рады табе, радыяцыя?

* * *

Я прыйшоў! Прачніцеся, зямляне,
Чуеце мой голас малады?
Так улетку звонкае світанне
Абуджае сонныя сады.

Я прыйшоў! Як ветрык на пракосы,
Быццам дождж на шызую раллю,
Каб сказаць палеткам і нябёсам —
Як жыццё зямное я люблю.

Я прыйшоў! Даведак мне не трэба:
Хто я і які мой будзе шлях...
Пашпарт мой — жытнёвы бохан хлеба,
Што нясу на стомленых руках.

* * *

Праліўся дождж на світанні
Над краем сцішаным, лясным.
Я не шукаю апраўданняў
Сваім паводзінам зямным.
Даўно забыў я пра выгоды,

Даўно спакою не прашу.
І строгім крытыкам прырода
Маю высвечвае душу.
Яна і судзіць і карае
Судом абачлівым сваім
І, калі трэба — апраўдае,
Хоць я не ведаю аб тым.
Хачу аддаць сябе дазвання
Жыццю, якое так люблю,
Як гэты дождж, што на світанні
Прывеціў юную зямлю.

* * *

Каханне не купляецца.
Яго немагчыма спакусіць
Ні кветкамі, ні прыгожымі словамі.
Той, хто гэтак мяркуе,
Будзе вымушаны застацца ў адзіноце.
Цана сапраўднаму каханню —
Толькі каханне.

* * *

Для кахання старасці няма,
Бо калі сапраўднае каханне,—
На вясну падобная зіма,
А душа жыве святлом спаткання.

І гады, пражытыя дарма,
Набываюць дзіўнае гучанне,
Калі ты мне скажаш з хваляваннем:
«У кахання старасці няма!»

* * *

Залатая пяшчота лісця
З ціхіх клёнаў цячэ на траву.
Не спяшаю ў палон забыцця —
Рады я, што на свеце жыву,

Што не гнуся пад ношай жыцця
І палёгкі сабе не прашу...
Залатою пяшчотай лісця
Для каханай санеты пішу.

* * *

Калі цябе няма побач, мне сумна.
Тады нават самы сонечны дзень
Здаецца шэрым і слотным.
І наадварот, калі ты са мной,
Самы шэры і слотны дзень
Заўсёды напаўняецца рамонкавым святлом
Тваёй невычэрпнай жаночай пяшчоты.
Па-за межамі майго разумення
Таямніца твайго існавання:
Калі ты побач са мной
Ці калі цябе няма?

## ТОСТ

Я падымаю келіх свой
За лад, парушаны табой,
За пацалункаў гаркату,
За слоў халодных немату,
За бессань тысячы начэй
І за падманны бляск вачэй...
Я падымаю келіх свой,
Што ты мая, ды не са мной.

## ПРЫ СВЯТЛЕ НАРАЧАНСКІХ БЯРОЗ

*З цыкла вершаў*

* * *

Твае маленькія пяшчотныя далоні
Нагадваюць мне бяздонную крыніцу
З чарадзейнай вадой.
Цалуючы іх, я спаталяю душэўную смагу
І загойваю шматлікія раны,
Што раз-пораз адкрываюцца
На маім збалелым сэрцы.
Дзіўна, што ты, мая любая,
Нават не здагадваешся
Аб гаючых чарах сваіх далоняў.

* * *

Мне заўсёды сяброў не ставала.
Шмат цяпла я ў дарозе згубіў.
Чалавеку ж патрэбна так мала —
Каб яго хоць хто-небудзь любіў.

Ды лаўлю зноў сябе я на слове:
Мо таму так самоціцца мне,
Што жадаў самай вернай любові
Ад людзей, што любілі мяне?

* * *

Калі размаўляюць вочы,
Заўсёды нямеюць словы.
І часам адзіны позірк
Каштуе паэмы цэлай.

Таму са сваёй каханай
Заўжды гавару вачамі,
А попел жывых пачуццяў
Нямой аддаю паперы.

* * *

Кахай мяне, як я цябе кахаю,
Гады жыцця імкліва праляцяць,
І прад дзвярыма пекла альбо раю
Мы будзем гэту ноч успамінаць.

Кахай! Яшчэ далёка да світання,
Кахай, пакуль пачуцці нас нясуць
Па лебядзінай завадзі кахання...
І гэту ноч ніколі не забудзь.

* * *

Світанак вятрысты і слотны,
Заблытаўся дождж у лісці...
З нас кожны па-свойму самотны
У гэтым няпростым жыцці.

Сваю разумеючы тленнасць,
Не клянчу спагады ў нябёс...
Пражыць і памерці сумленна —
Не кожнаму дадзены лёс.

* * *

Срэбракрылыя далі,
Соснаў стоены шум,
Нарачанскія хвалі
Ўскалыхнулі душу.

Чую голас Максіма,
Песні маці маёй...
Дзіўны вобраз Радзімы
Паўстае прада мной.

Да яе я хінуся
Трапяткім каласком,
З ёй аднойчы зліюся
Сэрцам, кожным радком.

* * *

Спакутваны да болю,
Выснову я адкрыў:
Хто не кахаў ніколі,
Той на зямлі не жыў.

* * *

Любая, мне сумна. Сыпле дождж асенні,
Што нясе ён з неба — шчасце ці бяду?..
Моўчкі прад табою стану на калені
І ў тваё далоні сэрца пакладу.
Мо часінай слотнай і мяне не стане,
Мо не будзем разам будучай вясной,—
Хай цябе сагрэе чарамі кахання
Сэрца, што кахае і жыве табой.

* * *

Пальцы твае — нібы клавішы
чароўнага аргана,
На якім я граю мелодыю нашага
кахання.
Вочы твае — дзве бяссонныя зоркі,
Якія не даюць мне збіцца з жыццёвага
тропу
Нават самай цёмнай ноччу.
Вусны твае спаталяюць смагу маёй
здарожанай душы
У самы спякотны дзень.
Вось толькі загадкі-таямніцы твайго
чароўнага сэрца
Мне, відаць, не спазнаць да самага скону.

* * *

На зорным аргане зайграла світанне,
Бывай, мая юная фея, бывай,
За слодыч кахання, за горыч расстання
Няпрошаных слёз ад мяне не хавай.

Што будзе — не знаю. Ды толькі жадаю,
Каб ты не астыла з гадамі душой,
Цябе абдымаю і слёз не хаваю
Ад шчасця кахання, што зведаў з табой.

* * *

Гавары са мной, гавары,
Калі дождж і снег на двары,
Калі точыць мне сэрца боль,—
Размаўляць хачу я з табой
Аб завейных днях, аб вясне...
Не хавай вачэй ад мяне.
Аб табе мае думкі-сны.
Гавары, калі мы адны.
Ад трывог душу разняволь,
Ты — любоў мая і мой боль.

* * *

Ад рук тваіх святло зямное,
Ад валасоў і ад вачэй...
Пакуль ты, родная, са мною,
І мне на свеце жыць лягчэй.

Калі ж я слухаю твой голас,
То ажываю сам душой,
Як у спякоту жытні колас
Пад спелай ранішняй расой.

* * *

Вятры. Бясконцыя дажджы.
Вада абсяг запаланіла.
Не чую музыкі ў душы,
Што ты вясною абудзіла.
Не будзем восень папракаць,
Што нам з табою не пяецца...
Вятры з дажджамі адшумяць,
Каханне ў сэрцах застанецца.

* * *

Калі няма ў тваёй душы
Святла...
І боль яе даймае,
Калі ў душы тваёй дажджы,
А сэрца сцюжа спавівае,—
Не плач па тым, што адышло,
Што больш не вернецца ніколі,
Трывай — і новае святло
Ўзыдзе з тваіх пакут і болю.

* * *

Я такіх жанчын яшчэ не бачыў,
Ты — пяшчота, ласка, цеплыня.
Па табе сумую я і плачу,
Пра цябе я думаю штодня.
Тонкая, як вербная галінка,
Ты трымціш на восеньскай імжы...
Упадзе з вачэй тваіх слязінка —
У маёй засвеціцца душы.
Мо таму ўсім сэрцам я ўспрымаю
Светлы боль душы тваёй святой,
Мо таму так шчыра я кахаю,
Быццам больш не ўбачуся з табой.

* * *

Кожны пражыты дзень
Сплывае ў бязмежнасць.
Душа не жадае змірыцца
З незваротнасцю перажытага.
Памяць, як музыка,
Жывіць пустоты душы —
І жыццё пераходзіць у новы дзень.

* * *

Барвовая лістота
Пад старым бацькавым клёнам
Тоіць у сабе бадзёрыя маналогі
летніх ліўняў,
Вясёлыя песні вятроў,
Галасы блізкіх і незваротна далёкіх
ад мяне людзей.
Зграбаючы ў грудкі гэты бясцэнны
скарб восені,
Я палю яго з апошняй надзеяй:
Мо пах дыму, што навявае мне
ўспаміны дзяцінства,
Хоць троху сагрэе маю азяблую сталасць.

* * *

Загадкі кольцаў гадавых
Я прачытаў на пні сасновым,
Як перавесці ў гукі, словы
Загадкі кольцаў гадавых?

Не для маёй збяднелай мовы
Прырода выдыхнула іх...
Загадкі кольцаў гадавых
Я прачытаў на пні сасновым.

* * *

Жыве толькі дзень матылёк,
Затое жыццю ён так рады!..
Без хцівасці, злосці і здрады
Жыве толькі дзень матылёк.

Разводы, разлады, распады...
Не йдзе на карысць нам урок:
Жыве толькі дзень матылёк,
Затое жыццю ён так рады!

## СПОВЕДЗЬ БЛУДНАГА СЫНА

Сярпок, згарбелы, пад страхой,
Плужок, абмыты потам таты...
Шукаў я шчасця за мяжой,
За сотні вёрст ад роднай хаты.

Зямля чужая дзень пры дні
Мяне, як сына, частавала,
Ды нейкай даўняй цеплыні
Душы хранічна не ставала.

Вітрыны тлумных гарадоў
Сваім багаццем асляплялі,
А я начамі сніў буслоў,
Рабіны, што мяне чакалі.

Вярнуўся я ў куточак свой,
Ніхто не выйшаў з роднай хаты...
Сярпок, згарбелы, пад страхой,
Плужок, абмыты потам таты.

* * *

Не трэба абязбольваць мне душу
Ліслівай пахвальбой, няшчырай ласкай,
Зацягваць не дазволю ліпкай раскай
Жывую праўду, што ў сабе нашу.
Час, як суддзя, у вочы мне глядзіць,
І я штодня адказ прад ім трымаю,
Пакуль душа чужы боль успрымае,
Не абязбольваць буду, а гаіць.

* * *

Я прад людзьмі ні ў чым не вінаваты,
Але сядзіць у сэрцы і ў касцях
Мільён разоў пракляты-распракляты,
Мой самы люты ў свеце вораг — страх.
Ён ува мне, як спадчынная доля,—
З часоў паганства
і ад тых багоў...
Ірвецца страх з нутра майго на волю,
Ды толькі я не выпушчу яго,
Яшчэ мяне пацягне ён на плаху
Ці на крыжы душу маю распне...
І, можа, я памру...
Памру ад страху...
Хай толькі страх закончыцца на мне!

* * *

Нашу ў сабе я свет і антысвет,
Дабро і зло, крык слова і зняменне,
Мой прашчур у пятнаццатым калене
Маёй крывёй выслухвае Сусвет.
Там, сярод зор, напэўна, ёсць мая,

Адзіная адвеку зорка долі,
Яна маё сілкуе біяполе,
І не сабе, а ёй належу я.
Таму і не гадаю на жыццё,
Я смерць усёй істотай не прымаю,
Бо продкаў дух штодзённа адчуваю
Цераз траву, карэнне і лісцё.

* * *

Ходзіць летні вечар паплавамі,
Спавівае рэчкі берагі
Шызымі, як воўна, туманамі,
Аглядае свежыя стагі.
На душы прасветлена і золка,
Пад бярозай матчынай стаю...
Недзе ў полі тужыць перапёлка,
Маладосць гукаючы маю.

* * *

Адбалела душа
Па вясне, што з паводкай сплыла.
Адбалела душа
Па табе, што са мною была.
Адбалела душа,
Адцвіла маладой сівізной.
Адбалела душа...
Толькі ты засталася са мной.

* * *

Згасае ноч. Пачатак дня
Салоўкі хорам блаславуляюць.
Такая ў сэрцы цішыня —
Чуваць, як зоркі размаўляюць.

Як добра, любая мая,
Што мы з табою зноўку разам,
Што ёсць на свеце ты і я...
І не старэць каханню з часам!

* * *

Не зберагаюць нас багі
Ад мітусні жыцця штодзённай...
Я адмалю свае грахі
На доўгай катарзе бяссоннай.

Узважу тое, чым я жыў,
На шалях мудрага сумлення,
Усё, што страціў і здабыў,
Цану шчаслівага імгнення.

І ты, адзіная мая,
Калі нас не разлучыць доля,
Адчуеш: зноў кахаю я,
Як не кахаў яшчэ ніколі.

* * *

Сіні-сіні сон асін,
Белы-белы сум бяроз.
Ты адна, і я адзін,
І не трэба слоў і слёз.
Помніш, як я цалаваў,
Як тваё разгадваў сны.
Ты кахала, я кахаў
У абдоймах збажыны.
Жураўлёў журлівы клін
Ласку лета ўдаль панёс...
Сіні-сіні сон асін,
Белы-белы сум бяроз.

* * *

«Прыгажосць нікога не ўратуе»,—
Гаварыў разважлівы паэт...
Мару песню скласці я такую,
Што ад зла ачысціць хворы свет.

Ды яна мне ў рукі не даецца,
Адабрала сон мой і спакой...
Зло ж гуляе побач, зло смяецца
Над нязбыўнай мараю маёй.

## САНЕТ

Ласкавасць рук. Святло жывых вачэй.
Юнацкі шал расхрыстанага сэрца.
Дрыготкасць вуснаў палкіх і плячэй...
Мне ад цябе нікуды не падзецца.

І я, недасыпаючы начэй,
Лаўлю твае пачуцці. Мне здаецца,
Аб іх спявае ўранні салавей,
Крынічка ва ўнісон табе смяецца.

Адзіная на ўсё маё жыццё,
Хай не пагасне ў сэрцы пачуццё,
Акрыленае верай, што ад Бога.

Наканавана мне цябе кахаць.
Але ў радках бязмоўных перадаць
Я не змагу святла твайго зямнога.

* * *

Хутка восень. Бярозы лістотай пяюць
Нам журлівую песню разлукі,
Каб ты ведала, як я хачу прыгарнуць
Да шчакі твае белыя рукі.

Я хачу да тваіх прытуліцца грудзей
І заплакаць ад шчасця і болю...
Каб ты ведала, колькі жыццёвых завей
Нам яшчэ давядзецца адолець.

Я гляджу ў твае вочы — і бачу сябе,
Пацалункамі іх апякаю...
Каб ты ведала, як я кахаю цябе,
Каб ты ведала, як я кахаю...

* * *

Там, дзе губляюцца словы,
Праз немату забыцця
Выблісне раптам вясновы,
Звонкі прамень пачуцця.

І патаемныя сховы
Сэрца, спавітага сном,
Ён асвятляе нанова
Дзіўным кахання святлом.

## ПРЫЗНАННЕ

*Вянок санетаў*

### 1

Жыццё пражыць — не поле перайсці.
Тым больш калі не ведаеш дарогі.
Замест таго каб камень абысці,
Нярэдка аб яго калечыш ногі.

Зняверышся і звянеш у ныцці
І не ўзарэш як след сваёй аблогі.
Памрэш, пасля жалобнае куцці
Цябе не памяне патомак строгі.

А можа, сумняваюся дарма?
Прамых шляхоў да ісціны няма,
Галоўнае — заўсёды трызніць ёю.

Пакуль да мэты крочу спакваля,
Мяне сілкуе родная зямля
З адвечнай таямніцаю жывою.

### 2

З адвечнай таямніцаю жывою
Мацней зямная повязь з кожным днём...
Я размаўляю з вешчаю травою
І разумею першы майскі гром.

Спавіты вечаровай цішынёю,
Сабе здаюся кволенькім сцяблом.
Аб вечным шэпча жыта маладое,
Не спапяліць яго сляпым агнём.

Ды пагражаюць свету гераcтраты.
Няўжо зноў сейбіт зробіцца салдатам
І кулі будуць поле малаціць?..

Зямля старыя раны загаіла.
Ды ёсць за Віслай дзедава магіла,
Якую змалку марыў я знайсці.

### 3

Якую змалку марыў я знайсці
Дарогу шчасця?.. Іх на свеце многа!.
Вяртаюся, нібыта ў забыцці,
Да ціхага бацькоўскага парога.

За мною вецер наўздагон ляціць,
Ды не дагнаць нам хлопчыка малога,
Што мячык сонца ўдалеч пакаціў
І знік ва ўлонні поля залатога.

Бягу за ім, галёкаю... Відаць,
Сцяжын дзяцінства тут не адшукаць.
Навошта цешыць марай незямною

Свае немаладыя ўжо гады?..
Нібы паводка веснае вады,
Зноў разлілося жыта прада мною.

### 4

Зноў разлілося жыта прада мною,
Хінецца хваляй цёплаю да рук,
Хачу пабыць сам-насам з цішынёю
Пасля вандровак дальніх і разлук.

Якім радком і музыкай якою
Мне выказаць, аб чым пяе жаўрук?.
Нішто тут не пазначана маною
І мае сэнс адметны кожны гук.

Чаму ж мы хараства не заўважаем?
Што продкі назапасілі — губляем.
Пазбаўлены пачуцці нашы крыл...

Ды трэба зберагчы, нібыта долю,
Людскім дабром засеянае поле.
Пад ім — з падзолу беднага насціл.

5

Пад ім — з падзолу беднага насціл.
І чужаніц трапляюць часам косці...
А колькі ў полі курганоў-магіл?
Спачылі там няпрошаныя госці.

Дзе на кавалкі неба рваў трацiл,
Шапочуць каласы вятрыску штосьці...
Ляжыць зямля ад Брэста да Курыл
У невыказнай боскай прыгажосці.

Ды блудны сын цураецца яе.
Няўжо яму свабоды не стае,
Што незямной аплачана цаною?

Не для мяне прадажніка таўро,
Не прамяняю я на серабро
Пясочак з горкім потам і крывёю.

6

Пясочак з горкім потам і крывёю
На далані, нібыта жар, смыліць...
Не зарасце мой шлях травой глухою,
Пакуль душа не стоміцца свяціць.

Ідзём па ім, каханая, з табою,
Ніякай нас бядзе не разлучыць,
Хоць часам невыказнаю журбою
Твой ціхі голас ува мне гучыць.

Няўжо, як дождж, сыду ў падзол і гліну
І памяці нашчадкам не пакіну,
Не паўтаруся болей у жыцці?..

Я спірытызму чары не прымаю,
Свае пачуцці сэрцам вывяраю...
Ды прашчуры не спяць у небыцці.

7

Ды прашчуры не спяць у небыццi,
Яны маё мацуюць біяполе.
I перад імі аб жыцці-быцці
Заўсёды спавядаюся міжволі.

Жадаючы да сутнасці дайсці,
Імкнуся дух свой бедны разняволіць.
За кожны крок даводзіцца плаціць
Бяссоннымі трывогамі і болем.

Канец тысячагоддзя. Час які
Напоўніць сэнсам гэтыя радкі?
Хто наталіцца песняю маёю?..

У цемры далеч будучых вякоў.
Паслухаю разважлівых дзядоў,
Іх думы ўскаласілі збажыною.

8

Іх думы ўскаласілі збажыною,
Яе не знішчыць чорны сухавей!..
Мне б прычасціцца гэтай чысцінёю,
Перш чым пайсці праз непагадзь далей.

Мо памудрэю продкаў сівізною?
Хай маладосці мары ўсё радзей,
Дарога лёсу лініяй скразною
Лягла праз поле ранішніх надзей.

Няўжо яны не збудуцца ніколі?
I мой наступнік смагу не спатоліць,
Пачуўшы разняволены радок...

З душы ў душу, з мазольных рук у рукі
Насенне перадам і тыя гукі,
Што нашаптаў мне жытні каласок.

9

Што нашаптаў мне жытні каласок?..
Хачу пазнаць мінуўшчыны сакрэты.
Наструнены на вечнасць слых і зрок,
Ды не звіняць бязмоўныя санеты.

Зусім заперці сэрца на замок
І прычакаць сапраўднага паэта?..
Усё цяжэй даецца кожны крок,
І з кожным днём даўжэйшы шлях да мэты.

А можа, быў падманным выбар мой?
Іду сабе дарогаю не той,
Згубіўшы роднай сцежкі паясок.

Смыліць людскімі бедамі душа.
Дзе ў полі палыновая мяжа —
Не скажа варажбіт або прарок.

10

Не скажа варажбіт або прарок,
Якое ранне заўтра нас чакае.
Жанчына ў зыбцы дзіцятка люляе
З адвечным пажаданнем: «Спі, сынок».

Свіціцца той, нібыта веташок,
На мове гукаў з маці размаўляе...
Ды наляцелі хмары зноў здалёк,
Кіслотны лівень поле залівае.

Навошта ж ты прыйшоў у гэты век,
Слабы, безабаронны чалавек?..
Праз цяжкае Чарнобыля дыханне

Я чую часу іншага хаду.
Што прынясе ён: шчасце ці бяду?..
Не для мяне містычныя гаданні.

## 11

Не для мяне містычныя гаданні,
Сам не сляпы і веру ў добры час,
Ды паўстаюць з магіл, нібыта здані,
Павадыры мінулыя між нас.

Здаецца, мы забылі іх дазвання,
Але яны не могуць жыць без мас
І прагнуць зноў крывавага змагання,
Павадыра не помнячы наказ.

Няўжо жыццё на тое нам даецца,
Каб спапяліць у дробных спрэчках сэрца
І ціха ў невядомасці спачыць?

Хоць не хапае ўсім нам згоды, ладу,
Мяне трымае моцна поле праўды.
Цяжэе ноша долі на плячы.

## 12

Цяжэе ноша долі на плячы.
Няма ад тлумных клопатаў адхлання,
Ды не прашу прывалу... І ўначы
Іду насустрач сонечнаму ранню.

Хоць свой відушчы посах надтачыў,
Аб камяні не раз я сэрца раніў.
Шчэ не адны стаптаць мне кірзачы,
Перш чым спасцігну сутнасць існавання.

Ды лепш, відаць, прысесці на валун,
Падслухаць вешчы спеў гуслярскіх струн...
У мітусні, як знічкі, мы згасаем.

Нясе нас, быццам трэскі, часу плынь.
Пасеянае зжаць не паспяваем...
Бяжыць з-пад ног дарога ўдалячынь.

## 13

Бяжыць з-пад ног дарога ўдалячынь,
Няма ў мяне начлежнае прапіскі.
Куды збалелым позіркам ні кінь —
Усюды падняліся абеліскі.

Мілуе іх валошкавая сінь
Нябёсаў, дзе ўладарылі агніскі...
Гукнеш «Хатынь», а чуецца «Катынь»...
І не рыпяць у хатах больш калыскі.

Няўжо дарэмна дзед мой голаў склаў?
Калі ў чужой старонцы паміраў,
Ён верыў: перамогі час настане...

Вайну прайгралі мы пасля вайны.
Ці ўберагуць зямлю бацькоў сыны,
Дзе новы дзень бярэцца на світанне?

## 14

Дзе новы дзень бярэцца на світанне,—
Сыходзіць з неба дзіўная любоў...
Спяшаюся да жыта на спатканне
Пад пераговы жніўных кавалькоў.

Хоць кожная сустрэча, як вяртанне
Да спадчынных вытокаў, да высноў,
Мне гэтак цяжка выказаць прызнанне,
Бо не стае патрэбных, шчырых слоў.

А можа, і не трэба прыбядняцца?
Я ж не цураўся век мазольнай працы,
Знаходзіў зерне ісціны ў асці.

Пад сонцам пёкся, ветрам прадзімаўся,
На першапутку часта спатыкаўся...
Жыццё пражыць — не поле перайсці.

## 15

Жыццё пражыць — не поле перайсці!
З адвечнай таямніцаю жывою,
Якую змалку марыў я знайсці,
Зноў разлілося жыта прада мною.

Пад ім — з падзолу беднага насціл,
Пясочак з горкім потам і крывёю...
Ды пращчуры не спяць у небыцці,
Іх думы ўскаласілі збажыною.

Што́ нашаптаў мне жытні каласок? —
Не скажа варажбіт або прарок.
Не для мяне містычныя гаданні.

Цяжэе ноша долі на плячы.
Бяжыць з-пад ног дарога ўдалячынь,
Дзе новы дзень бярэцца на світанне.

# АПАКАЛІПСІС ДУШЫ

*З вянка вянкоў санетаў*

## З ВЯНКА ПЕРШАГА

### 1

Вянок санетаў — летапіс дарог,
Занатаваны ў строгія каноны...
У кожнага паэта свой аблог,
Дзе ён шчыруе, мараю натхнёны.

І я Пегаса з раніцы запрог,
Пазбаўлены духоўнага прыгону,
Заворваю сляпога зла быльнёг —
У гэтым соль жыццёвага закону.

Няўжо змарнее клопат мой дарма?
«І ў Бога вечнай ісціны няма!» —
Мяне Люцыфер хіжы дапякае.

У кожнага Алімп свой і Парнас.
Ды хочацца спазнаць інакшы час,
У ім — Петраркі ліра трапяткая.

### 2

У ім — Петраркі ліра трапяткая,
Шэкспіра муза велічна гучыць...
Прыроды геній бурыць і стварае,
Між ім і мной жывая тчэцца ніць.

Шуміць ля хаты ліпа векавая,
Жадае сэрца з ёй пагаманіць...
Упала ў жыта знічка з небакраю,—
Хто будзе ў цемры мне цяпер свяціць?

А можа, я трывожуся дарэмна?
Багата ў нашым небе зор таемных.
Якая ж упадзе на мой парог?

Як сувязны між даўнім і наступным,
Ці выкажу радком сваім раскутым
Мільён надзей, памкненняў і трывог?

3

Мільён надзей, памкненняў і трывог —
Іх умясціць у сэрцы немагчыма!..
І ўсё ж Купала выказаць іх змог,
Яны ў «Вянку» пакутніка Максіма.

А я часцей маўчу, як нейкі ёг.
Сляпы, хоць і з відушчымі вачыма...
Але аб вечным шэпча мне мурог,
І вырастаюць крылы за плячыма!

Паэт ці мо рамеснік да пары?
Тым больш што светам правяць ліхвяры,
Чытач жа ў чэргах ногі абівае...

Не згіне мова-маці ў забыцці.
І мне не дасць зняверыцца ў жыцці
Тваё святло, старонка дарагая!

4

Тваё святло, старонка дарагая,
У пералівах спеўнай збажыны,
Яно мяне ад зла аберагае
І ачышчае сэрца ад маны.

Калыска долі — вёсачка лясная,
Мне бачацца рамонкавыя сны...
Але гудуць які ўжо год над краем
Чарнобыля набатныя званы.

Апакаліпсіс розуму і веры?
Жывыя думкі чэзнуць на паперы,
Нібы калодзеж праўды перасох...

Не давяраю хітрым пустазвонам.
Жыві, народ мой, вольным, нескароным,
Хай зберажэ цябе магутны Бог!

## 8

Калісьці сам зраблюся я травою:
Трыпутнікам, асочкай, лебядой...
Касі, унук, рупліваю касою
І не цурайся памяці маёй.

Твой дзед ішоў дарогаю крутою,
Ды не зракаўся ён зямлі святой
І слова самабытнае, літое
Збярог у першароднасці сваёй.

Нашчадак мой, крыклівая эстрада
Спявае новым ідалам рулады.
Працягваю далонь насустрач дню.

Ён дасць натхненне мне, пітво і ежу.
Пакуль сабе самому не належу,
Рамесніцтва баюся, як агню.

## 9

Рамесніцтва баюся, як агню.
Ды як шэдэўр адрозніць ад падробкі?
Майстроў сумленных больш за ўсё цаню
За дабрату, за шчырай праўды ўрокі.

Бывае, ноччу Пысіна прысню:
З былога, задуменны, яснавокі,
Працягвае, як бацька, даланю,
Такі мне блізкі і такі далёкі.

Яму я шмат чаго сказаць хацеў,
Чакаў таго імгнення... Не паспеў...
Пайшоў паэт, ды песні засталіся!

Мінулы дзень ужо не даганю.
Начныя гукі ў музыку зліліся.
Паслухаю нябёсаў цішыню.

## 10

Паслухаю нябёсаў цішыню —
Душой да таямніцы дакрануся,
Мне ўсе сузор'і дораць цеплыню,
Да іх я ноччу думкамі імкнуся.

Туды, у незямную вышыню,
Аднойчы, быццам Фенікс, падымуся,
Адчую зор магічных дабрыню
І ў дзіўны свет расінкай уліюся.

Ды рай бывае толькі на зямлі,
Вяртаюся да чорнае раллі,
Дзе хлебныя ствараюцца сюжэты.

Як выказаць пачуцці мне свае?
Сцяблінка штосьці ветрыку пяе —
Мо ў ёй гучыць паэзія сусвету?

## 11

Мо ў ёй гучыць паэзія сусвету,
У песні той, што чуецца здаля?
Яна жыве ў пчаліным звоне кветак
І ў галактычнай музыцы чмяля.

Яна не церпіць пазалоты клетак,
Крыляе вольнай птушкай у палях...
Ды хто не чуў салоннага эстэта,
Які надзьмуў ад сытасці валляк?

Без каранёў, без племені і роду,
Ён дакляруе ўласнаму народу:
«Жыць без турбот на свеце весялей!»

І хлеб, і песня — з жытняга насення.
Настане час — і сыдзе азарэнне
З няведамых сузор'яў да людзей.

**12**

З няведамых сузор'яў да людзей
Чамусьці прылятаюць марсіяне,
Міжволі сам трывожуся часцей:
«Мо там ідзе вайна за выжыванне?»

Няўжо гняце іх нейкі ліхадзей,
Аброкшы ўсіх няўгодных на выгнанне?..
У чарадзе трагічных дзён-падзей
Шукаю сэнс зямнога існавання.

Яго пазнаць — пакута для душы.
Жывуць жа вунь без розуму смаўжы,
А чалавек ад дум, як лунь, сівее.

Ад зла ратуй, зямля, сваіх дзяцей!
Да іх праз навальніцы і завеі
Ляцяць сігналы будучых надзей.

## З ВЯНКА СЁМАГА

**11**

Ёсць у мяне куточак запаветны.
Прыношу кветкі бацьку на грудок,
Здаецца, што з глыбіняў пракаветных
Пытае ён: «Ну як жывеш, сынок?»

І на душы так хораша і светла.
Кажу: «Злажылі сена мы ў стажок...
Прынёс табе мядовыя ранеткі,
Ты іх любіў...» Туманяць слёзы зрок.

Калі мужчыны ў вёсках паміраюць,
Удовы плачуць, хаты абрастаюць
Сівым імхом, нішчымнее ралля.

Свяці, не гасні, зорка Мілавіца,
Табе не дасць зняверыцца, згубіцца
Святая праўда — бацькава зямля.

### 12

Святая праўда — бацькава зямля,
Твае старонкі плугам я гартаю...
Той, хто крычыць: «Чужая! Нічыя!»,—
Твайго цяпла, відаць, не адчувае.

Тут мне сцяблінка кожная — свая,
Гасцінна спелым коласам ківае...
Маёвай ноччу цёхкат салаўя
У звонкім сэрцы слова абуджае.

Расце, дужэе песенны матыў,
Як птушак спеў у ранішніх гаях.
Люблю паслухаць роздум жытніх ніў,

Дзе спее бохан сонца спакваля...
Пакуль душой і целам не астыў,
Жыві, лясная вёсачка мая!

## З ВЯНКА ЧАТЫРНАЦЦАТАГА

### 7

І я пасеяў жытняе насенне,
Што збажыной падымецца з раллі,—
У гэтым сэнс зямнога абнаўлення,
Той волі, што мы ў муках здабылі.

Нас не сагнуць, не кінуць на калені
Магнаты рынку, цемры каралі...
Пасля гадоў духоўнага зацьмення
Мы да вытокаў згубленых прыйшлі.

Імёны ім: Любоў, Свабода, Вера.
Жывое слова свеціць на паперы
Для самага апошняга сляпца...

Старонкі будня ў памяці гартаю,
Сяйву багатай руні пажадаю,
Гляджу ў палі з развагай мудраца.

8

Гляджу ў палі з развагай мудраца.
Ляжыць знямогла ніва векавая,
Бадзёры звон асенняга званца
Мяне ўспамінам веснім саграває.

І бачу зноў бялявага хлапца,
Які за плугам бацькавым ступае,
І жаўрука, які дае нырца
У збажыну, што хвалямі гуляе.

Пражытае не згінула дарма,
Бо без яго наступнага няма,
Куды ўвесь час я зазірнуць імкнуся.

Каб таямніцы ісціны спазнаць,
Патрэбна ў час пасеянае зжаць...
Па кроплі ў глебу потам перальюся...

9

Па кроплі ў глебу потам перальюся...
Мяне падыме жыта з небыцця,
І я ў нашчадку юным адгукнуся
Радком, сагрэтым промнем пачуцця.

Багата песняроў на Белай Русі,
Не ўсім даецца талент адкрыцця.
Аб чым клякоча раніцаю бусел?
Як зразумець мне музыку лісця?

Ды лучыць прага пераўвасаблення —
Да нематы, да самаадрачэння...
Ідэі правяць светам ці любоў?

Век п'ю яе — ніяк не наталюся!
Пад сухавейным подыхам гадоў
Мо камяком сухой зямлі зраблюся?

## 10

Мо камяком сухой зямлі зраблюся?
Не разгадае лепшы экстрасенс,
Чым да людзей праз век ці два вярнуся...
Усё ў прыродзе мае пэўны сэнс.

У ім любоў, з якой душой зліюся,
Хоць робіць нас каменнымі прагрэс...
Па дзетках тужыць перапёлка ў лузе,
І б’е па сэрцах даўкай хваляй стрэс.

О чалавек, у сквапнасці бясконцай
Ты можаш патушыць аднойчы сонца,
Яго ад нас ужо хавае смог.

Няўжо ў цямрэчы будзем жыць, як змеі?
Магчыма, слова гэтак скамянее,
Што грэбліва адкіне ўнук з-пад ног.

### З ВЯНКА МАГІСТРАЛЬНАГА

## 1

Вянок санетаў — летапіс дарог,
У ім — Петраркі ліра трапяткая,
Мільён надзей, памкненняў і трывог,
Тваё святло, старонка дарагая.

«Хай зберажэ цябе магутны Бог!» —
Душа адну малітву паўтарае...
Заложнікі містычных перамог,
Наяве мы спазналі пекла «раю».

Аб’яўлена мінуламу вайна?!
Прарокаў шмат, а ісціна адна,
Як зорка недасяжная над светам.

Ці ж не таму і доўжыцца жыццё?..
Ды ёсць у ім заўсёды адкрыццё —
Жар-птушка — мара кожнага паэта.

2

Жар-птушка — мара кожнага паэта:
Па-свойму фарбы свету перадаць,
Пазначыць веку светлага прыкметы,—
Хоць іншым толькі чорнае аддаць.

Ляціць да нас агністая камета,
Што будзе — не збіраюся гадаць...
Адным радком, не тое што санетам,
На часткі сэрца лёгка разарваць.

На словах кожны прагне ачышчэння.
Сярод людзей пануе адчужэнне,
І ахінае нас духоўны смог.

Павыпаўзалі з цёплых нор хімеры,
Трымай мяне, пакутніцкая вера,
Тваю пяшчоту я ў душы збярог.

3

Тваю пяшчоту я ў душы збярог,
Маё да скону першае каханне...
Салодкай мятай пахнуў хмельны стог,
Салоўкі цалаваліся ў тумане.

Штукарыў жоўты месяц, як той ёг,
І цікаваў за намі на світанні...
Адзіная, на чысты твой парог
З усіх дарог лячу я на спатканне.

Жыццё пражыць — не поле перайсці.
Няўжо юнацтва кане ў забыцці?
Мне не дае спакою думка гэта.

Пачуцці спеліць сталасці пара.
Душою прадчуваю час дабра,
Хоць не пазнаў усіх зямных сакрэтаў.

4

Хоць не пазнаў усіх зямных сакрэтаў,
Я ведаю навуку баразны,
Яе цяплом жыццё маё сагрэта
Аж да сасновай скрушнае труны.

Па небе сонца коціцца ранетам,
І пахне хлебам поўдзень мой зямны,
Пакіну ўнукам шчырым не ракеты —
Сялянскі плуг і бохан аржаны.

Мо хтосьці гэтай спадчыны зрачэцца?
Кіпцюрыць неспакой драпежны сэрца,
Ірве душу, нібы ахвяру дог...

У кожнага свой лёс, свая пуціна,
Шуміць ля хаты бацькавай рабіна,
Не затупіўся вернасці нарог.

* * *

Палёў разлегласць — вокам не акінуць,
Задумлівая сцішанасць лясоў.
Народжаны ў цудоўную часіну,
Я да людзей нясу сваю любоў.

І калі лёс мяне далёка кіне
Ад цёплых ніў, ад роднага двара,
Мне васілёк напомніць аб Айчыне,
Прачулы верш Купалы-песняра.

* * *

Люблю глядзець, калі паволі
Світанак спее над ляском
І абуджае наваколле
Вясёлым жаўранка званком.

Люблю над цёплай баразною
Схіляцца ў роздуме зямным
І спавядацца перад ёю,
Як перад прашчурам сваім.

Люблю я жыта мудры одум,
Дзе, як шкаляр, заўжды стаю,
Бо, спасцігаючы прыроду,
Сябе былога пазнаю.

І мне ў такія вось імгненні
Заўсёды бачыцца далей:
І роднасць розных пакаленняў,
І раз'яднанасць душ людзей.

## БРАТУ АЛЕСЮ

О, як цану губляюць словы...
А ты ім верыш, меншы брат?..
Вадой жывой мне стала мова,
Вадою мёртвай — звон цытат.
Я валуноў не абмінаю,
Падобна коўзкаму вужу,—
Вадою мёртвай боль здымаю,
Жывой — ізноў яго буджу.
Шчаслівы тым, што меў і маю,
Што больш патрэбна для жыцця?..
Вада не мёртвая — жывая
Мяне падыме з небыцця.

## САЛАЎІНАЕ ПЕКЛА

За дротам — хворыя гаі.
Сады і хаты апусцелі.
Чарнобыльскія салаўі
Звіняць, нібыта звар'яцелі.
Мо гэта рэквіем па тых,
Што адляцелі назаўсёды?..
А мо аплакванне жывых,
Смяротна хворае прыроды?

* * *

Самотная яблыня на бацькавым котлішчы
Улетку размаўляе з вятрамі і малочнымі ліўнямі,
Успамінае маладосць.
Узімку трымціць пад сібернымі завеямі,
З нецярпеннем чакаючы вясны.
Чым наталіць заўсёднае жаданне
Прытуліцца да яблыні дзяцінства?
Распавесці ёй аб пражытым,
Напоўніць душу чысцінёй і прыгажосцю сусвету.

***

Знямелі птушыныя спевы,
Вятры азалела гудуць,
Апошняе золата дрэвы
Данінай жыццю аддаюць.

Ляцяць на азіміну гусі,
Каб зноўку вярнуцца сюды,
Так многа святла ў Беларусі,
Ды ў сэрцы не меней нуды.

Шкада, што азяблыя дрэвы
Дарэмна губляюць лісцё,
Бо золата кволых не грэе,
А дужым кароціць жыццё.

І ўсё ж я прыму перамены,
Што робіць прырода са мной,
Нібыта сцяблінкі, як вены,
Напоўніў уласнай крывёй.

***

З ласінага следу нап'юся,
Да роднай сасны прытулюся,
Паслухаю бор векавы.
Мядовыя слёзы жывіцы,
Карэнне, трава і грыбніцы
На вернасць сцвярджаюць правы.
Мая баравая краіна,
Прымі свайго блуднага сына,
Як роўнага, тут прапішы
Да соснаў сваіх вечаровых,
Да сцежак грыбных, верасовых,
Дзе ў полі снуюць мурашы...
І наледзь адтае ў душы!

* * *

Напішыце мне ліст з маладосці
Васільковым чарнілам нябёс,
І забытае, даўняе штосьці
Мне душу развярэдзіць да слёз.
Успамінаў гарачыя хвалі
Панясуць мяне ў тую вясну,
Дзе мяне аднаго Вы кахалі
І кахаў толькі Вас я адну.
Не хапае без Вас мне чагосьці.
Сэрцу зябка і сумна да слёз...
Напішыце мне ліст з маладосці
Васільковым чарнілам нябёс.

* * *

Тры словы я табе сказаў,
Што ў сэрцы выспеліў пакутна...
Як разняволена-раскута
Тры словы я табе сказаў!
Усю душу я ў іх уклаў,
Усё, што меў, і ўсё, што маю...
Тры словы я табе сказаў.
Ты чуеш, я цябе кахаю!

* * *

Над лебядзіным возерам таполі
Лісцём пажоўклым сцішана звіняць.
Бывай, мая каханая, ніколі
Цябе не буду больш я мілаваць.
Асенняю пяшчотнай пазалотай
Мая душа журботна адцвіце.
І лістапад пажухлаю лістотай
Сцяжыны ў лета хутка замяце.
Зноў наляцяць шалёныя завеі,
Спаўе нябёсы снежная імгла...
Бывай, мая нязведаная фея,
Як хараша, што побач ты была.

***

Самая чароўная жанчына,
Дваццаць год таму я Вас кахаў...
Вашымі цудоўнымі вачыма
Той вясной на свет я пазіраў.

Самая чароўная жанчына,
Колькі зім і вёснаў адплыло?..
Маладосць і сталасць за плячыма,
А расстання быццам не было.

Зноў сваімі светлымі вачыма
Вы ў цішы гаворыце са мной.
Самая чароўная жанчына,
Дваццаць Вам, як даўняй той вясной.

***

Зноў я світанак новы сустракаю,
Хвалюе сэрца песня салаўя,
Ды я б не зведаў чар зямнога раю,
Калі б не ты, каханая мая.

І гэты дзень, напэўна б, не з'явіўся
Святлом жыцця...
І, невідушчы, я
Сярод людзей у цемры заблудзіўся б,
Калі б не ты, каханая мая.

Чым, адкажы, мяне прывараджыла,
Дзе таямніца дзіўная твая?..
Маё жыццё, напэўна б, сэнс згубіла,
Калі б не ты, каханая мая.

## ТЫ

### *Вянок санетаў*

### 1

Усюды свеціць мне тваё каханне,
Хвалюе дзіўнай музыкай душу,
Чуллівых струн чароўнага гучання
Не парушае будняў тлумных шум.

Трывожней часу нашага дыханне,
Ды літасці ў яго не папрашу.
Паміж табой і мной няверʼя грані,
Нібы сцяну каменную, скрышу.

Ты ўся, як першародная крыніца,—
Жадаю піць, ды не магу напіцца.
Пакутую, як грэшнік на агні.

Часцей надзея сэрца пакідае
І на мяне самотна пазірае
Недасягальнай зоркай з вышыні.

### 2

Недасягальнай зоркай з вышыні
Твая душа прыцягвае заўсёды,
Не раз яна мае абвесціць дні
Дагэтуль неспазнанаю лагодай.

Цябе мой продак некалі сасніў,
І ты ўзышла з падзолу радаводу...
Пʼю цеплыню з ласкавай далані
І неўпрыкмет хмялею, як ад мёду.

Чакаў цябе я сотні вёснаў-зім.
Каханая, скажы, сакрэт у чым,
Як растлумачыць мне тваё вяртанне?..

Усё на свеце мае свой чарод.
Невыпадковым быў і твой прыход,
Сустрэча наша як наканаванне.

### 3

Сустрэча наша як наканаванне,
У радасці, у шчасці і ў журбе
Усе мае пакутныя шуканні
Цяпер належаць, любая, табе.

Прыходзіш да мяне ты на змярканні,
Як тая фея, з зоркай на ілбе,
І шэпчуць вусны палкія прызнанні,
Мядовай цнотай вабяць да сябе.

І я ў святле салодкім патанаю.
Магчыма, ты, жанчына незямная,
Прымчалася на вогненным кані?

Жыць без цябе на свеце немагчыма,
Дзе б я ні быў — твой твар перад вачыма,
Яму і памалюся ў цішыні.

### 4

Яму і памалюся ў цішыні,
Пачуццю, што злучыла нас навекі.
Адзіная, прашу, не адштурхні
На дабраце настоеныя лекі.

Збірае зло цяжкія камяні,
І пагражае нам духоўны рэкет,
Ды ад тваёй жаноцкай цеплыні
Сярод зімы прачнуцца могуць рэкі.

Цябе згубіць баюся незнарок.
«Не пакідай!..» — шапчу, нібы зарок.
Я не стрываю доўгага расстання.

Мо спалынею сам ад гаркаты,
Але мяне пакліча з нематы
Твой голас, быццам ветрыку спяванне.

5

Твой голас, быццам ветрыку спяванне,
Мне не дае ў знямозе супачыць,
Нібыта чарадзейнае паданне,
Ён ува мне і дзень і ноч гучыць.

Імкнуся сэрцам выказаць дазвання
Усё, што так хвалюе і баліць,
Добраахвотны раб твой і абраннік,
Цябе ад зла хачу абараніць.

Ды ты мяне нібы не заўважаеш.
Няўжо кагосьці іншага жадаеш
Славянскай прыгажосцю паланіць?

Мяне сумненні прыкрыя даймаюць,
Ды іх, нібыта хмаркі, разганяюць
Далоні-крылы дзіўнай дабрыні.

6

Далоні-крылы дзіўнай дабрыні
Ты апускаеш ціха мне на плечы.
Пасля трывог і тлумнай мітусні
Мы сустракаем разам летні вечар.

Дубоў перапляліся карані.
І мы да іх прыходзім, як на веча...
На небе першых зорачак агні
Нам свецяць, як вясельнай ноччу свечы.

Трывожуся за час, за гэты век,
Дзе ад спакус марнее чалавек —
Капеечных забаў хвілінны даннік,

Ды і каханне стала рамяством.
Маўчыць дабро, аблытанае злом.
Свет патанае ў п'янстве і падмане.

7

Свет патанае ў п'янстве і падмане.
Трывожуся часцей за маладых.
Вунь дзецюкі ад крамы, быццам здані,
Гурмой брыдуць панура ў нікуды.

А з імі Ева! Вочы як у лані!
Ды твар, як цэгла, попельна-руды,
Без цеплыні, без ласкі, без жадання,
Без таямніцы — згасла назаўжды.

А мо не трэба «зелле» вінаваціць?
Яна ж, відаць,— жанчына, жонка, маці?..
О Божухна, яе не адштурхні!

Дапамажы падняцца ёй з каленяў!..
Малюся — не знаходжу спаталення.
Любоў мая, ад зла абарані!

8

Любоў мая, ад зла абарані
Жанчыну, што мяне яшчэ кахае,
Яе святлом жывым ускалыхні,
Як летні ветрык ніву калыхае.

Ты толькі струны шчасця закрані,—
І сэрца любай звонка заспявае...
Таўкуцца ля яе, як авадні,
Мужчыны... Кожны нешта абяцае!

Я ж не прадам за срэбра пачуццё,
Каб тлумны быт змяняць на забыццё.
Тваё каханне, любая, са мною.

Яно — агонь, што ў цемрадзі гарыць,
Якога злым вятрам не патушыць.
Не дай мне Бог узняцца над табою.

## 9

Не дай мне Бог узняцца над табою,
Няўвагаю прынізіць хоць на час...
Пад нашай вечароваю вярбою
Святкуем дзень спаткання кожны раз.

Пытаеш ты з прытоенай журбою:
«Каханы мой, няўжо не будзе нас?..»
Жыву тваёй таемнай варажбою,
Цярністы шлях абраўшы на Парнас.

Да музы ты раўнуеш без прычыны.
Яна ж, як легкадумная жанчына,
Амаль што не наведвае мяне.

А ты са мной улетку і зімою.
Малюю воблік родны, як у сне,
Акрылены пяшчотаю жывою.

## 10

Акрылены пяшчотаю жывою,
Каханне, як святыню, берагу...
Здаецца, зноў сцяжынкай палявою
Я на спатканне першае бягу.

Звініць вястун-жаўрук над галавою
І навявае лёгкую тугу.
Здаешся ты маёй і не маёю...
Жыць без цябе на свеце не магу.

Усё далей вясновыя ўспаміны
Пра тыя незваротныя хвіліны.
Букет валошак сонечных нарву,

Табе іх прынясу, маё натхненне,
Хоць разарваўшы путы прыцягнення,
Душой, як птах, ірвуся ў сіняву.

## 11

Душой, як птах, ірвуся ў сіняву,
Твая ж любоў мяне не адпускае...
Мы дакасілі даўнюю траву,
Ды новая так хутка падрастае.

Вунь пад акном, пузаты, як кавун,
Стаіць хлапчук і голасна гукае:
«Алеся, выйдзі! Хопіць спаць! Ау!..»
Дачка крадком над кніжкай уздыхае.

Ахопленая першым пачуццём,
Амаль што не знаёмая з жыццём,
Яна нібы цнатлівая Джульета.

Ты разам з ёй пакутуеш цяпер.
Як я, Рамэо юнаму павер!
Тваім цяплом уся зямля сагрэта.

## 12

Тваім цяплом уся зямля сагрэта:
Лугі, палеткі, рэкі і лясы...
Ці помніш сад? Крамяныя ранеты
У кроплях дачарнобыльскай расы.

Ніколі не забыць мне тое лета
І салаўёў (апошніх!) галасы,
Нашэпты траў, і пах мядовы кветак,
І шоргат шустрай бацькавай касы.

Здае наш век імкліва паўнамоцтвы.
Ці спраўдзяцца біблейскія прароцтвы?
Няўжо не абароніць нас любоў?..

Хай дзеці аб'яднанага сусвету
Не ўбачаць жахаў прывідных грыбоў,
Пакуль пад сонцам верціцца планета.

## 13

Пакуль пад сонцам верціцца планета,
Не згасне і вачэй тваіх святло,
З вышынь сваіх таемнаю каметай
Ты падала мне зыркае крыло.

І мы ляцім, плывём над белым светам,
Пакінуўшы вярбовае сяло...
Не, гэта не фантазія паэта...
Здаецца, з намі гэта ўжо было.

То не палёт маёй бяссоннай мары.
Мо нашы продкі зорныя — Ікары?
Ці разгадаем іх шляхоў канву?

Сусвет вялікі, казачны, бяздонны.
Ды на зямлі жыве мая Мадонна.
І я кахаю, веру і жыву.

## 14

І я кахаю, веру і жыву.
І не раблю з быцця свайго сакрэту...
Ды час напяў стагоддзя цеціву,
Замест стралы ляжыць на ёй ракета.

Няхай у пашчу зорнаму ільву
Ляціць яна і згіне там без следу!..
Чуваць дакоры продкаў праз жарству:
«Няўжо забылі нашы запаветы?»

Энергія любові ўсіх людзей
Бяду ад родных гнёздаў адвядзе
І не дазволіць д'яблу апаганіць

Тваю душу відовішчам жуды.
Пакуль ты ёсць — пяюць мае сады.
Усюды свеціць мне тваё каханне.

## 15

Усюды свеціць мне тваё каханне
Недасягальнай зоркай з вышыні,
Сустрэча наша як наканаванне,
Яму і памалюся ў цішыні.

Твой голас, быццам ветрыку спяванне,
Далоні-крылы дзіўнай дабрыні...
Свет патанае ў п'янстве і падмане.
Любоў мая, ад зла абарані!

Не дай мне Бог узняцца над табою!
Акрылены пяшчотаю жывою,
Душой, як птах, ірвуся ў сіняву.

Тваім цяплом уся зямля сагрэта.
Пакуль пад сонцам верціцца планета,—
І я кахаю, веру і жыву.

* * *

Нясу свой крыж да ціхага пагоста,
Дзе родзічы стамлёныя ляжаць,
Дзе ўсё прыстойна, чыста, светла, проста
І ні аб чым не трэба шкадаваць.
Нясу свой крыж цяплом зямным сагрэты,
Штогод жыцця звужаючы кругі...
Усё радзей наперадзе прасветы,
І ўсё часцей завеі і снягі.

* * *

Над палямі цэлы тыдзень тчэцца
Аблажная, нудная імжа,
Каласы, што радавалі сэрца,
На зямлі, счарнелыя, ляжаць.

Не суняць цяпер тугі бясконцай,
Бо ў палеглай, мокрай збажыне
Тысячы жывых маленькіх сонцаў
Назаўжды патухлі для мяне.

На зямлю сыходзіць шызы вечар,
І хаця да ніткі я прамок,
Прад табою, поле, зноў укленчу,
Абагрэю кволы каласок.

* * *

Што я ўнукам пакіну,
Як пайду на клады?..
Цень засохлай вярбіны,
Плач нітратнай вады.
Колас, стронцыем хворы,
Немату, забыццё...
Недасяжныя зоры
Без надзей на жыццё.
Што я ўнукам пакіну?
І навошта жыву?..
Хутка з ценем вярбіны
Пералью́ся ў траву.

* * *

Хлебнае зернетка,
Што ляжыць на маёй далоні,
Тоіць у сабе генетычную памяць
Пра не адну тысячу ўраджаяў,
Дзякуючы якім
яно з'явілася на свет.

Ува мне таксама закладзены
Генетычны код
Маіх шматлікіх папярэднікаў.
Ды толькі я
У адрозненне ад хлебнага зернетка
Не памятаю нават свайго прадзеда.

* * *

Жыццё не раз мяне ламала,
Перш чым выснову змог адкрыць:
Быць беларусам — гэтак мала,
Каб за народ свой гаварыць.

Люблю палёў світальных цішу.
Ды калі грымне землятрус,
Я і на пласе не прыніжу
Святога слова — Беларус.

* * *

Характарам і лёсам вуглаваты,
Не выбіраў раўнюткіх я дарог.
Напэўна, шмат каму я вінаваты:
Не ў час паспеў, не ўгледзеў, не збярог.

Няхай гады на схіл жыцця прастуюць,
Любоў і веру ў сэрцы я збярог.
Каму я вінаваты — мо даруюць...
Хто вінаваты мне — даруе Бог.

* * *

Вачэй пралескавая сінь,
Дзе па каханні тужыць восень,
І слоў пяшчотная цяплынь —
Усё ў душу пералілося.

Відаць, я доўга буду жыць
Святлом тваёй зямной істоты,
Пакуль душа не адбаліць
На суднай пласе адзіноты.

* * *

Я быў адзін. Зусім адзін.
Адзін, як човен без вясла.
Навокал шмат было жанчын,
Ды ты адна за мной пайшла.

Шчаслівых будняў і начэй
Я не лічыў...
Было, была...
Як жыць мне без тваіх вачэй?
Навошта ты за мной пайшла?

Хачу хоць некалькі хвілін
Пагрэцца ля твайго цяпла...
Я зноў адзін. Зусім адзін.
Маё каханне ты ўзяла.

* * *

Глыбокай ноччу, калі ўсе людзі спяць,
Да мяне прыходзіць загадкавая жанчына,
Спавітая магічным святлом далёкіх зорак.
Яна глядзіць на мяне тваімі вялікімі,
прыгожымі вачыма.
Яна цалуе мой твар тваімі пунсовымі,
спякотнымі вуснамі.
Яна размаўляе са мной тваім звонкім,
салаўіным голасам.
Яна абдымае мяне тваімі пяшчотнымі,
жураўлінымі рукамі.
Каб ты толькі ведала, як мне хораша і
светла з той жанчынай!
Ды кожны раз, калі я прашу яе застацца,
Стаць маёй на ўсё жыццё, назаўсёды,
Яна моўчкі ўсміхаецца і з надыходам
світання некуды знікае.
Я ж зноў застаюся сам-насам са сваёй адзінотай.
І думаю-думаю пра цябе, мая каханая.
Мне здаецца, што гэта твая бяссонная душа
У вобразе той загадкавай, зорнай жанчыны
Штоночы наведвае мяне,
Каб саграць і супакоіць маю стамлёную душу
Пасля мітуслівага і нервовага будня.
І мне зноў хочацца жыць і кахаць,
Бо нішто на свеце так не лучыць людзей,
Як роднасць душ.

* * *

Раскалыхвае восеньскі вецер
Адзінокі лісток на галлі...
Кожны мае свой тэрмін на свеце,
Прызначэнне сваё на зямлі.

Разумею, не будзе вяртання
Дням, што ў Лету імкліва сплылі...

Як хачу я дабра і кахання!..
Цеплыні, як лісток на галлі.

Чую ў небе мінорныя гукі.
Дзе, калі абарвецца мой крок?..
Хай тады твае чыстыя рукі
Гэты сумны падхопяць лісток.

Ты спаві яго цёплым дыханнем,
Аднаго не пакінь у журбе...
Мо пра весняе наша каханне
Ён хоць зрэдку напомніць табе.

* * *

Дворнік-вецер пустую алею
Падмятае завейнай мятлой...
О, як я безнадзейна хварэю
Гэтай дзіўнай хваробай зямной!

Светлы боль, што каханнем завецца,
Мне да скону ў душы не суняць,
Шмат наўкол прыгажунь, толькі сэрца
Не жадае нікога кахаць.

Бачу я на вачах тваіх слёзы,
Чую голас твой дзіўны зямны:
«Нас з табой заручылі нябёсы,
І разлучаць нас толькі яны».

* * *

Я дзіўны свет намаляваў
Жывой фантазіяй паэта,
Табе яго падараваў,
Але ў адказ сказала мне ты:

«Я не люблю тваіх бяроз
З іх невыноснаю журбою,
Жывеш ты ў свеце райскіх кроз,
Мне ж даспадобы ўсё зямное».
Цябе не буду я трымаць.
Зрабіць не шмат мне засталося:
Святлом душы дамаляваць
Жыцця бярозавую восень.

* * *

Жаночыя вочы —
Пяшчота і ласка,
Бяссонныя ночы,
Як дзіўная казка.

Жаночыя вочы,
Як зорачкі ўранні:
Зірнеш і захочаш
Святла і кахання.

Жаночыя вочы —
Крынічкі натхнення,
Нап'ешся — да схочу,
Ды дзе спаталенне?

* * *

Я з Вамі бавіў час за кавай,
Лілася гутарка ў цішы,
І ад святла вачэй ласкавых
Цяплей рабілася душы.

Гудзеў народ на шэрай плошчы,
Буяла восень за акном,
Я ж бачыў толькі Вашы вочы
З таемным сумам і святлом.

І мне хацелася міжволі
Вас асцярожна прытуліць,
Каб прычасціцца Вашым болем,
Надзеяй сэрца акрыліць.

* * *

Класічная зіма — па дахі снег.
Я закахаўся ў твой дзіцячы смех,
Я закахаўся ў звонкі голас твой,
Што грэе сэрца дзіўнай чысцінёй.

Я закахаўся ў вочы, што і ў сне
Не адпускаюць ад сябе мяне.
Кахаю сэрцам я тваю душу
І лепшай долі ў Бога не прашу.

* * *

Дождж за вокнамі, дождж,
Як забыты чароўны матыў.
Палюбі мяне, дождж,
Як цябе я заўсёды любіў.
Наталі мяне, дождж,
Пахам кветак і лекавых траў,
Правядзі мяне, дождж,
Да сцяжынак, дзе з любай блукаў.
Атулі мяне, дождж,
Хлебным духам дажынкавых ніў,
Дзе каханне сваё
Я ў далёкім юнацтве згубіў.

* * *

Жанчына слухала санеты...
Вачыма, светлымі ад слёз,
Яна глядзела на паэта,
Які чытаў жаночы лёс.

Ён кляўся некаму ў каханні,
Што, як світальны сон, сплыло...

Радкоў спякотнае дыханне
Душу самотную пякло.

Жанчына слухала санеты
І не жадала слёз хаваць.
Яна паверыла паэту,
Ёй зноў хацелася кахаць.

## АПОШНЯЕ КАХАННЕ

Маладая, прыгожая, гнуткая,
Міласэрнасцю боскай спавітая,
Халадамі жыцця не кранутая,
Для кахання і шчасця адкрытая.

Трапяткая, у ласцы пяшчотная,
Ты чакаеш мяне пад рабінаю.
Я хачу, каб часінай маркотнаю
Ты была са мной побач, адзіная.

Пакладу табе рукі на плечы я,
Зазірну ў твае вочы глыбінныя,
На планеце з табой мы не вечныя,
Ты — каханне маё лебядзінае.

Я баюся згубіць цябе, родная.
Ды калі нашы мары не збудуцца,
За цябе памалюся, пяшчотная,
За імгненні, што век не забудуцца.

* * *

Мне здавалася, жыць без цябе немагчыма.
Думаў, нашага шчасця не скончыцца сон...
Углядаўся я ў зоркі тваімі вачыма,
Слухаў неба з тваёю душой ва ўнісон.

Лістапад на дварэ. Беспрытульная восень
Ахінула крылом верасовым палі...
Аднаму мне вядома, па кім так галосяць,
Адлятаючы ў вырай, твае жураўлі.

* * *

Сталасці парог пераступаю
З радасцю, трывогай і тугой,
Пакланюся сонечнаму гаю,
Каласок пагладжу даланёй,

Птушанятка выпешчу малое
І лісток з галінкі не сарву...
Я люблю аддана ўсё жывое
І таму на свеце сам жыву.

* * *

Пад месяца крылом
Нам дыхаць і спяваць...
Скажы, якім святлом
Цябе намаляваць?

У тлумнай мітусні
Мінае дзень за днём,
Ды фарбы цеплыні
Сагрэты пачуццём.

Скажы, якім святлом
Цябе намаляваць?..
Радком — адным мазком
Твой вобраз перадаць.

* * *

Шчасце — катэгорыя невызначальная.
Яно ў самім чаканні ці ў здзяйсненні чаканага?
А можа, гэта бясконцае імкненне да недасяжнага?
У чым яно?..
Штораніцы бачыць сонца, сінечу неба,
Удыхаць водар лугавых красак —
гэта і ёсць шчасце.

* * *

Нарог сталёвы мой не затупіўся,
Хаця ішоў не полем — цалінай.
Гарачы дзень ад працы прытаміўся
І выцер пот вятрыстаю рукой.
Гляджу я на ўзараную дзялянку —
Камення груды, парны травастой.

І не адно руплівае світанне,
Заручанае з роднаю зямлёй.
Я разумею: трэба многа працы,
Каб чарназёму слой схаваў пясок
І на сцяблінцы тонкай змог узняцца
Да сонца першы спелы каласок.

* * *

Спыніся, вечнасці імгненне,
Закрэслі тое, чым я жыў...
Я прадчуваю абнаўленне
Зямной прыроды і душы.

Былых пачуццяў попел — вершы —
Я ўжо даўно не варушу,

Не для таго, каб люд пацешыць,
Суд над самім сабой вяршу.

Хачу пачаць свой шлях нанова,
Свет зорны зведаць прагну я,
Як немаўля ў чаканні слова,
Душа пакутуе мая.

* * *

Якое халоднае лета —
Дажджы дзень і ноч шамацяць,
Ды вочы запозненых кветак
Мне ў сэрца з даверам глядзяць.

І сам я жадаю пагрэцца
Сярод непагоднага дня
Каля закаханага сэрца,
Дзе свеціць жыцця дабрыня.

* * *

Прашу: не стаўце крыж на мне,
Мая душа яшчэ жывая...
І я пра Вас адну спяваю.
Прашу: не стаўце крыж на мне!

Мінула, бы ў світальным сне,
Даўно апошняе спатканне...
Пакуль жыве ў душы каханне,
Прашу: не стаўце крыж на мне!

Мо пашкадуеце не раз
Аб тым, што мелі і згубілі...
Без пачуцця я́к Вы любілі?!
Як я кахаў аддана Вас!..

* * *

Я пераЖыў сваё каханне,
Душа па ім больш не баліць,
Хоць да апошняга дыхання
Я не змагу яго забыць.

Я не змагу забыць твой голас,
Пяшчоту рук тваіх і слоў,
І твар то сумны,
то вясёлы,
І пах пшанічных валасоў.

І вуснаў веснянае дыханне,
І вочы з восеньскай журбой...
Я пераЖыў сваё каханне,
Але душа Жыве табой.

* * *

Чалавек прыходзіць у жыццё
Для незамутненай праўды і зямной прыгажосці.
Святло і цемра,
дабро і зло,
Праўда і мана,
каханне і нянавісць...
Як душы абысці цемру,
зло,
ману,
нянавісць,
Як ёй прабіцца да святла, дабра,
Праўды, кахання?..
Як душы дапамагчы целу стаць чалавекам?

* * *

Быў доўгім шлях да развітання.
Журлівы верасень. Дажджы.
Я зберагу віно кахання
У кубку стомленай душы.
Няхай адстоіцца!
Мо з часам,
Калі асядзе бруд на дно,
Мы будзем піць з табою разам
Кахання светлага віно.

* * *

Даруй мне дробныя папрокі
І недарэчнасць хуткіх слоў...
Душой і сэрцам адзінокі,
Я да цябе шмат дзён ішоў.

Ішоў праз бессань і пакуты,
Смяг у спякоту без вады,
Я да цябе цяпер прыкуты
На ўсе астатнія гады.

Ніхто не зможа гэту повязь
Парушыць словам і агнём,
Пакуль жыцця свайго аповесць
Не завяршу зямным грудком.

## ВЯНОК БЕЛАРУСІ

*Вянок санетаў*

### 1

Табе я прысвячаю свой вянок,
Мая Радзіма, сэрцу дарагая,
Тут кожная сцяблінка і лісток
Тваё імя святое паўтарае.

Звініць над полем жаўранка званок,
Дванаццаць сёл уранні абуджае,
Чупрынай кучараваю клянок
Мяне ля хаты бацькавай вітае.

Як шмат наўкол сугучча хараства!
Дажджом памаладзілася трава,
Зяленівам душа мая сагрэта.

О, гэты неад’емны, дзіўны свет!
Дару табе, каханая, букет
З прыгожых кветак сонечнага лета.

2

З прыгожых кветак сонечнага лета
Каля рачулкі вытканы лугі,
Нібы саліст птушынага балета,
Бацян абходзіць важна берагі.

Каровы дояць дбайныя кабеты,
І мёдам пахнуць свежыя стагі...
О Беларусь, слязіначка планеты,
Дзе шмат пяшчоты светлай і тугі.

Люблю я хутары твае і вёскі,
Што захавалі часу адгалоскі
У вобразах цярплівых мацярок.

Крывёй і потам густа дол паліты.
Пра тое сведчаць абеліскаў пліты,
Валошка, святаяннік, чабарок.

3

Валошка, святаяннік, чабарок,
Душу народа ў назвах адчуваю.
Матуляй вышываны рушнічок —
Нібы сама гісторыя жывая.

Абмаляваны пеўнямі збанок
Умельству рук мазольных гімн спявае,
Нат сэрца, што замкнута на замок,
Прад хараством чароўным ажывае.

Вяртаемся да страчаных высноў?
А колькі лізаблюдаў-ласуноў
Сумленне размянялі на манеты?

Настольнікі, іконы, фартушкі...
Яны ж ва ўсе эпохі і вякі
Заўжды натхнялі кожнага паэта.

### 4

Заўжды натхнялі кожнага паэта
Старонкі роднай гоні і лясы...
Бацькоўскі кут, не раз ты мной апеты,
Няма на свеце лепшае красы.

Пераспяваюць у садах ранеты,
Смыляць у цётак рукі ад касы...
А дні жыцця згасаюць, як каметы,
І не вярнуць былой вясны часы.

Вяскоўцы-гараджане, мы не тыя,
Але чамусь гняце нас настальгія
Па матчынаму: «Сынку, з'еш блінок!»

Зямля дзядоў, прымі маё прызнанне:
Ты для мяне, як першае каханне,
Твая пяшчота просіцца ў радок.

5

Твая пяшчота просіцца ў радок,
Жанчына, маці, любая да скону,
З тваіх далоняў п'ю кляновы сок,
Касьбой світальнай трошачкі стамлёны.

Твой стан танюткі, быццам каласок,
Твар, як абрыс былiннае іконы.
Цалую валасоў тваіх лянок,
Кахай мяне, вясковая мадонна.

Хай стане ложкам зараз нам пракос.
Не бойся сведкаў — пчол і звонкіх вос,
Яны людзям не выкажуць сакрэта.

Прырода ўмее тайны берагчы,
Яе святло і ў будзень і ўначы
Пульсуе ў дзіўнай музыцы санета.

6

Пульсуе ў дзіўнай музыцы санета
Прарочая Максімава душа,
Радкі «Вянка» — нашчадкам запаветы,
Якіх не возьме смутных дзён іржа.

Ляжыць на мне стагоддзяў даўніх мета,
Нібы пісяг ад хіжага нажа...
На гарады нацэлены ракеты,
Якім народам ладзіцца імша?

Мы геніяў не слухалі ніколі.
Ці ж не таму асот буяе ў полі
І множыцца напасцяў злых клубок?

Прыпамінаю бацьку я міжволі:
«Сын, беражы зямлю сваю, як долю...»
Гучыць выслоўе ў сэрцы, як зарок.

7

Гучыць выслоўе ў сэрцы, як зарок,
Яно з крывёю мне перадалося...
Дзе быў раней малінавы барок,
Нямое ляда хмызам узялося.

Зламаны нейкім нелюдзем дубок
Вады ў залётнай хмаркі не папросіць,
Старая каня, гледзячы ў ставок,
Нібы ўдава, на могілках галосіць.

Спалю і я свае зямныя дні.
Нашчадак мой, малю: «Не пракляні
Ва ўгоду фарысейскаму эстэту».

Калі ж на ганьбу прах мой аддадуць,
Радзіма, прытулі і не забудзь,
Ты зорка найярчэйшая Сусвету.

8

Ты зорка найярчэйшая Сусвету,
Я Млечным Шляхам да цябе іду,
З табой заўжды бліжэй любая мэта,
Лягчэй адолець немач і бяду.

Не папрашу шчаслівага білета
У райскі сад. Сам шчасцейка знайду,
Свінцовы свіст бандыцкага кастэта
З мяне не выб'е твой бунтарскі дух.

Ты ваяроў багата нарадзіла,
Як маці, іх на подзвіг блаславіла.
Тваё імя мільёны ўберагло.

Ты сейбіта шануеш, як салдата.
І памяць аб забітых і распятых
Хай не патушыць хмарнае крыло.

9

Хай не патушыць хмарнае крыло
Вачэй дзіцяці, што жыцця не знае...
Чарнобыльскага монстра жарало
Над ім атрутнай парай патыхае.

Сышло ў нябыт чарговае сяло...
Кіслотны дожджык ніву палівае.
Чынуша кажа: «Што было — сплыло!»
І цыркуляр казённы запаўняе.

Пабраліся палеткі лебядой.
Сам-насам з нечуванаю бядой
Народ мой мужны б'ецца год каторы?

На звод насення шмат ужо пайшло.
О Беларусь, маю дарогу зорыць
Тваіх бароў жывічнае святло.

## 10

Тваіх бароў жывічнае святло
Маю душу ад ран будзённых гоіць...
Адклаўшы ўбок аловак і сціло,
Да мудрых дрэў спяшаюся на споведзь.

Там забываю пра чужое зло,
Якое ноччу сэрца непакоіць...
Ляснік запросіць у сваё жытло,
Кляновікам з карца мяне напоіць.

Каржакаваты ён, як Берандзей,
Сямёра ў горад выправіў дзяцей.
Гаворыць кожны раз адно і тое ж:

«Хлеб на асфальце голым не ляжыць.
А без зямелькі, сынку, як пражыць?
Ці прарасце насенне маладое?»

## 11

Ці прарасце насенне маладое
На полі нашых будучых надзей?..
Ляжыць яно, стаптанае, нямое,
Пасля вірлівых, ветраных падзей.

Прайшлі па ім бяздушнаю ардою
«Зычліўцаў» шмат, падобных на людзей,
Занятыя хіжацкаю дзяльбою
Гандляр, чынуша, злодзей, ліхадзей.

Ды грымне і над імі навальніца,
Павінен ачышчальны дождж праліцца,
Падымуцца нямыя з небыцця.

З палону векавога выйдзе мова.
І зазвіняць маёй любові словы
Галінкамі жывога пачуцця.

## 12

Галінкамі жывога пачуцця
Душа майго народа акрыляе.
І ён сягне за межы адкрыцця,
Якія толькі-толькі спасцігае.

Адкрыецца нязведаны прасцяг
Прад ім — стагоддзяў далеч векавая...
Мне бачыцца: прапраўнука дзіця
Мадонна беларуская люляе.

На дужых крылах жытняй збажыны
Дрыгавічоў, радзімічаў сыны
Да таямнічых зорак паляцяць.

Ёсць вера, што для дум прастор дае.
І я не адракуся ад яе
На развітальным выдыху жыцця.

### 13

На развітальным выдыху жыцця
Хачу цябе, Радзіма, вольнай бачыць,
Каб за мяжой халоднай забыцця
Ніхто мой лёс не здолеў перайначыць.

Жадаю зліцца з музыкай лісця,
Адчуць яе душой сваёй юначай...
Не трэба мне дарункаў набыцця,
Няхай бярозка нада мной паплача.

Душа з ёй будзе ўвесну гаманіць,
Ніколі не парвецца тая ніць,
Што звязвае свет мёртвых і зямное...

Пражыты дзень згасае за акном.
Нібы замову маці перад сном,
Зноў паўтару імя тваё святое.

### 14

Зноў паўтару імя тваё святое —
І адчуваю дужых сіл прыліў...
Яно — нібы насенне залатое,
Якое сейбіт-час мне падарыў.

У ім тваё пакутнае былое,
І боль, які душу запаланіў,
І слова, меладычнае, літое,
Як зерне з хлебадайных жытніх ніў.

Паэты, мастакі і песнятворцы
Цябе не раз узносілі да сонца,
Губляючы ў натхнёнай працы зрок.

О Беларусь! Табой узгадаваны,
З удзячнасцю, паклонам і пашанай
Табе я прысвячаю свой вянок.

## 15

Табе я прысвячаю свой вянок
З прыгожых кветак сонечнага лета.
Валошка, святаяннік, чабарок
Заўжды натхнялі кожнага паэта.

Твая пяшчота просіцца ў радок,
Пульсуе ў дзіўнай музыцы санета.
Гучыць выслоўе ў сэрцы, як зарок,
Ты зорка найярчэйшая Сусвету.

Хай не патушыць хмарнае крыло
Тваіх бароў жывічнае святло.
Ці прарасце насенне маладое

Галінкамі жывога пачуцця?
На развітальным выдыху жыцця
Зноў паўтару імя тваё святое.

## ЗМЕСТ

*Алесь Марціновіч.* Імгненняў паэтычных хараство 5

### МАКСІМ ЛУЖАНІН

*Прага крыла*

Маладым . . . . . . 23
Права на верш . . . . . . 24
Беларускаму народу . . . . . . 24
Хто ты? . . . . . . 25
Гуртам . . . . . . 26
Пахвала зброі . . . . . . 26
Кропля крыві . . . . . . 27
Мана . . . . . . 28
Вярнуся ветрам . . . . . . 28
Драўляная разьба . . . . . . 29
«Заўжды была ў народзе майстру хвала...» . . . 29
Шумелі бярозы . . . . . . 30
Матчын покліч . . . . . . 31
Першае слоўка Купалы . . . . . . 32
Сляпы салдат . . . . . . 32
Людзьмі стацца . . . . . . 33
Чарнобыльскі вецер . . . . . . 33
«І не сказаць, прыгожая...» . . . . . . 34
Скарбы . . . . . . 35
Вечнае сэрца . . . . . . 35
«Калі ў паход зайграў сігнал...» . . . . . . 36
«З ясных часін юнацтва...» . . . . . . 36
Рэпліка філосафу . . . . . . 37

Цераемнасць . . . . . . . . . . . . 37
Уздыхнуўшы . . . . . . . . . . . 38
«Возера — цудоўнае!..» . . . . . . . . . 38
«Як цёпла носіць у гадах...» . . . . . . . 39
«З тою злоснай вайной...» . . . . . . . 39
Часу . . . . . . . . . . . . . . 39
Сентэнцыя . . . . . . . . . . . . 40
«Гукнуў за морам наш хлапчына...» . . . . 40
«Цямнее...» . . . . . . . . . . . . 41
Нататкі колішняга дэпутата . . . . . . . 41
«Мой дружа, скаргамі ты збрыдзеў...» . . . . 43
«Усім часа́м радня...» . . . . . . . . 43
«Цесна і душна па нетрах таіцца...» . . . . . 43
«Перад разяўленай пашчай вайны...» . . . . 44
«Мой друг! Ці бачыў дзе ты...» . . . . . . 44
Выпадак на фронце . . . . . . . . . 45
«Спуджаныя вясной...» . . . . . . . . 46
Нядаўняе паданне . . . . . . . . . . 46
«Зайцы напрышывалі гузікаў...» . . . . . . 47
«Увечар пальцы лягуць...» . . . . . . . 48
Выстаім . . . . . . . . . . . . 48
Пачатак чалавека . . . . . . . . . . 49
Надыход слова . . . . . . . . . . . 50
Пушкіну . . . . . . . . . . . . 51
Экзамен . . . . . . . . . . . . 52
Сон . . . . . . . . . . . . . . 53
Здарэнне ў санаторыі «Нясвіж» . . . . . . 54
На раскопках . . . . . . . . . . . 56
Дом паэзіі . . . . . . . . . . . . 56
Бярозавік . . . . . . . . . . . . 57
Каменны сплаў . . . . . . . . . . . 57
«Ёсць у нашай краіны...» . . . . . . . . 58
«Зноў у вокны дарогі глядзяцца вагоны...» . . 59
У Амерыцы . . . . . . . . . . . . 59
«Мусіць, тут удачы многа...» . . . . . . 60
Зімовы малюнак . . . . . . . . . . 61
Жыццю . . . . . . . . . . . . . 61
Шыпшына . . . . . . . . . . . . 62
«Ліло...» . . . . . . . . . . . . 62
Мастак . . . . . . . . . . . . . 63
«МАЗ» на выстаўцы ў Нью-Йорку . . . . . 64
«Прад абліччам вечнай далі...» . . . . . . 65
Познія грыбы . . . . . . . . . . . 65
«Падманулі на ладушкі...» . . . . . . . 66

«На ўскраіне горада ў новай хаціне...» . . . . 66
Ластавінне . . . . . . . . . . . . . . . . 67
Яблыня . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Дзяўчына . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Пацалунак . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Запрашэнне на возера Нарач . . . . . . . . 73
Нарачанскія накіды . . . . . . . . . . . . 75
«Пахне спелай антонаўкай восеньскі сад...» . . . 77
«Яшчэ цяпла папачакай...» . . . . . . . . . 77
«Галлё шуміць...» . . . . . . . . . . . . 78
Крытыку, які дакараў за архаізмы . . . . . . 78
«Каб жа, маці, не была...» . . . . . . . . . 79
«Толькі вока заплюшчу...» . . . . . . . . . 80
Тыя, аб кім пісаў . . . . . . . . . . . . 80
«...Асеннія дні. Чырванее рабіна...» . . . . . 81
Раяль . . . . . . . . . . . . . . . . . 81
«Рэчка Паратунка на Камчатцы!..» . . . . . . 82
«Часцей і часцей на сябе наракаю...» . . . . . 83
«Шаўкі і дарогі па-рознаму мераюць...» . . . . 84
«Спяваем лепей або горай...» . . . . . . . . 85
Два галасы . . . . . . . . . . . . . . . 85
«Я дзесьці прачытаў...» . . . . . . . . . . 86
«Ні ў якім доме не хапіла б...» . . . . . . . 87
Дождж. Красавік, 1945 . . . . . . . . . . 88
Пачатак . . . . . . . . . . . . . . . . 88
На перадавой . . . . . . . . . . . . . . 90
Франтавік . . . . . . . . . . . . . . . 91
Палонны . . . . . . . . . . . . . . . . 92
Жаноцкае сэрца . . . . . . . . . . . . . 92
Маці . . . . . . . . . . . . . . . . . 93
«А навокал стаіць заварожаны бор...» . . . . . 93
«Кураць кнаты...» . . . . . . . . . . . . 94
1914 . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Прага крыла . . . . . . . . . . . . . . 99

## СЯРГЕЙ ГРАХОЎСКІ

### *Табе зайздросціць сонца*

Дубовы ліст . . . . . . . . . . . . . . 102
Пачатак . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Мама . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Народная настаўніца . . . . . . . . . . . 104

Сейбіт . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105
Поле, поле . . . . . . . . . . . . . . . . 106
Дома . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
Спагада . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
Кругазварот . . . . . . . . . . . . . . . 108
Табе зайздросціць сонца . . . . . . . . . 109
Блакітная зіма . . . . . . . . . . . . . . 110
Купалле . . . . . . . . . . . . . . . . . 111
Купалаў запавет . . . . . . . . . . . . . 112
Муза . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
У доме песняра . . . . . . . . . . . . . 113
Вечны вучань . . . . . . . . . . . . . . 114
Прарок Максім . . . . . . . . . . . . . . 115
Вішні . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
Музыка . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Права на праўду . . . . . . . . . . . . . 117
Казка . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
«Мы выраслі на хлебе і мякіне...» . . . . . . 118
Асенні дзень . . . . . . . . . . . . . . . 119
Вышэйшы чын . . . . . . . . . . . . . . 119
«Нельга ні забыцца, ні адкласці...» . . . . . 120
«Не спакушай мяне, змяя...» . . . . . . . . 121
Вечны след . . . . . . . . . . . . . . . 121
«Жыццё часамі мачахай было...» . . . . . . 122
Спаленыя масты . . . . . . . . . . . . . 123
Паэты . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
Папярэджанне . . . . . . . . . . . . . . 130
Няміга . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Адданасць . . . . . . . . . . . . . . . . 132
Мястэчка . . . . . . . . . . . . . . . . 133
Сівізна . . . . . . . . . . . . . . . . . 134
«Каго ты цураешся?..» . . . . . . . . . . . 134
Апошняя . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Асеннія гнёзды . . . . . . . . . . . . . 135
Каля вогнішча . . . . . . . . . . . . . . 136
Восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
Апусцелыя паркі . . . . . . . . . . . . . 138
Глухата . . . . . . . . . . . . . . . . . 138
Закаханым . . . . . . . . . . . . . . . . 139
Заінелыя журавіны . . . . . . . . . . . . 140
«Люблю зямлю, што пахне лесам...» . . . . . 143
На таежнай дарозе . . . . . . . . . . . . 143
Ласіны след . . . . . . . . . . . . . . . 144
На сібірскім тракце . . . . . . . . . . . 146

Шаман . . . . . . . . . . . . . . . . . 147
Маё багацце . . . . . . . . . . . . . . . 148
Душа . . . . . . . . . . . . . . . . . 149
«Я — малады, пакуль жывая маці...» . . . . . 150
Мая радаслоўная . . . . . . . . . . . . . 150
Павал . . . . . . . . . . . . . . . . . 152
Найлепшы твор . . . . . . . . . . . . . 153
Коні . . . . . . . . . . . . . . . . . 153
Саксафаніст . . . . . . . . . . . . . . 154
Тост . . . . . . . . . . . . . . . . . 155
Мой свет . . . . . . . . . . . . . . . 156
«Незавершаны верш — маладое віно...» . . . . 158
«Твае далоні пахнуць першым снегам...» . . . . 158
Пакаянне . . . . . . . . . . . . . . . 159
Крыло — да крыла . . . . . . . . . . . . 160
«Алены, Броні і Надзеі...» . . . . . . . . . 160
Вяртанне . . . . . . . . . . . . . . . 161
Сцюжа . . . . . . . . . . . . . . . . 162
Палае Рым . . . . . . . . . . . . . . . 163
Бяссмерце . . . . . . . . . . . . . . . 164
У зорнай вышыні . . . . . . . . . . . . 164
Завялыя рамонкі . . . . . . . . . . . . 165
«На ўзлессі дзічка расцвіла...» . . . . . . . 165
Сустрэча ў пекле з Мураўёвым . . . . . . . 166
Верасніца . . . . . . . . . . . . . . . 168
Бабіна лета . . . . . . . . . . . . . . 168
Хвіліна маўчання . . . . . . . . . . . . 170
Броня . . . . . . . . . . . . . . . . . 172
«Чаго мы не бачылі толькі...» . . . . . . . 173
Гарaць лясы . . . . . . . . . . . . . . 173
Агасфер . . . . . . . . . . . . . . . . 174
Серафім . . . . . . . . . . . . . . . . 174
Мелодыя . . . . . . . . . . . . . . . . 175
Старонка казкі . . . . . . . . . . . . . 176
Незваротнае . . . . . . . . . . . . . . 176
Мой верасень . . . . . . . . . . . . . . 177
Вера . . . . . . . . . . . . . . . . . 178
Свечка . . . . . . . . . . . . . . . . 179
Сатлелыя лісты . . . . . . . . . . . . . 179
Салодкае віно . . . . . . . . . . . . . 180
На апошняй вярсце . . . . . . . . . . . 181
Нашчадкам . . . . . . . . . . . . . . . 181

## АНАТОЛЬ ВЯРЦІНСКІ

### *Любоў адкрывае скарбы*

Маці пячэ хлеб. *З паэмы «Песня пра хлеб»* . 182
Лета 1965 года . . . . . . . . . . . . . . . 185
«Мы жывём, каб вяртацца...» . . . . . . . . . 186
Мама мыла раму... . . . . . . . . . . . . . . 187
Замест эпітафіі . . . . . . . . . . . . . . . 188
Там дома, у вёсцы . . . . . . . . . . . . . . 190
«Гора — не бяда, бяда — не гора...» . . . . . 190
«Цётка плакала па ўсім свеце...» . . . . . . . 191
Успамін былога вяскоўца . . . . . . . . . . 192
Статак вяртаецца з поля . . . . . . . . . . 193
Жаданні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 194
Паездка на радзіму са студэнцкім тэатрам «Жывое слова» . . . . . . . . . . . . . 195
Дынамік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 196
«Яны да вайны гулялі «ў вайну...» . . . . . . 197
Балада пра спаленую вёску і жывога пеўня . 198
Плач спаленай вёскі . . . . . . . . . . . . 199
Рэквіем па кожным чацвёртым . . . . . . . . 200
Два полі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 203
Не называйце ракеты крылатымі . . . . . . . 203
«Косім траву — яна не крычыць...» . . . . . . 204
Мая віна. *З паэмы «Даруйце!»* . . . . . . . 205
Пад небам адкрытым . . . . . . . . . . . . . 208
«Жыццё даецца, каб жыццё тварыць...» . . . . 208
«Люблю зямлю...» . . . . . . . . . . . . . . 209
«Любоў адкрывае скарбы...» . . . . . . . . . 209
З'яўленне . . . . . . . . . . . . . . . . . . 210
Позірк з космасу . . . . . . . . . . . . . . 210
«Будзе шкада, як шкада бывае...» . . . . . . 211
Той год незвычайны... . . . . . . . . . . . . 211
Пісьмо, каханне і дажджавая кропля . . . . 212
Парада юным закаханым . . . . . . . . . . . 213
«Мужчына. Жанчына. Чаканне...» . . . . . . . 214
Перад святам паэзіі ў Вязынцы . . . . . . . 215
Купала ідзе да Коласа . . . . . . . . . . . . 216
Ля магілы Максіма Танка . . . . . . . . . . 217
Сустрэча на Паркавай магістралі . . . . . . 218
На паклон да Кабзара . . . . . . . . . . . . 219
Баіцца быць беларус беларусам... . . . . . . 220
Калі гвалтуюць Айчыну... . . . . . . . . . . 221

Размова з Сожам. *Раздзелы з паэмы «Начны бераг»* 222
Яблыня ў горадзе . . . . . . . . . . . . 229
Дзеці ратуюць дзяцей... *З паэмы «Ствараецца новая казка»* . . . . . . . . . . . . 231
Перасцярога . . . . . . . . . . . . 232
Дзівак чалавек . . . . . . . . . . . . 234
«Маўчанне бывае рознае...» . . . . . . . . . . 235
«Я фільм глядзеў...» . . . . . . . . . . . 235
Варыяцыі на тэму «Гефест — друг Праметэя» . 236
«А ты ідзі, брат, чынна...» . . . . . . . . 239
«Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць...» . . . . 239
«Абрастаем...» . . . . . . . . . . . 240
«Мы напачатку зазналі страху...» . . . . . . 241
«Хто вынайшаў веласіпед?..» . . . . . . . . 242
Закон шчодрасці . . . . . . . . . . . 243
«Не ўсе і не заўсёды...» . . . . . . . . . 243
«Ляцеў груган...» . . . . . . . . . . 243
Туга метэарыта . . . . . . . . . . . 244
«Паміраюць ад кулі шалёнай...» . . . . . . . 244
Тры лепшыя спосабы заварвання чаю . . . . 245
Аптымістычны верш . . . . . . . . . . 246
Жылі-былі... . . . . . . . . . . . . 247
Тры цішыні . . . . . . . . . . . . 247
Хлопчык глядзіць . . . . . . . . . . . 249

## ЗМІТРОК МАРОЗАЎ

### *Парог сумлення*

«Сэрца вёскі маёй...» . . . . . . . . . . 250
Парог сумлення . . . . . . . . . . . . 251
«З баразны пачынаецца поле...» . . . . . . . 251
«Даўніной прычашчоны не раз...» . . . . . . 251
«Калі сцякае з небасхілу...» . . . . . . . . 252
«У бясконцых пошуках роднай душы...» . . . 252
Чытаючы вечную кнігу . . . . . . . . . 253
Мой лёс . . . . . . . . . . . . . . 253
«Карэц вады і луста хлеба...» . . . . . . . 254
«Ноч сышла нячутнаю хадою...» . . . . . . . 254
«Землякоў пазнаю па мове...» . . . . . . . 255
«Аляксандры, Марылі, Домны...» . . . . . . 255
Роднае . . . . . . . . . . . . . . 255

«Лісцвянае полымя з гаю...» . . . . . . . 256
«Будзіць у людзях чалавечнасць...» . . . . 256
«Матчыным парэпаным рукам...» . . . . . . 257
«У штодзённай пагоні...» . . . . . . . . . 257
«Люблю цябе, матчына мова...» . . . . . . 258
«Калі душа працята болем...» . . . . . . . 258
«Бярозавая светласць...» . . . . . . . . . 259
«Аддаю ўсяго сябе дарогам...» . . . . . . . 259
«Той, хто светла кахае...» . . . . . . . . 259
«Не будзіце любых на світанні...» . . . . . 260
«Басаногае сэрца спаткаў я ў дарозе...» . . . . 260
«Палёт натхнёны пачуцця...» . . . . . . . . 260
Берагіня. *Трыпціх* . . . . . . . . . . . . 261
«Вечар. Ціхая дарога...» . . . . . . . . . 262
«Сасновы бор гудзе, нібы арган...» . . . . . 262
«Расчаруй, вясна, таполю...» . . . . . . . 263
«Хаты. Жытняя палоска...» . . . . . . . . 263
«Даць сасмяглай кветцы вады...» . . . . . . 264
«Я кінуў жменю слоў жывых...» . . . . . . 264
«Мне Богам дадзена Радзіма...» . . . . . . 264
«Галосяць у дажджлівым небе гусі...» . . . . 265
«Скажы, зямля, чаму бяднееш?..» . . . . . . 265
Валуны. *З вянка санетаў* . . . . . . . . . 265
«Не бярыце грыбоў...» . . . . . . . . . . 266
«Я прыйшоў! Прачніцеся, зямляне...» . . . . . 267
«Праліўся дождждык на світанні...» . . . . . 267
«Каханне не купляецца...» . . . . . . . . 268
«Для кахання старасці няма...» . . . . . . 268
«Залатая пяшчота лісця...» . . . . . . . . 269
«Калі цябе няма побач, мне сумна...» . . . . 269
Тост . . . . . . . . . . . . . . . . . . 269
Пры святле нарачанскіх бяроз. *З цыкла вершаў* 270
«Твае маленькія пяшчотныя далоні...» . . . 270
«Мне заўсёды сяброў не ставала...» . . . . 270
«Калі размаўляюць вочы...» . . . . . . . 270
«Кахай мяне, як я цябе кахаю...» . . . . 271
«Світанак вятрысты і слотны...» . . . . . 271
«Срэбракрылыя далі...» . . . . . . . . . 271
«Спакутваны да болю...» . . . . . . . . 272
«Любая, мне сумна. Сыпле дождж асенні...» 272
«Пальцы твае — нібы клавішы...» . . . . . 272
«На зорным аргане зайграла світанне...» . . 273
«Гавары са мной, гавары...» . . . . . . . 273
«Ад рук тваіх святло зямное...» . . . . . 273

«Вятры. Бясконцыя дажджы...» . . . . . . 274
«Калі няма ў тваёй душы...» . . . . . . 274
«Я такіх жанчын яшчэ не бачыў...» . . . . 274
«Кожны пражыты дзень...» . . . . . . . . 275
«Барвовая лістота...» . . . . . . . . . 275
«Загадкі кольцаў гадавых...» . . . . . . . 275
«Жыве толькі дзень матылёк...» . . . . . . 276
Споведзь блуднага сына . . . . . . . . . 276
«Не трэба абязбольваць мне душу...» . . . . 277
«Я прад людзьмі ні ў чым не вінаваты...» . . . 277
«Нашу ў сабе я свет і антысвет...» . . . . . 277
«Ходзіць летні вечар паплавамі...» . . . . . 278
«Адбалела душа...» . . . . . . . . . . 278
«Згасае ноч. Пачатак дня...» . . . . . . . 279
«Не зберагаюць нас багі...» . . . . . . . 279
«Сіні-сіні сон асін...» . . . . . . . . . 279
«Прыгажосць нікога не ўратуе...» . . . . . 280
Санет . . . . . . . . . . . . . . . . 280
«Хутка восень. Бярозы лістотай пяюць...» . . . 280
«Там, дзе губляюцца словы...» . . . . . . 281
Прызнанне. *Вянок санетаў* . . . . . . . . 282
Апакаліпсіс душы. *З вянка вянкоў санетаў* . . 290
З вянка першага . . . . . . . . . . 290
З вянка пятага . . . . . . . . . . . 292
З вянка сёмага . . . . . . . . . . . 294
З вянка чатырнаццатага . . . . . . . . 295
З вянка магістральнага . . . . . . . . 297
«Палёў разлегласць — вокам не акінуць...» . . . 300
«Люблю глядзець, калі паволі...» . . . . . . 300
Брату Алесю . . . . . . . . . . . . . 301
Салаўінае пекла . . . . . . . . . . . . 301
«Самотная яблыня на бацькавым котлішчы...» . . 301
«Знямелі птушыныя спевы...» . . . . . . . 302
«З ласінага следу нап'юся...» . . . . . . . 302
«Напішыце мне ліст з маладосці...» . . . . . 303
«Тры словы я табе сказаў...» . . . . . . . 303
«Над лебядзіным возерам таполі...» . . . . . 303
«Самая чароўная жанчына...» . . . . . . . 304
«Зноў я світанак новы сустракаю...» . . . . . 304
Ты. *Вянок санетаў* . . . . . . . . . . . 305
«Нясу свой крыж да ціхага пагоста...» . . . . 313
«Над палямі цэлы тыдзень тчэцца...» . . . . . 313
«Што я ўнукам пакіну...» . . . . . . . . . 313
«Хлебнае зернетка...» . . . . . . . . . . 314

«Жыццё не раз мяне ламала...» . . . . . . 314
«Характарам і лёсам вуглаваты...» . . . . . 314
«Вачэй пралескавая сінь...» . . . . . . . 315
«Я быў адзін. Зусім адзін...» . . . . . . . 315
«Глыбокай ноччу, калі ўсе людзі спяць...» . . 316
«Раскалыхвае восеньскі вецер...» . . . . . 316
«Дворнік-вецер пустую алею...» . . . . . . 317
«Я дзіўны свет намаляваў...» . . . . . . . 317
«Жаночыя вочы...» . . . . . . . . . . . 318
«Я з Вамі бавіў час за кавай...» . . . . . . 318
«Класічная зіма — па дахі снег...» . . . . . 319
«Дождж за вокнамі, дождж...» . . . . . . . 319
«Жанчына слухала санеты...» . . . . . . . 319
Апошняе каханне . . . . . . . . . . . 320
«Мне здавалася, жыць без цябе немагчыма...» 320
«Сталасці парог пераступаю...» . . . . . . 321
«Пад месяца крылом...» . . . . . . . . . 321
«Шчасце — катэгорыя невызначальная...» . . . 322
«Нарог сталёвы мой не затупіўся...» . . . . 322
«Спыніся, вечнасці імгненне...» . . . . . . 322
«Якое халоднае лета...» . . . . . . . . . 323
«Прашу: не стаўце крыж на мне...» . . . . . 323
«Я перажыў сваё каханне...» . . . . . . . 324
«Чалавек прыходзіць у жыццё...» . . . . . . 324
«Быў доўгім шлях да развітання...» . . . . . 325
«Даруй мне дробныя папрокі...» . . . . . . 325
Вянок Беларусі. *Вянок санетаў* . . . . . . 326

**Сталасць думкі, маладосць душы: Зб. паэзіі / С75 Рэдактар-уклад. М. Мятліцкі; Прадм. А. Марціновіча.— Мн.: Маст. літ., 2000.— 350 с., іл.— (Школьная бібліятэка).**

ISBN 985-02-0060-X.

«Сталасць думкі, маладосць душы» — такім жыццёвым і творчым дэвізам аб'яднана творчасць чатырох вядомых беларускіх паэтаў — М. Лужаніна, С. Грахоўскага, А. Вярцінскага, З. Марозава. Гэта своеасаблівая хроніка духоўнага жыцця нашага народа на працягу XX стагоддзя, пададзеная трапным паэтычным словам і напоўненая ўзрушанасцю пачуцця і думкі.

**УДК 882.6-93**
**ББК 84(4Беи)6**

*Літаратурна-мастацкае выданне*

СТАЛАСЦЬ ДУМКІ,
МАЛАДОСЦЬ ДУШЫ

Зборнік паэзіі

*Для старэйшага школьнага ўзросту*

Рэдактар *М. М. Мятліцкі*
Мастак *В. І. Цехановіч*
Мастацкі рэдактар *М. Я. Шкурпіт*
Тэхнічны рэдактар *Т. М. Сокал*
Карэктары *Я. А. Бебель, Л. А. Дзядзюля*

Здадзена ў набор 08.12.99. Падп. да друку 25.01.2000. Фармат 84×108 $^{1}/_{32}$. Папера газетная. Гарнітура Школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 18,48. Ум. фарб.-адб. 18,90. Ул.-выд. арк. 16,09. Тыраж 25 822 экз. Зак. 4134

Выдавецкае дзяржаўнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ №3 ад 19.11.97. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат ВПП імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА

Чатыры паэты прадстаўлены ў гэтай кнізе: Максім Лужанін, Сяргей Грахоўскі, Анатоль Вярцінскі, Змітрок Марозаў. Чатыры са слаўнай кагорты творцаў, дзякуючы якім беларуская літаратура годна адчувае сябе сярод іншых высокаразвітых літаратур свету.

*Алесь Марціновіч*



МІНСК «МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА» 2000

127 000

127

060-X

9 789850 200600

СТАЛАСЦЬ ДУМКІ, МАЛАДОСЦЬ ДУШЫ